УЛАДЗІСЛАЎ СЫРАКОМЛЯ

ВАНДРОЎКІ ПА МАІХ БЫЛЫХ ВАКОЛІЦАХ



WĘDRÓWKI

PO MOICH NIEGDYŚ OKOLICACH.

WSPOMNIENIA, STUDJA HISTORYCZNE
I OBYCZAJOWE,

przez

Władysława Syrokomlę.



WILNO.
Nakładem i Drukiem Józefa Zawadzkiego.

1853.




Літаратурныя помнікі Беларусі

УЛАДЗІСЛАЎ СЫРАКОМЛЯ



ВАНДРОЎКІ
ПА МАІХ БЫЛЫХ ВАКОЛІЦАХ

УСПАМІНЫ,
ДАСЛЕДАВАННІ ГІСТОРЫІ І ЗВЫЧАЯЎ



Мінск
"Полымя"
1992

ББК 63.3(2Б)
С 95

Серыя заснавана ў 1991 г.

Пераклад з польскай мовы, прадмова і каментарыі
Кастуся Цвіркі

Пераклад падрыхтаваны па выданні:
Wędrówki po moich niegdyś okolicach. Wspomnienia, studja historyczne i obyczajowe, przez Władisława Syrokomlę.— Wilno: Nakladem i Drukiem Jozefa Zawadskiego, 1853.

Это довольно значительное прозаическое произведение Владислава Сырокомли (1823—1862) относится к жанру путевых очерков. Описывая исторические события в некоторых городах и местечках Беларуси автор воссоздает картину далекого прошлого здешней земли. Читатель побывает и во дворце местного магната, и в шляхетской усадьбе, и в бедной хатке селянина. С любовью рассказывая о дорогих сердцу местах — Несвиже, Столбцах, Койданове, Мире и др., В. Сырокомля не обходит вниманием и жизнь простых людей, показывает их быт, привычки, раскрывает богатство души. Со страниц книги предстают перед читателем и образы известных людей края — поэта Адама Плуга, философа С. Маймона, художника Ю. Гесского и др.

0503020903—038
С ——————— 15—92
М 306(03)—92

ISBN 5-345-00503-6

АД ПЕРАКЛАДЧЫКА

Вандраванні выдатнага польскага і беларускага паэта XIX стагоддзя Уладзіслава Сыракомлі (сапраўднае імя Людвік Кандратовіч) па роднай Беларусі пачаліся яшчэ з маленства: яго бацьку Аляксандру Кандратовічу, беззямельнаму шляхціцу, які вымушаны быў браць зямлю ў арэнду, даводзілася ў пошуках яе часта пераязджаць з месца на месца. Таму нарадзіўшыся ў вёсцы Смольгаў цяперашняга Любанскага раёна, будучы паэт неўзабаве апынуўся з бацькамі ў палескай вёсцы Яськавічы, што на рацэ Морач. Потым Кандратовічы перабраліся на новую арэнду — у вёску Кудзінавічы (зараз яна ў Капыльскім раёне). Адсюль малога Людвіка пасылаюць на вучобу ў Нясвіж, у дамініканскую школу. Пасля яе закрыцця хлопец едзе давучвацца ў Навагрудак, у такую ж самую школу, вядомую тым, што раней у ёй вучыліся славутыя паэты-філаматы, яго сучаснікі Адам Міцкевіч і Ян Чачот. Закончыўшы вучобу, Людвік ізноў вяртаецца да бацькоў, на іх чарговую арэнду — у вёску Мархачоўшчына пад Стоўбцамі. Праз колькі часу ён уладкоўваецца на працу ў нясвіжскую канцылярыю па кіраўніцтву панскімі маёнткамі, што месцілася ў радзівілаўскім замку. Вясной 1844 года, ажаніўшыся, дваццацігадовы Ул. Сыракомля бярэ ў арэнду фальварак Залуча на Стаўбцоўшчыне і пачынае гаспадарыць на зямлі. Магчыма, у тым чароўным прынёманскім кутку ён застаўся б назаўсёды, калі б не смерць дваіх яго дзяцей. Неспадзяванае гора вымусіла паэта пакінуць родныя ваколіцы і падацца далей ад іх — пад Вільню.

Туга па краі маладосці, па яго дарогах і сцежках, па светлых бярозавых гаях і зажураных палявых разлогах,

па жыватворнай бруі ціхаплыннага Нёмана, па звонкіх местачковых брукаванках і нясмелых акенцах сялянскіх хацінак паклікала яго ўзяцца за пяро і расказаць пра ўсё людзям. І паэт адразу ж па прыездзе на новае месца садзіцца за стол, піша вялікі мастацкі нарыс пра дарагія сэрцу мясціны.

Формай свайго твора аўтар узяў нататкі падарожжа на фурманцы. Яна, гэтая форма, дазволіла яму свабодна карыстацца самым разнастайным матэрыялам. У аповяд пра сучаснае аўтару жыццё беларускіх мястэчак і вёсак вельмі натуральна ўпісваюцца лірычныя адступленні паэта, уласныя ўспаміны, а таксама шырокі экскурс у даўніну краю. Прычым паэт смела выказвае асабістыя адносіны да фактаў сучаснасці і гісторыі, уласнае стаўленне да розных слаёў феадальнага грамадства, выяўляючы свой дэмакратызм, сваю крамольную сімпатыю да абяздоленых. У разглядзе гістарычнага мінулага беларускіх мястэчак і гарадоў ён не абмяжоўваецца храналагічным апісаннем падзей, а імкнецца дайсці да іх першапрычын. Як былы архівіст радзівілаўскага замка, Ул. Сыракомля побач з працамі па гісторыі меў добрую магчымасць вывучаць шматлікія дакументы, звязаныя з рознымі перыядамі Вялікага княства Літоўскага. Гэта дапамагло яму глыбей зразумець заблытаныя вузлы мінуўшчыны, аргументавана спрачацца з прафесійнымі гісторыкамі. Біёграф Ул. Сыракомлі польскі літаратуразнавец Ф. Фарнальчык, заўважыўшы такую свабодную манеру яго пісьма, жывую, неспакойную, непасрэдна звернутую да чытача плынь расказа, мусіць, правільна аднёс нарыс паэта да жанра публіцыстычнай прозы.

«Вандроўкі па маіх былых ваколіцах» — самы яркі празаічны твор «вясковага лірніка», як называлі Ул. Сыракомлю. Чытач з неаслабнай увагай сочыць за тым далёкім падарожжам паэта, за накірункам яго думкі, з цікавасцю аглядае тагачасныя мястэчкі і вёскі, зазірае у простую сялянскую хату і не нашмат багацейшы дворык засцянковай шляхты, у велічныя палацы і замкі магнатаў, углыбляецца разам з аўтарам у сівую даўніну краю, радуючыся сустрэчы з жывымі, па-майстэрску намаляванымі вобразамі вядомых гістарычных асоб і простых, але не менш цікавых людзей.

Апрача мастацкай каштоўнасці твор Ул. Сыракомлі мае вялікую пазнавальную вартасць. Па сутнасці праз хроніку гарадоў і мястэчак Нясвіжа, Стоўбцаў, Койданава, Міра і іншых аўтар разгортвае перад намі ўсю гісторыю Беларусі ад далёкай старажытнасці да ягонага часу, прытым вельмі аб'ектыўную, вольную ад палітычных схільнасцей, ад наўмыснага перакручвання. Надзвычай цікавыя старонкі, прысвечаныя культурнаму жыццю краю, яго помнікам. Паэт падрабязна апісвае выдатныя архітэктурныя помнікі — замкі, палацы, дамы, касцёлы, цэрквы, адміністрацыйныя, гаспадарчыя пабудовы, корчмы, многія з якіх бытавалі ў яго час і ад якіх цяпер засталіся мізэрныя рэшткі. Чытачу нават цяжка паверыць у тое неверагоднае культурнае багацце, што мела яшчэ не так і даўно наша зямля. Пачуццё шкадавання за незлічоныя культурныя страты яшчэ больш узмацняецца, калі чытаеш апісанне багацейшых мастацкіх калекцый, карцінных галерэй князёў Радзівілаў, дзе былі сабраны творы самых славутых майстроў свету і адначасова айчынных мастакоў. А якая безліч рэчавых каштоўнасцей, залатых, срэбных упрыгожанняў і прадметаў побыту захоўвалася ў багацейшых радзівілаўскіх скарбніцах! Расказвае Ул. Сыракомля і пра зборы старажытнай зброі, пра кнігі, рукапісы і іншыя прадметы духоўнай культуры, якія былі знішчаны ці разрабаваны і пра якія мы будзем ведаць хіба што з гэтых «Вандровак...»

Не забывае паэт і пра славутых людзей свайго краю — асветніка С. Будрага, філосафа С. Маймана, мастака Ю. Гескага, паэта А. Плуга, драматурга Ф. Уршулю Радзівіл і інш.

Асаблівую ўвагу ўдзяліў Ул. Сыракомля традыцыйнай культуры, звычаям, побыту, вуснапаэтычнай творчасці простага беларускага люду, паказваючы хараство яго душы, высокія маральныя якасці і адначасова не абмінаючы асобныя негатыўныя моманты ўласцівых яму поглядаў, што ўбачыў паэт у некаторых прыказках і прымаўках і ад чаго вучыць ён пазбаўляцца.

Напісаныя яшчэ ў часы прыгонніцтва Сыракомлевы «Вандроўкі...», дзе яскрава гучыць голас грамадзяніна сваёй зямлі, вельмі надзённыя і сёння. Для многіх даследчыкаў мінуўшчыны яны — выдатная крыніца,

адкуль дайно чэрпаюцца важныя звесткі па шмат якіх пытаннях нашай гісторыі і культуры.

У свой час айтару гэтых радкоў давялося адшукаць у рукапісным аддзеле бібліятэкі Акадэміі навук Літвы карэктарскі экземпляр «Вандровак...», што выходзілі асобным выданнем. Рукой цэнзара былі выкраслены там найбольш «непажаданыя» мясціны твора. У дадзеным перакладзе яны ў аснойным узнойлены. Такім чынам можна сказаць, што сёння, амаль праз 140 гадоў пасля напісання, «Вандройкі па маіх былых ваколіцах» Уладзіслава Сыракомлі друкуюцца ў пойным выглядзе ўпершыню.

К. ЦВІРКА

Спявай для сябе я пра родныя далі —
Каб слухалі й вы і пра сум забывалі.
Таму і спрачацца ні з кім тут не будзем,
Сабе тым лагоджу душу больш, чым людзям.
Прывыклі наш свет адбіваць на паперы
Во так — мастакі, а во так — землямеры.
Каморнік пакажа праз лініі поле:
У іх — толькі дужка яго і не болей.
Мастак жа бярэ краявід найцудойны
Ці сад манастырскі, руж сонечных пойны,
І сэрцам натхнёна пейзаж свой малюе.
Так я маляваць хачу край свой...

Б. Зімаровіч[1]

Вы ўжо без мяне заставайцеся ў свеце,
Маленства палеткі — як май вас расквеціў!
І вы заставайцеся, у сціпленькіх красках
Лугі мае любыя,— светлая казка.
Таксама і вы, нашы ціхія рэкі
Са стругамі ўсімі, бывайце навекі!
Бывайце, суседзі, сябры нашы — болей
Тут песні маёй не пачуць вам ніколі.
Вы толькі не кпіце з нядолі суседа
І не забывайце яго на бяседах.
А прыйдзе сабутка — на лузе ці ў лесе
Агонь раскладзіце і там пад гук песень,
Што з вамі спявай я, мяне спамяніце
Спагадлівым словам...

Той жа

ДА ЗЫЧЛІВАГА ЧЫТАЧА

Вельмі незвычайную кніжку прыношу табе, чытач: падарожжа па ваколіцы ў акружнасці пяці ці шасці міль, ваколіцы, якая нічым адметным не вылучаецца, якая не шмат можа ўспомніць з мінулага, а сёння зусім засталася без значэння. Аднак жа, не зважаючы на тое, узяўся я за працу над кніжкай. Дзве галоўныя акалічнасці падштурхнулі мяне да гэтага. Першая — жаданне падзяліцца з людзьмі сваімі асабістымі ўспамінамі, за што я павінен прасіць у чытача прабачэння, бо хоць для мяне яны і дарагія, яго могуць пакінуць абыякавым. Усё ж я цешу сябе надзеяй: хоць і не шмат, але знойдуцца чулыя сэрцы, якія, перажыўшы прыкладна тое ж, што і я, патрапяць і захочуць мяне зразумець.

Ваколіцы, якія я назваў тут *маімі*, адыгралі найважнейшую ролю ў маім уласным жыцці. Малым дзіцем трапіў я сюды, і тут, у радыусе некалькіх міль прайшло ўсё маё маленства, юнацтва і сталыя гады, тут зведаў я ўсе чалавечыя пачуцці — ад хлапчуковай радасці, калі ганяўся за матылём, і да сардэчнага болю, калі як бацька плакаў над магілкамі дзяцей. Гэтае сціплае мястэчка было першым горадам, які бачыў я ў жыцці, у гэтым ціхім касцёле пачуў я першы раз голас арганаў, прыняў там першае прычасце, якраз там на школьнай лаве ўпершыню пакаштаваў я пладоў навукі, там пад ценем вясковага алешніку, каля крыніцы, пачаў я прычашчацца да высокага святла паэзіі і марыць пра нязнанае яшчэ пачуццё кахання; у гэтым старажытным замку я ўвайшоў юнаком у кола таварыскага жыцця, у гэтай святыні узяў я шлюб, а потым у гэтай наднёманскай ваколіцы з Богам і кніжкай ступіў на пісьменніцкую дарогу, устанавіў ганаровыя для мяне і дарагія сэрцу адносіны з далёкім светам, тут, у першароднай цішыні, пад уражаннем прыроды і сямейнага жыцця вольна снаваў я ўток маіх думак.

Што ж за дзіва, калі гэтыя ваколіцы сталі для мяне святымі, што прырос я сэрцам да кожнай мілай мне касцельнай вежачкі, да кожнага ўзгорка на полі, крыжыка на дарозе, да кожнага дрэўца і кусціка, да амаль кожнай аблачынкі на небе!

Той, хто палюбіў так свае ваколіцы, знайшоў у іх, здавалася б, сваё шчасце.

Ды дзе там! Калі не знайшоў гэтага шчасця ў сабе, дарэмна шукаць яго ў знешнім свеце. Два балючыя ўдары лёсу, два непаразуменні з людзьмі — і старана, такая дарагая некалі сэрцу, стала для нас невыноснай; заставалася толькі пакінуць яе, забыўшыся на ўсё добрае, узяўшы з сабой толькі апошнія горкія ўспаміны. Добрае было сном і ілюзіяй, горкае ж — рэальнасцю.

Аднак жа цяпер, у шуме горада[2], не раз апаноўваюць мяне неадступныя ўспаміны пра тыя ваколіцы, пра тых людзей, тую прыроду. Калі не прагоніш іх сярод звычайных клопатаў удзень, яны вяртаюцца ўночы, не даючы спаць; дарэмна будзеш адганяць ад сябе былыя пачуцці — жаль ізноў міжволі сціснє здранцвелае сэрца; з заіржавелага вока па мармуровым твары скоціцца горкая сляза — уздыхнеш па сваім мінулым.

Як апошняе развітанне з людзьмі і зямлёй, дзе пражыў столькі гадоў гожай маладосці, як апошняе *«Бог, заплаці»* за хлеб, за соль, за слёзы, за радасць, за весялосць, за зведаны там смутак пішу я на аснове сваіх дзённікаў і ўспамінаў гэтыя нататкі пра *мае ваколіцы*. Нібы стары пілігрым, які не мае нічым іншым заплаціць свайму гаспадару за міласціну ці за гасцінную страху начлегу, расказвае свету пра свайго дабрачынца і ўслаўляе яго імя сярод добрых людзей. Хітры дзед ведае, што такім спосабам закране ў людзей самалюбства і схіліць іх да яшчэ больш шчодрай падаянкі. Але што да нас, то, не выпрошваючы, як жабрак, міласціну спачування, без ніякага тайнага разліку мы выплачваем наш доўг ваколіцы, у якой жылі.


Але ведаючы, што нашы асабістыя ўспаміны не шмат каму будуць цікавыя, не жадаючы тым не менш цалкам іх адкідваць, у гэтай вандроўцы будзем больш трымацца паважнасці і сухасці. Будзем даследаваць тут гісторыю, народныя звычаі, словам, усё, што просіцца нам на пяро, а паколькі выбралі мы вельмі невялікую прастору для вандроўкі, хочам паказаць, *што кожны закутак краю, хоць бы на першы погляд і не ўяўляе ён нічога надзвычайнага, можа стацца прадметам даследаванняў, а даследаванні такога роду не могуць быць для нас бескарыснымі, бо не*

ўсе мы добра ведаем сваю зямлю; што кожны, пільней прыгледзеўшыся да сваёй роднай ваколіцы і гэтак жа апісаўшы яе, здолеў бы дадаць нейкія звесткі да скарбніцы гісторыі.

Гэта была другая і важная мэта нашай працы.

Для спробы падаём на суд грамадскасці яе першую частку. Некалькі сядзіб, мястэчак, ваколіц — от і ўсё кола нашай вандроўкі. Калі чытач прыхільна яе прыме, гэта будзе для нас штуршком для далейшага падарожжа па *маіх былых ваколіцах.*

Д. 10 сакавіка 1853 г., Вільня



Дзе яе шукаць на карце? Мяжа Славяншчыны і Літвы.— Лясы.— Перадача маёнтка Свержня з ваколіцамі Яну Храптовічу.— Лёс уладанняў пасля яго.— Позірк на ваколіцы Залучы.— Жукаў Барок.— Успаміны пра Адама Плуга



Шчаслівы я, што доля даравала
Дабротай мерку мне. Хай іх і мала,
Мне досыць, Божа. І за гэта дзякуй —
Не трэба ўзнагароды больш ніякай.
Мая ты ніва! Скіба глебы плённай!
Ты з каласоў вянок за пот штодзённы
На галаву мне ўсклала...

В. Кахоўскі[3]. «ЛІРЫКІ»

Адзінокая, са старым дамком, ані адным дрэвам не прыцененая наднёманская сядзіба, што бачыла маю раннюю маладосць, не багатая на падзеі, але поўная ўсякіх пачуццяў, уражанняў, памятак з малых і сталых гадоў нашага жыцця; сядзіба, сама назва якой звязана з гэтулькімі маімі ўспамінамі, якая прыняла мяне дзіцем, песціла, калі стаў хлопцам, і якая выхавала з мяне, мусіць, аж занадта сур'ёзнага чалавека,— ад цябе пачынаю я сваю вандроўку, табе належыць першая старонка ў гэтай кніжцы! Хлеб з тваіх пясчаных палёў карміў маё цела, твае панурыя лясы, квяцістыя лугі, ні з чым не параўнальныя салоўкі выхавалі ў маёй душы замілаванне да красы нашай прыроды, тваёй самотнай глушы ўдзячны я за тое, што палюбіў песні і кнігі, у якіх бачу ўсю сваю будучыню. У падзяку за ўсё гэта я пашукаю ў зніклых вяках сляды тваёй мінуўшчыны — не гістарычных падзей, бо нам з табой не суджана было адыграць нейкай важнай ролі ў свеце.

Вось я разгортваю геаграфічную карту і, сочачы за бегам Нёмана, шукаю месца, дзе ты ляжыш...

Сакрат граміў некалі Альківіяда[4] за тое, што ён выхваляўся сваім сціплым кавалкам зямлі, якога і на карце Грэцыі нельга адшукаць. Я ж багацейшы за Альківіяда, бо на карце Літвы[5] без цяжкасці знаходжу месца, дзе ляжыць мая былая сядзіба. Праўду кажучы, не маё гэта ўладанне, але тое ніяк не кранае маё самалюбства. Мяне мала абыходзіць, што нехта іншы называе сябе ўладаром часткі зямлі, пра якую мова; хаця ўлюбёнец не мае аладыяльнага права[6] над сваёй любай, але тым не меней валодае ёю — яна належыць яму па праву любові. Такое права дазваляе і мне называць маімі і гэту сядзібу, і гэту вёску, і я прасочваю іх мінуўшчыну, не думаючы пра нейчае там дамінальнае на іх правы.

Так што зычлівы чытач, які захоча выправіцца з намі ў цяперашнюю *вандроўку па маіх былых ваколіцах*, няхай прабяжыць вокам па геаграфічнай карце — ад вусця да вытокаў Нёмана ў Мінскай губерні і спыніцца непадалёк ад гэтых вытокаў, у пункце паміж 45° і 46° паўночнай шыраты і паміж 54° і 55° усходняй даўгаты — з паўночнага боку Нёмана ўпадае тут у яго рака Сула. На малых картах яна пазначана толькі паўколам, на большых — напісана і яе назва. Амаль у тым жа самым месцы перасякае Нёман, ідучы з усходу і поўначы, старая мяжа паміж Рускай Славяншчынай і Літвой. На карце ўсё гэта — у адным месцы, але на зямлі ад Сулы да таго перасячэння мяжы праз Нёман — добрая палова мілі; тут якраз і мая сядзіба Залуча са сваім сціплым набыткам. Аднак мая тэрыторыя не абмяжоўваецца гэтым мізэрным кавалкам зямлі, а, цягнучыся аж за згаданую мяжу Славяншчыны, уключае ў сябе вёску, названую Жукаў Барок, дзе ўпадае ў Нёман невялікі ручай Ячонка. На паўночны захад, там, дзе вусце Сулы і Залуча, была яшчэ ўласна Літва, праз крок на паўднёвы ўсход, дзе сёння вёска Жукаў Барок,— ужо руска-славянскія ўладанні дрыгавічоў, крывічоў і г. д. Тут, за якія дзве тысячы крокаў ад майго дамка, я стаю на высокай гары, адкуль адкрываецца такі шырокі кругагляд, адкуль не раз азіраў я бясконцы свет, такі прывабны здалёку, не раз пасылаў малітву Небу; стаю на гары тварам да сонца, што заходзіць недзе за Нёманам за лес Бярштаны, і крычу: «Направа адсюль ляжала літоўская зямля, край Пяркуна[7] і сардэчнай Мільды[8], налева пачыналася зямля славянская, зямля сыноў Славы, прыхільнікаў Ессэ і Святавіда; потым з гэтага левага боку адбілася тут хрысціянская песня і рэха касцельнага звону, а з правага — хрыпаваты гук літоўскага рогу; тут, дзе стаю, спакойны складальнік вершаў,— праходзіла мяжа двух рыцарскіх народаў, у кожнага з якіх — свая будучыня, народаў, такіх розных сваімі норавамі, верай, звычаямі». Я мог бы, паказваючы направа і налева, усклікнуць услед за паэтам:

Вунь у адным баку блішчаць святынь зашчыты,
Гамоніць з небам лес — багоў прыстанак,
Ну, а ў другім — стаіць на ўзгорку ўбіты
Крыж...

Але ў сапраўднасці не было ў гэтай дзікай ваколіцы ні паганскіх святынь, ні хрысціянскіх крыжоў, толькі лясы на літоўскім і лясы на славянскім баку; літоўскія трохі цямнейшыя, бо сасновыя, славянскія дзе-нідзе перамешаны з весялейшымі бярозамі і ляшчынай; тут дае сябе знаць невялікая розніца ва ўрадлівасці зямлі. Спакойныя салаўі маглі тут вольна лятаць за мяжу на братнюю размову, бусел мог свабодна жыраваць на наднёманскай лугавіне за кардонам, нічога не баючыся... А людзі... Дзесьці ў гэтым месцы перасякала Нёман палітычная мяжа дзвюх моцных краін і плямён.

Аднак жалезнае плячо літоўскіх князёў яшчэ ў XIII стагоддзі знесла, як Самсон браму філістынаў, мяжу сваёй дзяржавы недзе далёка ва ўладанні мінскіх і полацкіх

князёў. Рынгольд, літоўскі князь, бацька Міндоўга, у 1235 г., г. зн. шэсцьсот семнаццаць гадоў назад, атрымаўшы перамогу пад Магільнам (4 мілі ад Залучы) над кіеўскім князем Святаславам, Дзмітрыем Друцкім і Лявонам Уладзімірскім, заняў тутэйшыя славянскія ваколіцы, зліў іх з Літвой, знёсшы гэтую мяжу. З таго часу тут ужо была Літва; Міндоўг, Вітаўт, Гедымін, Альгерд і яго дзеці сталі ўжо ўладарамі гэтых ваколіц; але панаванне Евангелля і крыжа шырылася тут так жа сама хутка, як панаванне літоўскага мяча і сякеры; з крыжам і Евангеллем літоўскія людзі прымалі чужую для сябе мову і звычаі народаў, ад якіх узялі веру. А з прычыны таго, што рэлігійная прапаганда вялася не мячом, а хлебам і соллю, пры дапамозе суседскай прыязнасці і шчырай любові, то поўная асіміляцыя тутэйшых літоўцаў прайшла так дасканала, што не толькі тут, але нават у ваколіцах Навагрудка, даўняй сталіцы Рынгольдаў і Міндоўгаў, дарэмна было б шукаць сярод люду чаго-небудзь літоўскага — звычаяў, грамадскіх парадкаў, мовы ці абрадаў. Калі што і нагадвае старое паганства, то без сумнення носіць хутчэй характэрныя рысы славян, чым літоўцаў. Але пакінем гэтакага роду даследаванні.

Мільда, літоўская багіня кахання, учыніла свой апошні цуд, кінуўшы князя Літвы Ягайлу да ног гожай хрысціянкі — польскай каралевы. Калі з віленскай вежы Крывэ-Крывэйтаў[9] загучаў голас кафедральнага звону, калі Польшча з Літвой пачалі ісці адной палітычнай дарогай долі і нядолі, старая мяжа Літвы, што ў тутэйшых ваколіцах пераразала раку Нёман, хоць і страціла сваё палітычнае значэнне, не перастала аднак існаваць, бо за польскім часам стала мяжой Навагрудскага і Мінскага ваяводстваў, у нашы ж часы аддзяляла Гродзенскую губерню ад Мінскай, а цяпер падзяляе Мінскі і Навагрудскі паветы. Як відаць з геаграфічных карт, уся гэтая межавая лінія, якая праходзіла тут здаўна, па сённяшні дзень засталася без асаблівых мадыфікацый і змен.

Шкада, што гэтая мясціна, нават назва якой невядома, нічым не вызначылася ў гісторыі: яна не была полем якой-небудзь гістарычнай бітвы, тут няма ніякага замчышча, няма нават мястэчка, якое б карысталася магдэбургскім правам і пра якое можна б было расказаць, што калісьці ў сівых вяках мела права мяча. Тут нават шляхецкае права бізуна над акалічнымі вёскамі дасталася маім папярэднікам, тутэйшым арандатарам, вельмі позна, бо хоць назва Залуча вядома ўжо з XVI ст., пра што мы далей скажам, аднак я сумняваюся, каб у тую эпоху сядзіба была сталіцай памешчыцкіх уладанняў. Можа, у ягелонскія часы які далёкі перасяленец раскарчаваў тут колькі загонаў поля, пабудаваў хату і даў назву мясціне, можа, потым жыў тут які стралок, бортнік ці наднёманскі рыбак, можа,

якая цікавая народная быліца звязана з гэтай мясцінай — хто ведае? Вецер развееў тутэйшыя дзеі, хвоі прыглушылі сваім шумам голас народнай традыцыі; песні.

Тут жа заўсёды былі лясы і лясы; хвоі і елкі ішлі па Літве ўздоўж па Нёмане ад самых яго вытокаў і, можа, да вусця, а ўшырыню — адзін Бог ведае, як далёка. Рэшткі гэтых лясоў славяцца яшчэ і сёння, нягледзячы на тое, што кожны год іх бязлітасна знішчаюць тыя, хто гандлюе дрэвам з замежнымі краінамі, нягледзячы на нябачную сякеру селяніна, які што ні дзень агаляе ваколіцу ад яе скарбаў, патрэбных яму ў паўсядзённым жыцці, і (што страшней за гандаль лесам і сялянскае спусташэнне) нягледзячы на так званую лясную ахову, для якой, як кажа мясцовая прымаўка, *на сасне пшаніца расце*.

Пасярод гэтых лясоў нешматлікае тут насельніцтва разрабляла для сябе палянкі, будавала вёскі і мястэчкі, што, як і ўвесь край, належалі, згодна са спадчынным правам, Вялікаму княству Літоўскаму, бо ў Літве Гаспадар з'яўляўся ўладаром краю і ўладальнікам маёнткаў і зямлі з усімі яе багаццямі і прыбыткамі, а яго падданыя лічыліся падданымі ў вузкім значэнні слова: адно — як падданыя яму палітычна, а другое — як памешчыцкая ўласнасць. Гэтак, як нашы сённяшнія сяляне. І была поўная роўнасць саслоўяў перад правам кія. Пасля пад уплывам іншых уяўленняў уладары сталі даваць за заслугі рыцарству з уладанняў галоўнага даміньёна свае вотчыны, гэта значыць наменклатуру месца, часам усяго некалькі хатак, з правам высечкі лясоў і заснавання асад у межах некалькіх міляў ці дзесяткаў міляў. Такім чынам пачалі з'яўляцца ўладальнікі зямлі, наданай уладарамі краю, пакуль, як вядома, Жыгімонт Аўгуст[10] не адрокся ад правоў над Літвою як землеўласнік, а застаўся толькі ўладаром у палітычным значэнні гэтага слова.

Месца, дзе сёння Залуча і навакольныя вёскі, займала толькі малую частку нязмернага абшару лясоў, дзе-нідзе раскарчаваных на палянкі, якія належалі маёнтку (curia) *Свержань*. Як і ўся Літва да пачатку XVI ст., гэтае месца было родавым уладаннем вялікага князя. Толькі Жыгімонт I[11], ацаніўшы маральныя вартасці, заслугі, вернасць і мужнасць Яна Літавора Храптовіча, вялікага маршалка і драгічынскага старосты, яго змаганне ў абарону манархіі і айчыны, перадаў яму ў вечнае карыстанне Свержань і вёскі, якія належалі Свержню, з усім тым, што ў іх маецца сёння і што будзе тут у будучым, з людзьмі, якія жылі на гэтых землях і якія могуць тут асесці пасля, словам, з усёй без выключэння маёмасцю і выгодамі, скрупулёзна падлічанымі ў лацінскім пергаментавым прывілеі, уласнаручна падпісаным самім каралём. Калі ад нядбалага захоўвання гэты прывілей так быў пашкоджаны часам і моллю, што нават нельга было прачытаць год яго выдання, Жыгімонт

Аўгуст у час Гродзенскага сейма ў 1550 г. на просьбу зацікаўленага боку загадаў выдаць з яго выпіску за сваім уласным подпісам і вялікай літоўскай пячаткай.

Тыя падараваныя ўладанні цягнуліся некалькі міляў па абодва бакі Нёмана. Яшчэ ў той час мы не сустракаем назваў вёсак і сядзіб. Відаць, іх было тут не шмат, а можа мы проста не знайшлі тутэйшых назваў у паперах з эпохі, пра якую ідзе гаворка*.

Ян Храптовіч спадчынныя ўладанні Свержня аддаў у пасаг дзвюм сваім дочкам, адна з якіх, Ганна, выйшла замуж за Грыгорыя Остыка, трокскага кашталяна, а другая, Зофія,— за Мікалая Ужэлеўскага. Куток зямлі, дзе цяпер Залуча і прылеглыя вёскі, дастаўся Грыгорыю Остыку.

Остык нядоўга гаспадарыў на гэтых землях, а хутчэй — у гэтых лясах, бо ў выніку сямейнай дамоўленасці ўступіў уладанні свайму швагру Ужэлеўскаму. З апісання тае перадачы, ажыццёўленай у 1536 г., вельмі выразна відаць межы ўладанняў, дзе сённяшняя Залуча,— рускі дакумент акрэслівае абшар ад ракі Ячонкі да Сулы. «А Сула ў Нёман упадае, а Ячная таксама ў Нёман упадае, і цягнуцца землі па рацэ Нёман...» — значыць, то быў абшар ад вусця ракі Ячонкі і да вусця Сулы. Якраз у гэтым абшары ляжыць мая вёска. У апісанні не згадваюцца іншыя паселішчы, акрамя вёскі Аталезь, што мела дзевяць асобных «службаў», г. зн. сялянскіх хат, колькасць якіх вырасла сёння да пяцідзесяці.

У гісторыі малой вёскі тры стагоддзі можна акрэсліць некалькімі фразамі: ад Ужэлеўскіх гэты куток перайшоў да Служкаў, гаспадароў стаўбцоўскіх уладанняў, ад Служкаў у 1575 г.— да Мікалая Крыштофа Радзівіла; у 1681 г. Залуча ўжо значыцца як фальварак; пры Яне Казіміры (паводле падання) гэтыя ваколіцы спустошылі шведы, пакінуўшы пасля сябе памяць — пару капцоў у лесе і жменю медных шэлегаў з адбіткам Яна Казіміра і падобных ім з ініцыяламі Г. А. (Густава Адольфа), кінутых калісьці ў Нёман,— грошы тыя вясной у час паводкі асядаюць на пясчаных берагах; Караль Станіслаў Радзівіл, канцлер літоўскі, каля 1720 г. заснаваў у Жукавым Барку уніяцкую царкву, тут жа нейкім сваім натуральным шляхам узнікла сама сабой і карчма — вось і ўсё гістарычнае мінулае вёсачкі. У вёсцы люд убогі, робіць ён на нёманскіх віцінах альбо на сваім і панскім полі; у маёнтку — арандатар ці

* Звесткі пра наднёманскія фальваркі, якія перайшлі потым да Радзівілаў, мы ўзялі з папер нясвіжскага архіва: некаторыя — непасрэдна, а некаторыя — з цытат у выступленнях юрыстаў пры разглядзе справы пра апеку князя Антонія Радзівіла, познаньскага валадара, над княжной Стэфаніяй Радзівіл у рамках гаворкі пра аддзяленне нясвіжскага майярату ад спадчынных уладанняў. З тых выступленняў найбольш нам прыдалася «Рэпліка з боку князёўны» п. П. Юзафа Карчэўскага 1824 года.

аканом; на пясчаных нівах — часцей за ўсё неўраджай; часам ранні разліў Нёмана, мор, спякотнае лета, марозная зіма, дажджы, спрыяльныя ці не спрыяльныя гаспадаркі — вось усе факты мясцовай гісторыі, якія трымаюцца ў памяці тутэйшых жыхароў. Помняцца яны, пакуль жыве старое пакаленне; маладое ў сваёй долі і нядолі цалкам забываецца пра ўсё гэта. Генерацыя за генерацыяй працавала на памешчыцкай ніве, скардзілася на сваю долю ў вясковай карчме, у нядзелю малілася ў царкве, у панядзелак вазіла з бліжэйшых лясоў у Мір дрэва на продаж і такім чынам аплачвала падаткі і чынш, пасля ішла на вечны спачын на пясчаны царкоўны цвінтар, уступаючы месца новаму пакаленню.

Выехаўшы з двара, мінуўшы грэблю ў нізіне, узбіраемся на высокую гару, адкуль як на далоні налева відаць разлеглыя пустыя палі, направа — зялёныя лугі, сярод якіх дзе-нідзе высяцца расахатыя дубы, далей — зарослыя вербалозам нёманскія затокі, а яшчэ далей — срэбная стужка самога Нёмана, за ім — лясы, раскіданыя ўдалечыні хаткі, пясчаныя ўзгоркі, шырокія разлогі палёў — ваколіца, прыгожая для вока таго, хто тут прыжыўся, але пустая для чужака, які не звязаны з гэтымі мясцінамі ніякімі ўспамінамі, таму не можа зразумець спеваў тутэйшых салаўёў, шуму тутэйшага ветру.

Пясчаным насыпам уязджаем у вёску Жукаў Барок. Працавіты люд праз стагоддзі ўрабіў гэтыя бязлюдныя пяскі: збажына навокал кусціцца буйней, чым ва ўсёй ваколіцы. Тутэйшыя людзі, сярэдняга росту, з лагодным, славянскага выразу тварам, у чорных з дамашняй воўны сярмягах, заклапочана снуюць па сваіх шнурах. Мы вітаем іх згодна звычаю: *«Бог у помач!»* і ад усёй душы зычым плёну ў іх мазольнай працы.

Вёска балоцістая, бо ў нізіне, і хоць малая (у ёй можна налічыць ледзьве дзесяць хат), але, дзякуючы свайму гожаму месцу на беразе Нёмана, славіцца кузняй, млынам, царквою, плябаніяй, лясніцтвам, прасторнай новай карчмою і паромам на Нёмане. Ад усяго гэтага яна часам нагадвае мястэчка, зрэшты, у мінулым і папраўдзе была нечым да яго падобнай, пра што любіць успомніць.

Не смейцеся, паблажлівыя чытачы, з такой арыстакратычнай прэтэнзіі нашай вёскі — я пакажу вам памятку, якой і праўда наша вёска можа ганарыцца. Ці бачыце з грэблі побач з царквой у садзе малую, цяпер запушчаную сядзібу? Гэта — тутэйшае лясніцтва. У тым дамку, у тым садзе правёў свае дзіцячыя гады малады, прызнаны грамадствам пісьменнік, аўтар *«Споведзі»*, *«Дзетазабойцы»* *«Заразы»* і іншых твораў Антоні Пяткевіч, вядомы пад імем Адама Плуга[12]. Таварыш яго дзіцячых гадоў, я добра помню маладога паэта ў акружэнні прыстойнай шляхецкай сям'і, у абдымках братоў і добрай маткі; помню тыя

сціплыя пакоі, той садок у квецені і тыя добрыя сэрцы жыхароў дамка, гледзячы на якіх чалавек з замілаваннем думаў пра сціплую прастату продкаў. У мяне сціскаецца сэрца, калі чытаю ў прысвечаным мне вершы Плуга* ўспамін пра тыя прыгожыя хвілі нашага ранку і адначасна горкі і праўдзівы зварот да рэчаіснасці:

Вунь яна, сядзіба продкаў,—
З садам тым, з гняздом буслiным,
З шустрых ластавак чародкай,
З буркатаннем галубiным.
Родны кут. Стаю, застылы.
Во наш дом бацькоўскі мілы.
Пацямнелі, збляклі сцены.
Дзе ты, час наш летуценны?
Жураўлінымі ключамі
Адляцеў ад нас імклiва.
Дом акенкамі-вачамі
На мяне глядзіць тужліва.
З палыном глухім ля клеці
Сумна шэпчацца унь вецер.
І сабака ў будцы вые...
А ці помніш, як, бывала,
Дружа, ўсё тут шчасцем грала?
Пойдзем к хаце... Ах, мой браце:
Людзі іншыя, чужыя
Там цяпер гаспадарамі;
Могуць дзверы ў нашай хаце
Зачыніць яны прад намі.
Дзе ж цябе я прывітаю?
Хай кутка, мой друг, не маю,
Дзе б цябе я хоць часамі
З распасцёртымі рукамі
Мог сустрэць каля парогу
І абняць, мой любы дружа,
Ды я маю, дзякуй Богу,
Сэрца, што кахае дужа.
Ты у ім, калі ні зойдзеш,
Дом наш даўні, родны знойдзеш.


І праўда, малады паэце: яшчэ ў нашых сэрцах знойдзем сябе. Ад берагоў Днястра[13], ад берагоў Віліі, куды параскідала нас доля, мы, поўныя ўспамінаў, сэрцам вяртаемся на пясчаны бераг Нёмана, каб там падумаць і заплакаць і ў сяброўскім абдымку падбадзёрыцца, набраць новых сіл у бясконцай жыццёвай дарозе.

* Гл. «Athenaeum», 1849. Т. III, стар. 235.

II

ДАРОГА ДА МІРА

Колькі слоў пра засцянковую шляхту



Мінаючы вёскі, дубровы,
мястэчкі,
Табе раскажу я пра рэкі і рэчкі,
Дзе шлях іх, куды з іх якая
ўпадае,
Якую з іх Вісла глытае.

Кляновіч[14]. «ПЛЫТНІК»

Пазнаёміўшы крыху са сваёй ранейшай сядзібай, запрашаю цябе, чытач, у далейшую вандроўку па тутэйшых ваколіцах. Будзем пільнавацца пры гэтым большых дарог. Пераправіўшыся ў Жукавым Барку праз Нёман, мы трапляем на яго заходнім беразе ў нізіну, прывабную для вока, але вельмі небяспечную для вандроўніка, які змушаны перасякаць тут сухія і мокрыя канавы і ручаіны, кружыць удоўж і ўпоперак па гразкім балоце. Удосталь пакружыўшыся тут, мы ўрэшце выязджаем на шырокую пясчаную дарогу, што вядзе на паўднёвы захад, да Міра.

З гэтай нізіны цікаўнае вока, скіроўваючыся і назад, і ўперад, убачыць усю розніцу ў краявідзе краіны па двух баках Нёмана: там, за ракой, адкуль мы рухаемся, сінеюць хваёвыя лясы, ярчэй зелянеюць наднёманскія астраўкі дрэў і гэты «*ракітавы вянок*»*, што аздабляе чало Нёмана. Адтуль, ад вады і з лясоў, далятаюць да нас спевы птаства, бо мы ездзім раніцай; а перад намі — голая пясчаная раўніна, высокія пясчаныя ўзгоркі, бедная раслiннасць. Уся безабаронная краіна, аддадзеная ва ўладу віхур і спякоты, выклікае ўражанне нейкай панылаcці. Направа ад нас цягнецца ў далечыні ўзбярэжжа Нёмана, налева пачынаюцца высокія ўзгоркі (на адным з іх — даўні шведскі акоп) — яны служаць як бы пераходам да больш урадлівых ваколіц, здольных карміць многія вялікія вёскі і засценкі. Дарога адкрывае перад нашымі вачамі стэп, дзе відаць толькі крыжы, дахі далёкіх сялянскіх хат і дзе-нідзе адзінокія купкі дрэў. Гэта адзіныя дэмаркацыйныя пункты, якія паказваюць дарогу таму, хто яе ведае і без іх; той жа, хто яе не ведае, пэўна, заблудзіцца сярод гэтых пясчаных палёў і ўзгоркаў, на гэтай сетцы дарог і дарожак, што вядуць немаведама куды.

Мы едзем адкрытымі палямі, прыпякае сонца, над намі

* Выраз Кляновіча ў дачыненні да Віслы.

бумкаюць авадні з нявінным намерам напіцца крыві падарожнікаў. Ці мала на дарозе жыцця мы сустракаем такіх во сатэлітаў?

Што азначаюць крыжы, якіх так многа трапляецца на шляху? На бясплоднай ніве выцягваюць яны плечы к небу — быццам узносячы малітву, каб быў пасланы адтуль ратаю лепшы ўраджай. Можа, гэта памятка якога-небудзь даўняга трагічнага выпадку? Але дарэмна пытацца пра тое ў навакольнага люду: пастаўлены ў далёкую даўніну крыж паступова гніў, вось-вось меўся ўпасці ці ўпаў, і новае пакаленне аднавіла яго, дадало да яго ад сябе новы і моліцца перад ім, просячы лепшую долю, а доля яго — тая ж самая.

Крыж, пясчаны маляўнічы ўзгорак, за ўзгоркам — ізноў крыж і вось ручай, абапал якога зялёная паша, а налева ўцёк ад гасцінца засценак Віскачы, каб схаваць ад вока падарожніка сваю сённяшнюю беднасць. Бо вядома ж, што засценкі, альбо шляхецкія сядзібы, якія былі калісьці характэрнаю прыкметаю шляхецкай польскай рэспублікі, некалі бурлілі палітычным жыццём сваёй краіны, болей нават шумна, чым сучасныя клубы на захадзе, былі гняздом і расаднікам гэтай дзейнай расы шляхціцаў, што зброяй, пяром, моцнай да кнігі і келіха галавой здзіўляла свет, сёння, скажам мы, страцілі не толькі грамадскае, але і ўсякае значэнне і ніякай не вытвараюць прадукцыі, нічога не даюць краю, акрамя невялікіх чыншаў, акрамя аканомаў для суседніх маёнткаў, акрамя (як тут) коней на кірмашы, гадаваных гэтай шляхтай, вернай рыцарскім звычаям продкаў. Са сціплымі патрэбамі і сродкамі засцянковы шляхціц, абрабляючы сваю ўбогую ніву, не клапоціцца пра сваю асвету, пра лепшы побыт, пра павышэнне прадукцыйнасці сваёй гаспадаркі. Ён яшчэ ганарыцца сваімі прывілеямі і гатоў паўтараць, што «ён роўны ваяводзе», але не здагадваецца, што некалі ён і праўда быў роўны ваяводзе і ў сіле, і ў розуме, і ваявода лічыўся з ім; не здагадваецца яшчэ сённяшняя засцянковая шляхта, што калісьці была каўчэгам законаў свабоды, якія так клапатліва выпрацоўваліся на сеймах, з'ездах і ў вусных ці пісьмовых палітычных даследаваннях альбо ў крывавых бітвах з ворагамі і братамі, што права яе продкаў не прызнавала ні пана, ні мужыка, ні мешчаніна, а толькі шляхціца, што яно не лічавала нават караля — толькі шляхту, толькі шляхта была ўсім і ўсё было для яе. Сумна цяпер глядзець на былых нашчадкаў тых магутных, свабодных, авеяных славаю шляхціцаў-рыцараў, сумна бачыць іх цяперашні інтэлектуальны ўзровень, сумна прызнаваць маральны ўпадак дробнай шляхты, якая пасля колішняга ўзвышэння трапіла ў поўную залежнасць ад магнатаў — сваіх братоў паводле канстытуцыі, але ў сапраўднасці

сваіх паноў. Як Эзаў у «Біблії», які за міску сачавіцы прадаў хітраму брату права старшынства, шляхта за кухаль мёду, за паўвалокі зямлі прадавала панам і сваё рыцарскае плячо, і сваё грамадзянскае права голасу, і не адзін раз сваё грамадзянскае сумленне. Спадзеючыся на панскую ласку, прыкутая да мізэрных засцянковых сядзіб, выціснутая з рысталішча вялікіх грамадзянскіх заслуг і адапхнутая ад стала, калі рэспубліка дзяліла хлеб для заслужаных, шляхта пачала карміцца сейміка-вым варывам і, абражаная ў сваёй чалавечай годнасці, дайшла да таго, што ў яе пачало расці пачуццё ганарлівасці за сваё шляхецкае званне, яна стала толькі хваліцца абвешчанай роўнасцю ў шляхецкім саслоўі, якой у сапраўднасці ўжо не было.


Сваю палітычную ролю, а з ёй і маральнасць шляхта пачала страчваць ужо з другой паловы XVII ст., дык ці дзіва, што сёння, калі ў яе аднялі права голасу, якім яна Бог ведае як карысталася, перайшла шляхта выключна на земляробчую працу, не вельмі ўдзячную як тут, так і ў іншых краях, і ледзь-ледзь забяспечвае свае самыя сціплыя патрэбы. Добра раскрыў невысокі інтэлектуальны ўзровень сённяшняй засцянковай шляхты ўсімі паважаны і мілы майму сэрцу паэт А. С.[15]

...Ведае шляхта, адкуль яна родам,
Ды раз не дае грошай прадзедаў слава,
Іх цнотам вучыцца якая выгода?
Глядзіць усё ж шляхта ў мінулага сховы
І знае, што продкі галілі галовы,
Насілі здаўна кунтушы ды чамары...
Што йшчэ? Білі туркаў, татараў.


Але цяпер шляхта перажыла век свайго актыўнага жыцця і забыла найбольш важную частку ўласнай гісторыі. Што ж ёй застаецца рабіць сёння? Яшчэ болей драбнець ці адрадзіцца ў новай форме, знайшоўшы карысную працу, выбраўшы адну з многіх патрэбных грамадству прафесій, якія прапануе ўрад кожнаму, хто жадае працаваць? Земляробства, літаратура, гандаль, дзяржаўная служба — колькі ж тут трэба працаўнікоў, колькі ж працавітым рукам будзе і хлеба, і пашаны, і славы! Сціплыя, невялікія, ідылічныя засценкі, што не даюць колькі патрэбна хлеба і не могуць забяспечыць усіх работай, няхай бы засталіся толькі як гняздо, дзе вырастаюць маладыя пакаленні, і як прытулак для старых пасля працоўнага жыцця, як захавальнікі сямейнай дабрачыннасці. Але маладым трэба ў свет! Абавязкова ў свет! Як было ў часы, калі шляхта жыла актыўным жыццём. Такая наша братэрская парада шляхце з засценкаў. І я буду маліцца, каб ёй на свеце заўсёды свяціла шчасце.

Няхай даруюць мне чытачы за такое адступленне пра нашу засцянковую шляхту. Едучы па пясчаных і аднастайных раўнінах, чалавек — хоча ён ці не хоча — мусіць пра што-небудзь думаць, а апісваючы падарожжа, і думкі свае павінен паведаць чытачу. Хто-небудзь можа пісаць усю кнігу з саміх уражанняў падарожжа — чаму ж мы не можам думкам сваім прысвяціць колькі старонак? Ці гэта для нас *першыня*? Ці адзін раз паэтычныя летуценні, салодкія і горкія, якія нам прыплывалі ў галаву і ў сэрца якраз у тутэйшых мясцінах, мы перадавалі нашым чытачам? Але пойдзем далей! Мінуўшы такім чынам цяжкі для пераезду масток пад засценкам Віскачы, *«наталіўшы»*, як кажа Трэмбіцкі[16], *«смагу ў мілым раўчуку»*, рухаемся па пясчанай раўніне пакручастаю дарогай далей. Мінаючы злева і справа ледзь бачныя здалёку два ці тры засценкі, дзе праводзяць сваё незайздроснае жыццё нашчадкі шляхты, што служыла некалі Радзівілам, падарожнік з прыемнасцю адчуе, як яго галаву асяняе лес гожых хвой, елак і ляшчын, а прытупленым аднастайнасцю вачам прадстае новая карціна. Неўзабаве з лесу адкрываецца від на зарослую цяністымі вербамі грэблю, направа відаць гожая лугавіна пасярод лесу, налева — возера, а за ім маляўнічы ўзгорак, зарослы ядлоўцам,— там шляхецкая хата, млын на возеры і яшчэ дзве іншыя хаты. Гэта асада *Міранка*, якая сваёй назвай нагадвае, што мы ўжо недалёка ад Міра.

І праўда, выехаўшы з лесу, мінуўшы колькі глiністых узгоркаў, любуемся весялейшымі краявідамі, бачым, як выплываюць з туману касцельныя і царкоўныя вежы мястэчка Мір, дах яўрэйскай школы і велічны сваімі руінамі замак Ільінічаў у вянку старых ліп і вязаў прылеглага да яго саду.



Першыя ўражанні па ўездзе.— Мірскі замак.— Адступленне ад прадмета і колькі слоў аб архітэктуры.— Першае гістарычнае ўпамінанне пра Мір у XIV ст.— Перадача Міра Сеньку Гедыгалдовічу.— Татарскія напады.— Ільінічы.— Апошні з Ільінічаў.— Мір у руках Радзівілаў.— Парафіяльны касцёл.— Літаратурная спрэчка мірскага арганіста з панам Марцінам, бернардынскім фурманам, пра мірскія званы.— Надпіс на плябаніі.— Сённяшні выгляд і становішча мястэчка.




Вось дамкоў убогіх статак —
Дзе канец, там і пачатак,
Бо ў мястэчку тым на грудзе
Нават дзвесце хат не будзе.
Пэўна, холадна ў тых хатах,
Бо ад дыму тут падатак.
Два тут кляштары, храм Божы,
Дзве карчмы на раздарожжы,
Як і ўсюды, як звычайна...

Я. Ясінскі[17]. «СПРЭЧКІ»

З боку Жукавага Барка ўязджаеш у Мір, у вёску: усе больш арыстакратычныя будынкі недзе пахаваліся, перад намі ж — вуліца мяшчанскіх дамоў і хлявоў, што нагадваюць вёску. Толькі карчма пры самым уездзе — гэтая пастка на сялян, якія прыязджаюць у горад, і купкі бруднага і лянівага яўрэйства напамінаюць мястэчка. Вязнучы ў гразі, якой Мір славіцца сярод іншых тутэйшых гарадоў, потым патрэсваючыся па выкладзеным нячастымі камянямі бруку, які, мусіць, помніць яшчэ паганскія часы — такі мае варварскі выгляд,— едзем на рынак, рухаемся міма ранейшай базыльянскай, а цяпер грэчаскай царквы і паміж крам, змураваных у два рады, паглядных знадворку, але пустых усярэдзіне, уцякаючы ад чарады крыклівых яўрэяў абодвага полу, якія расхвальваюць свае рэдкія тавары, сунімаемся нарэшце перад старасвецкім мураваным касцёлам са званіцай, таксама мураванай, толькі ўжо новай, у нейкім няпэўным архітэктурным стылі.

Калі паварочваем улева і едзем па вуліцы, што вядзе на Нясвіж, перад нашымі вачыма ўстае ва ўсёй веліччы сваіх руінаў Мірскі замак, да якога ад касцёла будзе з тысячу крокаў. Спяшаемся паглядзець на прыгожы помнік дойлідства першых гадоў шаснаццатага стагоддзя, узнесены над невялікім ручаём і абведзены валам, лёхам і ровам, рэшткі якіх яшчэ можна дзе-нідзе ўбачыць. Прыгожы гэта быў замак, шкода толькі, што ён не праславіўся ніводнай гістарычнай падзеяй. Брама ў форме паловы вала, над ёй і па кутах замка пяць прыгожай архітэктуры вежаў з пашкоджанымі байніцамі, яшчэ мураваныя сцены — вось і ўсё, што засталося ад велічнага гмаху*. Руіны з чырвонай цэглы прыгожа глядзяцца на зялёным фоне даўніх валоў і блізкага саду. Гнёзды буслоў на вежах па-асабліваму і вельмі добра аздабляюць

* Змяшчаем тут вельмі дакладны від Мірскага замка, скапіраванага з малюнка Русецкага — уласнасці вядомага археолага графа Яўстафія Тышкевіча.



Мірскі замак.
XIX ст.

тое, што засталося ад замка,— яму, нягледзячы на моцныя яшчэ сцены, ужо ніколі, мусіць, не ўваскрэснуць.

Гэта, як бачым, гатычная пабудова; яшчэ ў ёй праглядваецца нешта феадальнае, часы сярэднявечча, але відаць ужо ўплыў італьянскага стылю, які ў XVI ст. адбіўся ў нас на ўсіх творах мастацтва. Бо дойлідства, як і літаратура, добра адлюстроўвае час. Хачу развіць сваю думку. У грэкаў і рымлян, народаў рэспубліканскіх, што на ты з багамі, святымі, і грамадскія пабудовы вызначаліся вялікімі памерамі, лагоднасцю формаў і велічнаю прастатою. Адбівалася тут не веліч багоў, у чый гонар узносіліся святыні, а веліч здольнага да ўсяго народа, што прыходзіў сюды маліцца і абходзіць свае абрады. Язычнікі грэкі і рымляне прадугадвалі Бога, але паколькі яны жылі пры дзяржаўным ладзе, калі ўлада не была сканцэнтравана ў адных руках, то і рысы аднаго Бога — усемагутнасць, звышдабрата і звышмудрасць — раздрабілі на лікі тысячы сваіх бажкоў, што паасобку не былі нічым іншым, як людзьмі найвысокай маральнай дасканаласці, чые рысы ў сваёй сукупнасці і складалі Бога (так, як *senatus populusque romanus*[18] у сукупнасці складаў грамадскую ўладу Рыма), але ніводзін з іх паасобку не дасягаў найвышэйшай улады. Скараючыся зборнай сіле Бога, колішні язычнік адчуваў, што яго бажкі — толькі форма, у якую ён сам па сваім разуменні ўвасобіў некаторыя рысы Бога; таму з тымі багамі дазваляў сабе

абыходзіцца, як хацеў, а ў святынях, пабудаваных у іх гонар, не біў чалом, але адкрыта абмяркоўваў дзяржаўныя праблемы, верачы, што найбольшая заслуга ў вачах багоў — гэта лепшыя грамадзянскія якасці. Святыні грэкаў і рымлян былі пабудовамі народнымі — шырокімі, адкрытымі, галасы ў іх адгукаліся рэхам; там адзначаліся мінулыя гады, консульствы, бітвы, можна было ўбачыць творы папулярнага ў народзе разбярства і атрыманы за бітвы з ворагам сцяг — славу айчыннага мастацтва і славу зброі. Архітэктура святынь сімвалізавала сабой чалавецтва, *згуртаванае ў грамадзянскую супольнасць і ўзвышанае да ідэалу боства.*

Асаблівасці народнага побыту ў сярэднія вякі, адрозненні яго ад побыту ранейшых часоў адбіліся на абліччы гатычнай архітэктуры. Божы свет, разарваны на тысячы дробных частак; закуты ў жалеза рыцар адваяваў сабе ўладу над кавалкам зямлі, назваўся з Божай ласкі ўдзельным панам, але адчувае, што здабытае грубай сілай ён здолее ўтрымаць толькі тады, калі будзе пільны, узброены і хітры, а таму павінен быць строгім і ганарыстым, бо іначай не зможа дабіцца паслухмянасці васалаў. Дом яго — замак на высокай скале, з вежамі, якія служаць для абароны і адначасова сімвалізуюць неабмежаваную моц магната-феадала; гмах быццам кажа падданым, што няма ўлады іншай, як Бог і гаспадар замка, чый герб на высокай вежы сягае аж у неба. Феадальныя замкі — звычайна завостранай формы, дэкор ламаных кутоў нагадвае думнае і гнеўнае чало; кожная самая нявінная на выгляд аздоба мае абарончую мэту, як кожная ўсмешка хітрага чалавека, што прывык маскіраваць свае тайныя намеры; многа ў тых замках лёхаў, хованак, падкопаў, адсекаў для зняволеных і капліц, бо гэтак жа многа страшных тайнаў жыве ў сэрцы вяльможнага феадала. Вузкая брама — хацяб праз яе не ўціснулася помста ці здрада; малыя вокны — бо пры такім стане рэчаў не любяць сонца, бо гэта вякі цямноты; непабеленыя, з каменя альбо цэглы муры — бо ў задачу замкаў уваходзіць не прымаць любых сэрцу гасцей, а бараніцца ад назойлівых, пужаць тых, хто можа пранікнуць з ліхімі намерамі.

Гмахі касцёлаў у сярэднія вякі маюць той жа гатычны характар. Манархі і папы імкнуцца ўмацаваць сваю ўладу і паказаць людзям, што яны — пасланнікі Бога. Бог — гэта не носьбіт міласэрнасці, не сын, які пайшоў на крыж за людзей, не дух, што хоча асвяціць зямлю, як уяўляецца ўсім, а грозны ўладар, які на першы план ставіць справядлівасць, а не літасцівасць, які гатовы ў кожную хвіліну перуном пацвердзіць клятвы Ватыкана. Малітва да яго — гэта не просьба дзіцяці да бацькі, але голас зняволенага да свайго пана. І сапраўды, толькі так магло духавенства гаварыць з тагачасным грамадствам, дзе матэ-

рыяльная сіла стала над усімі ідэямі, дзе вялікія злачынствы патрабавалі вялікіх пакут, дзе толькі касцёл мог рэфармаваць грамадства; з магутнымі і безпакаранымі нельга было гаварыць іначай, як мовай нязломнай сілы і Божай справядлівасці. Вось тайна цёмных, вузкіх, высокіх, закратаваных жалезам касцельных і кляштарных сярэдневяковых муроў. Выгляд гатычных гмахаў з іх высокімі вежамі, што сягаюць аж у хмары, як бы хоча сказаць: *з нябёс бяруць яго пасланнікі сваю грозную зямную сілу.*

Па меры таго як друк і Рэфармацыя хісталі сярэдневяковы парадак рэчаў, весялеў і стыль будаўніцтва. Сцены сталі ўжо закругляць, вокны павялічваць, брамы пашыраць, бо ўжо дабрачыннасць, асвета, гасціннасць, словам, лепшыя чалавечыя якасці пачалі замяняць ранейшае «права мацнейшага». На месцы колішняй пакорнай і гарачай веры Рэфармацыя, тэалагічныя спрэчкі і заглыбленне ў Біблію адхілілі частку таямнічай заслоны, якая закрывала ў сярэднявеччы ўсю хрысціянскую рэлігію. Пачалі са святатацкай цікавасцю, наколькі было дасступна, углядвацца ў аблічча Божае, а калі заўважылі, што на тым святым абліччы болей спагады, чым гневу і грозьбаў, разняволеныя дзеці зблізіліся з Айцом, а ў велічных, ясных, прыгожых і адкрытых святынях, узнесеных Богу, хацелі выказаць Яго веліч, звышмудрасць і дабрату, якая гарнула да Яго лона ўсю Адамаву дзятву. Гэта ўжо была прысяга не зняволеных, а вольных і разумных істот, якімі бачацца дзеці *новых* вякоў. Такі стыль касцельнага будаўніцтва, найперш праяўлены ў Ватыкане, зрабіўся хутка ўсеагульным, нават езуіты, што кінулі ўсе сілы, каб не дапусціць усяго гэтага і вярнуць назад сярэднявечча, мусілі прыстасавацца да духу часу і сваім касцёлам надаваць рысы дабразычлівага, а не грознага боства.

Занепад гвалтоўнай сілы і рост палітычнага значэння маралі адбіліся ў новую пару і на грамадзянскім будаўніцтве. Паглядзім толькі на нашы замкі XV і XVI стагоддзяў і на пазнейшыя — як палагаднеў іх гатычны стыль ад новых, менш суровых формаў, вострыя куты ўступілі месца простым кутам, кругам і авалам, якія, надаючы будынкам характэрства правільнасці, выклікаюць пашану, а не страх. Грамадства пачало ўваходзіць у больш прыстойныя формы жыцця. Зменшылася сіла, стала — рада не рада — усміхацца, знізіліся вежы і дахі замкаў, расшырыліся вузкія брамы, як верны знак той дыпламатычнай гасціннасці, якой кожны чакаў ў гмаху магната. Са зменамі ў вайсковым мастацтве з вузкіх байніц былі зроблены шырэйшыя вокны, што ўпускалі болей сонечнага прамення, бо арыстакрат баяўся, каб не падумалі, быццам ў цемнаце ён снуе змову супроць грамадзянскіх

свабод. Завалены таямнічыя лёхі, а ў падземных склепах, дзе некалі енчылі зняволеныя ахвяры панскага самадурства і суровасці, хаваюць бочкі з венгерскім вінам і мёдам для прыёму братоў-шляхціцаў, без якіх не маюць сілы магнаты. Атынкаваны і пабелены муры, бо ўсякую дзікасць, што яшчэ заставалася, трэба было старанна выганяць, а ісці да людзей з прыветлівасцю, з святочнасцю, з распасцёртымі рукамі і з той вясёлай усмешкай, што яднае людскія сэрцы. Гэтакі выгляд муроў так званай новай эпохі нібы гаворыць: *няхай братаецца слабасць з сілай у імя святла.*

Ці пабудаваныя сёння гмахі багацеяў — з нізкімі дахамі, як іх ганаровая лагоднасць, з кваціcтымі садамі, як іх мова, з узятымі на замок брамамі, як іх сэрца, з недаступнымі паркамі, як іх эгаізм, ці яны, гэтыя пабудовы, у якіх спалучаецца столькі розных стыляў і эпох, правільна характарызуюць нашы часы? Які наогул характар нашай эпохі і нашага дойлідства? Пра тое з адлегласці часу скажа нехта іншы. Ну а мы вернемся да руін Мірскага замка.

Адразу можна заўважыць, што гэта пабудова вельмі старажытная. У руінах няма тых вялізных камянёў, якія, напрыклад, мы бачым у высокіх сценах Наваградскага, Лідскага, Медніцкага ці Крэўскага замкаў, дзівячыся з незвычайнай сілы людзей — так высока ўзнесеныя і замацаваныя вапнай велізарныя валуны прымушалі верыць народнаму паданню пра нейкае племя волатаў, што будавала гэтыя гмахі*, ці, можа, гэта дае прычыну паплакаць над дзікасцю вякоў, калі ваеннапалонны, прыраўняны да быдла, быў прыгнаны на работу, якая патрабавала нечалавечай сілы. Тут жа нічога такога няма: муры цагляныя, акуратныя, архітэктура пабудовы чыстая і поўная вытанчанага характэрства, стыль гатычны, але змякчаны акруглымі і прамавугольнымі формамі — словам, увесь замак прыгожы, з пераходнымі рысамі ад сярэднявечча да новага часу.

Можа ўзнікнуць пытанне: з якой мэтай узводзіўся гэты прыгожы помнік дойлідства XVI ст.? Быў спакойны час, будаваўся замак у глыбіні спакойнага краю, і цяжка дапусціць, што абарончыя мэты сталіся тут галоўнымі — тым больш што сама раўнінная мясцовасць для абароны не вельмі прыдатная. З другога боку, Юрый Ільініч, які

* Наш просты люд пра многія замкі апавядае, быццам бы яны пабудаваны волатамі альбо багамі. Прывядзем тут паданне, якое чуў я ў ваколіцах Крэва, дзе знаходзіцца старалітоўскі замак, што помніць забойства Кейстута. Кажуць, нібыта замак муравалі аднachасова з Медніцкім, за сем міляў адсюль. А племя, якое ўзводзіла гмахі, было такое дужае, што майстры, пазычаючы адны ў адных мулярскі молат, перакідалі яго з Меднікаў да Крэва і наадварот.

загадаў мураваць гэтыя сцены, быў не надта багаты магнат, і такі магутны гмах не адпавядаў яго фартуне і значэнню. Дзеля чаго ж тады будаваў? Ды проста ганарыстаму Ільнічу ці яго апекуну Мікалаю Радзівілу Чорнаму хацелася, каб Ільініч займеў тытул валадара замка Святой Рымскай Дзяржавы і пісаўся «граф мірскі», а такі тытул прысвойвалі нямецкія імператары толькі ўладальнікам замкаў. Значыць, арыстакратычная пыхлівасць была краевугольным каменем гэтай пабудовы.

Але вернемся ў даўнейшыя стагоддзі, зазірнём у першыя часы існавання Міра.

Сама назва мясцовасці гаворыць пра нейкі мір ці саюз, можа, паміж Літвой і Руссю, бо, як ужо згадвалася, недалёка адсюль праходзіла мяжа, што аддзяляла два плямёны. Але калі, хто і з кім завязаў тут саюз? Хто заснаваў мястэчка ці асаду? Змрок стагоддзяў схаваў усе падрабязнасці.

Першае ўпамінанне пра Мір мы сустракаем у рэляцыі пра інтрыгі крыжакоў у XIV ст., калі гэтыя ўзброеныя законнікі, пасварыўшы паміж сабой дзяцей Альгерда і Кейстута[19], мелі надзею скарыстаць упадак Літвы для свайго палітычнага ўзвышэння. У 1395 г. крыжакі, якія падтрымлівалі Свідрыгайлу ў барацьбе з Вітаўтам, уварваліся на чале з вялікім магістрам Конрадам Юнгінгенам у Літву і за пятнаццаць дзён спустошылі наднёманскія ваколіцы, спалілі Драгічын, Наваградак, Мір і Ліду*, а затым вырушылі ў свой рэйд далей і працягвалі яго, пакуль вясновае разводдзе, што заспела іх пад Салечнікамі, не прымусіла павярнуць назад.

Праз трыццаць дзевяць гадоў, г. зн. у 1434 г., знаходзім яшчэ адну згадку пра Мір. На вялікакняжацкім літоўскім троне, сагнаўшы з яго Свідрыгайлу, гады два сядзеў Жыгімонт Кейстутавіч[20]. Перад гэтым паміж абодвума князямі вяліся варварскія бітвы з прыцягненнем крыжакоў. Рыхтуючыся да рашучага ўдару па Свідрыгайлу, Жыгімонт адчуў патрэбу ў аб'яднанні моцных і верных сабе прыхільнікаў, для чаго пачаў раздаваць славутым літвінам землі і замкі — як тыя, што належалі ўсяму краю, так і тыя, што былі ў аладыяльным валоданні вялікіх князёў. У ліку адораных князем быў Сенька Гедыгалдовіч, якому дастаўся Мір з усімі землямі. Прыводзім тут дароўную паперу, што да гэтага часу захавалася на лацінскай мове ў Нясвіжскім архіве: «У імя Бога амін. Паколькі людскія дзеі хутка мінаюцца і іх не можа ўтрымаць нядоўгая чалавечая памяць, то іх трэба абавязкова замацаваць у пісьме. Пагэтаму мы, Жыгімонт, з Божай ласкі вялікі князь літоўскі, рускі і г. д., пісьмом

* Гл. «Гісторыю» М. Балінскага[21]. Вільня. Т. І. Стар. 154— цыт. Ліндэнблят.

гэтым даводзім да памяці ўсіх, што, добра ўзважыўшы многія заслугі вернага нам і мілага Сенькі Гедыгалдовіча і жадаючы, каб у будучым ён яшчэ лепей нёс сваю верную службу — не так дзеля ўзнагароды, як для прыкладу іншым, названаму Сеньку, а таксама яго дзецям і нашчадкам ніжэй памянёны маёнтак, г. зн. *Мір*, з усім тым, што даўно яму належыць, разам з людзьмі, г. зн. з Дзямідам і яго роднымі сынамі, тым Дзямідам, які праз мяжу перайшоў сюды са сваёй зямлі, мы аддалі, даравалі, запісалі і цяпер аддаём, даруем, замацоўваем, запісваем на будучае гэты маёнтак з усімі яго выгодамі, чыншамі, прыбыткамі, з усімі палямі, лясамі, палянкамі, дубнякамі, зараснікамі, з гаямі, сасновымі барамі, з борцямі і пчалінымі пасекамі, з платнымі выпасамі для коней, з лугамі, пашамі, узгоркамі, далінамі, азёрамі, ставамі, вадою, рэкамі, затокамі, плытамі, сажалкамі, з правам лавіць рыбу на берагах, ручаямі... з іх дабротамі, словам, з усімі паасобнымі і валавымі здабыткамі і даходамі ўсялякага роду як цяперашніх назваў, так і тых, якія ім будуць давацца ў будучым, уздоўж, ушыр і навокал у даўнейшых межах... і межах папярэднікаў нашых і яго, Сенькі; якія ён сам меў, дадаючы нашы правы на ўладанні да правоў нашых нашчадкаў, не адносячы сюды толькі службу, што здаўна нам абавязана падначальвацца. Правамоцны ён гэтыя пamесці трымаць і на вечныя часы валодаць імі, можа прадаць іх, абмяняць, перадаць, аддаць у заклад, падараваць, словам, рабіць з імі так, як яму і яго паўнапраўнаму патомству ці паўнапраўным далейшым наступнікам захочацца. Для пасведчання і трывалай моцы надання мы зацвярджаем пячаткай Нашай Велічы. Адбылося гэтае наданне ў нашым замку ў Троках большых у суботу, на восьмы дзень пасля Цела Божага, года тысяча чатырыста трыццаць чацвёртага ў прысутнасці радавітых і паважаных віленскага кашталяна Остыка, ваяводы трокскага Пятра, альбо Лелюша, маршалка зямлі літоўскай Пятра Мангердовіча, Андрэя Неміровіча, нашага сакратара шляхетнага Мікалая, які прысутнічаў на камісіі, і многіх іншых сапраўдных сведкаў».

Ці крыжакі дашчэнту спалілі і знішчылі даўнейшы Мір, ці быў ён тады яшчэ невялічкай асадай, але мы бачым: гэты гучны прывілей даваў шырокае права на валоданне ўсім, што ўжо і перад тым належала Гедыгалдовічам, і ў дадатак, відаць, права на карчаванне лясоў і засяленне людзьмі лядаў, але не даваў гатовых ўладанняў. Мы чытаем тут згадку толькі пра маёнтак (curia), але не ўпамінаецца яшчэ там замак, ані слова не гаворыцца пра горад, не называюцца ніякія ўгоддзі, а ўсё сялянскае насельніцтва, як апавядаецца, складаецца толькі з нейкага Дзяміда і яго сям'і, Дзяміда, які Бог ведае адкуль заблудзіў сюды і, нібы той Ной, памалу выгадаваў

цэлае племя падданых. Праз семнаццаць гадоў гаспадарання Сямён Гедыгалдовіч, стаўшы ўжо віленскім кашталянам і намеснікам Казіміра Ягелончыка[22] ў Смаленску, запісаў Мір амаль у тым жа складзе, што і ў час яго набыцця, сваёй прыёмнай дачцы Ганне Бутрымаўне, якая, паміраючы яшчэ ў дзявоцтве ў доме Забжэзінскіх у Камені (за міляў 8 ад Міра), перапісала свой набытак у пажыццёвае валоданне роднай цётцы — жонцы Сенькі — Мілохне Гедыгалдовіч (1476), пасля ж яе смерці ўладанні былі перададзены сваяку — Юрыю Ільінічу. Так у 1490 годзе ўладарамі Міра сталі Ільінічы. Юрый Ільініч пачаў клапаціцца пра ўпарадкаванне і ўдасканаленне сваіх уладанняў, скупліваць прылеглыя вотчыны, а можа, і заснаваў горад, бо якраз тады тутэйшыя ваколіцы сталі здабычай татарскіх нажоў і агню.

Гісторыкі хаця і не называюць спустошаных татарамі ў 1505 годзе мясцін, але з іх прац выразна відаць, што якраз гэты куток краю маюць яны на ўвазе. Першы раз татары прайшлі тут, калі кіраваліся на Наваградак, які абараняў ад іх са зброяй у руках наваградскі ваявода Альберт Гаштольд. На другі год, ідучы па сваіх мінулагодніх слядах, яны рушылі далей за Наваградак — аж за Нёман, пад Ліду. А ці ж невядома, што азначалі татарскія пераходы па безабаронных ваколіцах. Прывядзём рэляцыю з Кромера пра другі іх напад на Літву*: «Кароль (Аляксандр)[23] дагараў у руках аднаго эмпірычнага лекара, а хутчэй ашуканца, які, будучы палякам, выдаваў сябе за грэка — ён, прызначыўшы каралю лазню, паценне, яшчэ болей гэтым яго аслабіў. Літоўскія ж паны, усчаўшы бясконцыя сваркі ў час цяжкай хваробы караля, клапаціліся толькі пра сябе, не думаючы пра Рэч Паспалітую. Татары ж, падбадзёраныя сваім першым паспяховым паходам, калі яны прыцягнулі дамоў шмат рабункаў, пасля кароткага адпачынку, падмацаваўшы свае сілы, у месяцы жніўні ізноў напалі на Літву і, стаўшы пад Клецкім замкам, недалёка да вытокаў Нёмана, пакінуўшы там двух султанаў (так называюць сыноў іх уладароў) з дзесяцітысячным войскам, разбегліся ў колькасці 20 090 чалавек спустошаць ваколіцы. Перад гэтым цяжка хворы кароль разам з жонкай і ўсім сваім рыштункам выехаў з Вільні, дзе ляжаў, у Ліду, да замка, які знаходзіцца за 12 міляў ад Вільні... Калі ён ужо быў у Лідзе, прыскакаў да яго ганец і паведаміў, што татарскія войскі адсюль на адлегласці толькі аднаго дзённага пераходу**.

* M. Cromeri. De oriq. et rebus qestis Polonorum. Colon. Agrippinae 1589. Ciber XXX. pag. 456. Не маючы пад рукой перакладу Блажоўскага, гэтае месца мы пераклалі самі.

** Г. зн. якраз у ваколіцах Міра, які ляжыць паміж Клецкам і Лідай, за міляў 14 ад апошняга горада.

Гэтай вестцы не вельмі паверылі. Міхал Глінскі[24], які быў пры каралі, паслаў туды верны яму атрад адважных сербаў, упэўнены, што яны разаб'юць ворага. Хутка атрад напаў на татарскую арду, але ў імклівай бітве дзевяць з іх палегла там, астатнія былі рассеяны. Нанізаныя на коп'і галовы забітых татары прынеслі свайму военачальніку. Непакоячыся пра бяспеку караля, яго прыбліжаныя вырашылі адправіць на крытых насілках хворага і здарожанага манарха назад у Вільню, а Міхал Глінскі, які ведаў звычкі татар, з гетманам Станіславам Кішкам і літоўскай шляхтай, што, дачуўшыся пра набліжэнне арды, збеглася да караля, гатовая ісці з ім на ворага, выправіўся пад Клецк, каб ударыць па галоўным стане ворага раней, чым збяруцца асобныя групы, якія спусташалі ваколіцы...» і г. д.

Глінскі, як вядома, разбіў пад Клецкам татар і весткай пра гэтую перамогу асвятліў апошнія хвілі караля Аляксандра, які паміраў у Вільні. Але вернемся да Міра. Мы бачым, што ён стаяў на дарозе татарскіх набегаў, паміж Клецкам і Лідай, за сем міляў ад галоўнага зборышча татар. Ахвярамі іх спусташэнняў, аб чым пішуць гісторыкі, былі якраз ваколіцы Нясвіжа, Міра, Карэлічаў — пунктаў занадта малаважных, каб іх называць па імені.

Татарскія спусташэнні, сваркі Забжэзінскіх, Ільінічаў, Кішкаў, Глябовічаў і іншых літоўскіх магнатаў з гордым і магутным Міхалам Глінскім, сваркі, якія прывялі да таго, што Забжэзінскі быў пазбаўлены ваяводскай пасады, а Крыштоф Ільініч трапіў у турму, і яшчэ жахлівы лёс Яна Забжэзінскага, на якога Глінскі ўчыніў напад, замардаваў ва ўласным доме,— усё гэта, відаць, і натхніла Юрыя Ільініча пабудаваць у Міры крэпасць. Ці так гэта было ў сапраўднасці, ці падмурак замка пачаў закладваць Юрый, ці сын яго Шчасны Ільініч, ці ўнук Юрый — невядома, бо ў тагачасных дакументах мы не знаходзім згадак пра Мірскі замак.

Юрый Ільініч (дзед) памёр каля 1520 года маршалкам літоўскім і старостам брэсцкім. Ён значна пашырыў за жыццё свае ўладанні ў ваколіцах Міра, узяў спадчыну жонкі — Белую і Чарнаўчыцы, увесь гэты багаты набытак пакінуў сваім чатыром сынам, з якіх Шчасны, перажыўшы братоў, стаў гаспадаром амаль усёй бацькаўшчыны, у тым ліку і Міра*.

* Ю. І. Крашэўскі[25] ў *«Карцінах жыцця і падарожжа»* і М. Балінскі ў *«Старажытнай Польшчы»* не прыйшлі да адзінай думкі наконт таго, ці ўваходзілі ва ўладанні Радзівілаў землі Белай на Падляшшы. Першы сцвярджае, што яны былі набыткам Кішкаў, другі — што Ільінічаў. Іх довады, якія апіраюцца на пазнейшыя акты, хоць і дакладныя, але ўсё ж супярэчлівыя. Каб знайсці ісціну, трэба вярнуцца на некалькі дзесяткаў гадоў назад і не блытаць двух Юрыяў Ільінічаў — дзеда з унукам. Выходзячы з

Пра Шчаснага Ільініча мы ведаем толькі тое, што ён гэтак жа, як і бацька, быў брэсцкім старостам, ажаніўся з Соф'яй Радзівіл, дачкой Яна *Барадача*, трокскага кашталяна, меў ад яе сына Юрыя; памёр Шчасны Ільініч у 1540 годзе, а неўзабаве, у 1541 годзе, памерла і яго жонка, пакінуўшы адзінага сына, якога ўзялі пад апеку багатыя сваякі — Радзівілы.

Апекуном юнага Юрыя стаў яго дзядзька Мікалай Радзівіл Чорны, віленскі ваявода і літоўскі канцлер, вядомы на Літве сваім багаццем, розумам і магутнасцю, а яшчэ сваяцтвам і прыязнымі сувязямі з Жыгімонтам Аўгустам і, нарэшце, клопатам пра пашырэнне пратэстанцтва ў Літве. Юрый Ільініч выхоўваўся, відаць, у Нясвіжы разам з малымі дзецьмі Альбрыхтам, Станіславам, Юрыем і Мікалаем Крыштофам яшчэ на прынцыпах каталіцкага касцёла, бо Мікалай Чорны каля 1550 года прыняў гельвецкае[26] веравызнанне і схіляў да яго ўсю сваю сям'ю і дамашніх. Гэта быў магутны апякун: асабістая слава і знатнасць роду, багацце, арыстакратычная гордасць і дыпламатычныя здольнасці зрабілі Мікалая Чорнага адной з найславутых постацей сваёй эпохі. Значэнне яго ўзрасло з наданнем яму першых у Літве міністэрскіх пасадаў і асабліва пасля таго, калі былі выяўлены сваяцтва і прыязныя адносіны з домам манарха. Жыгімонт Аўгуст, сын і таварыш трону тады жывога Жыгімонта І, пасля смерці сваёй першай жонкі ў верасні 1547 года ажаніўся з Барбарай Радзівіл Гаштольд, дваюраднай сястрой Мікалая Радзівіла. Яшчэ калі гэты шлюбны саюз захоўваўся ў тайне, ужо быў адчувальны ўплыў Радзівіла на справы двара і дзяржавы. Праз месяцы два радзівілаўскі дом заззяў новымі найцудоўнейшымі ўпрыгажэннямі — гаспадары імкнуліся не адстаць ад двара, з якім былі звязаны. А нагода была такая. Імператар Карл V пацвердзіў пасланніку Жыгімонта Аўгуста раней прысуджанае Радзівілам княжацкае званне, пашыраючы яго на ўладальнікаў вотчын дзвюх ліній Радзівілаў — ад Ганёндза і Мядэлі да Алыкі, Нясвіжа, Біржаў і Дубінак.

даўніх дакументаў, можам высветліць, як сталася ў сапраўднасці. Юрый Іванавіч Ільініч ад сваёй жонкі (родавае імя яе мы не ведаем) атрымаў уладанні Белую і Чарнаўчыцы, якія пасля яго смерці былі падзелены паміж двума сынамі — Станіславам і Шчасным і дзвюма дочкамі — Ядзвігай, што мела мужа Абрамовіча, і Ганнай — жонкай Пятра Кішкі. Потым Ян Ільініч памёр, а Ядзвіга Абрамовіч перапрадала сваю вотчыну сястры, Бельшчыну ж падзялілі на дзве часткі, адна з якіх дасталася Шчаснаму Ільінічу, а другая — Ганне Кішка. Сын Шчаснага бяздзетны Юрый, усынавіўшы князя Мікалая Крыштофа Радзівіла, зрабіў яго ўладальнікам сваёй вотчыны, спадчыну ж Кішкаў яшчэ раней Мікалай Кішка і яго жонка з дому Хадкевічаў перапрадалі ў 1549 годзе Мікалаю Чорнаму. Так адна палова Белай і Чарнаўчыц з прылеглымі землямі перайшла да Радзівілаў ад Ільінічаў, а другая — ад Кішкаў.

Паважанаму ў імператарскім двары Мікалаю Чорнаму лёгка было знайсці свайму выхаванцу Юрыю Ільінічу выдатную пасаду на аўстрыйскай службе. Бо нашы магнаты рэдка калі выхоўваліся і праходзілі сваю рыцарскую вывучку на радзіме; ім хацелася перад усімі выхваляцца сваёй еўрапейскай адукацыяй, гучным тытулам, які да таго ж быў забаронены айчынным правам. Ды і чаму ж было не пазнаваць змоладу свет, калі дазвалялі сродкі? Чаму ж было не набываць працай замежныя званні, калі айчынныя даставаліся і так, без працы? Калі сын прывілеяванага роду мог заўсёды быць упэўнены, што яму забяспечана і месца ў сенаце, і староства для падтрымання яго годнасці і гонару сярод шляхты? Малады Юрый Ільініч, дзякуючы апецы Радзівіла і ўласным рыцарскім якасцям, выдатна сябе праявіў у аўстрыйскім войску і атрымаў прыхільнасць Фердынанда II, рымскага караля, які за заслугі падараваў яму 10 ліпеня 1555 года тытул графа Рымскай дзяржавы ў Міры — гэта ж яго каралеўска-апостальскай мосці нічога не каштавала. Тытул, згодна з польскім заканадаўствам, аснову якога складала шляхецкая роўнасць, не гарантаваў ніякіх дадатковых правоў, але надаваў магнату яшчэ большай велічы і важнасці. У дакуменце аб прысваенні гэтага тытула першы раз сустракаем мы згадку пра Мірскі замак: «Яго замак Мір і ўсю адміністрацыйную акругу з усёй маёмасцю мы ўзвышаем на ступень графства, гэтае званне надаём самому Юрыю Ільінічу, яго дзецям, спадчыннікам і законным наступнікам разам з усімі іх дзецьмі абодвух полаў, цяперашнімі і тымі, якія народзяцца, ад сённяшняга дня і ва ўсе будучыя часы называючы іх ад гэтага графства замка Мір графамі».

Але не суджана было Ільінічу перадаць сваім нашчадкам уладанні, падвышаныя велічным званнем графства. Чалавек у самым росквіце сіл, па-мужчынску прыгожы і моцны, якім мы бачым яго на захаваным дасюль партрэце ў Нясвіжскім замку, адчуваў аднак, што яму нядоўга засталося гасціць на зямлі. Невядома, слабае здароўе ці нейкая таямніца ў жыцці былі прычынай таго, што, не беручы ні з кім шлюбу, заўчасна пачаў думаць аб смерці і перадачы сваёй маёмасці ў чужыя дастойныя рукі, бо ні нашчадкаў, ні блізкіх сваякоў не меў. У рэшце рэшт у падзяку за апеку, якую ўзяў над ім Мікалай Радзівіл Чорны, Ільініч запісаў свае ўладанні ў спадчыну яго сыну, Мікалаю Крыштофу Радзівілу, празванаму ў народзе *Сіроткам* — юнаку хваравітаму, з рознымі заскокамі маладосці, што яшчэ больш падрывалі яго здароўе. У час, калі Ільініч яго ўсынавіў (1568), Мікалай Крыштоф

меў гадоў дзевятнаццаць і быў ужо маршалкам літоўскім, а праз тры гады пасля смерці бацькі стаў на чале свайго сямейства ў якасці галавы магутнага княжацкага роду Радзівілаў. Дзіця гэтае праславілася пазней як пілігрым у Ерусалім, як багаты, міласэрны і набожны пан, мудры міністр каралеўскай рады, пачынальнік нясвіжскага маярату, беражлівы гаспадар дому, заснавальнік многіх замкаў і касцёлаў у сваіх уладаннях, нарэшце, як роданачальнік шматлікіх радзівілаўскіх пакаленняў, што праславіліся ў айчыннай гісторыі. Але тады, калі яго ўсынавіў Ільініч, быў гэта, аб чым ўжо казалі, хваравіты юнак, да таго ж гуляка, ад якога мала чаго чакалі ў будучым; такім чынам, намнога большай пашаны заслугоўваў славуты сваімі дзеямі Ільініч, чым яго прыёмны сын. Якраз таму з вялікай цікавасцю сочым мы за гэтай постаццю, за гэтым чалавекам, што ў самым росквіце сіл з халоднай крывёю рыхтуецца да сваёй смерці, шчодра ўзнагароджвае слуг, раздорваючы ім набыткі са сваёй небагатай спадчыны*, робіць нашчадкам рэштках уладанняў сына свайго апекуна, намнога багацейшага за сябе, і хутка памірае, распыліўшы такім чынам усю сваю зямную маёмасць.

Неўзабаве пасля смерці Ільініча, якая наступіла ў Брэсце ў 1569 годзе, Мікалай Крыштоф Радзівіл афіцыйна быў запісаны ўладальнікам памесцяў Мір і Белая. Перадаваў яму гэтыя памесці навагрудскі возны Грыгоры Тарасовіч, а прымаў ад імя Мікалая Крыштофа стары радзівілаўскі слуга і стары арыянін Альберт Кавечынскі, вядомы ў гісторыі Рэфармацыі ў Польшчы як мецэнат Сымона Буднага, выдаўца славутай Нясвіжскай Біблії, паслядоўніка гельвецкага веравызнання пры жыцці Мікалая Чорнага, але потым гарачага прыхільніка і распаўсюджвальніка ў Літве навукі Сацына. Ці доўга жыў яшчэ Кавечынскі, ці з'яўляўся распарадчыкам радзівілаўскіх уладанняў і тады, калі малады яго пан вярнуўся ў лона каталіцкага касцёла, мы не ведаем.

З таго часу Мірам сталі валодаць Радзівілы нясвіжскай лініі. Калі апісвалі маярат, які Мікалай Крыштоф Радзівіл з братамі далучыў да сваіх уладанняў, Мір быў у ліку маёнткаў, што кіраваліся статутамі гэтага маярату — яго ў 1589 годзе зацвердзіў сейм. На працягу вякоў Мір з замкам і графствам належаў наступным нясвіжскім ардынатарам:

у 1549—1616 — Мікалаю Крыштофу Радзівілу, у 1616—1654 — Аляксандру Людвіку, прыдворнаму маршалку, у 1654—1680 — Міхалу Казіміру, падканцлеру літоўскаму, у 1680—1720 — Каралю Станіславу, канцлеру літоўскаму, у 1720—1762 — Міхалу Казіміру, віленскаму ваяводу і гетману літоўскаму, у 1762—1790 — Каралю Станіславу, віленскаму ваяводу, шырока вядомаму пад імем *Пане Каханку*, у 1790—1813 — Дамініку, камергеру двара рускага імператара.

Потым Мір перайшоў дачцы Даменіка княжне Стэфаніі, а пасля ў выніку сямейных пагадненняў з лініяй нясвіжскіх уладальнікаў маярату — мужу Стэфаніі князю Людвіку Саіну Вітгенштэйну Берлебургу.

Вось уся гісторыя Міра. Хоць ён месціцца і вельмі блізка ад галоўнай рэзідэнцыі гаспадароў уладанняў, але яны ніколі тут не жылі. Замак, што яшчэ ў 1792 годзе, як нам вядома, быў жылым, не маючы сродкаў абароны, не мог аказаць супраціўлення ані шведам у 1655 годзе, якіх прывёў сюды сваяк тагачаснага ўладальніка Міхала Казіміра здрадны Багуслаў Радзівіл, літоўскі канюшы, ані расіянам у час касцюшкаўскай рэвалюцыі. Быў, праўда, сведкам перамог, але ніякай яго заслугі ў гэтым не было.

І ўсё ж такі шкода, што з гэтымі прыгожымі руінамі не звязана ніводнага гістарычнага ўспаміну, шкода, што замак не праславіў які-небудзь рыцар, альбо выдатная з'ява ці славутая бітва. Малы, але жвавы ручай, які непрыкметна віецца за рэшткамі вала, паведаў бы нам пра тыя цікавыя падзеі, які-небудзь бард падслухаў бы яго сказ і распавядаў бы пра ўсё ў песнях, а натхнёны паданнем прахожы

Убачыў бы ў гэтых руінах
Тысячы і цені, і лікі,
Пачуў бы там рыцараў клікі
Пад поўнач у крыках савіных.

Па праўдзе ж задумнаму воку
Не бачацца ў замку тым здані.
Абдзёртая вежа здалёку
Самотна і холадна гляне.

Аб ёй не раскажуць старыя,
Мінуўшчыны след час развеяў.
Мо хіба што сэрцам здалее
Дамроіць хто дзеі былыя...

Пакінем цяпер старыя разваліны і пойдзем паглядзець на касцёл няпэўнага архітэктурнага стылю і на мурава-

* Усе распараджэнні Ільініча наконт надзялення маёмасцю слуг былі зроблены за год да яго смерці, г. зн. у 1568 годзе. Ён падараваў такім чынам Цімафею Крышталоўскому вёску Уніхава, Ярмолу Авядоўскаму — сем валок зямлі (надзел называўся Трэмбачоўскі, а пазней там узнікла вёска Агароднікі), Яну Абрамовічу — пяць валок зямлі і г. д. Спадчына Мікалая Крыштофа, якая дасталася ад Ільініча, у Міры і Белай не такая была і выдатная. Але апрача Ільінічавых уладанняў Радзівілы атрымалі яшчэ тытул мірскіх графаў, яны насілі яго разам са сваім княжацкім тытулам.

ную трохпавярховую плябанію, якая калі не прыгажосцю, то ва ўсякім разе даўнасцю сваёй архітэктуры заслугоўвае ўвагі.

Гэты прасторны касцёл, што доўгі час знаходзіўся ў занядбанні, але цяпер у лепшым стане, пабудаваны на сродкі Мікалая Крыштофа Радзівіла — ён у 1594 годзе заклаў першы камень у падмурак будынка, а праз дзесяць гадоў, у 1604 годзе, калі касцельныя муры былі гатовыя, выдзеліў багатыя сродкі і для плябаніі. У наступным, 1605 годзе тагачасны адміністратар віленскага сабора, а пазней яго біскуп, асвяціў ужо закончаную святыню. У ёй, наколькі помніцца, нават і не веяла старажытнасцю, а сённяшні рамонт інтэр'ера зусім сцёр некалькі характэрных адзнак мінуўшчыны. Усе карціны — новыя ці падноўленыя; ранейшых шкадаваць не трэба, бо яны былі вельмі кепскія, за выключэннем выявы святога Яна Непамуцэна ў бакавым алтары, сапраўды вытатнага твора, амаль не кранутага пазнейшым пэндзлем. Да прадметаў, якія напамінаюць пра даўнейшы густ, трэба аднесці: статую Хрыста ў вялікім алтары, абраз найсвятой панны Марыі з пазалочаным металічным месяцам, срэбныя шаты на абразах той жа Багародзіцы, святога Яна Непамуцэна і святога Антонія, а таксама калоны алтароў, драўляныя рамы з перавітым разбяным лісцем і такога ж стылю купель. Мы не ведаем, ці добра асвяжылі сёння гэтыя старыя помнікі нашай разьбы, пафарбаваўшы іх у белы і блакітны колер. Бо хоць і любім усё старажытнае, запыленае, аддаючы перавагу нейкай звычайнай фарбе каменя, заўсёды мусім ухваліць старанні сённяшняга плябана, дзякуючы якому інтэр'ер касцёла ў Міры зрабіўся прывабным, чыстым, ад чаго настройвае душу на малітву. Да характэрных упрыгожанняў мірскага касцёла, што мне давялося бачыць на працягу многіх гадоў, адносіліся вывешаныя каля алтара святога Антонія прынашэнні, пералітыя цяпер на алтарныя крыжы,— вялікай колькасці малыя сярэбраныя конікі. У Міры, мястэчку, дзе на год прыпадае шэсць конскіх кірмашоў, дзе амаль уся навакольная шляхта жыве на звязаных з імі спекуляцыях, дзе некалі была цыганская сталіца, а сёння ў час кірмашоў сапраўднае зборышча прыбылых здалёку яўрэяў,— можа, не адзін шляхціц, п'ючы дзе-небудзь у карчме разам з панам сябрам барыш*, нават не здагадваецца, што спрытны злодзей ужо недзе далёка скача на ягоным каняку, які быў, здаецца, незаўважана пастаўлены на двары. Дазнаўшыся пра страту,

---

* Барыш — замочка торгу, у іншых месцах гэтую неабходную кірмашовую цырымонію называюць магарыч ці літкуп. Сябар — у тутэйшай мове чалавек, з якім ідзе гандаль: па-нямецку Kundmann.

ён ішоў маліцца да святога Антонія, абаронцы згубленых рэчаў, а потым, знайшоўшы страчанае, са слязамі на вачах падвешваў каля ног таго заступніка срэбнае *simulacrum*[27] свайго гнядога ці каштанкі. А якія добрыя думкі выклікае выгляд гэтых прынашэнняў! Што тут слёз, што тут скаргаў! Бо тая ж каштанка — можа, уся маёмасць, прадмет усіх турбот, мрояў і надзей беднага засцянковага шляхціца. Якія тут сямейныя сцэны, колькі ўрачыстых клятваў віноўніка, што болей на гарэлку ён і не гляне, а колькі радасці, калі неяк зусім неспадзявана знойдзецца страчанае, радасці чыстай і прававеранай, бо ўцеха пасля роспачы прыпісвалася толькі Богу і святому патрону, сіле веры і пакорлівай малітвы.

Званіца, што служыць адначасова брамай да касцёла, змуравана ў першыя гады гэтага стагоддзя ў проста невыносным гатычным стылі. У яе невялікай вежы месціцца галоўны звон, названы *«Каралем»*, а ў аркадах — тры іншыя, хоць і меншыя, але з гарманічным гукам званы.

Хто ж не ведае *«Мемуараў манаха»*, якія займаюць цэнтральнае месца ў выданых *«Літоўскіх карцінах»* Ігнацыя Ходзькі[28]? Хто не запомніў у іх рэляцыі бернардынскага фурмана Марціна пра мірскія званы, рэляцыі, што дала Антонію Залескаму штуршок да стварэння прыгожай замалёўкі ў *«Віленскім альбоме»* пра тое, як пачцівы манах

... быў якраз пад Мірам.
Ступаў дарогай бітаю, са жвірам,
Яго гняды, а побач на кабылцы сівай
Патрэсваўся Марцін і пугай жыва
Паказваў на мястэчка — Лаўрыновіч слухаў
Пра Мірскі звон і бернардзінку нюхаў*.

Але ніяк не зменшыцца вартасць «Мемуараў манаха», калі, апіраючыся на дакладныя мясцовыя даследаванні, асмелімся мы аспрэчыць эрудыцыю пана Марціна і скажам, што мірскі звон, празваны *«Каралем»*, адліты быў задоўга да нараджэння князя Караля *Пане Каханку*, таму па яго вяртанні з-за мяжы (1768) не магло быць гаворкі пра мірскі звон быццам толькі што адліты. Што ў часе вяртання Радзівіла дадому мірскі *«Кароль»* ужо 52 гады склікаў на імшу прававерных насуперак сцвярджэнню пачцівага бернардзінскага фурмана Марціна ў «Мемуарах», тут можна даверыцца сведчанню не менш аўтарытэтнаму. Мірскі арганіст на нашу вялікую просьбу ласкава згадзіўся ўслужыць нам і дабрацца па лесвіцы аж да званіцы і, чытаючы па складах вылітыя на вялікім звоне літары, запісаў іх для нас у тым жа парадку: «Carolus Stanislaus Radziwiłł D. Y. Dux in Ołyka, Nieśwież, Birże, Dybinki, Słuck, Kopyl et Kleck S. R. I. Princeps, Comes in

---

* Гэта ўрывак з паэтычнага ліста да мяне пана Міхала Канткоўскага, аўтара быліцаў Амбражэвіча.

Szydłowies, Mir, Kroze et Biała, supremus Cancellarius M. D. L. Braclaviensis, Premislensis, Człuchoviensis, Camenecensis, Krzyszoviensis, Niżynensis, Ostrensis perpetuus gubernator. Anno domini 1710 Die 14 Julii». А ніжэй: «Fudit me Ambrosius Joannes Patt». А яшчэ ніжэй: «S. Michael, S. Calorus, Stanislaus»[29] — імёны святых, якія былі нададзены, паводле звычаю, звону касцёла.

Так што фундатарам мірскага *«Караля»* быў у сапраўднасці Караль Радзівіл, толькі не *Пане Каханку*, а яго дзед, Караль Станіслаў, падканцлер літоўскі (памёр у 1711 годзе). Другі, меншы звон таго ж самага фундатара Караля, пазначаны той жа датай і імем майстра Патта. Але за год перад гэтым убогі шляхціц *пан Мацей Самуэлёвіч са сваёй жонкай* даў добры прыклад князю падканцлеру, заказаўшы ў таго ж Патта іншы звон для мірскага касцёла. Тое, што *Пане Каханку* не ўзбагачаў тую званіцу ніякімі скарбамі, цалкам пацвярджае сваімі довадамі мірскі арганіст, абвяргаючы расказы пана Марціна. Хто ведае, калі б не лясы, што цягнуцца паўз дарогу з Міра да Нясвіжа, калі б не нізкае падвешванне *«Караля»*, можа, гучнае яго рэха дасягала б і муроў радзівілаўскай сталіцы. Ва ўсякім разе мы за дзве мілі чулі не раз, як мірскі звон склікаў вернікаў на мшу альбо вячэрню.

Прасторная, мураваная, на тры паверхі плябанія, цяпер менш як напалову жылая, была заснавана ў першыя гады XVII стагоддзя на сродкі першага ў Міры плябана Каспара Лянгшэвіча, відаць, з немалой дапамогай князя Мікалая Крыштофа Радзівіла — над брамай з вуліцы на каменнай пліце выбіта імя заснавальніка і год узвядзення пабудовы (яго мы не занатавалі). Той надпіс на лацінскай мове гучыць так: «Гэта вы не для сябе (працуеце)*. З дазволу князя і майго пана Мікалая Крыштофа Радзівіла гэты дом я будую для сябе, але і табе, добры наступнік, завяшчаю гэты дар: калі спадабаецца — з удзячнасцю прымі яго, калі не — пабудуй новы»**.

Мураваная грэка-расійская царква, пры якой быў даўней манастыр базыльянаў, мураваныя крамы пасярод рынку, драўляная аптэка, а таксама паштовая станцыя, гэты нерв, які мяне гадоў восем звязваў з далёкім светам,— вось найбольш важныя цяпер пункты мястэчка, што складаецца з трох ці чатырох сотняў драўляных дамкоў — яўрэйскіх, хрысціянскіх і татарскіх. Яўрэі, як звычайна,— найбольш рухавая і найбольш шумная частка местачкоўцаў, якая да таго ж часцей за ўсіх трапляе на вока. Некалькі гадоў

* Вергілій.

** Яшчэ адзін афарызм з мінулага стагоддзя знайшлі мы ў мірскай плябаніі — лацінскі надпіс на дзвярах верхняга, цяпер нежылога паверха: «Нашто дзверы замыкаеш, пачуўшы голас убогага; рабі тое, што Хрыстос робіць, калі жабрак у дзверы стукае».



Рынчная плошча ў Міры.
Пачатак XIX ст.

назад тутэйшыя крамы былі поўныя добрых баваўняных ды шаўковых вырабаў, палатна, футраў і ўсякай драбязы. У гэтых адносінах Мір меў шырокую вядомасць. Калі пра паненку, што збіралася хутка выходзіць замуж, казалі: *«Паехала ўжо ў Мір»*, то гэта азначала, што яна пачынае рыхтаваць сабе пасаг. У часы майго маленства сэнс той фразы нават у досыць далёкіх адсюль мясцінах быў добра знаёмы. Сёння гандаль тут амаль поўнасцю заняпаў, але ў яўрэяў засталося ў звычаі гурмой абступаць усіх, хто праязджае па вуліцы ці спыняецца каля карчмы, і наперабой расхвальваць сваю якую-небудзь прызначаную на продаж драбязу. Кожная больш-менш прыстойная павозка прыцягвае да сябе цэлую хмару гаманлівага і сварлівага яўрэйства. Некалькі самых значных таварных складаў месцяцца не ў крамах, а па дамах заможных яўрэяў, але і іх эмісары ходзяць па вуліцах, заваблiваючы да сябе любога прыезджага,— чаго толькі не вярзуць яму, каб ахаяць тавары сваіх канкурэнтаў. Пацяшацца з усяго гэтага ці абурацца — тут ужо будзе залежаць ад настрою прыезджага.

Тутэйшыя мяшчане ніколі не былі абдораны магдэбургскімі правамі, яны карысталіся толькі прывілеем Мікалая Крыштофа Радзівіла (1579), што ж да пытанняў, звязаных з маёмасцю і ўзаемным наймам, з перадачай і перазапісваннем выдзеленай памешчыкам зямлі, то яны вырашаюцца са згоды гэтага памешчыка. Апрача земляробства мяшчане займаюцца ганчарствам, ткацтвам, шавецкім рамяством — але ўсё робіцца звычайна на вельмі нізкім узроўні. Наогул жыццё і побыт мяшчан-хрысціян вельмі кепскія, прычына чаго, як і ўсюды,— адсутнасць асветы, суседства яўрэяў. У гэтым месцы можна б было

пагаварыць пра абавязкі памешчыка, духавенства, пра добрыя прыклады вярхоў... але ж мы не пішам кнігу пра абавязкі, а занатоўваем толькі тое, што ёсць, не маючы намеру павучаць, як павінна быць.

Жыве ў Міры некалькі дзесяткаў татарскіх сем'яў, татары маюць тут свайго Молну і малую, прыцененую дрэвамі мячэць. Хто і калі іх тут пасяліў, яны не помняць. Можа, Вітаўт, а можа, яны засталіся тут пасля клецкага разгрому — не хачу тут фантазіраваць. У мяне ў руках не было на гэты конт ніякіх пісьмовых дакументаў, а вусныя роспыты таксама нічога мне не далі*. Татары займаюцца вырабам шкур, агародніцтвам, якое вядуць адмыслова, і фурманствам. Увогуле гэта працавіты і цвярозы люд; хаця, дзякуючы рэстрыкцыям (а дзе іх няма?), што дазваляюць піць гарэлку замест забароненага віна, якое, зрэшты, беднаму люду няма за што купляць, правілы цвярозасці тут не без выключэння. Здаралася яшчэ ў іх аблічах напаткаць тып чыста азіяцкі, але на многіх тварах, асабліва жаночых, відаць ужо ўплыў паўночнага сонца, што сцерла іх родавыя рысы, наблізіўшы да мясцовага тыпу.

Можна б было сказаць тут колькі слоў і пра цыганоў, якія жылі тут некалі і мелі нават свайго «караля», што ў добрыя для цыган часы ўчыняў парады на вуліцах Міра, ехаў у акружэнні коннага цыганскага эскорта, узброенага канчукамі,— але сёння няма тут нават і следу гэтага племені. Уплыў цыганства застаўся толькі ў традыцыях, дух яго чуецца яшчэ хіба на конскіх кірмашах, якіх і цяпер бывае шэсць на год. Кірмашы, цыганы, гандаль футрамі і іншымі замежнымі таварамі — усё надавала калісьці гораду асаблівы характар, а цяпер канчаткова зніс. Старое мінулася, а новае жыццё з адпаведнымі часу ўмовамі яшчэ не пачалося.

Такая доля ўсіх нашых шматлікіх гарадоў і мястэчак.

---

* Нататка, дадзеная нам з Галоўнага кіраўніцтва памесцямі князя Людвіка Вітгенштэйна, запэўнівае, што ў Актах адміністрацыйных няма і следу якога-небудзь прывілею мірскім татарам, што «у нешматлікіх просьбах пра атрыманне дрэва для гарбарні (зрэшты, яны больш нічога не прасілі і ніколі ні нашто не скардзіліся) не спасылаюцца ні на якія прывілеі, а толькі на старыя звычаі». Даўнейшыя інвентары таксама не згадваюць аб прывілеях служылых татар.

IV

КУДЫ ПАЕХАЦЬ ДАЛЕЙ ?

Тракт да Нясвіжа.— Нашы дарогі і корчмы.— Мары і рэчаіснасць.— Прыклад добрай гаспадаркі.— Маёнткі, вёскі, лясы.— Уезд у Нясвіж.



Пра жыцця ўсе праявы расказ пачынаю —
Што думаеш ты, я зусім не зважаю.

Я. Каханоўскі[30]

Заxвотай падарожнічаць, з блакнотам для запісвання ўражанняў стаю я на рынку ў Міры, нібы той дзед-жабрак на ростанях: мэта не акрэслена, свет шырокі — да якой жа вёскі ці горада пусціцца вандроўніку? Пытанне гэтае цяжкае ў любой жыццёвай сітуацыі. Тут жа яго таксама нялёгка вырашыць: прыемныя сустрэчы чакаюцца ў адным месцы, але ці не страціш што-небудзь яшчэ больш прыемнае у іншым? Калі б мы паехалі прама, па вуліцы Жухавіцкай, я паказаў бы вам узгорак — на ім на схіле мінулага стагоддзя адбылася нейкая бітва. Далей натрапілі б мы на гожую Паланечку — уладанне князя Канстанціна Радзівіла, дзе ўбачылі б цудоўны сад, шыкоўны і цікавы ў многіх адносінах палац, дзе, сустрэўшыся з гаспадаром, упэўніліся б у радзівілаўскай знакамітасці і гасціннасці. Пасля б мы агледзелі ў мястэчку Ішкальдзь стары, вельмі стары, бо, несумненна, перароблены з язычніцкай святыні, парафіяльны каталіцкі касцёл, які ў XVI стагоддзі быў арыянскім саборам. Словам, атрымалася б у нас цікавая і прыемная вандроўка. Але зноў жа, як адмовіцца ад наведання вядомага выдатнымі помнікамі Навагрудка, сталіцы Міндоўга, месца нараджэння аднаго з выдатнейшых нашых паэтаў?[31] Як адмовіцца ад наведання старажытнай Любчы, дзе стаяў у вельмі далёкай старажытнасці сабор, дзе сярод язычніцкай Літвы часоў Міндоўга высока ўзнёс біскупскую годнасць Віт Дамініканец[32], пра якога мы не шмат ведаем, Любчы, дзе друкарні Пятра Бляста Кміты[33] і Яна Лянге[34] выдалі ў XVI і XVII стагоддзях столькі важных для вывучэння гісторыі Рэфармацыі ў Літве, такіх сягоння рэдкіх твораў, дзе яшчэ засталіся руіны радзівілаўскага замка, Любчы, якая, урэшце, у нашы дні сваю старую славу падтрымлівае хіба што вытворчасцю бруднаватага колерам, але, праўда, вельмі адметнага і славутага любчанскага лаку, калі верыць крамнікам, што разносяць яго па маёнтках? Гэтулькі важных прычын, вядома, не маглі б не схіліць нас скіраваць да Навагрудка, калі б не Нясвіж, да якога адсюль усяго нейкія чатыры

мілі, Нясвіж, славуты не менш за Любчу ў гісторыі Рэфармацыі і літоўскага друкарства, Нясвіж, колішняя сталіца вядомага князя Караля Радзівіла, дзе яшчэ стаіць яго замак, дзе яшчэ захоўваецца яго архіў, а таксама многа легенд пра самога і нават ягоны прах, Нясвіж, куды вядзе выдатная дарога і трапіць можна яшчэ да змяркання.

Але косць кінута: едзем у Нясвіж. Дарога туды бітая, прамая і, як даводзяць матэматыкі (а за справядлівасць сваіх слоў хай яны самі адказваюць), павінна быць самая кароткая.

Яшчэ раз пад'язджаем мы пад замак, адкуль разыходзяцца два тракты — адзін, той, што злева, каля старажытнага саду, вядзе да мястэчка Свержань, другі, правы,— да Нясвіжа. Кіруемся направа. Пераязджаем мосцік і, з ахвотай кінуўшы позірк на Мірскі замак і скамандаваўшы: «Едзьма, фурман!», пачынаем, паводле старасвецкага звычаю, наша падарожжа звыклым псалмом вандроўнікаў: *«Хто аддасць сябе ў апеку Пану свайму!»*

Зямля гарбаціцца невысокімі пясчанымі ўзгоркамі. Па баках тракта — бярозы, а за дарогай высяцца сасновыя гайкі і кусцяцца досыць буйныя хмызнякі — прыкмета някепскай зямлі. Збажына — сярэдняй ураджайнасці, краявід — не шырокі, нічым асаблівым не вылучаецца, дарога крыху пясчаная, але ў цэлым — выдатная. Нічога незвычайнага тут не ўбачыш.

Для эфекту можна б было, як заўсёды робяць падарожнікі, распісаць які-небудзь дарожны выпадак альбо ў яркіх фарбах размаляваць краявіды — чытач, можа, паверыў бы гэтаму, але калі адкрыецца падман, ці ж не сорамна будзе і ці паверыць табе пасля такога? Кажуць, праўда — як тая аліва ў вадзе: заўсёды наверх выплыве. От, напрыклад, у гэтых самых мясцінах, па якіх мы едзем, мы можам праз дзвесце гадоў абвінаваціць у хлусні шаноўнага Сымона Старавольскага, што напісаў нямала мудрых і праўдзівых кніг і так мудра і прыгожа адказаў шведскаму каралю, калі (ці памятаеце, чытачы?) той самаўпэўнены швед, робячы агляд трунаў польскіх каралёў, прарочыў, што Ян Казімір не вернецца болей у Польшчу. Дык вось ксёндз Сымон Старавольскі, чалавек у цэлым паважны, перасаліў праўду, распавядаючы ў адным мудрым творы пра Мікалая Крыштофа Радзівіла і тутэйшую ваколіцу. Расхвальваючы яго перад каралём, ён даводзіў, што Радзівіл пабудаваў у Міры мураваную ратушу, а наваколь-ныя вёскі акружыў садамі і ставамі, напракладваў прамых дарог, абсадзіўшы іх з абодвух бакоў пладовымі дрэвамі, словам, пасярод Літвы стварыў сапраўдную Аўзонскую краіну[35]. Адна няпраўда шаноўнага гісторыка — перад нашымі вачамі, а тры іншыя няпраўды адчуваем інстынктыўна. Пра мураваную ратушу ў Міры ніхто, коль-

кі жыве, не чуў. Зрэшты, дзеля чаго была патрэбна ратуша там, дзе жыхары не мелі магдэбургскіх правоў? Што ж да фруктовых дрэў, прамых дарог і ставаў, то даволі паглядзець на мясцовасць, каб засумнявацца ў гэтым. Тутэйшыя дарогі, як і ўсе людскія дарогі, зусім не прамыя, яны ўюцца самым фантастычным чынам, мінаючы то ўзгорак, то балота, то пясок, то проста камяні ў полі — бо лепей аб'ехаць камень, чым адкінуць яго з дарогі, тым болей, што гэта ўжо работа для ўсіх, а хто ж яе ўзнагародзіць? Выкапаных ставаў не відаць і следу,— зрэшты, яны маглі і засыпацца. Фруктовых дрэў не толькі на дарогах, але і ў вёсках вельмі мала. Хоць дрэва мае ўласцівасць адраджацца ў новыя часы, мы не сустракалі ні разу якой-небудзь прапраўнучкі старой яблыні ці грушы, пасаджанай па загаду Радзівіла. Тутэйшая зямля занадта неўрадлівая для гэтага, а Мікалай Крыштоф, які тады скупліваў і акругляў свае ўладанні пад Мірам, не меў яшчэ часу заняцца іх гаспадарчым уладкаваннем. Добраўпарадкаваць дарогі і масты — занадта вялікая раскоша, і да яе нашы продкі не дайшлі, як і мы сёння, іх нашчадкі. Славуты польскі паэт Ян Каханоўскі, дарэчы, сучаснік Мікалая Крыштофа, так пакеплівае з гэтай нямчызны (сатыр):

Аб прусах казаць вам не трэба, бо самі
Штогод плывяце вы да Гданьска плытамі
І бачыце бляск стройных замкаў, паселішч,
Як струны — дарогі, мастоў гожых веліч.
Без грошай такое зрабіць немагчыма:
Там гаспадары скрозь былі — вось прычына.
А сёння што сталася?

Але загаварыўшыся пра дарогі, не збочыць бы дзе на які іншы шлях, тым болей, што едзем мы па роўным і гладкім гасцінцы — такім яго зрабіла не людская праца, а сама прырода: так сабе, выпадкова кінула паміж Мірам і Нясвіжам сухі і не вельмі ўзгорысты грунт, а людзі гэтак жа выпадкова праклалі тут дарогу, абсадзілі яе бярозай і асінай, якія цяпер вунь як разрасліся. Так што выпадкова атрымалася добрая дарога.

Праз мілю паказалася вёска Семакова, што, нібы вялікі воз, ад'ехала ад гасцінца ў поле. Галава яе — карчма — свеціць падарожнаму двума прагнымі вокамі пабітых шыбаў і зіяе, як пашчай, адчыненымі варотамі свайго гумна, а тулава і хвост паселішча віецца па ўзгорках далей аж да лесу. Вёска гэтая, якая знешне нічым асаблівым не вылучаецца ад іншых нашых вёсак, вядомая тым, што ў ёй жыве аж некалькі выдатных сталяроў, чые вырабы маглі б аздобіць самы раскошны і вытанчаны салон. Тыя сталяры — сяляне, трохі вальнейшыя ад астатніх, бо вызвалены ад паншчыны як вартаўнікі далёкіх занёманскіх лясоў. Чаму ж, папытаецеся вы, надумалі вяскоўцы навучыцца такому непапулярнаму рамяству ў той бязлеснай ваколіцы, далёкай ад горада, які мог бы купляць іх вырабы? Адказ тут вельмі просты: так захацелася памешчыку, што падабраў некалі тутэйшых мужыкоў, паслаў іх у горад, дзе ім далі ў рукі па гэблю і загадалі — самім ім на славу, а двару на карысць — вывучыцца гэтаму рамяству.

Далей паабапал дарогі пайшоў прыгожы яловы лес, у якім адну за адной убачылі мы аж тры карчмы з маляўніча заквітнелымі саламянымі стрэхамі і напалову разваленымі сценамі. Ох, і гожы ж гэта прадмет у нашым пейзажы! Але чаму ж аздабляем мы нашы найцудоўныя краявіды толькі такім спосабам? Ці ж не больш прыгожа на фоне цёмна-зялёнага лесу выглядала б касцельная вежа, франтон сельскай школы, домік лесніка альбо сапраўдны заезны дом з усімі выгодамі для падарожнікаў, з кухняй, дзе чуецца пах дымка, з гасцінным святлом вокнаў, з аздабленнем, якое само запрашала б вандроўніка адпачыць. А як бы выдатна выглядаў наш краявід, калі б пры касцельчыку стаяў сівы ксёндз плябан з малітоўнай кнігай, прыхінуўшыся да якога-небудзь надмагільнага помніка, а перад гэтым помнікам укленчыла б заплаканая жанчына (ці дзіцё) — свяшчэннік супакойвае яе, паказвае на неба, і на яе твары відаць нябеснае суцяшэнне. Альбо каб мы ўбачылі з дарогі школьны падворак, са званком, са свавольнымі вясковымі хлапчукамі, з таўставатым настаўнікам, чало якога сведчыць аб вялікіх ведах, някепскай думцы пра сябе і добрым сэрцы, так што нават у тым выпадку, калі б ён павесіў сабе каля пояса класічны боцькаўскі бізун, то і гэты аксесуар улады не змог бы знізіць добрага ўражання ад пачцівага сельскага ментара. Якраз такія карцінкі хацелася б бачыць у нашых мастакоў-пейзажыстаў, але што ж рабіць, калі няма з чаго іх маляваць. Дзе знайсці ў нас сельскую школу адметнай архітэктуры альбо добры заезны двор, дзе ўзяць такіх настаўнікаў, сельскіх ксяндзоў з кніжкай, што нясуць слова суцяшэння для абяздоленых? Дзе знайсці хоць бы адзін прыклад добрага гаспадара заезнага двара? Усё гэта кніжныя ідэалы, якіх не відаць у жыцці. Заезны двор і яўрэй, вясковы хлопец, што пасе скаціну, парафіяльны свяшчэннік і прэферансавы столік — вось найбольш тыповыя кампазіцыі; разваленая карчма, побач тоўпяцца шумныя п'янаватыя вяскоўцы і ляскаюць зубамі няўдалыя іх *клячы, слухаючы рыторыкі,*— таксама вельмі характэрная мясцовая карціна. Дзіўна, што не натхніць яна ні пэндзля мастака, ні пяра якога-небудзь літоўскага Вальтэра Скота. Бо, праўда ж, прыгожае мастацтва ў нас таксама на вельмі нізкім узроўні.

Па выездзе з лесу перад вачамі адкрываюцца прыгожыя разлогі палёў, штораз больш ураджайных. Направа, не на-

многа вузейшая, чым паштовы гасцінец, бярозавая алея вядзе да мураванага маёнтка, які велічна выглядвае з зялёнага вянка саду. Побач з памешчыцкім дваром відаць акуратна збудаваная вёска, кожная хата ў ёй абсажана таполямі, высяцца там-сям ветракі, што замяняюць вадзяныя млыны, бо тут няма ніякай ракі. Нібы дываны, квітнеюць добра дагледжаныя палі канюшыны. Пры дарозе ладны заезны двор. Словам, усюды адчуваецца заможная і гаспадарлівая рука — сведчанне большага прагрэсу краю. Тут — Гарадзея, уладанне палкоўніка Брахоцкага, сапраўдны аазіс у гэтым баку. Шкода толькі, што двор той і тая акуратная вёска адбегліся ад дарогі і іх нельга разгледзець: можа, тыя, хто іх убачыў бы, шмат чаму навучыліся б. Мы, зазірнуўшы ў людскія вочы, і з аднаго позірку селяніна дазналіся б пра многае: напрыклад, колькі прыбытку ад гарэлкі прыносяць тутэйшыя ўладанні, ці нельга было б знайсці тут тып сельскага настаўніка для мясцовай карціны і г. д. Толькі здалёку кінуўшы вокам на тую прыгожую гаспадарку, мы шлём да неба просьбу, каб у гэтым краі паболей з'явілася такіх ваколіц.

І чаму ж не спадзявацца на такое? Урадлівая навакольная зямля дае гарантыю заможнага жыцця. Люд моцны, выглядае пачціва, тут мае дзе, як кажуць, прыкласці рукі грамадзянін, які добра адчувае, што абавязаны людзям, духу часу і добра зразумеламу ўласнаму інтарэсу.


Перад намі праходзяць яшчэ дзве іншыя вёскі. З той жа назвай — Гарадзея (ці не варыянт назвы Гарадзішча — такія найменні, як даводзіў добрай памяці Зарыян Хадакоўскі[37], можна знайсці на кожнай квадратнай мілі), потым вёска Ужанка — колішняе ўладанне нясвіжскіх езуітаў. Паселішчы, як усюды, нізкія, кепска пабудаваныя, маёнткі бялеюць дзе мураванай стайняй, дзе такой жа гарэльняй, дзе, як ва Ужанцы, ладным, відным здалёку касцельчыкам і — кожны навакольны маёнтачак прыслаў на паштовую дарогу сваю карчму, бо гэта ж кожнаму з іх належыць частка кантрыбуцыі з траякоў селяніна, што вяртаецца з торгу,— так прынята.

За Ужанкай колькі вёрст цягнецца прыгожы лісцёвы лес — дубы, асіны, бярозы, кляны, дзе-нідзе пракідаецца ў ім і хвоя. У лесе відаць ямы і печы для выпальвання вапны, якую навакольны люд здабывае з лона зямлі. Густы цень, халаднаваты ветрык, водыр лесу добра бадзёраць падарожніка, асвяжаюць грудзі — марыць бы тут, слухаць птушыныя песні, збіраць духмяныя архідэі, салодкія суніцы і кахаць. А гэты ж лес, хоць ён і блізка каля вёсак і горада, не адзін раз, паводле паданняў, быў хованкай для разбойнікаў, арэнай забойстваў бязвінных людзей. І меў жа сэрца злачынец сярод такой прыгожай прыроды ўзяць забойчы нож! Ён гэты цудоўны куток цаніў толькі

як добрую хованку: лясны гушчар даваў яму мажлівасць беспакарана ўчыняць свае злачынствы.

Мінаваўшы лес, мы сустракаем справа мураваны вакзал Рудаўку, таксама даўнейшае ўладанне езуітаў, пры дарозе, як звычайна, бачым карчму, а на ўзгорку — мураваны слуп. Слуп той пасля разбору Польшчы адзначаў, відаць, месца, дзе клінам збягаліся межы Расіі, Прусіі і Аўстрыі, потым паказваў мяжу Гродзенскай і Мінскай губерняў, цяпер нібыта размяжоўвае Слуцкі і Навагрудскі паветы, але на ім ужо няма ніякага надпісу — стаіць на ўзгорку без патрэбы.

З узгорка відаць ужо Нясвіж з ваколіцамі. Сам горад, час ад часу паблісkваючы ўгары вострымі вежамі фарнага і дамініканскага касцёлаў, хаваецца ў даліне. Над ім узвышаецца пастаўлены на ўзгорку на другім баку горада пусты сёння езуіцкі касцёл святога Міхала, направа сінее лес і дрэвы звярынца Альба, налева адкрываецца вачам велічны замак, дзе-нідзе позірк схоплівае сляды старых гарадскіх валоў. Пачынае мацней стукаць сэрца: гэта мы ўжо ўязджаем у дарагое даўнімі ўспамінамі месца. Вунь драўлянае прадмесце, якое завецца *Казімер*, вунь акружае нас вянок корчмаў, потым праязджаем каля касцёла бернардзінцаў мост праз нейкую лужыну ці пачатак ракі Ушы — і вось мы ўжо ў горадзе.




I

Цяперашні стан.— Замак: карцінная галерэя, архіў, скарбніца, гарматы (з апісаннем некаторых), капліца.— Слова пра шматгадовы кірмаш.— Фарны касцёл і грабніцы Радзівілаў у ім.— Касцёлы: бернардзінцаў, дамініканцаў, бенедыкцінак.— Іншыя муры горада.— Ваколіцы.— Звярынец Альба.— Абацтва айцоў бенедыкцінцаў у лесе за горадам.— Касцёл святога Міхала.

II

Хроніка мінулага Нясвіжа.



I

Схаваецца Дум, нібы кедр у Ліване,—
І быццам бы зноў ён ніколі не ўстане.

Вэсп. Кахоўскі. «ЛІРЫКІ».


Славуты ў мінулым гэты невялікі горад сёння мала чым можа зацікавіць падарожніка. Колькі касцёлаў, колькі руін іншых муроў, крамы, гаупт-вахта, а воддаль напалову жылы радзівілаўскі замак з рэшткамі старых помнікаў — усё гэта на хвіліну забавіць госця горада, але потым пачынае наводзіць на яго нейкую невыказную сумоту, жаданне даведацца пра ўсё, што адбывалася тут у далёкія гады. Вобразы князёў *Сіроткі* і *Пане Каханку* ўстаюць перад вачыма, выклікаюць розныя пытанні, якія цяпер застануцца, відаць, без адказу. Тут усё створанае імі — у разваленым выглядзе, там яны самі парахнеюць у алавяных трунах пад скляпеннямі фарнай святыні. Мы бачым: мінуўшчына з асаблівасцямі свайго побыту адышла, адляцела, як гістарычны сон, будучыня дзесьці за заслонай наканавання, а цяперашняя хвіля не мае ніякай прывабнасці. Добра часам бывае ўспомніць мінулае; гордасць старых часоў — здзяйсненне чацвёртага Божага наканавання: любоў да бацькоў; а паколькі вопыт даўняга служыць ці прынамсі павінен служыць у нейкай ступені як навука для будучыні, то і гісторыя малога мястэчка мае сваю цікавасць і павучальнасць.

Пакуль пачнём пра яе расказваць, трэба паглядзець, што сёння засталося тут ад колішніх часоў. А перш за ўсё задаволім нашу цікавасць аглядам замка, бо там найбольш старых помнікаў, бо ад тых падзей, якія адбываліся ў ім, залежала доля горада, бо калі там не знойдзем адгадкі на многія пытанні мінулага, то ўжо нідзе не знойдзем.

Мінаваўшы езуіцкі касцёл і перад ім капліцу Булгарына, успаміны пра якую запісаў аўтар «Сапліцы», мінаваўшы невядома кім пабудаваную і прыгожую, вялізных памераў, высечаную з аднаго каменя статую святога Яна Непамуцэна, ідзём тысячы дзве крокаў па грэблі, абапал якой цягнуцца ставы. За адным з іх, злева, бачым муры кляштара святых бернардзінцаў і яго сад, за другім ставам, справа,— прадмесце *новага горада* са старым запушчаным касцельчыкам святога Лазара. Грэблю, без сумнен-



Нясвіж. Агульны выгляд.
XIX ст.

ня, выклалі сярод вады для таго, каб у выпадку ваеннага нападу яе можна было раскапаць і заліць вадой, тым самым зрабіць перашкоду ворагу. Сам замак, акружаны глыбокім ровам, абсыпаны высокім валам, можна прыняць на першы погляд за вельмі ўмацаваную крэпасць, але, агледзеўшы нізкую васьмікантовую вежу, што ўзвышаецца над галоўнай брамай, бясформенныя, у розны час прыбудаваныя і да агульнага ансамбля далучаныя крылы, чатырохкутныя бастыёны і другую справа вежу, над якой дасюль распасціраe крылы гербавы арол Радзівілаў, трэба прызнаць, што ўзводзіўся замак хутчэй як раскошнае панскае жытло, чым пабудова для абароны самога месца і горада, а калі ў рыцарскія часы заснавальнік такога збудавання і думаў пра вайну, то болей, чым на муры, пакладаўся на мужныя плечы і грудзі сваёй служылай шляхты.

Зарослыя дзікім зеллем валы, разложыстыя грушы ў рове сведчаць, што здаўна ўжо не акаймлялася крэпасць вадой, замест колішняга разваднога моста ляжыць тут на палях новы, не зусім трывалы,— усё гэта сціраe чароўнасць старога феадальнага гмаха, чароўнасць, якую хацелася б захаваць у галоўнай сталіцы Радзівілаў.

Праз доўгую скляпеністую браму ўваходзім на васьмікутны брукаваны замкавы дзядзінец, дзе пасярэдзіне яшчэ за маёй памяццю месцілася клумба бяроз і асін — яны так разрасліся на добрай глебе, што нечым напаміналі даўнюю пару. Насупраць уваходу высокі гатычны фасад палаца з брамай, што вядзе на лесвіцу да галоўных замкавых залаў, дзіўна неяк выглядае між двух бакавых крылаў, проста ўзнесеных на тры паверхі, як звычайная жылая камяніца; над фасадам мы бачым гіпсавыя арматуры, эмблемы і гербы Мікалая Крыштофа Радзівіла, першага заснавальніка гэтых муроў, а направа, побач з

фасадам, над уваходнай брамай, узнімаюцца дзве згаданыя ўжо вежы з гербамі — вось і ўсе феадальныя рысы замка.

Галоўная лесвіца вядзе на трэці паверх да прасторных, але нічым не адметных сяней, адкуль направа і налева разыходзяцца прыгожыя залы, сёння альбо перарobленыя, альбо нежылыя і таму не дагледжаныя, апрача адной, так званай *Мармуровай*, якую перад нашымі часамі асвяжылі, выгіпсавалі, аднавілі. А такіх, намнога большых залаў, было дванаццаць. Прывядзем іх старыя назвы: *Залатая* — на чацвёртым паверсе, у крыле, цяпер цалкам запушчаным, славілася вытанчанасцю і багаццем сваіх упрыгожанняў; *Каралеўская* — таксама на чацвёртым паверсе, аздобленая партрэтамі польскіх каралёў, служыла пакоем для банкетаў, як бы гасцінай для прыёму шматлікіх паноў і шляхты; *Гетманская* — у ёй віселі партрэты ўсіх польскіх і літоўскіх гетманаў, у шэрагу якіх гаспадар знаходзіў не аднаго са сваіх продкаў, што падштурхоўвала яго імкнуцца да іх славы альбо, на жаль, схіляла (калі ён успамінаў іх сілу, значэнне і веліч) да гвалту, уціску падданых і да непаслушэнства каралю і рэспубліцы. Рознае здаралася. Багацце — небяспечная рэч, яно жывіць вялікія і нікчэмныя памкненні, высокае патрыятычнае спаборніцтва гэтак жа, як і злачынную пыху, служыць для дабра альбо для злоўжывання правамі мацнейшых і для ігнаравання слабейшых. А багацці былі тут незлічоныя: без перабольшання можна сказаць, што добрая палавіна Літвы, значная частка Украіны, Русі і амаль усё Палессе зносілі сюды даніну за сваё збожжа, за свае лясы, за рыбу ў вадзе, за птушак і пчол у паветры і, хто ведае, можа, за само паветра. Пот мільёнаў ратаяў, заменены на золата, напаўняў тутэйшыя скарбніцы каштоўнасцямі, тутэйшыя лёхі — вытанчаным пітвом, свет — здзіўленнем, а Сенатарскую і Пасольскую залы — гонарам і страхам.

У некаторых залах на сценах, абабітых некалі багатымі дыванамі ці аздобленых ад столі да падлогі суцэльнымі люстэркамі, чаго цяпер і следу не засталося, раскіданы там-сям старажытныя карціны, іх больш за ўсё на чацвёртым паверсе ў асобнай зале, названай сёння гучна *Карціннай галерэяй.* Сэрца сціскаецца, калі глядзіш на многія з тых карцін, асабліва калі зойдзеш у галерэю, дзе выдатныя палотны, каштоўныя і з боку мастацкай вартасці, і як дарагія памяткі, што захавалі для нас вобразы гістарычных асоб, старасвецкія ўборы альбо асобныя падзеі мінулага,— без парадку, без рам, без надпісаў вісяць на сцяне, чакаючы лепшых часоў, альбо, разасланыя па падлозе, марнеюць на нашых вачах, аблазяць, абвяшчаючы аб хуткай сваёй гібелі. Адны з іх маюць даўнія надпісы, на іншых прыклеены нумар, пры дапамозе якога ў інвентарнай кнізе, схаванай ад вока прафанаў дзесьці ў архіве, можна знайсці, хто (ці што) на іх адлюстраваны, некато-

рыя — без надпісаў, без нумароў, і таму страцілі ўжо сваё значэнне. Найбольшай увагі заслугоўваюць перш за ўсё вялізныя карціны, пакуль яшчэ не поўнасцю сапсаваныя, напрыклад: наданне Мікалаю Чорнаму Радзівілу княжацкага звання імператарам Карлам V; нейкі ўрывак пра казацкія войны часоў Яна Казіміра, нейкае паляванне з XVI ці XVII стагоддзя (абодва гэтыя шматкі палатна асыпаюцца з кожным павевам ветру, што гуляе па галерэі з пабітых вокнаў), а таксама паказ войск перад Аўгустам II, учынены Міхалам Казімірам Радзівілам, гетманам літоўскім. Да каштоўных, магчыма, сучасных карцін трэба аднесці такія, як партрэты Вітаўта (дакладную яго копію, гравюру на сталі, зробленую п. Гесам, можна ўбачыць у пачатку «Віталяраўды» Крашэўскага, выдадзенай у Вільні, у Завадскага, у 1842 годзе), Уладыслава Ягайлы, Барбары і яе роднага брата Мікалая, празванага Рудым, такія цудоўныя тварэнні пэндзля, як партрэты Мікалая Чорнага, канцлера літоўскага Альберта, аднаго з Астрожскіх, Януша Радзівіла, Міхала Казіміра Гетмана і некалькі іншых. Карціны гэтыя, дзе гістарычныя мужы паказаны ў поўны рост, выяўляюць сваё замежнае паходжанне. Нічога не было б дзіўнага, калі б які знаўца сярод некаторых з іх адкрыў творы аднаго з найвыдатных майстроў італьянскай ці фламандскай школы, ёсць жа ў нас звесткі, што Рэмбрант ахвяраваў за паслугі свой пэндзаль Крыштофу Радзівілу, слаўнаму гетману літоўскаму*. Да не менеў цудоўных трэба аднесці яшчэ пазнейшыя палотны, дзе намаляваны ў поўны рост кароль Станіслаў Аўгуст (мастак Гескі[38]) і князь Дамінік Радзівіл (мастак Дамель[39]). Да выдатных твораў мастацтва варта далучыць таксама бюсты кардынала Юрыя Радзівіла, падканцлера Міхала Казіміра і яго жонкі з роду Сабескіх, партрэты Льва Сапегі, Аляксандра Служкі, караля Аўгуста II Флемінга і інш. З гістарычных карцін нельга не адзначыць выдатную, майстэрскага, элегантнага пэндзля *«Каранацыю каралевы Барбары»*, некалькі гадоў назад адноўленую. З айчынных твораў заслугоўваюць увагі партрэты Ярэмія Вішнявецкага, кіеўскага мітрапаліта Пятра Магілы, гетманаў Паца, Пацея, Казіміра Сапегі, Станіслава Кішкі і шмат каго яшчэ. На адных мы заўважылі подпіс Яна Шронера (з першых гадоў XVII ст.), другія ў Інвентары 1658 года маюць надпіс: *«Свежага Францішкавага малявання»*, ёсць і такія, дзе пазначана прозвішча «Вітаноўскі» (здаецца, гэты Францішак і Вітаноўскі былі адной асобай), іншыя пазнейшыя работы належаць Юзафу Гескаму. Такія вось скарбы хаваюцца яшчэ ў Нясвіжскім

* Не будзем удакладняць гэта, бо сваю знаходку наконт сказанага мы падаравалі Ю. І. Крашэўскаму, які колькі гадоў працуе над гісторыяй нашага мастацтва. Там цікаўны чытач зможа ўпэўніцца у тым, што мы тут кажам.

замку. Некаторым з карцін пашанцавала тым, што яны ў новым часе былі ўзяты ў рамкі, пакрыты лакам, астатнія ж асуджаны на забыццё, а тыя, што значацца ў згаданым Інвентары, проста загінулі. Дзе, напрыклад, дзеўся партрэт Івана Грознага — на яго твар так цікава было б паглядзець? Дзе той партрэт селяніна з вёскі Чучэвічы, які пражыў у часы князя Міхала Казіміра Гетмана 140 гадоў? А хіба можна паверыць, што ў доме Радзівілаў не мелася аніводнага партрэта караля Жыгімонта Аўгуста? Ці можна дапусціць яшчэ, каб сёння ані ў так званай Карціннай галерэі, ані ва ўсім Нясвіжскім замку не было партрэта Караля Пане Каханку? Яшчэ ў Інвентары з 1770 года мы налічылі 984 рознага роду карціны на палатне і дрэве, сёння, не ведаю, ці хоць палова іх засталася.

Так вось шануем мы светлыя памяткі продкаў, так вось выконваем чацвёртае Божае наканаванне.

Акрамя збору карцін, вялікай увагі даследчыкаў старажытнасці заслугоўвае радзівілаўскі архіў — колішні склад усялякіх папер, што датычыліся Літвы. І гэта нягледзячы на шкоду, якую прынеслі яму рабаванні падчас войнаў. Дыпламатычныя матэрыялы, дзённікі, а галоўнае — збор напісаных у розныя эпохі на адрас Радзівілаў лістоў, усё, што некалі складала багацце роду і краю, можа праліць нямала святла на шматлікія гістарычныя падзеі. Архіў займае некалькі залаў над галоўнай брамай. Гаспадарчыя паперы трымаюцца там у парадку, але збор пісьмаў яшчэ *не даведзены да ладу*.

Сярод горкіх заўваг пра непашану да помнікаў мінулага не вельмі нас абыходзіць *нясвіжская скарбніца*, пра якую столькі кружыць легенд і якой ужо няма і следу. Матэрыяльнае багацце мае ўласцівасць знікнення намнога хутчэй, чым збуцвее папера, чым згіне палатно з фарбай і аліфай. Бронза ды жалеза захоўваюцца даўжэй: зброеўня Радзівілаў, хаця і ў страшным бязладдзі, збераглася аж да нашых дзён, а некалькі малых гармат, рэшткі багатых некалі (бо ў 1658 годзе мелі болей ста адзінак) нясвіжскіх умацаванняў,— іх цікаўны вандроўнік і сёння можа паглядзець у адным з замкавых падзямелляў.

Гэтыя старыя помнікі ліцейнага рамяства заслугоўваюць падрабязнага апісання. Сем гармат большага калібру 1529, 1534, 1536, 1541 і 1543 гадоў — амаль на ўсіх выліты альбо выразаны пазней герб горада Львова,— здаецца, адліваў Ленарт Гірл, чый подпіс мы бачым на некаторых з іх. З мастацкага боку асабліва заслугоўвае ўвагі адна гармата — з шасцю барэльефамі, якія мы і хочам апісаць. На першым — герб горада, на другім — бусел дзяўбе яшчарку, на трэцім — сатыр вядзе каня з урачыстым возам, дзе сядзяць двое, увенчаныя лаўрам, што падараваў анёл,— ён якраз адлятае ў неба, на чацвёртым — у спакойнай паставе сядзіць арол, на пятым — тры медальёны з га-

ловамі туркаў, ці, можа, валохаў, на шостым — галовы трох анёлаў, яшчэ надпіс: *«Добрая ў таго абарона, з кім Бог»* і год — 1541. Узнікае пытанне: якім шляхам трапілі ўсе гэтыя рэчы ў радзівілаўскі арсенал?

Але пяць іншых гармат з часоў Мікалая Крыштофа Радзівіла, пазначаныя радзівілаўскім гербам і крыжам і датаваныя 1591, 1599 і 1600 гадамі, можна лічыць не толькі помнікамі мінулага, але і выдатнымі творамі мастацтва. Вільгаць ад зямлі ў цёмным скляпенні псуе гэтыя цудоўныя медныя гарматы, якія, калі б ачысціць, маглі б стаць аздобай найвытанчанага салона, тым болей, што з такім невялікім памерам (два з лішнім локці даўжынёю) іх можна было б памясціць дзе хочаш — ці ў лежачым становішчы, ці ў форме калон. Апішам іх падрабязна.

Першая, *Гідра*, пры аснове мае форму страшыдла з пяццю галовамі і такое ж страшыдла — пасярэдзіне; на ёй надпіс на лацінскай мове: *«Гідра — рыхтую жалобу, калі смаловыя крану хвалі»*.

Другая, *Цэрбер*, мае форму неачэсанай калоды, пасярэдзіне якой віецца полымя; пры аснове — галава цэрбера і такая ж — на сярэдзіне; даецца надпіс на лацінскай мове: *«Цэрбер — грымлю прарэзліва, калі салдату даў дзяржаву»*.

Трэцяя, *Цырцэй*,— у форме патрэсканай калоны, звязанай каля ручкі, пасярэдзіне і пры вылеце мядзянай завязкай, дзве пятлі якой паказваюць сярэдзіну гарматы; пры яе аснове — чалавечая галава, вакол надпіс на латыні: *«Цырцэй — зняслаўлю кожнага, да каго з непустым шумам даткнуся»*.

Чацвёртая — васьмікутная прызма, пасярэдзіне — дзве савы задзіраюць дзвюх мышэй, а на адной са сцен — барэльеф савы.

Пятая — найпрыгажэйшая за ўсе іншыя, у форме калоды, абвітай вінаградней лазой, лісце якой гожа раскідана па гармаце; пры аснове і пасярэдзіне вылучаюцца дзве вінаградныя гронкі; надпіс на латыні: *«Няхай народы жывяцца з нашага багатага вінаградніка»*.

Вельмі шкода, што нам не ўдалося аздобіць гэтую кнігу малюнкамі тых цікавых гармат, якія смела можна аднесці да выдатных мастацкіх кампазіцый. Варта, каб яны дачакаліся, калі іх намалююць, пакуль не знішчацца вільгаццю, пакуль хто не скіне на іх які цяжар, сціраючы надпісы і барэльефы.

Мы агледзелі найбольш цікавае, што было ў старым гняздзе Радзівілаў. Больш дробныя рэчы ў сваім цяперашнім стане заслугоўваюць меншай увагі. Мы ўжо не ўбачым знойдзенай пад Венай каралём Я. Сабескім карціны, якая, дайшоўшы дарогай сямейнай спадчыны да Радзівілаў,

месцілася ў капліцы Нясвіжскага замка, асвечанай ў 1758 годзе. Не служыць ужо людзям святая ахвяра на зруйнаваным алтары; дом Божы стаў складам рознага хламу, аднак і яго нельга назваць помнікам старажытнасці; сведчаннем даўнейшага прызначэння месца з'яўляюцца толькі дзве мармуровыя пліты з рэляцыяй пра карціну і яе ахвяраванне, умураваныя калісьці з абодвух бакоў алтара. Пра карціну мы яшчэ раскажам. Пра радзівілаўскія лёхі і крамы, напоўненыя некалі шляхетным пітвом, гэтак жа як і пра скарбніцу, гавораць сёння толькі глухія паданні. Не кажучы пра залатыя і сярэбраныя кубкі, што пайшлі адсюль дарогай іншых тутэйшых каштоўнасцей, цяжка нават убачыць сёння ў замку хоць бы шкляны келіх, які напамінаў бы вясёлую эпоху караля Саса альбо яшчэ весялейшыя гулянкі вядомага Караля Радзівіла.

Уздыхнуўшы, пакінем цяпер старыя радзівілаўскія муры, а вышаўшы з замка, глянем вокам на два рады кірмашовых крам, збудаваных у новыя часы з прускага каменю — яны большую частку года пустуюць і толькі з 17 па 29 верасня, г. зн. ад рымскага да рускага дня святога Міхала Архангела, прыходзяць у рух, што вельмі нязвычна для спакойнага выгляду замка і мястэчка. Кірмаш бывае тут не абы які. Уведзены ў даўнейшыя часы каралеўскім прывілеем, ён ладзіўся ў розную пару года і ў розных месцах (заўсёды за горадам) аж да таго моманту, пакуль канчаткова не вызначылі для яго пэўны час і месца.

Правінцыяльны кірмаш звычайна дае вельмі многа матэрыялу для гумарыстычных карцін, аднак іх мы не маем намеру тут маляваць. Увядзенне вялікага кірмашу ў глухім месцы, аддаленым ад галоўных гарадоў краіны, такіх, як Варшава, Вільня, Кіеў ці Адэса, лічым вельмі карысным не толькі для прыбыткаў памешчыка і горада, але і для жыхароў бліжэйшых паветаў, што маюць добрую магчымасць набываць патрэбныя ім рэчы і збываць лішнія. Зрэшты, ці ёсць патрэба апісваць тутэйшы кірмаш — ён жа нічым не адрозніваецца ад кірмашоў іншых гарадоў і мястэчак. Наплыў людзей розных класаў і краёў, змяшанне, як у той Вавілонскай вежы, моў, крыкі і абрыўкі фраз на розных мовах — яўрэйскай, нямецкай, польскай, рускай і кухоннай французскай, гукі арганіка, спеў жабракоў, цыгарэтны дым — усё, як на кожным нашым кірмашы. Асаблівасць нясвіжскага хіба ў тым, што на ім можна ўбачыць жыхароў Палесся, якія прыязджаюць сюды амаль з адзіным прадуктам сваіх мясцін — рыбай; іх вазы са скуранымі будамі, пастаўленымі ў два рады, замяняюць шалашы. Гэтыя прыбышы з ваколіц Пінска і Давыд-Гарадка мовай і тыпам свайго твару прыкметна адрозніваюцца ад мясцовага люду. Палескі дыялект Русі — яшчэ не маларасійская ці валынская мова, а нешта

пераходнае ад беларускай да маларасійскай гаворкі*. Але пакінем у спакоі рухавы кірмашовы люд, які нас далёка адхіліў бы ад прадмету гаворкі, і, верныя сваёй тэме, вернемся да горада, каб агледзець выдатнейшыя яго будынкі.

Калі ідзеш ад замка ў горад, перш за ўсё на вочы трапляецца колішняя езуіцкая святыня ў чыстым італьянскім стылі, у падзямеллях якой месцяцца зямныя астанкі багатых, слаўных і магутных спрадвечных уладароў Нясвіжа. Ніжэй мы будзем мець мажлівасць раскрыць гісторыю гэтага касцёла і яго калегіі, а тым часам кінем вокам на яго цяперашні стан.


Пад высокім і прасторным скляпеннем, ва ўрачыстым паўцені, што зганяецца нават святлом з высокіх вокнаў, міжволі агортвае нейкае пачуццё скрухі і пашаны да святой старажытнасці, сляды якой сустракаеш усюды. Вялікі цудоўны алтар з выявай Тайнай вячэры, здаецца, пэндзля Юзафа Гескага, і два іншыя, бакавыя алтары з партрэтамі апекуноў ордэна езуітаў уяўляюць сабой *sanctum sanctorum*[40], аддзеленыя ад астатняй часткі касцёла драўлянымі балясінамі, з разбянымі кветкамі і лісцем — гэтая старажытная разьба заслугоўвае ўвагі. Направа бачым алтар тонкай работы — першых гадоў нашага стагоддзя; у ім — карціна Дамеля з выявай святой Канстанцыі ці Гелены з крыжам, у даўнейшых строях; а над алтаром, на прыгожай, з каляровага мармуру труне — белая, майстэрскай работы статуя заплаканай жанчыны, надмагільны помнік Канстанцыі Радзівіл, дачкі клецкага ўладальніка маярату трокскага ваяводы Юзафа, што мела мужам Чудоўскага. Гэта павінен быць алтар, але касцельнае кіраўніцтва, ці то знайшоўшы ўборы святой Гелены на карціне занадта сучаснымі, ці то таму, што, як кажа паданне, рысы святой на ёй узяты з твару княжны, на грабніцы якой стаў алтар, не дазволіла яго асвяціць**. Калі любуешся кампазіцыяй маўзалея, а таксама разьбой на труне і статуі, узнікае жаданне даведацца імя мастака — аўтара твора. Мы шукалі звесткі пра гэты помнік у мясцовых парафіяльных візітах, але хто ж не ведае, што візіта — усяго толькі просты інвентар касцельных прадметаў, дзе не звяртаецца ўвага на іх мастацкую вартасць.

Направа ад балясін бачым прыгожы помнік Крыштофу Мікалаю (сыну Мікалая Сіроткі), які памёр у шаснаццаць гадоў (у 1607 годзе), калі вучыўся ў Баноніі. Пад белым мармуровым бюстам на чорнай дошцы таксама з мармуру выціснуты на латыні надпіс акрэслівае гады нараджэння і смерці юнака, расказвае пра жаль бацькоў. Калі б мы болей шанавалі нашы айчынныя памяткі, гэты помнік заслугоўваў бы таго, каб быць перамаляваным і ўвекавечаным на літаграфіі. Тое ж трэба сказаць і пра другі помнік, які бачым тут жа,— барэльеф з выявай укленчанага Мікалая Крыштофа Радзівіла ў пілігрымскім плашчы, у капелюшы, з кіем і ружанцам. Час ашчаджае цвёрдых камянёў, а надпіс бывае больш трывалы, чым мармур. Пацвярджэнне таму і трэці прыгожы барэльеф яшчэ аднаго надмагільнага помніка — другому сыну Мікалая Крыштофа, што памёр у калысцы. Долата мастака па-майстэрску адбіла вобраз маленькага дзіцяці і яго вечнага ложа, але мармур пакрышыўся, і засталіся толькі рэшткі гожага помніка. А, можа, якраз у пашкоджаным месцы і стаяла імя мастака і было яно польскае — у такім разе двайная страта для нашчадкаў. Партрэт Эльжбеты Вішнявецкай, жонкі Мікалая Крыштофа, намаляваны на сцяне і выцерты плячамі набожных, заслонены сёння спавядальняй. З іншых рэчаў былой езуіцкай святыні, якія заслугоўваюць упамінання, можна назваць фрэскі не надта яшчэ дасканалай работы езуіцкіх часоў на скляпеннях з выявамі сцэн са Свяшчэннага пісання, запыленыя партрэты Мікалая Крыштофа Радзівіла і яго жонкі, што стаяць каля касцельных дзвярэй, а таксама аксамітныя, з залатымі галунамі пакрывалы, падараваныя Радзівіламі для заслоны — ад столі да долу — прэсвітэрыі ў час вялікіх урачыстасцей. Паводле падання, падобнымі пакрываламі абівалі некалі ўвесь касцёл, прынамсі ўсе яго тоўстыя чатырохкутныя калоны — але чаго толькі на рахунак падання не ўскладае народ! Карціны і статуі іншых бакавых алтароў не вельмі заслугоўваюць увагі і ўпамінання.

Пад адным з такіх алтароў ёсць дзверы і лесвіца да радзівілаўскіх грабніц. Ветлівае касцельнае начальства не адмаўляецца адкінуць завалы гэтых таемных дзвярэй перад цікаўнымі і павадзіць іх між грабніц. Маецца там алтар, перад якім у пэўны дзень кожнага года адпраўляецца боскае ахвярапрынашэнне за памерлых Радзівілаў. А бліжэй, за кратамі, у доўгіх лёхах цягнуцца шэрагі вельмі дагледжаных алавяных альбо дубовых княжацкіх трун, акутых латуннымі скобамі. Як з генеалагічнай табліцы, даведваешся з іх пра ўсе пакаленні магутнай сям'і.

* Палессе, даўняе селішча ятвягаў, хаця і невялікі край, мае тым не меней два розныя тыпы сваіх насельнікаў. Паляшук з ваколіц Слуцка і Бабруйска — худы, бледны, барадаты, пакорлівы, з вачэй яго глядзіць бяда і нездароўе; чалавек жа з-пад Піны, Шчары і Ясельды высокі, моцнага складу, а ў мове і позірку адчуваецца амаль украінская энергія. Не відаць, аднак жа, каб такія непадобныя адзін на аднаго тыпы мелі рознае паходжанне: адны, як і другія, не маюць лепшай зямлі, здаравейшай вады альбо якіх-небудзь больш спрыяльных умоў жыцця, пінчукі хіба што адрозніваюцца ад сваіх сабратаў з-пад Слуцка тым, што ў іх, можа, трохі болей свабоды ў адносінах з памешчыкамі буйных уладанняў.

** Сёння карціна перанесена ў плябанію, там яе заставілі якімсьці іншым абразом у алтары, дзе адпраўляецца імша.



Частка інтэр'ера касцёла езуітаў у Нясвіжы

За нейкія хвіліны можна абыйсці некалькі эпох у гісторыі Радзівілаў — ад *Сіроткі* да *Пане Каханку*. Да цябе прыходзяць звычайныя, але абвостраныя тут думкі пра людскую фанабэрыю і разам з тым пра марнасць чалавечага жыцця, схіляючы кожнага да заўсёднай пакоры перад Богам. Дык ушануйма ж вечную цішу памерлых, а вяртаючыся назад і ідучы міма труны Мікалая Крыштофа, што месціцца бліжэй да капліцы, возьмем сабе хоць крышку дабраты і высакародства гэтага пана, якога шанавалі за хрысціянскае сэрца. Вось у грабніцах, змураваных ім для сябе і сваёй сям'і, у грабніцах, куды не маглі трапіць не ўзвышаныя княжацкім тытулам святой рымскай дзяржавы

астанкі, ён усё ж дазволіў пахаваць побач з сабой вернага гайдука, які суправаджаў яго ў паломніцтве да Ерусаліма. Мы не запомнілі, а можа, і не ведалі імя таго аддапага слугі, але ведалі, што хоць ён не быў шляхціцам, пан, маючы да яго сардэчную прыязнасць, лічыў яго членам сваёй сям'і. Пазнейшыя пакаленні таксама належным чынам ушанавалі згаданага гайдука, і дагэтуль доўгая труна, якая сведчыць аб незвычайным росце чалавека, стаіць побач з алавянай трупой князя Сіроткі.

Ад грабніц выйдзем цяпер на свежае паветра і агледзім іншыя нясвіжскія касцёлы.

Перад намі — падноўленая пры дапамозе белай і блакітнай фарбаў святыня бернардзінцаў правільнага, але нічым асаблівым не прыметнага архітэктурнага стылю; у ёй няма той велічнай таямнічай красы, якою каталіцызм звык уздейнічаць на сэрцы тых, хто заходзіць у святое месца; затое ўсе карціны тут маюць адметную мастацкую вартасць. Шкода, што не ведаем імя мастака-выканаўцы. Малюнак — правільны, пэндзаль — роўны, можа, нават залішне, прываблівае гульня светаценяў, прыгажосць і праўда. Бачым тут пяць такіх карцін, а канкрэтна — выявы розных асоб, і ў іх ліку святая *Кацярына-пакутніца* ў хвіліну, калі святая дзявочая грамадка пераконвае сівабародых мудрацоў у праўдзівасці веры; паказаная на ўвесь рост *Багародзіца*, што наступае на месяц,— найбольш выдатная з усіх карцін; святая *Ганна* на фоне прыгожага краявіду; святы *Антоній* і святы *Францішак Серафічны*, з ран якога, як з ран Хрыста, пырскае праменне святла.

Касцёл дамініканцаў на рынку з характэрнымі архітэктурнымі рысамі асабліва цікавы карцінамі 70-гадовага Юзафа Гескага, які быў трэцезаконнікам ордэна святога Дамініка і памёр на пачатку гэтага стагоддзя ў Нясвіжы — амаль усе апошнія хвіліны жыцця ён прысвяціў тутэйшаму касцёлу. Усё, што тут бачым,— фрэскі с гісторыі ордэна на скляпеннях, карціны ў алтары (сёння аднаўленыя), партрэт святога Яцка каля амбона, бюсты патронаў ордэна, якія ўпрыгожваюць калідоры кляштара і трапезную,— носяць характэрныя рысы яго роўнага, дакладнага пэндзля, часта натхнёнага святой энергіяй і запалам. Дзе-ндзе мы ўжо ўспаміналі Гескага, тут жа таксама палічылі патрэбным абавязкова сказаць пра яго.

Ёсць у касцёле, у так званым Ружанцовым алтары і адзін твор іншага мастака: гэта бюст Багародзіцы са складзенымі ў малітве рукамі і галавою, ахінутай белым празрыстым пакрывалам. Пра яго ў кніжцы пад назвай *«Прэрагатыва прапаведніцкага закона»* ксяндза Юзафа Шымака мы знайшлі легенду, заснаваную на шчырай веры, а таму яна не вытрымлівае сённяшняй рацыянальнай крытыкі.

Было гэта задоўга да 1672 года, калі Базыль Баканоўскі заснаваў касцёл дамініканцаў. На яго месцы раней стаяў палац Зыгмунта Караля Радзівіла, мальційскага рыцара, памерлага ў 1642 годзе. Пры езуіцкім касцёле жыла багамолка, званая Шыеруўна. Як і ўсе набожныя, яна верыла ў сны і ў самыя розныя цуды. Аднаго разу прыснілася ёй Матка Боская, якая быццам бы загадала пайсці ў замак і папрасіць стары, аднесены ўжо недзе з іншымі непатрэбнымі рэчамі на гарышча яе абраз, што павінен быў захоўвацца ў белых манахаў,— пра іх тады ў Нясвіжы яшчэ і не чулі. Жанчына пайшла ў замак, адшукала той абраз і папрасіла семінарыста, які вучыўся ў бернардзінцаў, паднавіць яго, і семінарыст, хоць *не дасканальна валодаў сваім рамяством,* на здзіўленне вельмі хораша асвяжыў карціну (і праўда, яна не кепска адноўлена). Гэты поспех мастака-семінарыста айцы ўзялі за першы довад цудадзейнасці абраза. Ксёндз-рытар езуіцкай калегіі выпрасіў яго ў Шыеруўны для алтара ў студэнцкай капліцы і хацеў назаўсёды захаваць у калегіі, але тым часам з'явіліся ў Нясвіжы дамініканцы, і багамолка, выконваючы пачуты ў тым сваім сне загад, памясціла абраз у іх першым драўляным касцельчыку.

Варта згадаць тут яшчэ пра колькі гіпсавых статуй, драўляны амбон, аздоблены разьбой, а таксама пра два партрэты над рызніцай: адзін — гетмана Міхала Казіміра Радзівіла, другі — Базыля Баканоўскага, падчашага смаленскага, фундатара.

У кляштары, што некалі, пасля ўпадку езуітаў, меў школы, спачатку гімназічную, а потым павятовую, захавалася яшчэ невялікая бібліятэка, дзе сабраны творы маральнага і аскетычнага зместу. Не помню, ці было там што-небудзь з бібліяграфічных каштоўнасцей апроч вершаў Каха624скага першага выдання і *аддзела забароненых кніг,* дзе магло зберагчыся сёе-тое з прац іншаверцаў XVI стагоддзя, якія артадаксальная стараннасць пазнейшай эпохі нішчыла і паліла.

Касцёл бенедыкцінак з кляштарам, што ўтрымліваў, верагодна, бібліятэку і цікавы архіў ордэна, нельга было належным чынам вывучыць, бо мужчын туды не пускалі. Карціны ў святыні не заслугоўваюць асаблівай увагі, а агульны выгляд касцёла такі ж змрочны, як і статут ордэнскіх маладзіц, але на ім можна ўбачыць мноства дробных цудоўных упрыгожанняў — адразу тут відаць дотык мілых жаночых рук.

З іншых найбольш цікавых муроў Нясвіжа можна назваць гарадскую ратушу, высокая вежа якой колькі дзесяткаў гадоў узнімалася над іншымі вежамі горада, але, пашкоджаная пажарам 1836 года, была няўдала прыкрыта нечым падобным на каптурык дашкам, і замест колішняй велічнасці займела цяпер смешны выгляд. Яшчэ

трэба адзначыць мураваную краму побач з ратушай, стары радзівілаўскі палац, дзе некалі дзейнічаў тэатр, нарэшце пры ўездзе са Слуцка брама ў форме аркі з капліцай і абразом Маткі Боскай, над якім відаць горды надпіс: «*Restauratum anno Domini 1787 dominante Principe Carolo secundo*» (у час панавання князя Караля Другога). Так пампаршаму тытулавалі сябе Радзівілы. Заўважым, што манаршаму тытулавалі сябе Радзівілы. Заўважым, што надпіс на браме пакінуў той самы магнат, які казаў: «Кароль сабе каралём у Варшаве, а Радзівіл у Нясвіжы».

З бліжэйшых ваколіц вартая ўвагі гістарычная Альба — радзівілаўскі звярынец з руінамі летняга палаца князёў, які да нядаўняга часу пуставаў, і толькі цяпер нейкі спекулянт перарабіў яго на простую гаспадарчую ферму, так што палац пазбавіўся найпрыгажэйшай сваёй аздобы: ценю раскошных ліп і бяроз, якія помнілі яшчэ тыя часы, калі хараство цудоўнай прыроды цанілася вышэй за дробныя ад яе прыбыткі.

З другога канца горада відаць пахмуры хвойнік, над якім маляўніча высунула галаву невялічкая вежа касцёла ксяндзоў-бенедыкцінцаў і бялеюць муры іх кляштара. Гэта — *Святы Крыж,* прывілеяваны могільнік усяго горада. На высокай гары стаіць мураваны касцёл, побач з ім — кляштар. Чароўны, эфектны від! Навокал святынь — лес, а ў лесе — горад мёртвых, косці колькіх пакаленняў, магіла на магіле, помнік пры помніку. Нібы спрачаючыся са змрочнымі думкамі, што апаноўваюць тут кожнага, у цёмнай гушчыні бяроз, ліп і ляшчын весела, на розныя галасы выспеўваюць свае шчаслівыя песні салаўі і іншае птаства. Толькі дзякуючы вышэйшай веры, можна зразумець такі дзівосны кантраст — у хрысціянстве няма смерці, у агульнай гармоніі сусвету бясконца доўжыцца вечнае жыццё, а жыццё гэтае з магіл, з смерці бярэ свой пачатак.

Згадаем яшчэ на другім баку дарогі, што вядзе да Слуцка, на самым высокім у ваколіцы ўзгорку, якраз насупраць *Святога Крыжа,* пабудаваны ў пачатку XVIII ст. мураваны касцёл святога Міхала, пры якім было паслушніцтва езуітаў. Касцёл (пра яго потым скажам яшчэ колькі слоў) пазбаўлены сёння сваёй вежы іператвораны ў склад пораху і вайсковай амуніцыі: ад калегіі ж няма і следу. Згодна падання, ад касцёла аж да езуіцкай калегіі ў горадзе цягнуліся пад возерам лёхі, па якіх наладжваліся працэсіі. Ці ёсць хоць колькі праўды ў гэтым паданні? Ці, можа, яно прыдумана для ўзвелічэння езуітаў? А калі ёсць у ім праўда, чым тады растлумачыць імкненне езуітаў хавацца пад зямлю ад людскіх вачэй і сонечнага прамення? Сёння, калі езуіцкая эпоха адышла ад нас у гісторыю, ***як святы Міхал ад Нясвіжа****, калі на па-

* Мясцовая прымаўка, вядомая на Літве.

дземныя ходы і падземную палітыку езуітаў час насунуў сваю заслону, можна меркаваць так і гэтак, але цяжка знайсці ўсяму адгадку, даведацца, як было папраўдзе.

Звернемся ж да старых часоў Нясвіжа і накрэслім яго хроніку.

II.

Усё, што ў мінулым, мае сваю гісторыю. Новыя гмахі маўчаць, руіны гавораць.

М. Вішнеўскі[41]. ГІСТ. ЛІТ. Т. 2.

1. УЗВЫШЭННЕ ГОРАДА 1224—1650

Даўнія нясвіжскія князі.— Кішкі і Радзівілы.— Мікалай Радзівіл Чорны і яго палітыка.— Кальвінізм і арыянізм.— Нясвіж да Мікалая Крыштофа.— Мікалай Крыштоф Радзівіл.— Езуіты.— Першае кіраванне горада — сацыяльныя, рэлігійныя, гаспадарчыя арганізацыі.— Нашчадкі Мікалая Крыштофа.— Эпідэміі.— Памятныя выпадкі да другой паловы XVII ст.

У гэтых мясцінах, як мы ўжо казалі, былі спрадвеку асады славян, што межавалі з Літвой. Жылі яны пад кіраваннем сваіх гмін, гаспадароў і князёў, што ў сваю чаргу залежалі ад больш магутных уладароў Кіева, Галіча, Уладзіміра альбо Мінска, потым — у першай палове XIII ст.— сталі падданымі вялікіх князёў літоўскіх. У рускіх летапісах ёсць згадка пра Юрыя, нясвіжскага князя, які каля 1224 года загінуў у бітве з татарамі. У апошнія часы палітычнага існавання Літвы нясвіжскія князі былі вядомымі баярамі, а ў 1388 годзе, падчас аб'яднання Літвы з Польшчай, мясцовыя князі Грыгорый і Ян, што гаспадарылі тут ад імя Дзмітрыя Карыбута, уладара Ноўгарада-Северскага, паставілі пячаткі на акты, доказваючы тым самым сваю і свайго пана вернасць Уладзіславу Ягайлу[42] і каралеве Ядвізе.

Каля 1430 года ў нясвіжскім удзельным княстве панаваў Федзька, сын Карыбута Альгердавіча, пра якога мы ведаем: ён заснаваў горад Вінніцу на Падоліі, далучаны ў 1395 годзе Вітаўтам да Літвы. Федзька ўзамен страчаных там уладанняў змог атрымаць ад дзядзькі Нясвіж з ваколіцамі. Сынам Фёдара быў Дашка, сынам Дашкі — Васіль, князь нясвіжскі,— яны, як сведчыць

Папроцкі[43], і сталіся начальнікамі княжацкіх родаў: Збарацкіх, Вішнявецкіх, Порыцкіх і Варанецкіх, але Нясвіж ад іх адыйшоў ва ўласнасць кароны. У канцы XV стагоддзя польскі кароль Аляксандр аддаў яго магутнаму ў Літве роду Кішкаў, аб чым сведчыць збережоны ў архіве лацінскі прывілей, дзе гаворыцца, што ён дадзены ў 1492 годзе ў суботу ў Троках перад святым Марцінам Пятру Іванавічу Кішку з Цеханоўца на валоданне наступнымі вотчынамі: Нясвіжам, Крутыбрэгам, Чучэвічамі, Папорцем. Гэты ж Пётр Іванавіч Кішка ў наступным годзе ад таго ж караля Аляксандра атрымаў пацвярджэнне на ўладанне Олтыкі, а таксама Лахвы з маёмасцю, якія ён займеў ад Казіміра Ягелончыка.

Нясвіж заставаўся ў руках Кішкаў каля сарака гадоў, аж да 1533 года, калі Ганна Кішчанка, вышаўшы замуж за Яна Мікалаевіча Радзівіла, кашталяна трокскага і маршалка літоўскага, празванага *Барадачом*, прынесла ў пасаг Радзівілам Нясвіж, Алыку і палову Лахвы.

Радзівілы яшчэ ад язычніцкіх часоў былі вядомыя як слаўныя літоўскія мужы. Яны, праўда, не паходзілі ад Ліздзейкі, галоўнага жраца Літвы, і не ад яго ўзялі сваё прозвішча, як тое тлумачыць паданне — быццам бы адзін з іх *рáдзіў* Гедыміну заснаваць *Вільню.* Гэтую легенду стварылі пазней езуіцкія панегірысты, *не радзячыся* з аутэнтычнымі крыніцамі, што сведчаць: Радзівілы паходзілі ад нейкага Войшміда, а сваё прозвішча як чыстай крыві літвіны ўзялі без сумнення з літоўскай, а не польскай мовы. Аднак заўсёды на Літве гэта быў славуты род. Першы з вядомых у гісторыі нашчадкаў Войшміда — Радзівіл, які пры святым хрышчэнні атрымаў імя Мікола, падпісаў у 1401 годзе унію Літвы з Польшчай. Памёр ён у 1460 годзе. Яго сын Мікалай II, ваявода віленскі і канцлер літоўскі, ад сваёй жонкі Соф'і Монвід пакінуў чатырох сыноў: *Мікалая,* што згодна з прывілеем імператара Максімільяна ад 1518 года пісаўся князем Ганёндзы і Медэлі (тытул гэты ў другім пакаленні знік); *Альберта,* які быў у 1508 — 1519 гадах віленскім біскупам і атрымаў прыгожае імя бацькі ўбогіх*; *Юрыя,* праслаўленага геройскімі учынкамі пры Жыгімонце I, гетмана літоўскага, роданачальніка пазнейшай Біржанскай лініі; нарэшце *Яна Барадача* — пра яго мы казалі вышэй.

Так што ў самым пачатку XVI стагоддзя мы бачым магутнасць Радзівілаў. Ужо не кажучы пра вялікія ўладанні і пра тытулы, відаць, што не абы якія пасады ў Літве мелі чатыры сыны Мікалая II Радзівіла. Мікалай быў віленскім

* М. Балінскі («Гісторыя горада Вільні». Т. I, стар. 224) беспадстаўна называе яго князем Алыкі і Нясвіжа, бо тыя ўладанні праз чатырнаццаць гадоў пасля яго смерці адышлі да Радзівілаў, а праз дваццаць восем атрымалі статус княства.



Мікалай I Радзівіл.
XIV ст.

ваяводам і канцлерам, Альберт — біскупам, Юрый — віленскім кашталянам і гетманам, Ян — кашталянам трокскім і маршалкам. Больш высокіх сенатарскіх пасад не мелася ў Літве. Радзівілы былі ўсім, палова Літвы апынулася ў іх руках, на другую — яны рабілі свой



Мікалай III Радзівіл.
XV ст.

пераважны ўплыў як найвышэйшыя чыны Літвы, не вельмі моцна яшчэ з'яднанай з Польшчай.

У гэтакім вось родзе нарадзіўся ў драўляным яшчэ, але вядомым сваім багаццем і славаю Нясвіжскім замку Мікалай Радзівіл, празваны *Чорным*, славуты вучонас-

цю, вялікім дыпламатычным талентам, багаццем, уплывам на двор, сваяцтвам з каралём Жыгімонтам Аўгустам. У 1547 годзе як пасланец караля да імператара Караля V Мікалай Радзівіл Чорны атрымаў ад апошняга тытул алыцкага і нясвіжскага князя — для сябе і сваіх нашчадкаў. Гэты замежны тытул не дадаваў яму дома ніякіх правоў, але забяспечваў магнату большую вагу і веліч у вачах мясцовай шляхты.

Там, дзе няма сапраўдных фактаў, гісторык не мае права выносіць нейкай з'яве свой прысуд, але ён можа выказваць уласныя меркаванні, гіпотэзы, не прэтэндуючы на канчатковую ісціну. Да такіх не адкінутых гісторыяй гіпотэз можна аднесці намеры Мікалая Чорнага ў яго стаўленні да Літвы. Зямля Альгердаў пры Ягайле і яго наступніках неахвотна ўваходзіла ў лона сваёй старой сястры Польшчы, з якой потым ішла адной палітычнай дарогай долі і нядолі. Пры Ягайле, чые родныя і стрыечныя браты змагаліся за карону, яна прыпісвала свае няўдачы палякам; нешчаслівы Казімір Ягелончык тысячу разоў сварыў два толькі што пабратаныя плямёны, абвастраючы адносіны паміж імі; пры Жыгімонце І, парушаючы унію, пра якую марылі патрыёты свайго краю, Літва вечна перамаўлялася з Польшчай такімі словамі: *«Толькі вайна са скандалам»*, паводле дасціпу чарналескага паэта. Жыгімонт Аўгуст, якому надакучылі соймавыя буры з нагоды жаніцьбы з Барбарай Гаштольд, гразіўся кінуць Польшчу і перабрацца ў Вільню панаваць над сваімі вернымі літвінамі. Замест абмежаваных *pactami*[43] каралеўскіх правоў у Кракаве, замест гучных шляхецкіх з'ездаў, замест соймаў, што зрываліся магутнымі магнатамі, у Вільні Ягелоны мелі права на спадчыну, усеагульную пашану і неабмежаваную паслухмянасць. Пра падзел дзвюх краін, як відаць, не раз марылі стомленыя барацьбой з народам манархі Ягелоны. Норавы і звычаі Літвы не дазвалялі ёй хутка зрасціся з блізкай сваім паходжаннем краінай, таму і літоўскія магнаты адкрыта і патаемна ўздыхалі пра падзел. Але, не зважаючы на тыя непрыемнасці, якія прыносіла унія, Жыгімонт Аўгуст быў дастаткова мудры, каб бачыць палітычныя перавагі еднасці, дастаткова шляхетны, каб нечым ахвяраваць асабіста. І, паўздыхаўшы па свабодзе літоўскіх лясоў, на практыцы шмат рабіў для з'яднання дзвюх краін, для іх умацавання. Таму літвіны, жадаючы аддзяліцца ад кароны, не маглі спадзявацца, што іх князь і адначасова польскі кароль стане на чале іх. Другім пасля караля па моцы, багацці і асабістых вартасцях быў Мікалай Чорны. У спрэчках караля з народам наконт яго-най жонкі Радзівілы выпрабавалі сваю моц, таму не дзіва, што ў ганарыстай галаве Мікалая Чорнага нарадзілася думка пра незалежнасць літоўскай кароны ад Польшчы. Ён прыкладаў усе намаганні, каб сарваць унію, а паколькі

меў немалую сілу, уплыў на караля і найвышэйшы ў Літве чын віленскага ваяводы, дык у яго былі ўсе падставы спадзявацца, што мара пра незалежнасць рана ці позна здзейсніцца. Народу, якому паўтара стагоддзя свяціла ўжо сонца вышэйшай цывілізацыі цяжка было загадаць, каб ён ізноў вярнуўся ў лясы, запаліў агонь Зніча і чалом біў Перуну. Радзівіл не думаў таксама пакінуць у Літве каталіцызм, хаця якраз у імя рымскай веры аб'ядналіся дзве краіны, якія ён мерыўся падзяліць. Каталіцызм — вера палякаў, а алыцкі і нясвіжскі князь не хацеў, каб Літва мела з імі што-небудзь агульнае. З тае нагоды пачаў прыглядацца да іншаверя, што распаўсюджвалася ў гэты час у Еўропе, і каля 1554 года сам прыняў вучэнне Кальвіна, паволі стаў пашыраць яго ўсякімі магчымымі сродкамі па Літве — сродкамі, якіх у яго руках было аж занадта многа. Іншыя літоўскія магнаты, не здагадваючыся пра намер Радзівіла, але імкнучыся патрапляць духу часовай моды, працавалі ў тым жа яго кірунку, прымалі пратэстанцтва, садзейнічалі яго распаўсюджанню ў сваіх уладаннях. Радзівіл заснаваў у Вільні ў сваім доме насупраць касцёла святога Яна другі на Лукішках Гельвецкі збор, прывёў туды двух старанных празалітаў пратэстанцтва Вэндрыхоўскага і Чаховіча. У Брэсце, не шкадуючы выдаткаў, згуртаваў магутныя разумовыя сілы з пратэстантаў, каб яны рэдагавалі пераклад Біблii, пабудаваў збор у Клецку, на чале якога паставіў Тамаша Сакалоўскага (Фальконя), узвёў таксама зборы ў Койданаве, Свержні, Дзераўной і іншых сваіх уладаннях, а ў Нясвіжы, што быў у яго часы, можна сказаць, другой сталіцай Літвы, акружыўся духавенствам новай веры, на чале з Ваўжынцам Крышкоўскім з Вялікай Польшчы, заўзятым палемікам, аўтарам гутаркі чатырох братоў Вальдэнскіх, перакладчыкам гутарак філосафа святога Юстына з яўрэем Трыфанам і памочнікам Буднага ў перакладзе вядомай Нясвіжскай Біблii. Гэтак жа як і Радзівіл, Крышкоўскі зрабіў магутны ўплыў на ўсіх бліжэйшых грамадзян, асабліва на братоў Вайцеха і Марціна Кавячынскіх, вяльможных слуг і верных выканаўцаў волі Радзівіла. Пад уздзеяннем Крышкоўскага Кавячынскія заснавалі ў Нясвіжы друкарню, запрасіўшы ўзначаліць яе вядомага ў Польшчы друкара Даніэля Лянчыцкага. Тут апрача менш значных рэлігійна-палемічных твораў выйшаў перадрук з Брэсцкай Біблii — *«Новы запавет, дакладна перакладзены з грэчаскай мовы на польскую»*.

Тым часам палітычная сітуацыя змянілася, і пра ўтварэнне асобнай Літоўскай дзяржавы ўжо нельга было думаць, бо ў 1564 годзе Мікалай Радзівіл Чорны памёр, а маладыя яго сыны Мікалай Крыштоф, Юрый, Альберт і Станіслаў ці вучыліся, ці займаліся грамадскай працай. Кавячынскія сталі ўсеўладнымі кіраўнікамі Няс-

віжа і радзівілаўскай спадчыны. Грамадская ж ўзбуджанасць, выклiканая рэлігійнымі спрэчкамі, прайшла не вельмі хутка. Адзін раз парваўшы з Вучэннем, тэолагі не маглі ўжо затрымацца ў межах чыстага кальвінізму. Навука Соцына адкрывала новую арэну для тэалагічнай думкі, і Нясвіж, дзякуючы намаганням Кавячынскіх, Лэнчыцаніна, Крышкоўскага, Фальконя, Буднага, Паўлі, стаў шырокавядомым асяродкам арыянства ў Літве. Не гуляла друкарня Лянчыцкага: тут быў перш за ўсё паўторна аддрукаваны Брэсцкі *«Новы запавет»* (1586), выдадзены *«Катэхізіс»* Буднага і, нарэшце, двойчы выходзіла так званая Нясвіжская Біблія — над перакладам яе некалькі гадоў працавалі Кавячынскія, Крышкоўскі і Будны, і яна носіць імя астатняга, галоўнага перакладчыка. Нясвіжская Біблія як надзвычай важны помнік рэлігійнай барацьбы, польскай мовы і нават друкавання ў мінулым заслугоўвае шырокага даследавання, аднак тут яно будзе не да месца. Вернемся да гісторыі Нясвіжа.

Ужо маючы статус княства, Нясвіж, гэтае гняздо магутнага роду, прыстанак арыянства ў Літве, быў драўляным горадам, падзеленым на дзве часткі — на старую і новую. Жылі ў ім хлебаробы-хрысціяне — княжацкія слугі — і яўрэі, што вялі шырокі гандаль з Руссю. Непадалёку ад горада высіўся драўляны замак (можа, часткова і мураваны), дзе, згодна з прывілеем Жыгімонта Аўгуста, дадзеным ў 1551 годзе ў Вільні Мікалаю Чорнаму і аднесеным у галоўны архіў прывілеяў, якія служылі княству літоўскаму (знойдзеныя тут літоўскія паперы могуць пацвердзіць меркаванне пра надзеі Мікалая Чорнага незалежна панаваць над Літвой). Нясвіж карыстаўся ўжо некаторымі гандлёвымі прывілеямі, атрыманымі ад караля, але яшчэ не вызваляўся ад земскіх законаў і звычаяў. У горадзе ўзнёсся парафіяльны касцёл Святога Духа, што стаў потым Гельвецкім зборам, і старажытная грэчаская царква Нараджэння найсвяцейшай Панны (Рождество Пречистое). Словам, было гэта яшчэ невялікае сціплае мястэчка, якое хутка вырасце і праславіцца.

Тым часам малады ўладар Нясвіжа Мікалай Крыштоф ужо наведаў двор імператара Максіміл'яна, праявіў сябе пад кіраўніцтвам Рамана Сангушкі ў рыцарскай прафесіі, быў пасланцом у Парыж для запрашэння на трон Генрыха Валезыя, браў удзел у выбарах Стэфана Баторыя. На Стэнжыцкім з'ездзе ён захварэў. У сваёй хваробе ўбачыў боскую кару за свавольствы маладосці і за адрачэнне ад каталіцызму, адклікаў дыпламатычнага прадстаўніка, прыняў святое прычасце паводле каталіцкага абраду з рук Пятра Скаргі[45] і пакляўся, што калі выздаравее, то наведае магілу Збавіцеля ў Ерусаліме. Паправіўшыся, удзельнічаў у войнах Стэфана Баторыя з Іванам Грозным і нарэшце у 1582 годзе выбраўся ў сваю

набожную вандроўку. Калі чытач хоча даведацца пра яго прыгоды ў двухгадовым падарожжы, можна пачытаць кнігу *«Вандроўка»*, якая напісана ім па-польску і не належыць да бібліяграфічных рэдкасцей, бо з польскага арыгіналу, узноўленага ў невялікай колькасці экземпляраў, Тамаш Трэтэр пераклаў яе на лацінскую мову, а Анджэй Варгоцкі — зноў на польскую — якраз нядаўняе выданне таго перакладу і ёсць у нас (Вроцлаў, у Схлеттэра, 1847).

7 ліпеня 1584 года вярнуўся Радзівіл у Нясвіж, і гэтае вяртанне паклала пачатак новай эпохі ў гісторыі горада — калыскі роду Радзівілаў. Перш за ўсё на месцы даўняга, вельмі ўбогага, не адпаведнага княжацкай веліччы мястэчка ён залажыў 8 мая падмурак сённяшняга Нясвіжскага замка. Потым пачаў знішчаць усе з такой стараннасцю створаныя бацькам помнікі пратэстанцтва, паліць на рынках у Вільні і Нясвіжы Брэсцкую і Нясвіжскую Біблії, замяняць кальвініцкіх пастараў каталіцкім духавенствам, словам, шумнаму некалі божышчу арыян пачаў надаваць прававерную постаць. Зварот да каталіцызму быў тады ў Польшчы ўсеагульны, а апорай Рыму, выразнікамі тэндэнцыі часу сталіся не хто іншыя, як езуіты. Бліжэйшая шляхта, княжацкія слугі, мяшчане і сяляне дружна вярталіся ў лона старой веры; у такой справе патрабавалася дапамога езуітаў, і Радзівіл выклікаў іх у Нясвіж яшчэ перад сваім падарожжам у Палесціну.

Але запрошаныя, убачыўшы малое і ўбогае мястэчка, не вартае таго, каб засноўваць тут школу, прытым не ўсім забяспечанае, тым больш, што яны былі нарасхват (традыцца на езуітаў зрабілася модай), нібыта доўга не хацелі жыць у гэтым, як піша іх гісторык Растоўскі, вясковым зацішку (ruralis solitudo). Паміж Радзівілам і генералам ордэна вяліся доўгія перамовы. Нарэшце, пераканаўшыся, што намаганнямі Мікалая Крыштофа горад увачавідкі расце, езуіты згадзіліся паслаць сюды двух са сваіх братоў — Вайцеха Мрашкоўскага і Крыштофа Астроўскага, «як найбольш дасведчаных у Божым вінаградніку працаўнікоў»*. Аднак тое падвышэнне ў цане езуітаў было перабольшанае. Яшчэ ў час вандроўкі да святой зямлі прыданыя Радзівілу езуіты Леанард Пацiфікус Сыцылійчык і Ігнацы Іспанец добра настроілі пабожнага магната імкнуцца нават коштам найцяжэйшых ахвяр для ўзвелічэння горада замацаваць у ім езуітаў. Пасля доўгіх нараканняў на дзікае і глухое месца, на цеснату жылля і недастатковае забеспячэнне яны нарэшце адкрылі ў 1584 годзе пачатковую школу граматыкі і казаннямі сталі прываблiваць люд. Праз два гады пачалі закладваць падмурак для касцёла, але як самі езуіты, так і іх своесаблівы пратэктар Юрый Кардынал Радзівіл, брат Мікалая Крыш-

* Растоўскі[46].

тофа, былі ім незадаволены, таму ўзяліся рабіць яго інача; у выніку кутні камень асвяцілі аж у 1589 годзе. Тым часам Мікалай Крыштоф адарыў езуітаў сапраўды па-каралеўскі, запісаўшы на іх буйное ўладанне Ліпскае, г. зн. вёскі: Туховічы, Свецічы, Навасёлкі, Раздзяловічы, Заліпене, Залучу, Ушанку і Рудаву, вызваліўшы іх ад вайсковай службы і чыншу, наогул ад усіх павіннасцей, як было ў маёнтках духавенства. Будаўніцтва касцёла і калегіі цягнулася да лістапада 1593 года. У тым годзе касцёл асвяцілі, адчынілі для людзей, і значэнне езуітаў павялічылася. Таму яны змаглі схіліць да каталіцкай веры Элеанору з Астрожскіх князёў, удаву Гераніма Язлавецкага, з якой ажаніўся Ян Юрый Радзівіл, сын Мікалая Крыштофа, а таксама вярнулі да новай веры яшчэ трыццаць іншых разнаверцаў. Такая стараннасць нясвіжскіх езуітаў найболей хінула да іх Мікалая Крыштофа, ён усяляк садзейнічаў ім: значна расшырыў калегію, так што ў ёй можна было змясціць дзвесце асоб, а таксама падараваў сваю друкарню — невядома толькі, ці выйшла ў ёй тады хоць адна важная кніга. У 1590 годзе згуртаванне езуітаў наведаў А. Людвік Масэлля, прысланы з Рыма ад езуіцкага генерала, пры якім была ўтворана ў Нясвіжы езуіцкая правінцыяльная кангрэгацыя, гасцінна прынятая князем; сваёй мэтай яна ставіла аддзяленне польскай правінцыі ад літоўскай, таму што ўжо ў абедзвюх краінах значна вырасла колькасць калегій і не мелася магчымасці кіраваць імі з аднаго правінцыяльнага цэнтра. Раздзяленне адбылося некалькі гадоў пазней.

Задаволіўшы патрэбы роду і зрабіўшы ўсё, што падказвала сумленне, Мікалай Крыштоф Радзівіл пачаў звяртаць пільную ўвагу на сам горад. Выкліканыя князем з краіны і з-за мяжы рамеснікі і аселыя ў Нясвіжы шматлікія купцы патрабавалі карэннага паляпшэння ўмоў жыцця і гарантыі ўсіх іхніх правоў. Цэнячы іх працу, адукаваны гаспадар паехаў да караля Стэфана з просьбай аб наданні Нясвіжу магдэбургскага права, пры гэтым уручыў яму гатовы праект. І вось 23 красавіка 1586 года Баторый падпісаў у Гродне прывілей. Так Нясвіж быў прыраўнаны да ўсіх каралеўскіх гарадоў у Літве, атрымаўшы магдэбургскае права з апеляцыяй ад магістрата да гаспадара, вызваліўшыся ад усіх іншых айчынных юрысдыкцый — як земскіх, так і гродскіх. Яго жыхары назаўсёды вызваляліся ад аплаты за грэблі і масты, а ад павіннасцей, што збіраюцца ў Літве,— на пяцьдзесят гадоў. Прычым устанаўляліся апрача ранейшых яшчэ два новыя кірмашы; адзін — на Зялёныя Святкі, другі — перад Божым Нараджэннем; абодва цягнуліся па два тыдні. Гэты каралеўскі прывілей паклаў пачатак другому — нададзенаму гораду 18 чэрвеня таго ж года яго гаспадаром князем Сіроткам; гарантуючы поўнае захаванне са свайго боку і з боку нашчадкаў атрыманых горадам прывілеяў, ён загадаў нясвіжскім мяшчанам кіравацца кнігай *«Саскае люстэрка»* ў перакладзе Паўла Шчэрбіча, выдадзенай у 1581 годзе. Вялікая частка таго прывілею вартая нашай памяці. Згодна з ім, уводзілася пасада войта, якому давалася шэсць валок зямлі. У выпадку яго смерці быў вызначаны спосаб выбрання новага войта. Войт і мяшчане выбіралі бурмістра і дарадчыкаў, устанаўлівалася апеляцыя гарадскога кіравання да князя і яго наступнікаў. Паводле прывілею, мяшчане атрымалі ў вечнае валоданне зямельныя надзелы без усякай іх аплаты і поўнае права распараджацца імі. Апрача таго, для суменснага карыстання гораду аддаваліся ўсе бровары, саладоўні, вінакурні, лазні, крамы, яткі, цырульні і васкабойні з іх прыбыткамі. Нарэшце Нясвіж займеў у поўнае ўладанне сто валок зямлі — з пэўнымі ўмовамі, а канкрэтна: каб тыя, хто не вызвалены ад чыншу, плацілі па капе грошаў, якія ішлі на розныя патрэбы па даўнейшых княжацкіх распараджэннях: на гарадскі шпіталь — 40 коп грошаў літоўскіх, на школу — 24, на арганіста — 8 коп, рэшта ж мусіла папаўняць гарадскую скарбонку. Мяшчане са сваіх надзелаў абавязаны былі даваць пробашчу да 50 гадоў па грошу, а за сто валок — па карцу[47] жыта. Князі, паводле таго самага прывілею, захавалі для сябе права збору гандлёвай мыты, падушнай і памернай, але не болей 40 коп грошаў за год, і то толькі ў будучым, пасля пяцідзесяцігадовай волі. Затое гарадское кіраўніцтва павінна было пабудаваць мураваную ратушу, дзве брамы — адну большую, пры ўездзе з Міра, а другую меншую — для замыкання горада. Ліквідаваліся талокі на жніве, якія дагэтуль адбывалі мяшчане, з умовай, каб кожны са свайго надзелу насыпаў вакол першапачатковага горада па адным прэнце[48] вала. Урэшце, князь, жадаючы, каб мяшчане ў знак падзякі каралю за дараваную волю з большай ахвотай будавалі муры, дабіваўся ў гарадскога кіраўніцтва на святога Марціна штогадовай справаздачы перад гаспадаром і горадам пра ўсе даходы і расходы. Апрача тых ільгот, якімі князь сваім прывілеем адарыў Нясвіж, ён сачыў яшчэ, каб людзі ўсіх саслоўяў маглі заўсёды карыстацца атрыманымі правамі. Нават таму, хто ехаў куды-небудзь са сваімі таварамі далёка ад горада, давалася пасведчанне з гарадской пячаткай. І яўрэі не засталіся тут абыйдзенымі. Яны, праўда, не карысталіся магдэбургскім правам, але затое кіраваліся юрысдыкцыяй замка. Такім чынам, Мікалай Крыштоф стаўся другім фундатарам і ў нейкай ступені аднаўляльнікам Нясвіжа. Ён залажыў замак, у якім падпісаў вышэй памянёны прывілей, пачаў умацоўваць горад, збудаваў і забяспечыў усім неабходным школу і шпіталь. Апрача таго, пры падтрымцы князя было ўтворана брацтва міласэрнасці, бо Сіротка, нягледзя-

чы на ўласцівую яму беражлівасць, меў чулае да чужога гора сэрца і, не адказваючы ў дапамозе няшчасным, часта казаў: «Няхай мяне завуць не Радзівіл, а рад жывіл».

Кароль Стэфан, зацвярджаючы такія распараджэнні князя Мікалая Крыштофа, надзяліў горад гербам, ці пячаткай, з выявай: з аднаго боку на шчыце палавіна чорнага арла, рассечанага ўздоўж, з цэлай галавой, а з другога боку — дзесяць касых палос блакітнага, чырвонага і жоўтага колеру, папераменна размаляваных.

Хутка разбудаваны Нясвіж стаў галоўным горадам ардынацыі, утворанай 16 жніўня 1586 года сямейным пактам паміж князем Сіроткам і яго братамі Альбертам і Станіславам. Новы ўладальнік маярату, шчыра ўзяўшыся за развіццё горада, выдаў важнае распараджэнне адносна тутэйшых яўрэяў. У дадзеным ім прывілеі хацелася б звярнуць увагу на адзін пункт. Паводле яго, яўрэі абавязаны былі не толькі на ноч, як звычайна, але і ўсе тры дні Велікодныя — чацвер, пятніцу і суботу — замыкаць з абодвух бакоў сваю вуліцу. Ключы на гэты час абавязкова здаваліся ў кіраўніцтва замка, якое мусіла сачыць, каб ніхто з яўрэяў не выходзіў у горад, і, наадварот, каб распаленыя ўяўленнямі пра пакуты Збавіцеля хрысціяне не кідаліся помсціць нашчадкам ганіцеляў Хрыста. Мудры Радзівіл хацеў папярэдзіць самавольства, можа, не так нясвіжскіх мяшчан, як вучняў езуіцкай школы, не свабодных ад забабонаў часу.

Доўга можна б было пералічваць грамадскія, гаспадарчыя, сямейныя і рэлігійныя новаўвядзенні Крыштофа Радзівіла; гэтае клапатлівае, поўнае боязі перад Богам і хрысціянскай міласэрнасці спагадлівае сэрца дачакалася жаданага плёну сваёй працы. Прывядзём яшчэ іншыя важнейшыя яго новаўвядзенні ў Нясвіжы. Ён, заснаваўшы пры езуіцкім касцёле брацтва міласэрнасці, прызначыў пад назвай mons pietatis* [49] сродкі на пажыццёвае забеспячэнне бедных паненак, у 1590 годзе разам са сваёй жонкай Еўфеміяй з Вішнявецкіх стварыў кляштар бенедыкцінак, аддаўшы яму набыты ад слуцкіх князёў Алельжавічаў маёнтак Гавезну (быў гэта першы ў Літве жаночы кляштар). У 1598 годзе ён заснаваў і ўсім забяспечыў кляштар бернардзінцаў і, нарэшце, перадаў уладанні Навасёлкі і Амулынцы ў фонд нясвіжскага плябана, якім мусіў быць свецкі святар, прызначаны ад імя езуітаў,— ад іх яму належала атрымліваць свой дар і ў іх касцёле адпраўляць парафіяльныя абрады, таму што іншага парафіяльнага касцёла не існавала. Плябан той, як бачым, з'яўляўся стаўленікам езуітаў, бо яны знаходзіліся ў той час, можна сказаць, на чале духавенства. Мікалай Крыштоф да такой ступені любіў езуітаў, верыў у іх вучэнне і збаўчыя для хрысціянства намеры, што, як сведчыць тагачасны пісьменнік Каспар Вількоўскі, прыдворны медык Радзівіла, у кнізе *«Desidorosus, альбо Сцежка да ласкі Божай»* (Кракаў, 1589) «імкнуўся, каб дом пры нясвіжскім калегіуме быў забяспечаны пэўнымі прыбыткамі для пэўнай колькасці маладых людзей, якія вучыліся б набожнасці, каб потым былі добрыя і годныя плябаны ў яго шматлікіх уладаннях». Гэтае імкненне, хаця яно і не здзейснілася, паказвае на вялікую перавагу езуітаў ва ўплыве на грамадскую думку краю, такую, што нават свецкая семінарыя пачынала ім верыць. Дык ці ж дзіўна, што езуіцтва так хутка рабіла поспехі?

Як бы там ні было, Мікалай Крыштоф Радзівіл стварыў, можна сказаць, тутэйшы край, які яшчэ нядаўна лічыўся

* Не маючы пад рукой фундацыі *Montis pietatis у Нясвіжы*, але жадаючы даць чытачам уяўленне пра падобнага роду ўстановы міласэрнасці нашых продкаў, прывядзём тут апісанне ўтворанага ў 1690 годзе ў Алыцы ахвярнага фонда Альбрыхта Станіслава Радзівіла і яго жонкі Кацярыны з Любамірскіх: «Жадаючы даць з нашых прыбыткаў дапамогу і пасаг убогім паненкам, якім сорам не дазваляе ісці жабраваць і беднасць якіх прычыняе ім многа ліха... ахвяруем і запісваем... сорок тысяч злотых польскіх, з якіх кожны год на дзень нараджэння святога Яна Хрысціцеля будзем аддаваць для іх на рукі пробашча чатыры тысячы злотых на правізію. Выбраць дванаццаць паненак — шэсць шляхецкага і шэсць *простага саслоўя*, даўшы ім па 500 зл. першым і па 100 зл. другім. Для пасагу ім даць ксяндзу-пробашчу 100 зл., капітуле — 200 зл., а астатнія 100 зл.— на абед паннам. Гэты абед даць ім адразу пасля ўручэння пасагу... Каб прайшло ўсё гэта найлепшым чынам... павінны адбыцца выбары паненак, якім будзе давацца пасаг. На цырымоніі выбараў прысутнічаць будуць: пробашч з васьмю прэлатамі і дзесяты пан, які будзе ўладаром Алыкі, альбо яго намеснік. У той дзень, калі будзе ўручацца пасаг, яны сыйдуцца ў ратушы і адтуль паміж двух галоў пад вянкамі, з якімі звычайна бяруць шлюб, пойдуць у касцёл на мшу, і там перад в. Алтаром — шляхцянкі з правага боку, а з левага дзяўчаты простага саслоўя — з запаленымі свечкамі на працягу ўсёй мшы будуць стаяць на каленях і, папярэдне паспавядаўшыся, прымуць прычасце, а яшчэ прамовяць літанію пра святую панну, пасля чаго ксёндз-пробашч з капітулай і пан ці яго намеснік сядуць на табурэткі і сам пробашч перадасць у апячатаных пакетах пасаг. Пасля маёй смерці гэтая цырымонія павінна быць праведзена перад пахавальнай працэсіяй, пасля якой панны адразу пойдуць у капліцу святой Аргентыны, дзе я буду ляжаць, і там літанію пра Найсвятую Матку ўслед за свяшчэннікам прамовяць за памерлых, потым гэты ж ксёндз, а за ім кожная панна пакропіць труны асвечанай вадой і скажа: *«Дай ім, Божа, вечны спачынак»*. Адтуль зноў пойдуць у ратушу і, спажыўшы там абед, разыйдуцца куды захочуць. З атрыманым пасагам яны могуць выходзіць замуж, ісці ў манастыр ці жыць паненкамі».

Хіба ж патрабуе каментарыяў гэтая святая фундацыя ці гэты мілы абрад? Звяртаем толькі ўвагу чытачоў на тое, што і дочкі простага люду мелі права карыстацца такім дабрачынным забеспячэннем.



Елізавета Еўфемія Радзівіл.
XVI ст.

лясной пустэчай. На колькі міляў наўкол скупіўшы зямлю і маёнткі ў дробнай шляхты, пачаў па-сапраўднаму там гаспадарыць, удыхнуў новае жыццё ў горад, змяніўшы ўвесь яго выгляд. Сам жа гаспадар, які, паводле сведчання памянёнага Вількоўскага, у першы год пасля свайго пера-

ходу ў лона каталіцызму змог на Вялікдзень ледзьве восем асоб далучыць да свайго прычасця, у канцы жыцця, паміраючы, бачыў задаволены, як да некалькіх збудаваных ім каталіцкіх святынь збіраліся на малітву тысячы людзей. Не стала яго ў 1616 годзе. Калі ён паміраў, пры ім былі для суцяшэння тры езуіты, вядомыя ў гісторыі нашага пісьменства: Ян Аляндус, яго біёграф і перакладчык гутарак святога Аўгустына з самім сабой (soliloquium) пад назвай *«Трызны»* (каля 1633 года быў тут рэктарам), Марцін Смігельскі, вядомы палкімі і пераможнымі палемікамі з іншаверцамі, і Міхал Орціс Іспанец (двойчы займаў пасаду рэктара, памёр у 1637 годзе), вядомы як вельмі вучоны муж і надзвычай набожны чалавек. Мікалай Крыштоф спачывае ў грабніцы, што сам для сябе падрыхтаваў. Над ёю мы бачым яго барэльеф, пад ім чытаем на латыні: *«Я прыхадзень і вандроўнік да сябе, як і ўсе бацькі мае»*. Сярод мноства пахвал, якія яму пры жыцці і пасля смерці, па-польску і па-латыні, вершамі і прозай пісалі езуіты, хочацца прывесці тут такое прыгожае чатырохрадкоўе:

Templa Deo, turres patriae, Colledia Misis
Aedes afflictis mundi fugisquae; dedit.
Gloria militiae lux pasis, codnitor orbis.
Si deni tales, vicimus Italiam.

(Узнёс святыні Богу, крэпасці для айчыны, калегію для навук, прыстанак для гаротных і ўцекачоў ад свету; быў славаю ў баю, святлом ў радзе; адведаў і пазнаў зямлю. Калі б мы мелі двух такіх мужоў, без цяжкасці перагналі б Італію.)

Пасля яго смерці гаспадаром усіх княжацкіх уладанняў стаў як наследнік і кіраўнік нясвіжскага маярату ягоны сын Ян Юрый Радзівіл, трокскі кашталян, вядомы, паводле сведчання Нясецкага*, распуснымі звычкамі, якія ледзьве прыглушыў толькі перад смерцю. З яго часоў варта згадкі толькі тое, што ў верасні 1617 года Уладзіслаў IV, яшчэ калі быў каралевічам, у час паходу на Маскву наведаў Нясвіж і гасцяваў у Радзівіла. У калегіуме яго віталі пахвальнай прамовай экспедыцыі**. У горадзе на сустрэчу з маладым рыцарам выйшлі з харугвамі цэхі, на замкавым вале яго віталі стрэламі, а калі на банкеце прагучаў тост ў гонар каралеўскай мосці, такі грымнуў гром з гармат, што толькі дзе-нідзе ў горадзе вокны засталіся цэлыя. Кашталян трокскі, з вялікай помпай прыняўшы каралевіча і яго прыдворных, падараваў яму для вайны дзве вялікія гарматы***.

Пасля смерці Яна Юрыя Радзівіла (1625 год), які ад сваёй жонкі Элеаноры з Астрога Язлавецкай не меў патом-

* Выданне Лейпцыгскае. Т. VIII, стар. 73.
** Маскевіч ва ўспамінах.
*** Растоўскі.

ства, яго малодшы брат, таксама бяздзетны, Альбрэхт Уладзіслаў, староста рыжскі і кашталян віленскі, завалодаў Нясвіжам з маяратам, дзе гаспадарыў да 1636 года. У час яго гаспадарання быў асабліва памятны 1625 год, калі лютаваў па ўсёй Літве і Польшчы мор, што ў кастрычніку таго ж года дайшоў і да Нясвіжа. Калі пачалі паміраць людзі ў Валыні, езуіцкае кіраўніцтва прыслала ў Нясвіж сваіх маладых вучняў тэалогіі, таму колькасць асоб у тутэйшым калегіуме ўзрасла да 73. З набліжэннем эпідэміі езуіты, пакінуўшы ў горадзе толькі Яна Аляндуса з некалькімі яго вучнямі для адпявання і пахавання памерлых, разбегліся па палескіх вёсках. Пяцьдзесят асоб свецкіх і колькі езуітаў пала ахвярамі бедства, якое спынілася ў апошнія дні лістапада. Езуіты, прыпісаўшы гэта апецы святога Пасхазюша, чые мошчы былі ў калегіуме, адправілі ў яго гонар пахвальную мшу, а удзячныя Небу мяшчане збудавалі ў прадмесці Новы горад невялікую уніяцкую капліцу.

Уладзіслаў IV, стаўшы каралём, пацвердзіў даўнія прывілеі для Нясвіжа, вызваліў горад ад мыты і пошлін і перанёс на 24 лютага кірмаш. Нарэшце, з помнікаў, уцалелых у Нясвіжы з часоў Альберта Уладзіслава, трэба назваць уніяцкую царкву святога Юрыя, пабудаваную перад бернардзінскім касцёлам,— у ёй у 1635 годзе пан прадстаўляў ксяндза Базыля Меляшкевіча*. Калі уніяцтва зблізілася з каталіцкім касцёлам, а езуіты са сваім парафіяльным свяшчэннікам і яшчэ бернардзінцы маглі задаволіць духоўныя патрэбы ваколіц і горада, гэтая царква, якая многія гады не дзейнічала, так заняпала, што нельга ўжо адшукаць нават месца, дзе яна стаяла. З часоў кіравання Аляксандра Людвіка Радзівіла, трэцяга сына Мікалая Крыштофа (з 1636 па 1654), варты ўвагі некалькі выпадкаў, якія датычацца Нясвіжа.

У 1640 годзе Ісусава таварыства спраўляла стогадовы юбілей свайго зацвярджэння. Па ўсіх калегіях наладжваліся ўрачыстасці, да чаго падахвоціў віленскі біскуп Война, распачаўшы ў Вільні васьмідзённае ўрачыстае святкаванне. У Нясвіжы Аляксандр Людвік Радзівіл разам з езуітамі наладзіў велічнае відовішча. Ад касцёла бенедыкцінак аж да муроў калегіума пацягнуліся працэсіі, былі выстаўлены трыумфальныя аркі, гербы таварыства, гербы Радзівіла і партрэт іх стваральніка Мікалая Крыштофа. Школьная моладзь выспеўвала пад музыку трыумфальныя гімны. На памяць пра той дзень Радзівіл палажыў у касцёле натуральнай велічыні сэрца, адлітае з золата. У той жа год пасланыя ад езуіцкага генерала інспектары Фабрыцыус Банхус і Бенедыкт дэ Сакса падзялілі езуітаў у

* Прывілей той надрукаваны ў Зборы старажытных грамат і актаў Мінскай губерні (Собрание древних грамот и актов. Минск, 1848).

Польшчы на дзве правінцыі — Польскую і Літоўскую. Для раздзеленага так згуртавання неабходна было арганізаваць вышэйшае навучанне езуіцкай моладзі, і таму магістр Анджэй Эрэнт адкрыў філасофскія курсы на дваццаць слухачоў.

У 1644 годзе нясвіжскі калегіум узначальвалі два рэктары: Рудзінскі, які ажыццяўляў нагляд за шасцюдзесяццю з лішнім асобамі, і Мікалай Лэнчыцкі, што кіраваў гаспадарчай часткай. Гэта быў сын славутага некалі друкара Даніэля з Лэнчыцы — апошні якраз тут пры дапамозе свайго друку не так даўно сеяў па Літве насенне гельвецкай навукі і арыянства. Якім палымяным пратэстантам лічыўся бацька, такім жа шчырым, аж да фанатызму заядлым католікам-езуітам стаў яго сын. Нясецкаму спатрэбілася некалькі лістоў паперы, каб запісаць многія рысы характару гэтага незвычайнага чалавека. Можна знайсці там рысы высакароднасці, узорнай маралі і адначасова рэшткі дзівацтваў празмернага піетызму. Прыпісвалі яму чараўнічыя здольнасці і прароцтвы. Але як можам мы тое аспрэчыць? У тым, што ў шчырай веры, у любові і хрысціянскай пакорлівасці ёсць таямнічае насенне цуду, ніхто не сумняваецца, аднак у наш разважлівы час цяжка паверыць у цуд.

Тады ж жылі ў Нясвіжы вядомыя езуіты: Казімір Каяловіч, брат славутага гісторыка Войцэха, сам аўтар двух частак «Рыторыкі», а таксама прамовы над магілай віцебскага ваяводы Уладзіслава Валовіча, біяграфіі Мікалая Лэнчыцкага і многіх друкаваных пропаведзяў; Андрэй Розенвальд, вядомы як аўтар некалькіх лірычных паэм, напісаных на латыні, і Бенедыкт дэ Сакса Іспанец, заслужаны сярод езуітаў чалавек, аўтар асноў права і пачаткаў польскай граматыкі.

Недзе ў той час, як сведчаць езуіцкія хронікі, жыў у Нясвіжы езуіцкі місіянер з Францыі Францішак Рыкард, што ездзіў у Іспанію як апостал і дыпламат (ён насіў тытул пасла Рэчы Паспалітай польскай у Персіі). Вярнуўшыся, Рыкард заклікаў каталіцкіх свяшчэннікаў, асабліва езуітаў, каб яны наведаліся з місіяй у Персію. Пры гэтым запэўніваў, што тамашні шах іх гасцінна прыме. Паказаў нават указ шаха пра пастаялыя двары для прыезджых. Езуіты вельмі ганарыліся тым, што ў гэтым указе некалькі разоў упаміналася іх згуртаванне, адпаведныя словы з таго дакумента яны перапісалі залатымі літарамі. Ці напраўду Персія тады добра ставілася да хрысціянства, ці набожны француз толькі выхваляўся — цяжка было тады праверыць. Занадта неспакойная пара пачыналася ў краіне, каб польскае духавенства шукала небяспеку ў краях няверных. Лаўр пакутніцтва можна было лёгка знайсці і дома.

І праўда, набліжаліся вельмі сумныя часіны. Уладзі-

слаў IV паміраў, узбунтаваная казаччына на чале з Хмяльніцкім, які ўзяў сабе ў дапамогу і татар, аб'явіла вайну Рэчы Паспалітай. Гетманы Патоцкі і Камінскі, а таксама мноства знакамітай шляхты трапілі ў татарскую няволю, але мала хто спяшаўся на Украіну, каб паставіць на месца мяцежнікаў, бо шляхта ў Варшаве была занята то выбарамі, то рэлігійнымі спрэчкамі, то сваркамі магнатаў.

Польшчу і Літву ахапіла паніка. А выбранне ў такіх абставінах Яна Казіміра каралём наводзіла на думку, што гэтакім жа неспакойным будзе ўсё яго панаванне.

2. БЕДСТВЫ І ВАЕННЫЯ СПУСТАШЭННІ. ПАСТУПОВАЕ АДРАДЖЭННЕ ГОРАДА 1650—1763

Смерць Уладзіслава IV.— Казакі.— Пачатак войнаў з Расіяй.— Колькі слоў пра матэматыка езуіта Освальда Кругера.— Смерць Аляксандра Людвіка Радзівіла.— Два напады расіян на Нясвіж.— Прывілеі і статуты ўрада і паноў для развіцця горада.— Становішча горада.— Напад шведаў, асада і ўзяцце Нясвіжа.— Міхал Казімір Радзівіл, вялікі гетман літоўскі.— Норавы часу.— Рэлігійныя абрады.— Творы, што выдаваліся мясцовым духавенствам.— Тэатр, слова аб Фр. Уршулі Радзівіл з Вішнявецкіх.— Становішча Нясвіжа ў час смерці князя Гетмана

У час, калі Нясвіж пад апекай урада і ўласных паноў усё болей квітнеў і развіваўся, памнажаючы свае багацці, узносячы новыя пабудовы, павялічваючы насельніцтва, і хутка мог ужо заняць не апошняе месца сярод іншых гарадоў Літвы, з Украіны пачаў даносіцца да гарадскіх муроў водгалас панічнага страху. Жыхары Украіны, Валыні, Палесся, пакідаючы свае стэпы і лясы, уцякалі сюды, каб знайсці сховў у нашых абарончых крэпасцях, якіх не так і шмат стаяла на літоўскай зямлі. Нясвіж даваў ім прытулак у сваіх мурах. Аляксандр Людвік Радзівіл, чый замак быў прыстасаваны для абароны, гасцінна адчыняў вароты для ўцекачоў. Тыя, каго не ўдалося змясціць у замку, беглі далей. Быццам анёл смерці праляцеў па горадзе — так ён абязлюдзеў. Але на гэты раз страхі былі дарэмныя: непрыяцель не дайшоў так далёка. Нясвіж яшчэ гады чатыры меў спакой, толькі ў 1651 годзе пракаціўся тут мор, што забраў колькі ахвяр.

Але з-за казакоў і выхвалянні польскага пасла Вэс-



Януш Радзівіл.
XVII ст.

сэля і некалькіх іншых прычын абвастрыліся адносіны паміж Янам Казімірам і маскоўскім царом Аляксеем Міхайлавічам. Чатыры атрады расійскіх войск уварваліся ў Літву. Януш Радзівіл, хаця і даў ім добры адпор у бітве пад Шкловам, аднак не здолеў затрымаць шырока рассыпаных па краі чужых войск, што, мінуўшы Мінск, пацягнуліся да Вільні. Нясвіжская цвярдыня замкнулася, і вораг яе не змог узяць, але ў 1654 годзе горад упершыню стаў ахвярай спустошэнняў. Няўзброеныя гараджане паўцякалі, а тыя, хто мог узяць у рукі зброю, бег у за-

мак, які, не здольны змясціць усіх, толькі для знатнай шляхты адчыніў свае брамы. Перапалоханы вясковы люд рушыў у горад, каб схавацца ў езуіцкім касцёле, дзе пакінутыя тры свяшчэннікі* з вялікай цяжкасцю аказвалі сваю апошнюю паслугу такому мноству людзей, пакуль саміх не забіла раз'юшаная салдатня. У гэты ж 1654 год уладар Нясвіжа Аляксандр Людвік, падарожнічаючы па Італіі, развітаўся ў Баноніі з жыццём.


Яну Казіміру, які быў у Гродне, спатрэбіўся для выпрацоўкі плана ваенных дзеянняў добры матэматык, для чаго выклікалі з нясвіжскага калегіума рэктара Освальда Кругера — ён выдаў нямала кніг па матэматыцы, там, у Гродне, і памёр у 1656 годзе **.

У 1659 годзе расіяне з новымі сіламі пайшлі на Літву. Трыццацітысячнае войска на чале з князем Трубяцкім рушыла на Украіну, гэтакае ж войска развярнуў паміж Дняпром і Бярэзінай Радомскі, не малыя сілы пад камандаваннем Далгарукага і Хаванскага ўварваліся ў Літву. Пасля паражэння ў ваколіцах Вільні пад Веркамі гетмана польнага Гансеўскага атрады непрыяцеля смялей разышліся па Літве. Хаванскі напаў на абарончую крэпасць Ляхавічы, непадалёку ад Нясвіжа, а частка яго войск пад кіраўніцтвам Шчэрбы і другая на чале са Жміевым паспрабавалі ўзяць Нясвіж, які быў забяспечаны зброяй і служыў прытулкам навакольнай шляхце, ся-

---

* Вяховіч, Станішэўскі і Буткевіч.

** Паколькі нашы гісторыкі літаратуры нічога не ўспамінаюць пра Кругера, бо ён пісаў на латыні і не належаў да кампаній мясцовых мудрацоў, пададзім тут пра яго кароткую даведку. Нарадзіўся ў 1601 годзе ў Прусіі, уступіў у ордэн езуітаў у 1619 годзе, а ў 1622 яго паслалі па далейшую навуку ў Рым, дзе ён вучыўся разам з Янам Гружэўскім, Андрэем Рудамінам, Мікалаем Завішам і Мацеем Казімірам Сабескім. У 1639 годзе атрымаў у Вільні вучоную ступень доктара філасофіі і пачаў выкладаць там матэматыку, філасофію і маральную тэалогію. Не займаў ніякіх высокіх езуіцкіх пасад, пакуль у 1653 годзе яго не паклікалі заняць пасля Анджэя Шчапкоўскага пасаду рэктара ў Нясвіжы. Напісаў і выдаў наступныя працы: 1. *«Матэматычныя задачы па оптыцы, геаметрыі, астраноміі, элементарнай сферы і касцельнай рахубе»* (Teoremata et problemata matematica, Vilnae, 1633). 2. *«Арыфметыка»* (1635). 3. *«Аб устаноўцы гармат»* (Parallela horoscopa sive de directione termentorum, 1635). 4. *«Рымскі каляндар»* (Calendarium Romanum, 1637). 5. *«Астранамічная сотня»* (Centuria astronomica, 1639). 6. *«Выклад тэорыі зроку»* (Theoremata de oculo, optica, catoptrica etc., 1641). 7. *«Матэматычныя нататкі аб пункце і цэнтры»* (Theorocentrica, sive matematicae de puncto et centris considerationes, 1644). 8. *«Вылічэнне велікодных свят»* (Exegesis festivitatis paschalis, 1646). 9. *«Аб колерах вясёлкі»* (Iris sive de coloribus apparentibus, 1647). 10. *«Трактат пра вакуум»* (Disertatio de vacuo, 1648). 11. *«Пра зрок»* (Oculus, 1652). Смерць заспела яго над працай «Аб практычнай устаноўцы гадзіннікаў» (Horolographia). Гл. у Растоўскага.



Дамінік Мікалай Радзівіл.
XVII ст.

лянам, мяшчанам і духавенству. Войску, што ўсюды мела поспех, замак узяць не ўдалося, але не заслонены мурам і шанцам горад не мог даць ніякага адпору ворагу. Яго аддалі на рабаванне і ў гэтым, і ў наступным годзе. Начальства не здолела стрымаць раз'юшанай салдатні, у вы-

ніку — некалькі забітых, а сярод іх і стары Машынскі, фундатар і дабрачынец езуітаў у Навагрудку*.

Нарэшце Чарнецкі і Сапега разбілі войскі, што асаджалі Ляхавічы, і вызвалілі Нясвіж, які, вытрымаўшы асаду, быў заліты крывёю, ператварыўся ў папялішча. Гаспадар, заможнейшыя жыхары і езуіты пацярпелі мала: свае багацці яны здолелі схаваць, абараніць. Сціплую ж маёмасць бедных непрыяцель разрабаваў і спаліў.

Пасля ваенных спусташэнняў 1661 года Міхал Казімір Радзівіл змог перш за ўсё вызваліць на гады чатыры свой горад ад падаткаў і салдацкіх пастояў, а таксама ад каралеўскіх пошлін, а для сябе здабыў гарантыі вяртання сродкаў, укладзеных на абарончыя ўмацаванні Нясвіжа**. Праўда, як відаць з пазнейшых папер, дзяржава многія гады не магла выплаціць доўг і, здаецца, ніколі яго не выплаціла, але само дамаганне аплаты за ўмацаванне ўласнага родавага гнязда не робіць гонару шаноўнаму мужу Міхалу Казіміру Радзівілу, падканцлеру і гетману літоўскаму, гаспадару вялікіх уладанняў, саноўніку высокага рангу, што абавязаны быў падзяляць цяжкую долю краю, плёнам якога так шчодра карыстаўся. Бо гэта ж у тыя часы мінулася, як ні шкада, шляхетнае імкненне да ўсеагульнага дабра. За кроплю крыві, за нейкія цагліны, за колькі жалеза і бронзы не саромеліся магнаты таргавацца з айчынай і грукацца да яе небагатай казны.

Як бы там ні было, Міхал Казімір не шкадаваў сваіх сіл для аднаўлення Нясвіжа. Апрача льгот для горада, пра што мы ўжо казалі, 20 студзеня 1673 года ён выдаў універсал, дзе, каб заахвоціць людзей сяліцца ў Нясвіжы, гарантаваў на аснове нямецкага права новапасяленцам усялякія свабоды, у тым ліку магчымасць пакінуць у любы час горад. Усе гэтыя прывілеі, а таксама арганізацыя новых прадпрыемстваў змаглі ў нейкай ступені палепшыць жыццё нясвіжцаў і аднавіць горад, таму ў 1678 годзе Таннэр Чэх — разам з царскім пасланнікам князем Міхалам Чартарыйскім праязджаў праз Нясвіж — змог напісаць у сваім дарожным дзённіку***, што ён бачыў тут муры, якія акружалі горад, вялікі рынак, прыгожыя дамы і замак, абнесены валамі ды равамі і забяспечаны гарматамі.

Два новыя касцельныя ахвяраванні прыдалі Нясвіжу болей руху, палепшылі яго выгляд. Першае з іх учыніў у 1672 годзе для дамініканцаў смаленскі войскі Базыль Бакаоўскі, падтрыманы князем. Спачатку ён пабудаваў *Араторыум*, а неўзабаве ўзнёс і асвяціў мураваны касцёл святога Яна Хрысціцеля. Другое ахвяраванне было ад само-

* Гл. часта цытаваны твор Растоўскага: Litvanicarum Soc. J. Historiarum provincialium pars prima.
** Гл. Volumina Legum за 1661, 1670 і 1674 гады.
*** «Нататкі пра даўнюю Польшчу» Нямцэвіча.



Караль Станіслаў Радзівіл.
XVII ст.

га князя абацтву бенедыкцінцаў, што знаходзілася за горадам, яму ён запісаў у 1673 годзе са сваіх прыбыткаў 30 000 польскіх злотых на касцёл *Святога Крыжа*. Аднак не так хутка ўжо сын фундатара Караль Станіслаў Радзівіл закончыў тое духоўнае збудаванне, а ў 1690 годзе яго зацвердзіў сейм.

Міхал Карыбут Вішнеўскі прывілеем 1669 года зноў вызваліў нясвіжскіх мяшчан ад мыт і пошлін назаўсёды, а ад галоўнай пошліны — на пятнаццаць гадоў; у 1670 годзе сейм сваёй пастановай падоўжыў яе да дваццаці гадоў у сувязі з ваеннымі спусташэннямі і пераходамі айчынных войск, а таксама ўлічваючы абарончыя ўмацаванні, якія Радзівіл канчаткова прывёў у парадак «для большай бяспекі і славы дзяржавы»*. У далейшыя гады ўладару Нясвіжа яшчэ лягчэй было дабівацца для свайго горада дабрачынных прывілеяў, бо яго, падканцлера Міхала Казіміра, звязвалі з тронам сваяцкія адносіны: ён даводзіўся мужам роднай сястры Яна Сабескага — Кацярыне. У выніку Ян III, уступіўшы на трон, не толькі пацвердзіў Нясвіжу ўсе папярэднія прывілеі і надалей вызваліў яго ад краёвых пошлін і мыт, але ў дадатак асобным прывілеем як узнагароду за мужнасць пры адпоры непрыяцеля ад Нясвіжа, што не раз быў у варожай асадзе, устанавіў для паляпшэння гарадскіх грамадзян чатырохнядзельны кірмаш, які мусіў пачынацца 25 жніўня**.

Міхал Казімір Радзівіл, чыё жыццё праходзіла то ў клопатах пра дабрабыт айчыны, то на полі бітвы, то, нарэшце, у навуковых занятках, дзе меў поспех, у апошнія гады жыцця наведваў з дыпламатычнай місіяй замежныя краіны. У 1681 годзе ён быў пасланы да імператара Леапольда выказаць ад імя польскага караля суседскую прыязнасць, а таксама да папы Інакенція XI, каб засведчыць яму каралеўскую пакору. З гонарам справіўшыся з абедзвюма місіямі і дабіўшыся далучэння да ліку святых Яна Кантэма ў Бановіі, фатальным для яго бацькі і дзядзькі месцы, закончыў сваё жыццё.

Пасля яго смерці памесцямі гадоў дванаццаць валодала жонка Кацярына Радзівіл з Сабескіх, а яе каранаваны брат Ян III быў, вядома ж, заўсёдным апекуном радзівілаўскай фартуны. І праўда, можна ўбачыць не адзін прыклад клопату тагачаснага трона пра дабрабыт горада. На сейме 1681 года кароль зацвердзіў прадстаўлены Кацярынай Радзівіл статут купецкага цэха, а ў наступным годзе перанёс пачатак чатырохнядзельнага кірмашу з 25 жніўня на Уводную нядзелю***, нарэшце, 21

* Volum. legum. T. V, стар. 11.

** Аўтэнтычны прывілей — у гарадскім архіве.

*** Прывілей, датаваны 26 сакавіка 1682 г., быў падпісаны ў Яварове.

лютага 1688 года ўладальніца Нясвіжа выдала (відаць, з ведама караля, бо вяршылася тое ў сямейным гняздзе Сабескіх — Жолкве) загад магістрата, каб гарадскія яўрэі не дапускаліся ў кіраўнічыя ўстановы, а ў кірмашовыя дні не чынілі ніякіх пабораў, якія б стрымлівалі гандаль, а тым самым перашкаджалі развіццю і ўзбагачэнню горада.

Гэта былі, трэба сказаць, часы ўпадку гарадоў і мяшчанска-купецкага саслоўя. Яшчэ нядаўна мяшчане выдатнейшых гарадоў па сушы і вадзе вялі шырокі гандаль з замежнымі краінамі і на сваіх землях, доказам чаго з'яўляюцца шматлікія прывілеі — яны вызвалялі розных мяшчан ад пошлін і мыт на ўвоз замежных тавараў, а таксама ад аплаты ў сваёй краіне за грэблі і масты, купецкі транспарт. Чытаючы ў актах канцылярыі Слуцкага замка тэстаменты розных мяшчан, якія станавіліся купцамі, не раз дзівіліся мы іх заможнасці і багаццю. Але разам з аплаканымі часамі Яна Казіміра канчаецца шчаслівае жыццё нашых гарадоў. Падпальванне дамоў і крамаў, рабаванні, напады на дарогах на купецкі транспарт давялі мяшчан-купцоў да беднасці, а гэта хутка скарысталі заўсёды спрытныя і моцныя сваёй салідарнасцю яўрэі. Пазычаючы збяднелым мяшчанам невялікія сумы на значныя працэнты, яны здолелі такім спосабам завалодаць іхнімі багатымі калісьці крамамі і дамамі на рынках і галоўных гарадскіх вуліцах, дзе пры заснаванні гарадоў яўрэйскаму племені не было дазволена сяліцца. Паслужлівы гандаль гарэлкай давяршыў карціну*. Са свайго боку, шляхта і багацейшае духавенства, да каго збяднелы мешчанін ішоў пазычаць грошы, здолелі прысвоіць зямельныя ўгоддзі, гарадскія пляцы і пабудовы, таму ў гарадах знаходзім мы вызваленыя ад розных абмежаванняў і гарадскіх павіннасцей духоўныя і шляхецкія сядзібы і камяніцы, што ўсім сваім цяжарам пачалі прыціскаць непрывілеяваных і маральна прыгнечаных бедных мяшчан. Вось дарога, якой нашы гарады, прыйшоўшы да ўпадку, набылі свой сённяшні незайздросны выгляд. Вернемся ж да Нясвіжа.

Падканцлер літоўскі Караль Станіслаў Радзівіл, стаўшы ў 1692 годзе кіраўніком канцылярыі сваіх уладанняў, добра бачыў заняпад горада і ведаў прычыну гэтага. Яго прывілей, дадзены Нясвіжу 4 чэрвеня таго года,

* Каб дабіцца свайго, яўрэі заўсёды падшуквалі сабе прыхільнікаў, скарыстоўвалі любыя хітрыкі. Так, у 1729 годзе ў Слуцку яны выпрасілі для сябе ў Аўгуста II мартарыяльны ліст, згодна з якім аплата яўрэямі і ўсім слуцкім кагалам сваіх даўгоў розным асобам адтэрміноўвалася да трох гадоў, на працягу якіх крэдыторы павінны забіраць толькі пяць працэнтаў. Дзе ж тут справядлівасць? Яўрэй меў права турбаваць свайго даўжніка, а ад крэдытораў засланяўся каралеўскай паперай. Як жа тут не магло заняпасці гарадское саслоўе хрысціян?

быў чаканай узнагародай гораду за яго зычлівасць да гаспадара і нясвіжскай крэпасці, дзе згодна прывілею, «грамадзяне атрымалі не адзін голас крывавай Белоны[50], але захавалі веру». Убачыўшы, як абязлюдзеў горад у выніку войнаў, гаспадар дазволіў застацца ў ім і сялянам з вёсак, што аселі ў горадзе, прытым іх прыраўнялі ў правах да мяшчан. Аднак пасля прымаць сялян у горад забаранялася. Прывілеем* касаваліся духоўныя і шляхецкія юрысдыкі, лік якіх у горадзе памножыўся, пры гэтым дазвалялася перадаваць іх мяшчанам, забіраць, нарэшце, аддадзеныя ў доўг дамы і пляцы.

Але ўсе тыя ахоўныя меры не змаглі прынесці свайго выніку, таму што ў хуткім часе палітычны гарызонт ізноў зацягнула хмарамі, літоўскія гарады ізноў зведалі забойствы, рабункі і пажары. Пачатак XVIII ст. будзе памятны ў нашай гісторыі крывавымі спрэчкамі паміж Аўгустам II і Станіславам Ляшчынскім, якія далі падставу двум найпершым ваенным геніям таго часу Пятру Вялікаму і Карлу XII умяшацца ў справы Польшчы і пачаць паміж сабой барацьбу за пальму славы і палітычныя набыткі. Шведы быццам бы для падтрымкі Ляшчынскага рабавалі Польшчу. У пачатку 1706 года ваенныя дзеянні перанесліся з Польшчы ў Літву, дзе ў Гродне Аўгуст II са жменькай палякаў, з войскам сваіх саксонцаў і расійскімі падмацаваннямі сабраў свае сілы. Карл XII, скіраваўшы ўсю ўвагу на гэты галоўны ваенны цэнтр, выслаў у глыб Літвы конныя атрады, каб заняць крэпасці і знішчыць маёнткі прыхільнікаў Аўгуста. А якраз да самых шчырых саксонскіх прыхільнікаў належаў Караль Станіслаў Радзівіл, які колькі гадоў карыстаўся вялікай пячаткай літоўскай і быў абавязаны трону за шматлікія староствы і іншыя дабрачыннасці Аўгуста II. Не маючы магчымасці схіліць на свой бок такога працаўніка, як Радзівіл, Карл XII вырашыў яго хаця б спаралізаваць. Нясвіж з усімі навакольнымі радзівілаўскімі ўладаннямі мусіў стаць ахвярай яго нянавісці, а знешняй нагодай для рабаўніцтва тутэйшых ваколіц паслужылі 40 000 казакаў пад кіраўніцтвам Мазепы, што разам з расіянамі Пётр Вялікі размясціў у Мінску, Слуцку, Нясвіжы і ў іншых гарадах. Пра першы напад шведаў на Нясвіж сучасны шведскі гісторык** расказвае так: «Кароль адчуваў, што трэба выслаць на другі бок Нёмана свае войскі пад кіраўніцтвам падпалкоўніка Траўтветэра, маёра Аксэля Спэнса і ротмістра Дрэфеншульца. Спачатку накіраваліся яны да горада Міра, дзе знаходзілася 1000 казакоў. Супроць іх былі пасланы шведамі прыданыя ім валахі, якія да такой ступені асмеліліся, што, напаўшы

* Арыгінал захоўваецца ў гарадскім архіве.

** Georg. Nordberg. Leben Carl des zwölften 1745. T. I, стар. 656 і 657.

на абоз непрыяцеля, захапілі дзесяць палонных... З Міра Траўтветэр накіраваўся да Нясвіжа, горада, які належаў вялікаму канцлеру літоўскаму Радзівілу. Акружаны валам і ровам Нясвіж меў прыгожы і моцны замак — ён стаяў за межамі горада. Гаспадар замка не прыняў у яго сцены казакоў. У горадзе іх налічвалася 2000 чалавек, камандаваў імі Міхаловіч, адзін з вышэйшых военачальнікаў Мазепы. Прыбыўшы вельмі рана (14 сакавіка) да гарадскіх муроў і выстраіўшы тры батальёны сваіх драгунаў, Траўтветэр ударыў адначасова на браму і гарадскія валы. Казакі, сабраўшыся на рынку для абароны, адказалі агнём. Але шведы, з ходу захапіўшы браму, напалі з палашамі на непрыяцеля так хутка, што казакі разбегліся па бліжэйшых дамах, а іх военачальнік і 300 чалавек палеглі на полі бою. Пяцьсот казакоў зачынілася ў мурах езуіцкага калегіума, якога Траўтветэр без гармат вялікага калібра не змог узяць. У замак не пусцілі ніводнага казака, адтуль не стралялі па шведах, хоць яны на вачах военачальніка ўшчэнт разбілі каля рова казацкі атрад. Тых, што паўцякалі ў дамы, Траўтветэр загадаў не забіваць. Але казакі, не жадаючы карыстацца ласкай шведаў, безупынна вялі з вокнаў і дзвярэй агонь. Таму военачальнік мусіў выкарыстаць апошні сродак: даў загад падпаліць горад. У пажары загінула 500, а то і ўсе 600 казакоў. Каля 180, уцякаючы з агню, добраахвотна здаліся ворагу. Чатыры гарматы, чатыры штандары, дзве пары літаўраў і дамашнія рэчы, якія не згарэлі ў агні пажараў, сталі здабычай пераможцаў. Траўтветэр адаслаў палонных і 50 чалавек параненых — сярод іх былі афіцэры і салдаты, а сам рушыў на Ляхавічы».

Было тое ў сакавіку 1706 года. У спаленым Нясвіжы стаяў яшчэ абарончы замак на чале з радзівілаўскім камендантам Баліманам — Карл XII загадаў узяць умацаванне. Але шведам гэта не ўдалося, таму праз два месяцы кароль сам накіраваўся да Нясвіжа. Ізноў прывядзём тут расказ таго ж гісторыка пра ўзяцце крэпасці*: «З-пад Ляхавіч кароль (Карл XII) рушыў да Клецка, а праз тры дні з войскам, што білася пад Ляхавічамі, пайшоў на Нясвіж. Нясвіжская крэпасць уяўляла сабой правільны чатырохкутнік з умацаванымі і глыбокімі мураванымі акопамі. Гарнізон складаўся з 200 чалавек, з якіх толькі 90 — сапраўдныя салдаты, мяшчане і сяляне. Падпалкоўнік Траўтветэр і генерал-ад'ютант Расенштэрн былі пасланы да каменданта крэпасці Балімана з прапановай праз гадзіну здаць крэпасць, бо ён не можа спадзявацца, што яго пана (Караля Станіслава Радзівіла) і ўсіх прыхільнікаў спаткаў іншы лёс, чым той, які яны заслужылі як бунтаўшчыкі супроць караля і Рэчы Паспалітай.

* Гл. Nordberg. T. I, стар. 661 і 662.

Гэта мела вынік: крэпасць здалі шведам. Быў спалены ўвесь ваенны рыштунак, у тым ліку сцягі, ручная зброя і шчыты, затоплена 21 гармата*, каменданта, афіцэраў і ўвесь гарнізон адпусцілі на волю. Выгнаўшы яўрэяў і сялян, што хаваліся ў замку, і дазволіўшы ім узяць з сабой сваю маёмасць, шведы разбурылі крэпасць. Пад канец горад, за выключэннем касцёлаў і кляштараў, падпалілі і ператварылі ў попел.

Акрамя таго, кароль пасылаў атрады розных партызан, якія ўшыр і ўдоўж спусташалі ваколіцы. Было разрабавана каля ста вёсак і мястэчак, не ўцалела ні адна з вёсак, што належалі Вішнявецкім, Радзівілам і іх прыхільнікам. Гэтакім спосабам кароль хацеў так аслабіць сілы магнатаў, каб яны не змаглі выступіць супроць шведаў і караля Станіслава».

Карл XII імчаўся на кані чвалам, з незразумелай паспешнасцю займаючы і спусташаючы тутэйшыя ваколіцы. 10 мая ўзяў Нясвіж, а праз два наступныя дні тое ж самае зрабіў і са Слуцкам. 13 мая з князем Вюртэнбергскім і генералам Меерфельдам ляцеў ужо конна праз лясы, яры і балоты Палесся, а 14 мая быў аж у Пінску, у тым nec plus ultra[51] сваіх паходаў, як сам назваў гэты горад, гледзячы з вежы езуіцкага касцёла на раўніну навакольных багнаў. Але не паставіў тут яшчэ сваіх пераможных слупоў, як Геркулес, бо спяшаўся далей — на Валынь, на Украіну, дзе аж пад Палтавай пачуў фатальнае nec plus ultra.

Не хутка пасля столькіх спусташэнняў адраджаўся Нясвіж. Сярод руін і папялішчаў прымаў Караль Станіслаў Радзівіл з усёю радзівілаўскай гасціннасцю і пыхаю Аўгуста II, які наведаў яго. Радзівіл так і не дачакаўся аднаўлення горада да сваёй смерці, што наступіла ў Белай у 1719 годзе**.

Колькі гадоў пасля кіравала ўладаннямі яго жонка Ганна Радзівіл з Сангушкаў — гэта відаць з многіх эканамічных дагавораў. Каля 1720 года спадчына канчаткова перайшла да старэйшага сына Караля Станіслава, Міхала Казіміра, кіраўніка нясвіжскага маярату, больш вядомага пад імем князя Гетмана, альбо *Рыбанькі* — званага так паводле ягонай прыгаворкі. Бязлюдную пустэчу

---

* Паводле «Histoire militaire de Charles XII» Адлерфельда, шведы ўбачылі Нясвіжскі замак з чатырма вежамі, акуратнымі ўмацаваннямі і валамі. З 21 гарматы, пра што тут кажа Нордберг, 17 было бронзавых і 4 жалезныя. Паколькі замак, як чытаем у Інвентары 1658 г., падзяляўся на ўласна крэпасць і замкавую камяніцу, то шведы, разбураючы крэпасць, мусілі зруйнаваць прывулічныя муры, на месцы якіх пазней быў узведзены павільён, што зусім не стасаваўся з рэштай пабудовы, дзе сёння месціцца архіў.

** А не ў 1711 годзе, як у Нясецкага.

атрымаў ён у Нясвіжы, калі пастановай ад 26 ліпеня 1724 года, пацвярджаючы даўнейшыя прывілеі сваіх папярэднікаў, дазволіў карыстацца гарадскімі правамі ўсім, хто хацеў тут пасяліцца, з гарантыяй поўнай свабоды для ўласнага ўзвышэння.

У іншым яго прывілеі для горада — ад 1731 года — ёсць цікавы параграф пра вайсковыя вучэнні, альбо хутчэй пра гульні. Гэта стральба па шчыце, што праводзілася пад кіраўніцтвам самога князя кожны год на трэці дзень Зялёных свят і ў якой мусілі ўдзельнічаць усе без выключэння мяшчане Нясвіжа. Галоўнейшыя ўмовы яе былі такія: хто найлепей пападзе ў шчыт, таго назавуць «каралём», «узнагародзяць» аксамітным пасам з сярэбранымі пласцінкамі, з трыумфам правядуць у ратушу і запішуць у мемарыяльны пратакол. «Кароль» вызваляўся на цэлы год ад гарадскіх работ і службы і мог выгнаць без аплаты адзін вар гарэлкі і два піва; разам з тым яго абавязвалі трымаць ключы ад дома, пабудаванага за валамі і кляштарам бенедыкцінак, вартаваць яго, рамантаваць, калі трэба, і пакінуць там зробленую за свой кошт сярэбраную таблічку вагой у адзін лот з выбітымі на ёй яго імем і датай выбрання. Гэтыя вучэнні нагадваюць кракаўскага «пеўніка», яны не былі, як там, нашай традыцыяй, нашай школай, дзе гарадскі люд можа вучыцца ваяваць. Адначасова ў тутэйшай езуіцкай школе, відаць, паводле распараджэння ўладара, увялі нешта падобнае на вайсковую муштру. Але адно і другое было толькі гульнёй, толькі прычынай для наладжвання потым шчодрага банкета.

Такія вось урачыстасці, гульні, банкеты, пахвальныя прамовы і набажэнствы — характэрная асаблівасць саксонскіх часоў у Польшчы. Гэта былі такія ж спакойныя часы, як сон здарожанага вандроўніка над кратэрам вулкана. Сніліся прыгожыя рэчы!

Апрача як пра набажэнствы і рознага роду ўрачыстасці амаль нічога больш нельга сказаць пра часы Міхала Казіміра Гетмана. Былі адноўлены касцёлы; на ўзгорку за чвэрць мілі ад горада пры езуіцкім касцёле святога Міхала ўзнёсся другі езуіцкі кляштар для паслушніцтва і амаль цалкам перабудаваны сам касцёл, які ў 1738 годзе асвяціў віленскі біскуп Міхал Зяньковіч. У 1746 годзе князь Гетман наладзіў нечувана раскошнае пахаванне сваёй маткі Ганны з Сангушкаў, там прысутнічала некалькі біскупаў, колькі сот духоўнікаў і езуітаў, што прыехалі амаль з усёй літоўскай правінцыі. У 1750 годзе там, дзе радзівілаўскія грабніцы, узвялі алтар і асвячалі з гэткай жа помпаю. Пахаванне ў 1753 годзе Францішкі Уршулі Радзівіл з Вішнявецкіх, першай жонкі князя Гетмана, і асвячэнне ў 1758 годзе капліцы ў замку з уносам туды знойдзенай пад Венай іконы Багародзіцы ста-



Францішка Уршуля Радзівіл (1705—1753)

ліся для Радзівіла падставай для запрашэння шматлікіх гасцей — свецкіх сенатараў, біскупаў, духавенства і шляхты, гасцей, якіх замкавыя, кляштарныя і гарадскія муры ледзьве змаглі змясціць. А колькі было тут разліта віна, колькі прагучала ўрачыстых прамоў, вершаваных панегірыкаў, колькі пахвал атрымалі ад князя хітрыя езуіты!

Але ў той час, калі мужчынскія галовы, ачмураныя езуіцтвам, нічога лепшага ўжо не здолелі прыдумаць для прагрэсу, жанчыны, надзеленыя мацнейшым пачуццём прыгожага, пачалі скіроўваць грамадства да большай інтэ-

лектуальнасці. І смела можна сказаць, што калі б тады польскія жанчыны былі трохі болей адукаваныя і свабаднейшыя, хто ведае, ці не прыйшло б да нас так званае адраджэнне навук у Польшчы значна раней і ў формах, меней згубных для веры, звычаяў і побыту. Яшчэ да Станіслава Аўгуста, да Канарскага[52] Альжбета Друждбацкая[53] настроіла родную песню на сапраўдную ноту, выказаўшы ў лёгкіх вершыках слова праўды пра тагачасную літаратуру, да чаго не дадумаўся ніводзін з мужчын апрача Канарскага, якому нямала прычынілі клопату нягугі. Вось як піша Друждбацкая:

Я чула шмат прамоў панегірычных,
Вітанняў найузнёслейшых публічных,
Дзе што ні слова — то пыхлівасць оды,
Абагаўленне, пахвальбы куродым.
Узнёслася і ў лісты ўжо, бачым з вамі,
Скрозь сыплецца, бы збажына, карцамі.
Калі каму захочацца — як бачыш
Лашт пыхі з меркі вырасце, няйначай.
Усе мы ведаем з Пісьма святога,
Што ўзвялічваць варта толькі Бога.
Ці ж трэба нам, каб зноў мы ажыўлялі
Язычніцкіх бажкоў, што пазнікалі?
Венера, Марс... Тут помніць мы павінны,
Што кожны ідал — ёсць кавалак гліны.

Папярэдніцай Друждбацкай у пісьменніцкай прафесіі была Уршуля Радзівіл з Вішнявецкіх, аўтарка драматычных твораў, што ставіліся ў нясвіжскім тэатры і выйшлі з друку ў 1754 годзе пад назвай *«Камедыі і трагедыі, вельмі арыгінальныя, дасціпныя, напісаныя ў выдатнай вершаванай форме жонкай віленскага ваяводы Радзівіла...»* і г. д. Надрукаваў іх Якуб Побуг Фрычынскі. Ілюстраваны яны былі гравюрамі, вельмі кепска выкананымі на блясе Міхалам Жукоўскім у Львове.

Усё гэта ў большасці камедыі, перароблены з Мальера і іншых французскіх драматургаў. Хоць тут нічым асаблівым не праявіўся талент пісьменніцы, творы яе цікавыя для нас як факт у гісторыі нашай культуры: у Нясвіжы яшчэ да Друждбацкай пісалі вершаваныя п'есы для сцэны і працаваў выдатны княжацкі тэатр, дзе ставіліся спектаклі задоўга да таго, як у 1765 годзе ў так званым *«адроджаным»* тэатры ў Варшаве ўпершыню быў паказаны спектакль па п'есе Бяляўскага[54] *«Назолы»*, на якім прысутнічаў Станіслаў Аўгуст*. Зрэшты, тая набожная і аду-

* Арыгінальнай задумы ў тых п'есах не відаць, верш, аднак, часам не кепскі. Вось некаторыя з іх: трагедыя «Суддзя без розуму» — пра адзін з эпізодаў гісторыі пакутніцтва першых хрысціян, камедыі *«Празорлівыя не праходзяць міма»*, *«Каханне нараджаецца з вачэй»*, *«Гульня фартуны»*, *«Несумленнасць у пастцы»*, *«Суддзя, якому адмовілі ў розуме»*, *«Ідэальнае каханне майстрыхі»*, *«Суцяшэнне пасля турбот»*. Здаецца, яны пераpоб-

каваная па сваім часе пані дзейсна ўплывала на свайго мужа ў яго намаганнях па развіцці горада. У час прабывання ў Нясвіжскім замку яна шмат рабіла і для пашырэння адукацыі сярод насельніцтва. Пад яе кіраўніцтвам распачаўся ў тутэйшых мясцінах пэўны культурны рух: Уршуля Радзівіл многа зрабіла для памнажэння багацця сціплай дагэтуль замкавай бібліятэкі — кніжны фонд яе вырас з часам да дваццаці з лішнім тамоў. Яна падгаварыла мужа, каб ён адшукаў і загадаў аднавіць забытую замкавую друкарню, якую Аўгуст III прывілеем ад 27 жніўня 1750 года санкцыяніраваў і якая выдала дзве кнігі і некалькі брашур. У тую пару, мусіць, заахвочаны княжацкай апекай, вызначыўся як гравёр нясвіжскі яўрэй Гірш Лейбовіч, што быў вядомы сваімі рэдкімі гравюрамі на блясе, у тым ліку — «Кнігай партрэтаў Радзівілаў» з замкавага збору, гравюрай Castri doloris,[55], дзе паказаны інтэр'ер езуіцкага касцёла ў Нясвіжы — яна аздабляла кнігу надмагільных казаняў, якія прагучалі пры пахаванні мацеры князя Ганны Радзівіл з Сангушкаў (Вільня, 1750). Нарэшце, тутэйшае духавенства пачало друкаваць тады розныя аскетычныя творы, узровень іх хоць і не быў вышэйшы за іншыя тагачасныя выданні, але яны паказвалі, што тут ужо адчувалася патрэба ў культуры, кнігадрукаванні.

Назавём некалькі прац духавенства таго перыяду. Перш за ўсё палемічныя творы езуіта Яна Пашакоўскага, які жыў у Слуцку, Белай і ў Нясвіжы, дзе працаваў рэктарам,— «Кальвінская гісторыя пра пачатак, росквіт і заняпад гэтай секты ў Францыі і г. д.» (1747), «Пачатак адлучэння англіканскага касцёла» (1748), «Кальвінская гісторыя — частка трэцця, дзе расказваецца пра гэтую ерась і спосабы яе пашырэння ў Бельгіі альбо ў Нідэрландах» (1749) і г. д. Гэта кампіляцыя з розных пісьменнікаў. Яшчэ ён пераклаў з французскай «Вясковыя казані» Юзафа Лямберта (1755), выдаў *«Споведзь, альбо Вызнанне веры, складзенае з агульнага дазволу ўсіх кальвінскіх збораў і падлеглае раздрабленню, калі гэта не разыходзіцца са словам Божым і вучэннем старадаўняга касцёла»* (1742). Апрача таго, з 1737 года ён выдаваў на працягу некалькіх гадоў на польскай і лацінскай мовах *«Палітычныя календары»*, а таксама *«Езуіцкія календары»*, большыя і меншыя, з каталогамі правінцый, калегій і асоб Societatis Iesu[56], неабходных для гісторыі польскіх езуітаў*. Ксёндз Міхал Пашкевіч, нясвіжскі бернардзі-

лены з невядомых сёння французскіх п'ес ці апавяданняў. Два іншыя творы — «Трагедыя» і «Камедыя» (іншых назваў не маюць) — пераклады з Мальера: «Камедыя» — гэта вядомы мальераўскі «Доктар па неабходнасці», перакладзены дакладна і сапраўды па-майстэрску.

* Гл. Jochera «Obraz bibliograficzno-historyczny literatury i nauk w Polsce» — нумары 3089, 4552, 7897, 9319 і г. д.

нец, выпусціў зборнік сваіх велікапосных казаняў пад пацешнай назвай — *«Балесная слава, альбо Слаўныя болі (бо каралеўскія) найслаўнейшага караля Баляслава, Хрыста, прамоўленыя за пяць посных пятніц з нясвіжскага амбону»* (1744), а таксама іншыя казані пад назвай *«Festim ecce, альбо Фэст святога Бенедыкта»*, прамоўленыя ў касцёле нясвіжскіх бенедыкцінцаў*. Яшчэ адзін нясвіжскі бернардзінец Ювеналіс Харкевіч выдаў кнігу пад назвай *«Праваднік у нябесную айчыну, які трымае ў сабе статут трэцяга закона айца святога Францішка»* (1758)**. Да тутэйшай аскетычнай літаратуры трэба аднесці казань *«Вяршыня, альбо Усе дабрадзействы Маткі Боскай, паказаныя калісьці свету ксяндзом Пятром Дунгоўскім у сверханьскім абразе, а цяпер паданыя ў друк з дадаткам да другой часткі»* (у Нясвіжы ў княжацкай друкарні, 1757)***. Нарэшце, для вывучэння асветы ў Літве можа паслужыць школьная брашура нясвіжскіх езуітаў *«Што падштурхоўвае пісаць навуковыя працы»* (De incitamentic ad literarim studia)****, якая чыталася ў гадавіну адкрыцця школьнага навучання ў 1750 годзе. Гэтая кніжачка — адна з рэдкіх памятак княжацкай радзівілаўскай гімназіі. У ёй ёсць звесткі пра княжацкую публічную бібліятэку ў Нясвіжы.

Нясвіжская друкарня выдала ў той час некалькі кніг, сярод іх — «Даніна ўдзячнасці святому Казіміру, аплачаная ксяндзом Янам Корсакам рознымі пахваламі» (1751), а таксама «Курцый Руф пра жыццё і дзейнасць Аляксандра» Андрэя Варгоцкага (1763)*****.

У гэтых і іншых тагачасных помніках пісьменства тутэйшага краю, мусіць, няма адзнак высокага інтэлектуальнага жыцця, але ж відаць, прынамсі, моцная патрэба такога жыцця.

Мы ўпаміналі асвячэнне прыведзенай у парадак князем Гетманам капліцы ў замку для таго, каб змясціць там абраз прасвятой Багародзіцы, знойдзены пад Венай. Цяпер пададзім тут аповяд пра гэты абраз так, як ён запісаны на мармуровай пліце, што дасюль захоўваецца ў замку. У той жа час, калі па божай волі Вена была пры пасрэдніцтве Яна III вызвалена ў 1683 годзе ад доўгай і цяжкай асады туркаў, кашталян кракаўскі Станіслаў Ябланоўскі, аб'язджаючы горад, прыкмеціў пад руінамі муроў трубку палатна, растаптаную конскімі капытамі. Загадаў яе прынесці і убачыў абраз Багародзіцы, пачытаў напісаныя на ім словы. На адным боку значылася: Vinces Joannes (Пераможаш, Яне), а на другім —

* Там жа, № 4648 і 4993.
** Там жа, № 9268.
*** Там жа, № 9038.
**** Там жа, № 1686.
***** Гл. Bandkie «Hist. Drukarń». Т. II, стар. 18 і 19.

4—1329

Eris Viktor Joannes (Будзеш пераможцам, Яне). Здзіўлены такімі прарочымі выразамі, Ябланоўскі аднёс абраз каралю, той загадаў строганазіраць за ім. Аднак, нягледзячы на ўсе намаганні, цяжка было зразумець, хто з'яўляўся ўладальнікам абраза, якім чынам апынуўся ён пад руінамі і да якога Яна адносілася прароцтва. Расказвалі, праўда, што абраз некалі прывёз з Італіі Ян Капістран, праслаўлены перамогай над туркамі ў Венгрыі. Як бы там ні было, кароль, уражаны надпісам, дзе згадвалася яго імя, адразу памясціў абраз у сваёй абознай капліцы, а тое прароцтва падбадзёрвала яго ў бітве з мусульманамі. Пасля смерці караля 17 чэрвеня 1696 года ў Вілянове каралева Марыя Казіміра забрала абраз з сабою ў Рым. Пазней ён дастаўся каралевічу Якубу, а потым стаў уласнасцю Міхала Казіміра Радзівіла, які і памясціў яго ў капліцы Нясвіжскага замка. Біскуп жмудскі Антоні Тышкевіч у таварыстве двух іншых біскупаў пры вялікім зборы сенатараў і грамадскасці 18 чэрвеня 1758 года асвяціў капліцу пад імем прасвятой панны Марыі.

Дапоўнім нашу хроніку Нясвіжа звесткай пра ўзвядзенне ў 1758 годзе невялічкага летняга палаца пад назвай *«Суцяшэнне»* ў звярынцы Альба, што знаходзіўся на паўднёвай ускраіне горада, там, дзе яшчэ ў часы Мікалая Крыштофа стаяў іншы гмах, што называўся *«Пустэльніцтва»*. Ен быў вымураваны ў дзве лініі. Як відаць з дакладнага яго апісання ў старых інвентарах, гэта было месца, куды набожныя ўцякалі ад свету — для роздуму і духоўнага самаўдасканальвання. Па сваёй структуры будынак нагадваў нешта сярэдняе паміж капліцай і домам. На адным франтоне месцілася статуя святога Мікалая, а на другім — святога Крыштофа, у сярэдзіне пакоі былі пафарбаваны цёмнымі фарбамі, аздоблены чорнымі мармуровымі камінамі, над кожным з іх мелася нейкая эмблема: то крыж, то келіх, то Agnus Dei[57], то мёртвая галава, то што-небудзь іншае. Цяпер *«Пустэльніцтва»* згніло, ад яго не засталося ні знаку. Маленькі палац *«Суцяшэнне»* — увесь у руінах. Не ведаем нават, ці можна дапытацца ў якога дзеда ў Альбе, дзе тут знаходзіліся паравы млын і ліцейны завод, што ўпамінаюцца ў інвентарах. Ледзьве ільга адшукаць і сляды італьянскага саду, аранжарэі, выспы паміж каналамі, якія зліваліся, так званай *Каралеўскай* дарогі (ёю праязджаў у свой час Станіслаў Аўгуст) і звярынца. Нават старыя радзівілаўскія бярозы і ліпы кожны дзень спускае бязбожная сякера, не чакаючы, пакуль зваліць іх старасць.

Князь Міхал Казімір Радзівіл Гетман памёр у 1762 годзе. Пасля яго Нясвіж з маяратам перайшоў да Караля Станіслава II, Караля *Пане Каханку*, пры панаванні якога пачынаецца асобная эпоха ў гісторыі Нясвіжа.

3. ЯШЧЭ ВАЕННАЕ СПУСТАШЭННЕ. РОСКВІТ. ЗАНЯПАД. 1763—1844

Караль Радзівіл.— Кароткі нарыс яго жыцця.— Свавольствы маладосці.— Багацці.— Палітычныя выступленні і пакаранні.— Радамская і Барская канфедэрацыі.— Спусташэнне Нясвіжа.— Караль Радзівіл вяртаецца дадому.— Святкаванне ў памяць перамогі пад Венай.— Прабыванне Станіслава Аўгуста ў Нясвіжы.— Смерць князя Караля.— Слова пра князя Дамініка Радзівіла.— Сціслая хроніка новых падзей

Намерыўшыся апісаць гэтую эпоху і на яе фоне адметную постаць Караля Радзівіла, адразу прадбачу, што мы не адолеем прадмета нашага апавяду. Трэба мець немалую адвагу паказаць яго ў побыце паводле тых узораў, якія падалі ўжо граф Ржэвускі ў *«Сапліцы»* і *«Лістападзе»* і Ігнацы Ходзька ў сваім *«Зборшчыку ахвяраванняў»* і *«Сядзібах на Антокалі»*. Намаляваны пяром гэтых майстроў слова, Радзівіл як бы ажывае перад намі. Калі часам у пісьменніка не стае фактычных дэталяў з біяграфіі героя, то праўда мастацтва, адзнакі часу, мясцовыя рэаліі дапамагаюць яшчэ больш замацаваць у нашай памяці яго вобраз. Шырокі гістарычны фон, мноства паданняў і анекдотаў пра Караля, сам кантраст дзвюх эпох пры іх змене: патрыятычнай, пабожнай, актыўнай у баі і ў бяседзе езуіцка-шляхецкай са сваім галоўным героем Радзівілам — яна ўжо завяршалася, і французскай XVIII стагоддзя, легкадумнай, бязбожнай, што на цэлую галаву перавышала першую ў асвеце і на цэлае сэрца была ніжэй за яе з пункту гледжання ўзнёсласці пачуццяў. Галоўнымі дзейнымі асобамі гэтай эпохі сталі Чартарыйскія і Станіслаў Аўгуст. Сутыкненне абедзвюх эпох — выдатная тэма для мастацкага твора, але, каб напісаць яго, патрэбна рука майстра. Паколькі мы нарадзіліся запозна, то не маглі ведаць Караля Радзівіла, а бачылі яго толькі ў труне сямейнага склепа. Не давяраючы чужым характарыстыкам вялікіх гістарычных асоб, мы не хочам абапірацца на тысячы ўсялякіх пра яго анекдотаў і паданняў, бо яны так, як і песні, любяць пералятаць з эпохі ў эпоху, чапляючыся то да адной асобы, то да другой. Нам хацелася б толькі на аснове строга гістарычных звестак скласці сухі жыццяпіс Караля Радзівіла, але перашкаджае таму адсутнасць крыніц, далікатнасць матэрыялу. Эпоха Радзівілаў, Патоцкіх, Браніцкіх, Пулаўскіх найлепей распрацавана ў нашай гісторыі, але яна занадта яшчэ блізкая, так што вывучаць яе ў асобных момантах не заўсёды будзе зручна. Таму апісваючы жыццё Караля Радзівіла і

ў сувязі з ім гісторыю Нясвіжа, абмяжуемся толькі некалькімі вядомымі альбо знойдзенымі намі звесткамі.

Нарадзіўся ён каля 1720 года. Бацька яго — вядомы набожнасцю і строгасцю ў норавах Міхал Казімір, віленскі ваявода, гетман Вялікага княства Літоўскага. Маці — Францішка Уршуля з Вішнявецкіх, жанчына высокай маралі, намнога болей адукаваная за іншых тагачасных жанчын. Караль быў трэцім па ліку сынам у сям'і. Паколькі два яго браты — Мікалай Крыштоф і Януш Тадэвуш — рана памерлі, мелася надзея, што ён возьме ў спадчыну агромністыя радзівілаўскія ўладанні, якія к таму часу значна пашырыліся ў нясвіжскай лініі гэтых князёў.

Многія анекдоты, малюючы яго як гуляку, паказваюць, нібы ён з дзяцінства быў невукам, ды такім, што яго ледзьве навучылі чытанню, нібы дзеля таго стралялі ў намаляваныя на шчыце літары. Такі своеасаблівы метад навучання трэба лічыць толькі дасціпнай мастацкай выдумкай. Цяжка ўявіць, каб сын такога строгага бацькі, такой разумнай, захопленай літаратураю мацеры не атрымаў адпаведнай свайму званню адукацыі, тым больш, што ў дзяцінстве быў пад пільным вокам езуітаў з іх педантычнай дысцыплінай. Можа, для яго як князя той кніжнай навукі не ставала, але як для магната, дык нават і залішне. Характэрныя для таго часу рыцарскія вучэнні, банкеты, якія часта наладжваліся пры двары князя Гетмана, вывешаныя на сценах партрэты славутых продкаў,— вядома, гэта адбілася на выхаванні той прамой, бесцырымоннай, таварыскай і разам з тым папулярнай асобы, узнёслай любові князя да краю, што усё жыццё заставалася яго характэрнай рысай.

Яму не трэба было дабівацца высокіх званняў, бо яны самі прыходзілі ў радзівілаўскі дом. У 1739 годзе Караль Філіп Палятын Рэну зрабіў яго кавалерам ордэна святога Губерта, у 1750 годзе бачым ужо маладога Караля ротмістрам петыгорскім і суддзёй пінскім Трыбунала Літоўскага, а праз колькі гадоў ён ужо становіцца вялікім мечнікам літоўскім і чакае далейшых пасад.

Смерць мацеры і пасталенне маглі б прычыніцца да нястрыманасці ў гулянках Караля Радзівіла, але ўсё ж цяжка яшчэ прывесці факты, якія сведчылі б пра яго нястрыманае свавольства ў той час. Першай авантурай Радзівіла быў няўдалы напад на трыбунал у Мінску пасля нашумелага пакарання смерцю Валадковіча. Але гэты выпадак у сапраўднасці нагадвае, як тое падаў аўтар *«Зборшчыка ахвяраванняў»*, не столькі гайдамацкае свавольства, колькі выяўляе парыў маладога сэрца. Толькі пасля смерці бацькі ў 1762 годзе распачынаецца перыяд пагулянак маладога літоўскага магната.

Ды і як жа мог ён устрымацца ад гэтага шалу;



Караль Радзівіл — Пане Каханку.
XVIII ст.

калі меў безліч спакус, і ўсе — даступныя. Малады чалавек нейкіх трыццаці з лішнім гадоў стаў пасля бацькі віленскім ваяводам, а значыць, і найпершым у Літве сенатарам. Быў ён князем у Алыцы, Нясвіжы, Біржанах, Дубінках, Слуцку і Капылі, графам у Шыдлоўцы, Міры, Белай і Крожах, магнатам у Невелі, Себежы, Заблудаве, Койданаве і Копысі, апекуном некалькіх старостваў, словам, меў 1 300 000 талераў гадавога прыбытку. Натоўпы паслужлівай шляхецкай кліентуры акружалі багатага

саноўніка, пад камандаваннем якога было каля 6000 чалавек уланскага войска і некалькі абарончых крэпасцей. Грошы, муры і верныя плечы забяспечвалі распуснаму князю беспакаранасць ва ўсіх яго ўчынках. Што ж за дзіва, калі ў краі неабмежаваных свабод у час разлажэння ўсіх абарончых сіл ён вытварыў столькі амаральных учынкаў? Узброеная радзівілаўская плойма нападала на шляхецкія сядзібы, рабіла бясчынствы і разбой, на рэгіянальных сейміках у Вільні, Мінску і Лідзе не раз правацыраваў князь, а то і непасрэдна ўчыняў крывавыя сцэны. У актах тагачасных гарадоў не цяжка адшукаць маніфесты паноў Карэйвы, Ляговіча ці нават сваякоў і сяброў Радзівіла — Струтынскага, Пішчалы, Багушэвіча, Янкоўскага, пакрыўджаных ці замардаваных паплечнікамі князя.

Але гэтыя ганебныя факты ў жыцці Радзівіла апраўдваліся ў нейкай ступені яго грамадскім становішчам. Учыненыя ім разбоі часта дыктаваліся палітычнымі меркаваннямі — не хацелі прызнаваць яго непрыяцелі — і прычына іх замоўчвалася. Пасля смерці Аўгуста III Караль Радзівіл як прыхільнік саксонцаў падтрымліваў пры дапамозе зброі на троне караля курляндскага князя, выступаючы тут разам з Клеменсам Браніцкім і Патоцкімі. На баку Станіслава Аўгуста сталі непрыязныя да Радзівілаў роды Масальскіх і Чартарыйскіх. Яшчэ пры жыцці караля Аўгуста III Караль Радзівіл зрываў іх намеры, калі як віленскі ваявода і маршалак Трыбунала правяраў паўнамоцтвы дэпутатаў на гэты Трыбунал. У час бескаралеўства запомніўся ўсім яго авантурны напад на Вільню з мэтай дапячы Масальскім за тое, што яны схілялі дэпутатаў сеймікаў супроць яго. Уварваўшыся ў горад на чале двухсоценнага атрада, ён узяў у асаду палац біскупа Ігнацыя Масальскага. Нагадваючы яму пра лёс біскупаў, якія паплаціліся жыццём за свой удзел у палітыцы, князь заявіў: «Калі захочацца што-небудзь падобнае зрабіць яшчэ раз, ведай, што ў мяне ў запасе ёсць сто тысяч чырвоных злотых для таго, каб дабіцца ў Рыме апраўдання».

Пасля адыходу Радзівіла Масальскі загадаў біць у набат, забарыкадзіраваўся ў кафедральным саборы і ўтварыў узброены саюз супроць князя пад назвай Літоўская канфедэрацыя. Але Радзівіл сваім смелым выступленнем заваяваў прыхільнасць у літоўскай шляхты і перавагу на сейміках, падарваную непрыяцелем. Сваім дэкрэтам ад 7 мая 1764 года канфедэрацыя паклікала яго на суд. Калі ж Радзівіл не з'явіўся, ён быў аб'яўлены выганнікам з краю, а гетманам літоўскім загадвалася абяззброіць і ліквідаваць радзівілаўскае войска. У час жаніцьбы з Марыяй Любамірскай князь, вяртаючыся з вясельнага піру, спустошыў горад роду Флемінгаў Цярэспаль і

разбіў пасланае супроць яго войска. У маніфесце, пададзеным у брэсцкі гродскі суд 25 ліпеня 1764 года, ён імкнуўся апраўдаць свае дзеянні.

Гэтым апошнім учынкам Радзівіл у вачах варожай яму Літоўскай канфедэрацыі перайшоў усе межы свайго сваволыства. 16 верасня таго ж года канфедэрацыя прынятым у Гродне дэкрэтам абвінаваціла яго ў дзяржаўным злачынстве, аб'явіла ворагам айчыны і пазбавіла звання віленскага ваяводы; было загадана таксама абяззброіць княжацкія крэпасці ў Нясвіжы, Слуцку і Белай, перадаўшы зброю і гарматы ў арсенал Рэчы Паспалітай, а маёнткі — у распараджэнне ўрадавай адміністрацыі, самога ж князя вырашылі адправіць у Слуцкі замак як вязня з выплатай яму па 10 000 польскіх злотых у год, пазбавіўшы нават права апекі над малалетнім братам Геранімам Радзівілам.

За такія злачынствы, учыненыя ў выніку нястрыманасці, ніколі ў Польшчы, калі не лічыць справу Збароўскіх, так сурова не каралі магнатаў. Не цяжка тут убачыць палітычную прадузятасць абодвух бакоў.

Прыгнечаны такім выракам, Радзівіл ехаў у Варшаву на сейм. Але калі там перамаглі яго ворагі, калі кароль прускі, якому ён пісаў, просячы дапамогі, толькі і зрабіў, што параіў яму быць спакойным і стрыманым, усю надзею князь ускладаў цяпер на ўласную моц і на плечы сваёй вернай шляхты. Ён быў якраз у Белай, калі да яго дайшла вестка аб асадзе Нясвіжа Літоўскай канфедэрацыяй. З усімі сваімі сіламі Радзівіл рушыў на дапамогу. У ваколіцах Слоніма уступіў у святую бітву з расійскім войскам*, пасля чаго паспяшаўся да Нясвіжа. Камендант замка Юзаф Сабескі ўжо здаў яго ворагам. Князь кінуўся на поўдзень, каб схавацца ў родавай Алыцы. Але абараняцца там было немагчыма, хоць і хапала зброі: Алыцкі замак знаходзіўся ў стане поўнага занядбання — абваліліся муры, заплылі равы. Не рашаючыся замыкацца ў такім замку, баючыся сутычак з моцнымі сіламі праціўніка, Радзівіл пакінуў сваю пяхоту і на чале пяцісот коннікаў падаўся да турэцкай граніцы. Пад неаслабным націскам ворага ён мусіў кінуцца ў вірлівыя хвалі Днястра, пераплыў раку і, карыстаючыся звычаем гасціннасці, які свята выконваўся ў туркаў, папрасіў сховішча ў султана.

А дома ўсе яго набыткі і частка зямельных уладанняў сталі здабычай ворагаў. Вакантнае віленскае ваяводства кароль аддаў Агінскаму. Радзівілаўскія ж маёнткі падзялілі паміж сабой непрыяцелі, а прыяцелі паўцякалі

* У бітве пад Слонімам разам з Каралем Радзівілам білася яго маладая сястра Тэафілія. Сярод удзельнікаў бою вызначыўся мужнасцю малады чалавек Ігнацы Мараўскі. Ён так ачараваў сваёй адвагай рыцарскую дзяўчыну, што праз восем дзён пасля бітвы багатая княжна аддала сваю руку беднаму шляхціцу.

хто куды. Крэпасці былі заняты, срэбра перададзена ў манетны двор. Не страціўшы ў нядолі гераічнага духу, Радзівіл не думаў прыніжацца, прасіць у трона прабачэння і вырашыў не ступаць на бацькоўскую зямлю да таго часу, пакуль яму не будуць вернуты ўсе высокія званні і пасады і аплочаны страты.

І гэтай хвіліны ён такі дачакаўся. З гісторыі вядомы падзеі, якія прычыніліся да ўтварэння так званай Радамскай канфедэрацыі. Каб прыдаць ёй вагу, патрабавалася звязаць з ёй найбольш папулярнае ў краі імя. Так яе маршалкам абвясцілі Караля Радзівіла. Ён, выехаўшы з Турцыі, прабываў якраз у Саксоніі, у Дрэздзене, калі да яго дайшла ганаровая прапанова. Прапанову прыняў, але, вяртаючыся на радзіму, не мог забыць пра тое, што яго выгналі, таму, абагнуў тэрыторыю Польшчы і скіраваў да Гданьска, адкуль пад эскортам казакоў ступіў на сваю зямлю. З чэрвеня 1767 года, калі Радзівіл уязджаў у Вільню, духавенства, шляхта, магістрат і натоўпы людзей выйшлі яго сустракаць. У гонар князя званілі званы касцёлаў і салютавалі гарматы. Вярнуўшы ўсе свае пасады і званні, стаўшы маршалкам канфедэрацыі, Радзівіл выправіўся праз Беласток да Радамлі, дзе яго ўжо чакалі шматлікія землякі.

Радамская канфедэрацыя потым перанеслася ў Варшаву. Горды сваёй перамогай Радзівіл акрамя маршалка канфедэрацыі стаў і маршалкам сейма, які не толькі вярнуў яму гонар, званне віленскага ваяводы, страчаныя ўладанні, права на захоўванне ў сваім архіве папер, што тычыліся Літвы, але нават дабіўся выплаты сямі асобных сум агульнай колькасцю 7 000 000 польскіх злотых, выдаткаваных яшчэ продкамі на абарону краю, на замежныя дыпламатычныя місіі ці на грамадскія патрэбы. Для параўнання з тымі грознымі рашэннямі, якія некалькі гадоў назад абрынуліся былі на яго, прывядзём выпіскі з новай пастановы сейма: «Самы верны доказ душэўнай велічы і прыгажосці — самааддана, ахвяруючы жыццём, *субстанцыяй* служыць айчыне, чыніць людзям дабро, вялікімі дзеямі даваць прыклад нашчадкам і не шукаць ніякай за гэта ўзнагароды і нават ганаровай славы. Якраз да такіх вялікіх людзей трэба аднесці высокаадукаванага князя, маршалка генеральнай каронная канфедэрацыі і маршалка сейма Караля Радзівіла, вартага самай шчырай і вечнай хвалы і ад усёй Рэчы Паспалітай заслужанай удзячнасці... Усе яго прэтэнзіі, як уласныя, так і грамадскія, павінны быць задаволены цяперашнім сеймам. *Ніякіх іншых узнагарод, якія Рэч Паспалітая ахвотна гатова ахвяраваць, ён не просіць* і тым самым у братніх сэрцах грамадзян мацней, чым у велічных манументах, закладае лепшыя да сябе пачуцці, што даражэй за ўсё. Пра гэтую веліч і сціпласць, а значыць, пра сапраўдную любоў да

айчыны, пра гэтую высакародную і слаўную акцыю паведваючы праз векі нашчадкам для памяці і добрага прыкладу, запісвае Рэч Паспалітая ў канстытуцыі яму, адукаванаму князю, і славутаму дзеямі, маральнымі вартасцямі роду яго заслужаную падзяку».

Тое, што пераможац заўсёды лічыцца героем, а пераможаны — злачынцам, яшчэ раз вельмі добра паказаў Караль Радзівіл.

Радзівіл вымушаны быў прасіць аўдыенцыі ў караля, якога не любіў і не паважаў. Адзін французскі аўтар запісаў іх размову:

— Тая самая рука,— казаў Радзівіл,— якая надзела на тваю галаву карону і аб'явіла мяне ворагам айчыны, сёння прывяла мяне сюды — спадзяюся, што ад гэтага буду мець прыхільнасць у Вашай каралеўскай мосці.

— Род твой, князь,— адказаў Станіслаў Аўгуст,— заўсёды быў верны каралям; цябе самога бачыў асвечаным для караля, майго папярэдніка, і такіх самых пачуццяў я чакаю ад цябе.

— Былы кароль мяне не прыціскаў,— прамовіў суха Радзівіл.

— Будучы раней раўнапраўнымі грамадзянамі,— працягваў кароль,— мы былі прыяцелямі. Хачу, каб тая прыязнасць працягвалася.

— Мне хацелася б верыць у шчырасць гэтых слоў,— адказаў князь з уздыхам.

Кароль абняў яго. Пасля некалькіх хвілін маўчання Радзівіл выйшаў, не пацалаваўшы каралеўскай рукі.

Сапраўды, тое паяднанне Радзівіла з дваром было толькі знешняе і нядоўгае. Хутка змяніліся абставіны: Радамская канфедэрацыя ў наступным годзе расфарміравалася, і Радзівіл вярнуўся ў спустошаны Нясвіж, каб хутчэй арганізаваць тут мясцовую канфедэрацыю, блізкую па сваёй сутнасці да ўтворанай на Украіне Пулаўскімі Барскай канфедэрацыі, якая ўзнікла пад уплывам аўстрыйскага двара і апостальскай сталіцы. Але Нясвіж занялі расіяне, войска Радзівіла было распушчана, яго прыхільнікі разбегліся. Князь на чале невялікай жменькі свайго войска падаўся да Варшавы і, перайшоўшы неўзабаве аўстрыйскую мяжу, знайшоў сховішча ў Цешыне, дзе размяшчалася кіраўніцтва Барскай канфедэрацыі.

З гісторыі вядомы лёс гэтай канфедэрацыі: выдатныя яе поспехі, спроба пасадзіць у турму караля, уцёкі кіраўніцтва ў Цешын пад апеку Аўстрыі, дзе яму пасля адмовілі ў прабыванні, і, нарэшце, здача яго ў рукі караля. Падзеі тыя папярэднічалі першаму падзелу Польшчы ў 1772 годзе.

У нас няма падрабязных звестак пра паўторную эміграцыю Радзівіла. Вядома толькі, што ён быў у Вене, дзе меў аўдыенцыю ў двары, быў, здаецца, у Італіі, дзе здзіўляў

усіх сваёй здольнасцю прыкладацца да келіха і добрым апетытам, быў у Парыжы, дзе ў яго гонар адну брудную вулачку назвалі Радзівілаўскім пасажам. Але больш за ўсё князь прабаўляўся ў Саксоніі і Баварыі. Якраз з яго прабываннем у тых краях звязаны адзін пацешны выпадак, пра які мы і раскажам.

Баварскі кюрфюрст, ведаючы, што Радзівілы атрымалі ад імператара Карла V княжацкі тытул і тым самым ураўняны ў званні з князямі нямецкай рэспублікі, намерыўся акружыць Караля манаршай світай. Для гэтага палякам і літвінам з яго світы ён панадаваў званні камергераў і ім падобныя. Але каб атрымаць тыя званні, кожны з прэтэндэнтаў мусіў яшчэ даказаць сваё шляхецкае паходжанне, вывесці свой радавод праз многія стагоддзі як па бацькоўскай, так і па мацерынай лініях. Зрабіць гэта было немагчыма: канфедэраты толькі са зброяй у руках уцяклі за мяжу, і, вядома ж, не мелі пры сабе ніякіх родавых архіваў і не маглі атрымаць з дому патрэбных папер. Але выйсце тут прыдумаў заўсёды знаходлівы Радзівіл. Палякі пачалі даказваць сваю прыналежнасць да шляхты дакументамі, якія быццам бы прыслалі ім з дому поштай. У сапраўднасці ж пад кіраўніцтвам Караля іх падрабілі спрытныя прыдворныя. Пры дапамозе геральдыкі выводзіўся кожны шляхецкі род з глыбокай старажытнасці, яшчэ ад Ноева каўчэга, даказвалася сваяцкасць з усімі славутасцямі на зямлі. Выплывалі на свет Божы дзіўныя юрыдычныя і геральдычныя дакументы, рукапісныя хронікі. Баварскі двор прымаў за чыстую манету тыя «апокрыфы», што, кажуць, дасюль захоўваюцца ў тамашніх архівах альбо з пашанай вывешваюцца на шаўковых шнурах і сведчаць аб тым, якія штукі выкідваў Радзівіл перад немцамі.

Багацці Радзівіла забяспечвалі доўгі час як яго самога, так і бедных палякаў, знайшоўшых прытулак за мяжой. Але калі яны былі вычарпаны і з уладанняў, на якія наклалі секвестр, не маглі да князя прыходзіць прыбыткі, шляхта, што сядзела на яго землях, нягледзячы на плату — яна мусіла яе ўносіць у казну Рэчы Паспалітай — пасылала за мяжу збяднеламу каралю ўласны грош. Ці патрабуе гэта каментарыя? Ці не яскрава гэта малюе характар літоўскай шляхты і Радзівіла, што быў для яе амаль Богам?

Радзівілаўскія ўладанні сталіся аб'ектам ваенных спусташэнняў аж да 1776 года. «Вайна людзей не нараджае»,— казаў некалі Чарнецкі[58]. Вайна, можна дадаць, гарадоў не ўзбагачае, палёў не ўрабляе і не дае краіне ўмоў для дабрабыту. Лісты і рапарты каменданта нясвіжскай крэпасці, якія захаваліся ў архіве, даюць карціну спусташэнняў тутэйшых мясцін ад 1773 да 1776 года. У 1773 годзе (тады якраз былі распушчаны езуіты, чый

лёс падзяляў і нясвіжскі калегіум) горад апынуўся ў руках расіян. У замку гасціў генерал Татлебен. «Нясвіжскі замак,— піша князю 27 мая Сабескі,— пасля паведамлення няверных вашых слуг пра тое, што там павінны захоўвацца гарматы і розныя скарбы, ужо тры разы быў перакапаны...» «Скарбніца ў Нясвіжы,— піша той ж карэспандэнт у лісце ад 12 лютага 1774 года,— які пасля яго агляду нябожчыкам Татлебенам быў апячатаны, цяпер, з прыбыццём праз колькі тыдняў на пастой новага легіёна пад кіраўніцтвам каменданта князя Фабулава, пячаць ужо сарвана, таму наўрад ці трэба сумнявацца, што ў скарбніцы хоць што засталося». Услед за вайсковымі рабаўнікамі снавала тут нямала і мясцовых шукальнікаў радзівілаўскіх каштоўнасцей. Пра гэта 10 ліпеня 1774 года, калі ўжо мінуліся ваенныя трывогі, паведамляе князю той жа Сабескі: «Ключы ад скарбніцы аддадзены пану Папінему, а самі скарбніцы апячатаны панам камісарам Раманоўскім, хаця ў іх мала чаго засталося, таму што і па заканчэнні секвестра яшчэ многа было рабаўнікоў і зладзеяў... Некалькі дзесяткаў жалезных гармат, прывезеных у старыя часы са Слуцка, яшчэ дасюль ляжаць у Нясвіжы на гаўптвахце...»

Пасля першага падзелу Польшчы і аб'яўлення амністыі Барскім канфедэратам Караль Радзівіл вярнуўся, нарэшце, на радзіму, дзе былі для яго страчаны толькі вялікія ўладанні Невель і Себеж, якія разам з іншымі беларускімі землямі адышлі да Расіі. Спустошаны і надоўга пакінуты Нясвіж ізноў вітаў яго ў сваіх мурах. Ізноў адбылося прымірэнне з каралём, прымірэнне няшчырае, бо дыктавалася толькі неабходнасцю. Але Радзівіл цяпер мала паказваўся ў двары, замкнуўся ў сваім уладанні, каб панаваць над шматлікай і магутнай шляхтай. Здаволіўшыся ўсякімі прыгодамі, ён бавіўся цяпер успамінамі пра іх, не скупячыся дамалёўваць тыя прыгоды яркімі фарбамі ўласнай фантазіі. З таго часу пра яго пачалі хадзіць розныя выдумкі і пацешныя анекдоты, але іх мы не маем магчымасці тут прыводзіць. У недаступных лясах Лахвы, Леніна, Налібак і далейшых слуцкіх і нясвіжскіх уладаннях не раз наладжвалася такое шумнае паляванне, якое сваім размахам пераўзыходзіла ўсе ловы каралёў і феадальных князёў, аб чым мы толькі чыталі ў кнігах. У нас ёсць звесткі, што за мілі і дзесяткі міляў паміж спецыяльна выгараджаных платоў проста ў нясвіжскі парк гналі ўсялякую зверыну, так, як гоняць па вуліцы статак жывёлы. Дзе яшчэ можна знайсці такое своеасаблівае паляванне? Альбо такую дзікую язду Радзівіла ў карэце, запрэжанай мядзведзямі? Але памыліўся б той, хто толькі па гэтых арыгінальных забавах князя меркаваў аб яго адукаванасці і схільнасцях, бо ў нас ёсць таксама факты, якія сведчаць, што Радзівіл ведаў патрэбы краю

і рабіў шмат карыснага. Ен давёў да ўзорнага парадку сваё войска, пазней падараванае Рэчы Паспалітай. Заснаваў у Нясвіжы кадэцкую школу, вельмі прэстыжную і важную для краю, школу, дзе вялося навучанне артылерыі, маляванню, мовам, вайсковай і грамадзянскай архітэктуры. Апрача пачатковых ведаў, якія магло атрымаць тут кожнае шляхецкае дзіця, за кошт князя выхоўвалася трыццаць вучняў. Адны выхаванцы гэтай установы выдатна вызначыліся потым у літоўскім войску, другія, як Сакалоўскі і Цыбульскі, даслужыліся ў расійскім войску да генералаў*. Ушаноўваючы памяць сваёй мацеры, стваральніцы тэатра ў Нясвіжы, Радзівіл аднавіў яго і аздобіў у сваім гмаху ў горадзе, арганізаваў балет, куды ўваходзіла сорак чалавек, упарадкаваў і забяспечыў новым абсталяваннем бацькоўскую друкарню, што апрача некалькіх газетных лісткоў і брашур выдала на польскай мове *«Судовы працэс, альбо Спосаб вядзення судовай справы ў трыбуналах і ўсякіх субсэліях Вялікага княства Літоўскага»* (1781), прывёў у парадак персіярні, альбо фабрыкі вышываных залатам паясоў у Слуцку і Нясвіжы (абедзве, асабліва першая, славіліся да апошняга часу ва ўсёй Польшчы і Літве), заснаваў шкляныя гуты ў Налібаках і Урэччы, вырабы якіх яшчэ і цяпер дзе-нідзе можна ўбачыць — яны сталі прыгожымі помнікамі мінулага, закладаў і ўпрыгожваў сады ў Нясвіжы, Белай і Міры, дзе ў аранжарэях культывавалася мноства субтрапічных гатункаў раслін. Словам, тое дзікае сэрца было ў сваёй аснове добрым, шляхетным і адгукалася на ўсё прыгожае, у той дзівацкай галаве ўзнікалі нярэдка здаровыя і канструктыўныя думкі.

У часы Караля Радзівіла Нясвіж і тутэйшая яўрэйская абшчына маглі ганарыцца тым, што ўзгадавалі вялікага чалавека — вядомага Саламона Маймана, аўтара многіх філасофскіх твораў на нямецкай мове, якія зрабілі яго імя славутым у Еўропе. Многа павучальнага ў маленстве геніяльнага яўрэя, што знайшоў дарогу да навукі сярод убоства і цемнаты яўрэйства, у чыім асяроддзі вырастаў. Аўтабіяграфія Маймана** — хвалюючы і павучальны прыклад таго, чаго можа дасягнуць прыродны талент, надзелены да таго ж цярплівасцю і працавітасцю. Нарадзіўся Майман у 1754 годзе. Бацька яго быў зацяты мудрэц-талмудзіст і з усім бацькоўскім запалам навучаў сваёй мудрасці і сына. З цікавасцю сочым мы, як гэтае шасцігадовае яўрэйскае дзіця, цэлымі днямі не вылазячы з сінаго-

* Звесткі пра кадэцкую школу ў Нясвіжы мы ўзялі з папер Амброжага Вэйлы (Athenaeum, 1845), але паколькі аўтар даводзіць, што ён пісаў па памяці і толькі праз некалькі дзесяткаў гадоў пасля смерці Караля Радзівіла, мы гэтыя факты праверылі па іншых крыніцах.

** Sal. Maimons. Lebensgeschichte von ihm selbst geschrieben. Berlin, 1793.

гі, вартуе кабалістычныя кнігі, як начамі пры смольнай лучыне, хаваючыся ад бацькі, вывучае астранамічны трактат пражскага рабіна Давіда Ганса, былога таварыша па аглядных працах Ціхана Брагэ[59], як выплятае з дубцоў нябесную сферу, як на адзінаццатым годзе жыцця прызначаны адзінаверцамі годным сана рабіна, прыгнечаны беднасцю прысвячае сябе навучанню дзяцей, як, шыфруючы друкарскія нямецкія сігнатуры на яўрэйскіх кнігах, вывучае азы нямецкай мовы і пазней валодае ёю як першарадны пісьменнік, як у зімовыя маразы не адну мілю месіць снег, носячы кнігі па фізіцы, якімі яго забяспечваў суседні рабін, як, нарэшце, з такімі цяжкасцямі набытымі ведамі шчодра дзеліцца з землякамі, што слухаюць яго з недаверам і жахам як маладога апантанага ерэтыка.

Займеўшы нейкія сціплыя сродкі, Майман выправіўся з Нясвіжа ў Шчэцін і Берлін. Без граша ў кішэні, узяўшы ў дарогу толькі селядзец і некалькі сухароў, праз негасціннае Памор'е ён дабіраўся да прускай сталіцы, спадзеючыся, што там чаму-небудзь навучыцца і атрымае сталы, хай і скупы кавалак хлеба. Але калі фанатычны і цёмны тамашні рабін назваў яго сярод яўрэяў у Берліне небяспечным нававерцам, падаўся, галодны, да Познані, дзе яму ўсміхнулася ўрэшце лепшая доля. Вярнуўшыся пасля доўгіх блуканняў ізноў у Берлін, з усёй сур'ёзнасцю ўзяўся ён за вывучэнне філасофіі, медыцыны, хіміі, матэматыкі, пачаў перапісвацца з Кантам, Мендэльсонам, Бен-Давідам, Рэйнгольдам, Шульцам, з нямецкімі паэтамі Кюнам і Гётэ, наладзіў з усімі імі сяброўскія стасункі. Тут і ў Амстэрдаме напісаў каля трохсот прац па філасофіі і матэматыцы, дзе паказаў сябе як сапраўдны філосаф-мысліцель*.

Дзіўнае было жыццё ў Маймана. Ганарыліся яўрэі, што ён з іх асяроддзя. Заўсёды схільны да крайнасцей просты люд палічыў яго мудрацом, вышэйшым нават за Саламона, прарокам, пасланым з неба, і пачаў ужо біць чалом перад сціплым вучоным. Але, убачыўшы, як мудрэц усміхаўся, калі шаноўны рабін даводзіў, што згатаваная на шабаш рыба адзывалася голасам прытоенага ў ёй духа, ён ужо называў яго блюзнерам і атэістам. Вучоны свет захапляўся ім, просты люд недаацэньваў Маймана, яго ўсюды праследавала зайздрасць. Між тым Майман, які быў верны рэлігіі сваіх бацькоў, верны Польшчы, дзе ён не меў ні грамадзянскіх правоў, ні таварыскага кола, адпаведнага сваёй высокай духоўнасці, думаў, пісаў, рабіў навуковыя даследаванні і не мог за сціплы ганарар ад уласных кніг задаволіць самыя неабходныя жыццёвыя патрэбы: ён жыў у

* Важнейшыя працы Маймана: *«Даследаванні ў галіне трансцэндэнтальнай філасофіі»* (Берлін, 1790), *«Крытычныя даследаванні чалавечага духа»* (Лейпцыг, 1797), *«Аўтабіяграфія, альбо Майманіяна»*, выдадзеная яго прыяцелем Вольфам.

такой нястачы, што калі б не ласкавая апека гр. Калькрэйта, ва ўладаннях якога знайшоў сабе гасцінны прытулак, апошнія гады жыцця правёў бы ў галечы. Памёр Майман у 1800 годзе ў Сілезіі, ва ўладальні памянёнага свайго дабрачынца. Толькі са смерцю знікла зайздрасць, а Польшча, яго родны горад і ўсе яго аднаверцы пачалі ім ганарыцца. Звычайная гісторыя незвычайных людзей! Вернемся ж да прадмета нашай гаворкі.

У 1783 годзе ў Нясвіжы быў урачыста адсвяткаваны стогадовы юбілей перамогі Яна III пад Венай. Думку пра гэта падаў на святочных абходзінах у Варшаве, якія каштавалі 100 000 злотых, Станіслаў Аўгуст. Ва ўсёй краіне, ва ўсіх дамах магнатаў, беручы прыклад з Варшавы, адзначалі слаўную дату. Караль Радзівіл не даў манарху пераўзыйсці сябе ва ўрачыстасцях. Маючы ў спадчыне па Сабескіх нямала родавых памятак, ён здолеў не адной толькі пампезнасцю, але і паказам тых унікальных памятак, што засталіся ад Яна III, прыцягнуць увагу грамадскасці. Пададзім выпіскі з тагачасных газет пра згаданую ўрачыстасць у Нясвіжы*: «Святкаванне стогадовага юбілею перамогі польскага караля Яна III над туркамі ў 1683 годзе пад Венай нідзе з такой раскошай і велічнасцю (хай і найбольшым коштам) не магло быць праведзена, як у горадзе Нясвіжы. Бо ў славутую родавую скарбніцу Радзівілаў былі пакладзены для захоўвання каралеўскія багацці і дамашнія рэчы вялікага Сабескага. Вельмі каштоўныя самі па сабе як дарагія металы і ювелірныя вырабы, яны, аднак, мелі непараўнальна большую вартасць ад таго, што служылі гэтаму вялікаму герою свайго часу. Адныімі прадметамі ён валодаў, займаючы высокія пасады ў Рэчы Паспалітай, удзельнічаючы ў войнах, другія адбіраў пераможнай рукой у ганарлівых атаманскіх праваўыроў, іншыя — з удзячнасцю атрымліваў у падарунак ад хрысціянскіх манархаў (як вядомы абаронца хрысціянства). Тыя дарагія сямейныя рэчы да цяперашняга часу цалкам захаваліся ў радзівілаўскім доме, адзіныя ў сваім родзе, ім няма цаны. Па загаду Караля Радзівіла, віленскага ваяводы, яны з памянёнай скарбніцы былі перанесены таго ж дня для публічнага паказу ў велічную нясвіжскую езуіцкую базыліку і раскладзены густоўна на троне пад аксамітным балдахінам, дастойна ўшаноўваючы вялікага караля. Ляжалі рэчы ў такім парадку: 1. Арыгінальны партрэт караля Яна. 2. Пад партрэтам — французскі ордэн Святога Духа. 3. Шчыт, ці герб Яна з Сабескіх. 4. Два маршалкоўскія жэзлы караля Яна. 5. Шаблі — з правага боку караля Сабескага, а з левага — Жалкеўскага. 6. Дзве булавы караля Сабескага. 7. Яго ж дзве паліцы. 8. Два бунчукі, адзін — караля Яна, другі — турэцкі,

* «Gazeta Warszawska», 1783, 22 кастрычніка, № 85.

узяты пад Венай. 9. Два турэцкія мушкеты. 10. Дзве пары пісталетаў караля Сабескага. 11. Два булаты таго ж караля. 12. Бубен караля Яна, што быў у яго пры сядле — каб у час баявых сутычак клікаць да сябе ад'ютантаў. 13. Шчыт караля Яна, аздоблены перламі. 14. Сагайдак і лук турэцкі. 15. Турэцкая харугва. 16. Яшчэ сагайдак і лук турэцкі. 17. Яшчэ турэцкая харугва. 18. Кайстра караля Яна для вады, што знаходзілася пры сядле ў час баявых сутычак. 19. Плашч французскага ордэна Святога Духа з чорнага аксаміту, абшытага золатам,— яго прыслаў каралю Яну французскі кароль Людовік XIV. 20. Капялюш, аздоблены перламі,— ён быў разам з памянёным ордэнскім плашчом падараваны каралю Яну тым жа французскім каралём. 21. Шышак і зброя Жалкеўскага. 22. Меч, прысланы каралю Яну папам Інакенціям XI, з залатымі рукаяццю і похвай, з папскім гербам і інш. Акрамя таго, на дванаццаці добрых конях, якіх трымалі на дзядзінцы перад касцёлам, паказвалася багатая збруя, дыўдыкі і іншыя рэчы, аздобленыя золатам, дыяментамі, перламі, рубінамі, смарагдамі і іншымі дарагімі камянямі, забраныя пад Венай каралём Янам у абозе вялікага візіра.

Апрача такой колькасці гістарычных каштоўнасцей заставалася яшчэ ў нясвіжскай скарбніцы, пэўна, мноства іншых розных багатых рэчаў, нягледзячы на рабункі і ліхую долю горада і яго гаспадара. «Хто ж высушыць мора?» — усклікаў, маючы на ўвазе радзівілаўскія скарбы, прыдворны нясвіжскі паэт Юзаф Ляснёўскі ў сваім вершы пад назвай: *«Радасць айчыны, што мае такога ўлюбёнага ў яе сына, як князь Караль Радзівіл, віленскі ваявода»*. З заўваг аўтара да гэтага верша возьмем некалькі звестак пра багацці Нясвіжскага замка, тым больш, што ў творы, які быў прысвечаны Радзівілу і друкаваўся, не магло быць фальшу і перабольшання, як тое бачым у бытуючых вусных паданнях. «Дванаццаць апосталаў,— піша наіўны прыдворны падхалім Ляснёўскі,— і чатыры евангелісты велічынёй у два локці — гэта золата ў радзівілаўскай скарбніцы; сапраўды, тых святых апосталаў і евангелістаў можна назваць дамашнімі бажкамі, бо яны не павінны дапусціць ніякіх няшчасцяў у доме Радзівілаў... Дванаццаць вялікіх касцельных ліхтароў, мядніца, налівачка, каштоўныя келіхі, патыны, кадзільніцы, ампулы — усё з найлепшага золата; рэчы большай часткай — адлітыя, як, напрыклад ліхтары, часткова — выкаваныя. Гэты бясцэнны скарб для таго толькі і зроблены ў форме касцельных рэчаў, каб быў заўсёды цэлым, някранутым, каб бараніў ад вялікіх няшчасцяў Рэч Паспалітую і радзівілаўскі дом: пры выпадку святыя апосталы не пашкадавалі б сваёй міласэрнасці нябеснай...» «Бачыў я ў Нясвіжы,— кажа ў іншым каментарыі Ляснёўскі,— вялікі круглы стол асоб на дванаццаць, не меней — мала таго, што сам стол

быў срэбны, але нават яго ножкі і падножкі выкаваны са срэбра так, як некалі з жалеза, па-старасвецку. Святыя апосталы і евангелісты часта сустракаюцца каля стала і радзяцца, што рабіць, каб магутны радзівілаўскі дом мог заўсёды з адпаведнай велічы гаспадара раскошай прымаць каралёў, даваць банкеты, карміць тысячы людзей, забяспечваць бедныя шпіталі і сірот, памагаць збяднелай шляхце, клапаціцца, каб і яе дзеці мелі добрае і прыстойнае жыццё, прыбліжаць іх да свайго двара. Такія парады даюць святыя апосталы і евангелісты каля гэтага срэбнага стала, імкнучыся да таго, каб на ім Радзівілы ў пазнейшыя вякі лічылі мільёны талераў».

У тым жа 1783 годзе ізноў можна было ўбачыць раскошу і пыху Радзівілаў — тады святкаваліся ўгодкі князевага брата — Іераніма Радзівіла, літоўскага падкаморага. Паводле тагачасных апублікаваных твораў, прыдадзім тое святкаванне — яно вельмі добра паказвае багацці і карціну забаў Караля Радзівіла*: «Раніцай, пасля сотага стрэлу з гармат, князь віленскі ваявода, абвясціўшы князю, свайму брату, віншаванне, выехаў у Залучу на сустрэчу са сваім шваграм панам Мараўскім, маршалкам Трыбунала Вялікага княства Літоўскага, якога, падаўшы ў карэце правую руку, прывёў той жа раніцай пад салюты з гармат у свой Нясвіжскі замак. Каля полудня князь, выслухаўшы ад шматлікіх гасцей віншаванні, накіраваўся да парафіяльнага езуіцкага касцёла. Перад ім скакаў эскадрон кавалерыі, потым вывелі дванаццаць дзівосных адборных коней для язды верхам у рыцарскай экіпіроўцы, аздобленай рубінамі, перламі, смарагдамі і іншымі дарагімі камянямі, пры кожным кані былі па два прыданыя ім конюхі, за верхавымі коньмі рухалася дванаццаць парадных карэт, кожная з якіх была запрэжана ў шасцёрку коней з сярэбранай і залацістай шорнай вупражжу і з прыданымі да кожнай карэты лёкаямі. Далей выстраілася пяцьдзесят карэт для гасцей. Калі князь падкаморы пад'ехаў з усёй кампаніяй да касцёла, яго павіталі ад ксяндза Катэбрынга, тутэйшага пробашча, каноніка смаленскага. Пасля гэтага пачалася імша і *Te Deum Laudamus*[60] пры стральбе з гармат і з ручных стрэльбаў. Калі вярнуліся з парада ў замак, гасцям падалі багаты абед на двух сталах, адзін з якіх прызначаўся на сто, а другі — на шэсцьдзесят асоб. Там пілі за здароўе імянінніка пад гарматныя стрэлы. Вечарам была паказана опера, потым адбылася вячэра і, нарэшце, пачаўся баль, што цягнуўся аж да 3 гадзін раніцы».

Але найлепш могуць характарызаваць Радзівілаў урачыстасці з нагоды памятнага наведвання Нясвіжа ў 1785 годзе Станіславам Аўгустам, які ехаў на сейм у Гродна.

* Гл. Дадатак да «Gazety Warszawskiej», 1783, № 85.

Гэтае гасціванне — яно павінна было ўвянчаць уяўную згоду Караля Радзівіла з тронам і каштавала больш 1 000 000 польскіх злотых — занатавана ўдзельнікам урачыстасцей Нарушэвічам*[61] (мусіць, ён суправаджаў караля), а таксама Амброжымам Вэйлам**. Там цікаўны чытач знойдзе падрабязнае апісанне тых баляў, феерверкаў, насыпаных пасярод возера гор, што імітавалі ці то Гібралтар, ці то вывяржэнне Везувія; там можна знайсці і аповяд пра дзіўныя ловы у звярынцы Альба, куды, як ужо гаварылася, гналі з палескіх лясоў цэлыя чароды мядзведзяў, лісаў і ваўкоў,— ловы гэтыя, праўда, маглі б у поўнай меры задаволіць больш рыцарскага караля, чым Станіслаў Аўгуст; з тых апісанняў можна скласці ўяўленне і пра багаты радзівілаўскі тэатр, і пра былую езуіцкую школу, якая працвітала пад апекай Радзівіла, знясла́ўленага перад нашчадкамі як невук.

Купаючыся ў раскошы, акружаны ўсімі самымі вядомымі ў Польшчы славутасцямі кансерватыўнага крыла і шматлікай, адоранай яго дабрадзействамі шляхтай, у вясёлым таварыстве Бароўскіх, Касакоўскага, сярод сваёй сям'і, на чале вялікай колькасці слуг і прыдворнай міліцыі, адпраўляючы малітвы, забаўляючыся паляваннем, спраўляючы банкеты, цараваў у Нясвіжы Кароль Радзівіл. Палітычнае жыццё яго ўжо закончылася. Ён бачыў, што не можа ўплываць на падзеі ці ўхіляцца ад іх, і добра разумеў, што нічога яму не застаецца, як толькі аказваць дабрачыннасць людзям, сярод якіх жыў. Апошнія гады жыцця Радзівіла называюць яго лянівай дрымотай. Гэта мела сваю прычыну. І разумнейшыя галовы, і больш магутныя постаці падалі ў няроўных бітвах, дык ці ж дзіва, што Радзівіл, змучаны частымі палітычнымі няўдачамі і трохразовым выгнаннем, на схіле дзён сваіх не захацеў прымаць удзел ў астатнім акце гістарычнай драмы Польшчы? Не дзіва таксама, што ў асяроддзі падуладнай сабе шумнай шляхты, у бяседах і на паляванні прыходзілі яму ў галаву пацешныя дзівацтвы, у якіх адны бачылі геніяльнасць, другія — праявы варварства. Мы не бачым у яго ні таго, ні другога, а аддаючы належнае лепшым памкненням яго першапачатковай грамадскай дзейнасці, без асаблівага здзіўлення слухаем усялякія неверагодныя байкі, што ён выдумляў у добрым настроі.

У 1787 годзе памёр Іеранім Радзівіл, малодшы, любімы брат Караля. Паданне правільна распавядала пра багатае пахаванне, наладжанае Каралем разам за пахаваннем сваёй мачыхі. Колішняя езуіцкая святыня была абабіта кармазынавым аксамітам, якога, як расказваюць, пайшло

* Гл. Raczyńskiego «Pamiętniki o dawnej Polsce».
** Гл. Athenaeum, 1845. T. VI.

на гэта 2000 локцяў. На пахаванне прыехалі ў Нясвіж запрошаныя Радзівілам папскі нунцый Салюзза і біскупы — віленскі Ігнацы Масальскі, смаленскі Габр. Вадзінскі і траадэнскі Мікалай Быкоўскі. Тады ў апошні раз усе ўбачылі старую радзівілаўскую зброю у варты, што стаяла пры ўваходзе ў касцёл і каля трун. Пасля пахавання, развітваючыся з гасцямі, Радзівіл сказаў: *«Я пахаваў таго, хто мяне пахаваць бы павінен — ніхто мяне не пахавае».*

Гэта былі прарочыя словы. Праз некалькі гадоў, у 1790 годзе, страціўшы зрок, Караль Радзівіл памёр у Белай. Цела яго перавезлі ў Нясвіж і паставілі ў касцельчыку ў прадмесці Новы горад. Але хваляванні, што ўзніклі якраз у краі, не далі часу апекунам яго багаццяў і малалетняга пляменніка Дамініка Радзівіла на пахаванне, таму абходзіны адбыліся толькі праз некалькі дзесяткаў гадоў.

Мы прасачылі важнейшыя моманты жыцця слыннай у свой час постаці, апошняга, як нехта сказаў, з еўрапейскіх паноў, чыё імя праславілася ў гісторыі апошніх стагоддзяў і хто сілай сваёй прыраўніваўся не да аднаго з тагачасных дзяржаўных уладароў. Успаўленае тое імя надоўга яшчэ было аб'ектам успамінаў, захаплення, насмешак, ухвалы, легенд і спрэчак, бо таксама выразна адзначылася на карце гісторыі і ў людской памяці.

Каб хутчэй скончыць нашу хроніку Нясвіжа, зробім толькі кароткі нарыс яго гісторыі апошняй паловы стагоддзя.

Адразу пасля смерці Караля Радзівіла Нясвіж ізноў і ўжо канчаткова занялі расіяне. Малалетні нашчадак князя, спешчанае дзіця, выхоўваць якое не ўзяўся паэт Фр. Карпінскі[62], заставаўся пад апекай сваіх крэўных, пакуль не завалодаў набыткамі прадзедаў. Пляменнік і наступнік Караля Радзівіла ўзяў у спадчыну таксама і яго адкрытае ўсім людзям сэрца, і яго схільнасць да раскошы, жаданне быць аб'ектам захаплення, раскідваць направа і налева грошы, паказваючы тым самым, што радзівілаўская скарбніца — невычэрпная. Але часы ўжо змяніліся: польскі магнат не мог цяпер у такім шырокім маштабе выстаўляць сваю пыху і раскошу. Мода і звычаі часу, а таксама строгія айчынныя законы абумовілі фантастычныя выбрыкі багатага дзецюка. Зрэшты, Дамінік Радзівіл, не шкадуючы на шык свае нязмерныя багацці, гэтак жа, як і дзядзька, шчодра надзяляў бліжніх, ажывіў грамадскім рухам муры свайго замка і горада, так што Нясвіж у яго часы развіваўся і квітнеў, займеўшы назву малой Варшавы. Пасярод рынка ўзнесліся мураваныя і добра забяспечаныя неабходнымі прыстасаваннямі купецкія крамы. Тут пасялілася многа выдатных рамеснікаў. У палацы аднавіўся тэатр. У другім княжацкім гмаху, які называўся

Абержай (сёння стаіць у руінах), месціліся гандлёвыя ўстановы, рэстаран і пошта. Былая езуіцкая гімназія адышла дамініканцам, для яе забеспячэння Дамінік Радзівіл аддаў вёску Скарбін. Нават вольнамулярскае таварыства мела тут, у спустошаных цяпер мурах дома Мікуця, былога сакратара князя Караля, сваю ложу.

Росквіт горада перапынілі падзеі 1812 года. З гісторыі вядомы ваенныя сутычкі ў гэтым краі, у выніку якіх Нясвіжскі замак быў спустошаны і разрабаваны і такім чынам страціў значэнне абарончай крэпасці. Дамінік Радзівіл, заражаны рыцарскім духам сваіх продкаў, сфарміраваў кавалерыйскі полк і падаўся на чале яго пад штандары Напалеона, чыя зорка славы ўжо згасала. Атрымаўшы кантузію, 11 лістапада 1813 года ён памёр у Францыі ў горадзе Ляўтэрэцке, пакінуўшы пасля сябе сваю адзіную дачку. На ім абарвалася лінія нясвіжскіх ардынатаў, якая цягнулася без перарыву ад Мікалая Крыштофа каля 230 гадоў: Нясвіж перастаў быць месцам жыхарства сваіх паноў, што ўладарылі тут каля трох стагоддзяў.

Указам бласлаўлёнай памяці цара Аляксандра ад 24 лютага 1814 года нясвіжская ардынацыя перайшла князю Антонію Радзівілу, познаньскаму ўладару. Малалетнюю дачку Дамініка Радзівіла княжну Стэфанію (потым выйшла замуж за князя Людвіка Вітгенштэйна) аддалі пад апеку князя Адама Чартарыйскага, Тамаша Ваўжэцкага, а таксама князькоў Валента і Канстанціна Радзівілаў. Для размежавання земляў ардынацкіх ад уласна памешчыцкіх, а таксама для ўрэгулявання агромністых, але абцяжараных даўгамі радзівілаўскіх уладанняў была створана камісія, якая працавала ў Вільні аж да 1838 года ўключна. Гэта яшчэ занадта свежыя падзеі, каб мы маглі падрабязна пра іх расказваць.

Нясвіж у той час, паступова страчваючы сваё насельніцтва і заможнасць, прыходзіў у заняпад. Ён быў даведзены да руін, у якіх па сённяшні дзень бачым яго.

У 1835 годзе тут ліквідавалі павятовую школу, што трымалі дамініканцы на руінах гімназій — езуіцкай, пасляезуіцкай і дамініканскай, а два пажары — адзін у ліпені 1836, другі ў жніўні 1843 года — давялі да канчатковага ўпадку славуты некалі горад. Галоўнае кіраўніцтва уладаннямі князя Вітгенштэйна за некалькі гадоў свайго існавання надало Нясвіжу хоць нейкі рух і жыццё. Але ў 1844 годзе кіраўніцтва перабралася ў Вільню, і Нясвіж — ён зрабіўся амаль пусткай — меў ажыўленне толькі ад таго, што тут скрыжоўвалася некалькі трактаў, якія злучалі захад і поўдзень краю з яго паўночнымі і ўсходнімі бакамі.

Сёння Нясвіж налічвае 4 230 жыхароў абодвух полаў, звыш 300 дамоў, у іх ліку дваццаць мураванак, пяць

касцёлаў, тры мужчынскія і адзін жаночы кляштар, адна мураваная і колькі драўляных яўрэйскіх бажніц. Хрысціянскае насельніцтва займаецца выключна земляробствам, яўрэйскае, як усюды, дробным гандлем, продажам спіртнога пітва, пасрэдніцтвам, рамёствамі — словам, усім і нічым. Дзейнічае тут яшчэ магдэбургскае права і цэхавыя статуты, напамінаючы пра залаты час — зрэшты, усё шчаслівa плеснявее пачцівай гістарычнай плесенню.

Жыццё горада, як жыццё чалавека, адыграўшы сваю ролю, мусіць дайсці да сваёй мяжы, каб уступіць месца новаму часу, новым людзям, гарадам і новаму іх прызначэнню на зямлі. Застаецца, нібы цьмяны сон, толькі ўспамін, які і праходзіць, як сон!

VI

УСПАМІНЫ

Шэраг асабістых успамінаў.— Праграма далейшай вандроўкі.



Пра свой боль памаўчы і забудзь аб журбе,
Каб не знаў непрыяцель, што кепска табе.

Я. Кахановскі. ПЕСНІ I. XXIII.


Калі б мы ў гэтай кніжцы не адмовіліся даваць месца асабістым, магчыма, мала цікавым для грамадскасці ўспамінам, тут, у Нясвіжы і ў яго ваколіцах, можна было б вельмі многа чаго распавядаць. Вярнуўшыся ў думках гадоў у дваццаць назад, павадзіў бы я цябе, чытач, па калідорах тутэйшага дамініканскага кляштара, дзе я пачынаў сваю вучобу, паказаў бы кожныя дзверы манаскіх келляў, прыгадаў бы, дзе які месціўся клас, і расказаў бы пра мае поспехі і няўдачы ў кожным з тых класаў. Успамінаючы аблічы сваіх таварышаў па школьнай лаве, якіх Бог ведае дзе параскідалі жыццёвыя буры, і шаноўныя, незабыўныя для мяне твары дарагіх настаўнікаў, я мог бы бясконца малюваць іх вобразы. І я, паважаныя мае настаўнікі, свяшчэннікі, бескарысна адданыя выхаванню маладога пакалення, Абдоне Рагальскі, Сымоне Чарніцкі, Якубе Шкілёньдзь, а перш за ўсё дарагі мой прафесар нямецкай мовы Тадэвуш Сікорскі, яшчэ раз хачу падзякаваць вам за ўсё і сказаць, што я заўсёды буду ў даўгу перад вамі. Углыбляючыся ва ўспаміны, я вярнуўся б у мае пазнейшыя гады і даў бы чытачу ўяўленне пра маю прафесію перапісчыка-канцылярыста, намаляваў бы вобразы маіх начальнікаў і калег, сваю пашану і прыязнасць да каго я хацеў бы выказаць і сёння. Але тут мяне стрымлівае пачуццё далікатнасці і боязь таго, што чытачу ў гэтых месцах можа прыйсці ахвота не зусім дарэчы пазяхнуць, а нам — заплакаць. Так, так — заплакаць. Вялікі паэт сказаў, што калі б той камень, з якім гуляе чалавек у дзіцячым узросце, пакласці праз многа гадоў яму ў труну пад галаву, ён, камень, мог бы пусціць слязу над чалавечай доляй. Мясціны, дзе я рос! Сведкі прыгожых мар, сведкі звычайнай, нуднай, прыкрай, цяжкай рэчаіснасці! І вы, добрыя людзі, сярод якіх пражыў я столькі вёсен, столькі летаў і восеней! Няўжо ж не захавалі вы ніякага пра нас успаміну, ніякага да нас спачування? Але нашто тыя ўспаміны і спачуванні? Занадта мы гордыя, каб прасіць аб шкадаванні, і радыя, што пачынаюць зацягвацца пакутлівыя душэўныя раны, нам не хацелася б ізноў вярэдзіць іх успамінамі, прыгадваць, што калісьці былі мы шчаслівыя — тое шчасце, як добра паказала пазнейшае жыццё, было адзінае ў нашай тагачаснай слепаце, у залішне лёгкай веры, у залішне паэтычнай надзеі, у залішне маладым каханні, словам, у абмане. Люба прыгадваць мінулыя гады, калі ў цэлым яны ўдачлівыя, але калі, азірнуўшыся на пражытае, чалавек бачыць адны толькі бязвінныя, смешныя і нязбытныя мары — для чаго ж аднаўляць іх у душы? Нехта скажа: «Для навукі на будучае!» О, добрая для мяне навука, ад якой ідзе няверʼе і магільны холад, здольны на ўсё астатняе жыццё смяртэльна замарозіць душу і адгарадзіць яе ад усіх пачуццяў. Але пакінем ў спакоі асабістыя ўспаміны.

Цяпер чарга наведаць Свержань, Стоўбцы, Койданава. Тут я змагу паказаць вам колькі святынь, апісаць колькі гістарычных падзей. Па дарозе заглянем дзе-небудзь пад гасцінную страху якога невялічкага маёнтка, дзе будзем упэўнены ў ласкавым прыёме. А калі чалавек міжволі сыйдзе на дарогу асабістых успамінаў, то хай ласкавы чытач даруе за гэта. Нарэшце, успомніўшы, што абяцаў вам падаць тут і даследаванне пра наш люд, я мяркую ў адным месцы намаляваць воблік тутэйшых вёсак і тутэйшага люду.

VII

ДАРОГА ДА СВЕРЖНЯ

Палі.— Звярок, што завецца суслік.— Мястэчка Гавязна.— Характарыстыка зямлі і людзей.— Свержань.— Яго спадчыннікі.— Касцёл.— Слова пра сплаў і гандаль збожжам па Нёмане да Круляўца.



Высокія горы, ў абнове лясы,
Любуюся вамі й былыя часы
Свае ўспамінаю...

Я. Каханоўскі. «ФРАШКІ»

Р обычы неверагодны зігзаг, кіруем з Нясвіжа ізноў на поўнач, ізноў да Нёмана. Едзем у напрамку Мінска і першай нашай перадышкай будзе прынёманскае мястэчка Свержань.

Я не разгарну перад вашымі вачамі панарамы незвычайнай прыгажосці краявідаў — гэты бок Літвы не багаты на раскошныя карціны прыроды. Аднак вока падарожніка не стамляецца аднастайнасцю раўнін, узгоркаў і лясоў, бо кожны з пейзажаў мае сваю сціплую, някідкую красу, якую, думаю, можна параўнаць хіба што з красою літоўскай дзяўчыны. Не знойдзеш у яе ні залішне правільных контураў, тае эфектнай прыгажосці — убачыш толькі ў абліччы адкрытасць і мілую прастату, стрыманую ўсмешку на ім, нейкую ціхую гуллівасць, нейкую пяшчоту. Што ж такога, што яна не распальвае жаданняў, не растрывожвае сэрца, а толькі разлівае гаючы бальзам для душы. Спачатку яна будзе проста падабацца, але потым да яе разгарыцца сапраўднае каханне. Пакуль мы разбярэмся ў сваіх пачуццях, яна ўжо завалодае нашым сэрцам. Такая Літва, такія і яе дочкі.

Але не будзем развіваць далікатныя і небяспечныя параўнанні, бо воз ужо гатовы ў дарогу, частка якой у нас за плячыма.

Тым жа самым прадмесцем *Казімер*, кудой мы ўехалі ў горад, выязджаем цяпер з Нясвіжа. Налева, г. зн. на захад, ідзе дарога на Мір, направа, амаль строга ў паўночным напрамку, выбягае паштовы тракт на Свержань. Туды мы і кіруем. Мінаем сляды даўніх валоў і праз колькі часу, азірнуўшыся назад, ужо не бачым касцельных вежаў — іх засланілі сабой крайнія дамы пабудаванага ў нізіне Нясвіжа. Здалёку ўзвышаецца над старым радзівілаўскім горадам толькі разбураны Свята-Міхальскі касцёл на гары.

Перад намі колькі вёрст сцелецца па раўніне прамая, абсаджаная высокімі бярозамі дарога. Па абодва бакі яе багатая расліннасць: густыя шыракалістыя лясы, выдатная збажына ў полі — як-ніяк Нясвіж з ваколіцамі нале-

жыць яшчэ да Случчыны, што славіцца сваімі ўраджаямі на раўніннай зямлі, вядомай чарназёмамі і глінай.

Аднак плён тутэйшых палёў бывае здабычай своеасаблівага непрыяцеля. Гэты малы, попельнага колеру з белымі крапінкамі звярок завецца *суслік* (Arctomis citellus), з роду пацукоў — велічынёй з пацука; водзіцца тут у нечуванай колькасці. Неўзабаве пачне спець збажына, і чароды суслікаў, узброеных чатырма вострымі зубкамі, будуць нападаць на каласы, падгрызаць іх і цягаць у свае глыбокія вертыкальныя норы — назапашваць на зіму. А паколькі на адным моргзе жыве зерняедных шкоднікаў да дзесяткаў сямей і кожная сям'я вельмі хутка размнажаецца, не дзіва, што часам яны спусташаюць цэлыя маргі, таму людзі мусяць іх кідаць. Вывесці гэтых шкоднікаў зусім немагчыма, бо свае норы суслік капае глыбока, іх нельга дастаць плугам, а атруціць сябе ён таксама не даецца, бо для яго не знойдзеш лепшай прынады, чым зерне, якога ў полі колькі хочаш. Паколькі раскапваць норы вельмі цяжка, па патрабаванні ўрада часам праводзіцца паўсюдны адначасовы наступ на сусліка пры дапамозе вады. Такі спосаб, дзякуючы вертыкальнасці нор суслікаў, вельмі эфектыўны: пакуль звярок з затопленага гнязда выплыве наверх, у нары будзе ўжо не адно вядро вады. Суслік у Расіі і ў іншых краінах вельмі распаўсюджаны, на Літве ён вядомы толькі ў ваколіцах Нясвіжа. Паданне расказвае, нібы нехта з Радзівілаў (Сіротка ці Караль), упадабаўшы недзе за мяжой гэтага гожага звярка, прывёз пару суслікаў у Нясвіж. Уцёкшы з замка, яны пачалі размнажацца ў навакольных палях, і праз нейкі час іх стала там, як зорак на небе. Сёння за некалькі міляў адсюль ужо можна сустрэць калоніі суслікаў, але галоўная іх сталіца — прылеглыя да Нясвіжа палі.

Праз шэсць вёрст краявід мяняецца: адкрытыя дагэтуль палі ўступаюць месца лясам, якія некалькі вёрст цягнуцца злева — сярод іх на тракце на радасць падарожнікам сустракаюцца дзве ці тры непрыглядныя карчмы. У тых драўляных, цёмных і брудных прытулках вандроўнік можа дапытацца толькі трох прадметаў: гарэлкі, гарэлкі і гарэлкі. Авёс і сена для коней адносяцца тут да прадметаў раскошы, пра ежу для падарожных, пра асобны пакойчык для начлегу і пытацца не трэба.

Яшчэ праз чатырнаццаць вёрст сярод ураджайных раўнінных палёў ляжыць мястэчка Гавязна з прыгожай мураванай царквою, з прасторнай драўлянай карчмой, з панскім маёнткам непадалёку і з некалькімі падуладнымі яму вёскамі. Гэта адна са старэйшых тут асад. У 1588 годзе Мікалай Крыштоф Радзівіл набыў яе ў слуцкага князя Яна Алелькавіча, а ў 1590 годзе перадаў з усімі сваімі навакольнымі вёскамі кляштару нясвіжскіх бенедыкцінак, якія заснавалі тут раскошную уніяцкую царкву. Помняцца

яе старыя непабеленыя гатычныя муры. Вельмі шкада, што сёння, белячы будынак і аздабляючы яго блішчастымі купаламі, сціраюць і характэрныя асаблівасці далёкага мінулага.

За Гавязнай яшчэ колькі вёрст цягнуцца раўнінныя ураджайныя палі, але потым, недзе за вёрст дваццаць ад Нясвіжа, характар ландшафту мяняецца: раўніна пачынае горбіцца ўзгоркамі, чарназёмы і гліністая глеба паступова ўступаюць месца пясчаным глебам. З левага боку некалькі вабных для вока сядзіб, з якімі звязана ў нас многа асабістых хвалюючых успамінаў, але яны наўрад ці зацікавяць абыякавага чытача. Цяпер перад намі ўжо краявід, характэрны для наднёманскіх ваколіц. Пяць вёрст ад Свержня такія невыносныя для падарожніка, што ён звычайна зварочвае з паштовага гасцінца, хараша аздобленага шнурам прыгожых рослых бяроз, і едзе ўзбоч, дзе хоць пяскі і не меншыя, але не столькі прыкрых выбоін.

Уся гэтая мясцовасць, за выключэннем Гавязны, нягледзячы на ўраджайнасць глебы, засялялася надзвычай позна. Да XVI стагоддзя тут былі толькі дробныя ўладанні шляхты, якія набываў і далучаў да сваіх уладанняў Мікалай Крыштоф Радзівіл. І амаль усе тутэйшыя двары і вёскі ўзніклі не раней азначанага часу, а назвы іх паходзяць ад прозвішчаў уладальнікаў. Вось тыя двары і вёскі, пачынаючы ад Нясвіжа: фальварак *Ферберкаў*, які атрымаў назву ад Каспара Фальберга (перайшоў да Радзівілаў у 1675 годзе), *Грэшнаўшчына* — ад Андрэя Грэшнага (была набыта ў 1565 годзе), вёска *Ахрамовічы* каля Гавязны — яе Мікалай Крыштоф набыў у Абрама Мікітавіча Ахрамовіча, і г. д. Добра, што такім чынам захаваліся прозвішчы шляхты, якая першапачаткова валодала тымі землямі, але ўсё ж шкода — сцерліся даўнейшыя назвы мясцін: якіх-небудзь Акопішчаў, Гарадзішчаў, Замчышчаў і іншых падобных помнікаў старажытнай Славяншчыны, калі, канешне, яны даўней былі.

Па некалькіх вёсках на гэтай дарозе, па знешнім выглядзе сустрэчных сялян можна ўбачыць, як адрозніваюцца тут умовы жыцця ад тых, што мы бачылі болей чым за тры мілі адсюль. Селянін пад Нясвіжам, як і на ўсёй Случчыне, заможны, выключна аддадзены працы на сваёй ураджайнай зямлі, дамасед, далей царквы і гандлёвага мястэчка нідзе не бывае, а таму ў сваім адзенні захаваў нешта спрадвечнае. Ён носіць доўгія, старанна прычэсаныя валасы, вялікую барановую шапку, адвечнага крою світу, шырокую раменную папругу. Сялянка ходзіць у каптуры і гарсэце, у такіх самых, як насілі яшчэ яе прабабкі. Гэта шаноўны клас хлебаробаў, такі, якім мы і ўяўляем яго ў сваіх ідэалах. Селянін жа ваколіц Нёмана, гаспадар менш ураджайнай нівы, вымушаны зімой зарабляць у мястэчку пры дапамозе сякеры, а летам хадзіць на плытах ці віці-

нах,— большы касмапаліт, ён з меншай пашанай захоўвае каштоўныя мясцовыя паданні, бяднейшы, спрытнейшы і менш клапоціцца пра сваю маёмасць. Замест старасвецкай сярмягі, барановай высокай шапкі і ліпавых лапцей з шырокімі рамянямі, якія з такой элегантнасцю абвязваюць нагу селяніна са Случчыны, тут убачыш на мужчынах і жанчынах нейкую эмансіпаваную капоту: у жанчын — яшчэ нешта падобнае на чэпчык паняў-мяшчанак, а ў мужчын — якуюсь пашытую на нямецкі лад шапку альбо капялюш і святочныя боты, хаця тутэйшыя сяляне ўвогуле не так любяць ахайнасць і чысціню ў адзенні, як іх браты найболей хлебаробскіх мясцін. Больш цесныя сувязі з яўрэямі прывучылі вяскоўцаў да гульні і келіха, а зносіны з класам гандляроў вызвалілі ў нейкай меры ад здаровых у сваёй аснове маральных нормаў. У сялянскіх песнях, казках і пагаданках адчуваецца і нейкі знешні ўплыў. Але які канкрэтна? І якой дарогай ён прыходзіць сюды? Цяжка растлумачыць, чаму любоў селяніна да сваёй бацькаўшчыны мала дапамагае зберагаць і шанаваць уласныя традыцыі. Зрэшты, і адны, і другія — і сяляне з-пад Слуцка, і сяляне з Прынямоння — размаўляюць на беларускай гаворцы, вызнаюць грэка-расійскую альбо каталіцкую веру, прычым веданне імі сваёй веры абмяжоўваецца толькі тым, што яны ўмеюць памаліцца, прыродная ж славянская пачцівасць сцеражэ іх сумленне, здаровы сялянскі розум замяняе навуку.

Але вось з пясчанага ўзгорка адкрываецца перад намі прыгожая наднёманская панарама! У сярэдзіне карціны відаць здалёк як бы вялікі горад з некалькімі мураванымі будынкамі. Гэта два, блізкія адно ад другога мястэчкі, падзеленыя паміж сабой Нёманам — Свержань і Стоўбцы, якія ўдалечыні зліваюцца ў адно цэлае, выстаўляючы напаказ вежы сваіх касцёлаў і цэркваў. Злева — вянок альшын над рэчкай і маляўнічыя ўзгоркі з лесам, што сінее на гарызонце. Справа на зялёнай прасторнай лугавіне серабрыцца Нёман са сваімі затокамі. На адной з тых заток відаць мост на высокіх палях — ён нагадвае нейкага вялізнага, станогага авадня, які паўзе па лузе.

Уязджаем у мястэчка Свержань. Маленькі гэта і непрыглядны горад. Вось на шырокай бруднай вуліцы туліцца колькі бедных хрысціянскіх і яўрэйскіх дамоў, некалькі корчмаў, далей — паштовая станцыя, яшчэ далей — млын, плябанія і невялічкі старасвецкі цагляны касцельчык. Там — рынак са сваімі ўбогімі драўлянымі крамамі, мураваная царква і дзве поўныя гразі вуліцы, што збягаюць уніз і звязваюць Свержань з суседнімі мястэчкамі — Стоўбцамі і Мірам. Як бачым, няма тут ніякіх вартых увагі выдатнасцей. Але пакуль папасуцца коні, згадаем што-кольвек пра мінулае мясціны і адведаем убогі касцельчык.

Свержань, аб чым ўжо мовілі, у пачатку XVI стагоддзя

быў толькі панскім *маёнткам ці вёскай* (curia seu vicus), падараванай Жыгімонтам I Яну Літавору Храптовічу, маршалку літоўскаму і старосту драгіцкаму. Жыгімонт Аўгуст пацвердзіў наданне. Свержань з прылеглымі ўладаннямі падзялілі паміж сабой дочкі Храптовіча, адна з якіх выйшла замуж за Рыгора Остыка, другая — за Мікалая Ужэўлеўскага. Абодва ўладанні шляхам куплі і працэсаў перайшлі потым да Мікалая Крыштофа Радзівіла і дасюль засталіся ўласнасцю яго роду. Трэба б было многа расказваць пра тыя працэсы. Адно толькі варта тут успомніць. Перагаворы, што вяліся наконт гэтага да 1581 года паміж Радзівіламі і Глябовічамі, палюбоўна завяршыў таварыш і прыяцель Яна Кахануўскага Лукаш Гурніцкі, тыкацінскі староста, вядомы аўтар *«Двараніна»*, *«Гісторыі Кароны Польскай*, перакладчык *«Troady»* — трагедыі Сенекі, яго ж даследавання пра дабрачыннасць, а таксама Сакратавага *«Дэмана»*.

Хто ж мог спадзявацца, што ў невялікім літоўскім паселішчы мы спаткаемся з гэтым імем, што знойдзем тут адну падрабязнасць з жыцця славутага польскага пісьменніка?

Пра тутэйшы касцёл мы ведаем толькі адно: у 1588 годзе яго забраў у кальвіністаў ці, магчыма, у арыянаў Мікалай Крыштоф Радзівіл, загадаў асвяціць яго на імя Пятра і Паўла, але вельмі скупа забяспечыў. Невялікі старасвецкі цагляны касцельчык такі ж сціплы ў сярэдзіне, як і знадворку. З першага погляду відаць, што яго будавалі не для католікаў, а для невялікай часткі людзей пратэстанцкага веравызнання. Рызніца, алтары, лаўкі, амбон, спавядальні — усё драўлянае і прыбудаванае ў час, калі касцёл быў перададзены католікам. У вялікім алтары статуя Хрыста пры слупе, а ў бакавых — два абразы, не зусім па-мастацку выкананыя. Званы разбітыя, арган, а лепш сказаць арганчык — з незвычайным піскам. Аднак у той сціплай святыні, перапоўненай ў свята набожным людам, помню, як шчыра і горача я маліўся, на многа больш шчыра і горача, чым пазней у прасторных і велічных базыліках! Ці то рысы шаноўнага і вельмі набожнага твару святара, ці працяжны, прачулы яго спеў, ці старадаўнасць, якой вее тут з кожнага кутка, ці можа большы запас веры ў грудзях, не ведаю, што з усяго гэтага рабіла ўплыў на маю набожнасць.

У трохі лепшай рускай царкве, якая некалі належала айцам базыльянам — яны мелі тут сваё паслушэнства — было, як мне памятаецца, некалькі някепскіх абразоў. У маёй памяці засталіся паказаныя там пакуты езуітаў у Японіі, а таксама запомніўся пустэльнік Ануфры з барадой да каленяў, з якім анёл ідзе да святога прычасця.


Свержань — гэта пункт, адкуль суднаходны Нёман пачынае несці на сваіх крутых хвалях літоўскія віціны, на-

гружаныя неапрацаванымі набыткамі нашай зямлі. Есць тут прыстань, некалькі свірнаў. Але ўвесь гандаль знаходзіцца ў руках яўрэяў — хто не бачыць, на якім яшчэ нізкім ён узроўні! Адсутнасць капіталаў у гандляроў, адсутнасць духу прадпрыймальніцтва ў грамадзян, адсутнасць добрых рамеснікаў, што маглі б спрасціць старасвецкую канструкцыю саміх суднаў (хаця б прыстасавалі да іх сілу пары), нарэшце, нежаданне спраміць крутое карыта Нёмана і зрабіць карту меляў, карчоў, камянёў і схаваных пад вадой глыбаў — усё гэта трымае яшчэ тутэйшы гандаль у тым стане, у якім ён быў у нашых далёкіх продкаў. Шкода толькі, што мы меней сціплыя ў сваіх патрэбах, чым продкі, шкода, што збяднелыя нашы нівы ўжо не так добра родзяць, як у часы першапачатковага, больш стараннага земляробства, шкода, бо гандаль па Нёмане да Круляўца на многа меней дае сёння нам, чым нашым далёкім продкам.

VIII

СТОЎБЦЫ

Яшчэ пра гандаль збожжам.— Стоўбцы ў далёкія часы.— Дамініканскі касцёл.— Царква.— Urbs subterranea.[63]



Над суднамі тут — палатняныя крылы.
Заморскія купіш тут мыла ды вілы,
Тут гонкія мачты, што бачылі моры,
Сягаюць пад зоры.
Тут шкіперы — мудрыя, пэўне, галовы:
У іх у цане ўсё — і грошы, і словы.
Купляй, прадавай. Ноч на носе? Няхай!
Кішэнь напіхай!

Кляновіч.[64] «ПЛЫТАГОН»

Са Свержня, замест таго, каб падацца паштовым гасцінцам, што праз доўгі мост вядзе на Мінск, едзем прыватнай бітай дарогай агледзець другое сплаўнае мястэчка Стоўбцы — яно ляжыць праз вярсты дзве на другім беразе Нёмана. Кароткая дарога ідзе лугамі паўз раку і блізкія затокі. На мутным Нёмане стаяць віціны, пры якіх снуюць рабочыя альбо плытагоны — гэта зімовай ці вясновай парою. Летам жа плёхаецца тут з венцерам рыбак, а па бязлюдным беразе паважна ходзіць бусел. Перад намі на фоне зялёных лугоў і цёмных лясоў бялее некалькімі мурамі мястэчка, куды нас перавозіць паром.

Пры самым уездзе каля Нёмана пачынаюцца шэрагі купецкіх свірнаў. Летам тут пуста і глуха. Але зімой і пад вясну, калі саннай дарогай лёгка дастаўляць тавары, прызначаныя для адпраўкі ў Крулявец — што тут галасу, што людзей, што фур з усіх канцоў краіны і з усялякім таварам! Сустрэнеш тут і нашага селяніна са Случчыны і з Наваградчыны са збажынаю, і палешука, з адзінай, характэрнай для яго краю прадукцыяй — рагожамі, і валыняніна з прыправамі, і беларусіна з ільном ці пянькой, і велікарусіна з алеем. Усё гэта тутэйшыя віціны павінны забраць і завезці на спажытак немцам. А што мы будзем мець ад іх узамен? Некалькі сотняў бочак селядцоў, некалькі дзесяткаў бочак віна і трохі грошай. Кажам — трохі, бо з таго гандлю не вялікая карысць не толькі для краю, не толькі для вытворца прадукцыі, якім з'яўляецца памешчык і селянін, але нават для самога гандляра, бо ім часцей за ўсё з'яўляецца яўрэй, што карыстаецца пазычаным грошам, гоніцца за дробнымі прыбыткамі, і не ведае сапраўдных купецкіх спекуляцый, ахвяраванняў, без чаго цяжка ўявіць шырокі гандаль. Даверлівасць, тая моцная падпора меркантыльнага дабрабыту, часта злоўжывалася ў выніку няўдачы ці кепскай рахубы паміж тутэйшымі гандлярамі, здаецца, страчана, дык ці дзіва, што плён нашай зямлі бескарысна рэалізуецца?

Зараз толькі самымі агульнымі словамі мусім мы гаварыць з чытачом, хаця разумеем: пра гандаль збожжам трэба б было даць больш шырокую справаздачу. Калі-небудзь

у вальнейшую хвіліну, займеўшы ўсе неабходныя матэрыялы, мы падрабязна раскажам, якая прадукцыя, у якой колькасці і адкуль дастаўляецца да тутэйшай прыстані, колькі віцін адпраўляе ўсё гэта, якія выручаюцца капіталы* альбо бытавыя прадметы, што мусім мы купляць у немцаў і англічан, як, напрыклад, суадносіцца сума, заплочаная за спіртное, для шляхецкіх сталоў, з сумай, заплочанай за соль і селядцы — самыя сціплыя прадметы сціплага сялянскага абеду. Мы апішам вам падрабязна нашу віціну, раскажам пра яе вандроўку па шырокім Нёмане, намалюем воблік наднёманскага сплаўшчыка, пастараемся на аснове старых матэрыялаў падаць хаця б кароткую гісторыю сплаву па Нёмане з даўнейшых часоў, словам, паспрабуем вычарпаць тэму, якой толькі здалёку дакрануліся. Аглядзім жа мястэчка, пачынаючы, як звычайна, з яго мінулага.

Мы вельмі сумняваемся, што яно магло быць заснавана раней чым у другой палове XVI стагоддзя. Бо цытаваны ўжо намі прывілей Жыгімонта I Храптовічу на Свержань замацоўвае за ім абодва берагі Нёмана, прычым Стоўбцы там нават не ўпамінаюцца — сведчанне таго, што яны яшчэ не існавалі. Той другі (паўночны) бераг Нёмана, бераг, дзе знаходзіліся прыналежныя да Стаўбцоўшчыны вёскі, у выніку паяднання Храптовіча з домам Мікалая Яновіча Слушкі, старосты крычаўскага, праз яго жонку Гальшку Кміцянку, роду Храптовічаў, засялілі Слушкі. Пасля гэтага паміж Слушкамі, Ужэўлеўскімі і Мікалаем Крыштофам Радзівілам, які набыў вотчыну апошніх, у 1575 годзе працэс закончыўся. Уладальнікам гэтых зямель стаў Радзівіл. Але пазней, аж у 1582 годзе, акругляючы свае ўладанні на свержаньскім баку Нёмана, ён дамовіўся з удавой Слушкі і за некаторыя занёманскія вёскі аддаў ёй некалькі тутэйшых, з галоўным дваром Кавалеўшчынай. Пра мястэчка Стоўбцы няма яшчэ ніякага ўпамінку.

Можна дапусціць, што тут пасяліўся сын Мікалая Аляксандр Слушка, ваявода навагрудскі. Робячы Кавалеўшчыну нечым падобным да рэзідэнцыі, пабудаваў у ёй замак. Неўзабаве, перайшоўшы з пратэстантызму да каталіцкага веравызнання, ён, магнат, фундатар некалькіх касцёлаў у Літве, заснаваў тут у 1621 годзе кляштар дамініканцаў рускай правінцыі і касцёл — спачатку драўляны, а потым прыгожа аблажыў яго цэглай. У ім Слушка і спачывае пасля сваёй смерці ў 1651 годзе.**

У гэтым касцёле гатычнага стылю, з дзвюма вежыцамі спераду і велічнай ратондай збоку маецца некалькі кар-

* У 1848 годзе на стаўбцоўскай прыстані сабрана і выслана за мяжу прадуктаў вартасцю ў 273 969 рублёў срэбрам. Гл. «Статистические очерки России» Арсеньева.

** Нясецкі (выданне Бабровіча. Т. VIII, стар. 414), гаворачы пра Аляксандра Слушку, два разы памыляецца: першы раз —

цін, якія маюць адзнакі самага высокага пэндзля, за выключэннем партрэта святога Казіміра ў вялікім алтары. Некалькі святых прапаведнікаў, святы Антоній і Юльян Біскуп, што дае міласціну ўбогаму,— усе выявы, як відаць, мясцовага выканання, у іх праглядваецца рука Юзафа Гескага, мастака XVIII стагоддзя — аб ім мы ўжо ўпаміналі, гаворачы пра дамініканскі касцёл у Нясвіжы. Можна ўбачыць тут яшчэ ў бакавым алтары абраз, на якім паказана бойка святога Міхаіла Архангела з д'яблам. Абраз выкананы Смуглевічам[65] і падараваны Стаўбцоўскаму касцёлу Чартарыйскімі, пазнейшымі ўладальнікамі гэтых зямель. Не меней варты ўвагі даўнейшы партрэт фундатара ў натуральную велічыню, вывешаны ў рызніцы, а таксама чатыры вялізныя статуі святых у прэсвітэрыі і чатыры меншыя ў двух бакавых алтарах. У першых кідаецца ў вочы пэўная афектацыя ў кампазіцыі фігур, затое другія, дзе намаляваны святыя жаночыя постаці,— поўныя высакародства і тонкай прыгажосці. Гіпсавы арнамент ва ўсім касцёле — таксама вельмі прыгожы. Словам, велічная і гожая выйшла святыня з рук фундатара. Аляпаватыя статуі святых апосталаў Пятра і Паўла ў бакавой капліцы, абы як намаляваныя працэсуальныя харугвы і тоўсты слой пылу на сценах і скляпеннях касцёла — гэта ўжо «аздобы» пазнейшага часу. Трохпавярховы сціплы кляштар, што пасля таго, як яго пакінулі у 1830 годзе дамініканцы, быў перароблены на свецкую плябанію, не меў, здаецца, ні бібліятэкі (нельга ж лічыць ёю некалькі дзесяткаў кніг, якія там знаходзяцца), ні якога-небудзь іншага помніка старажытнасці, апрача партрэта фундатара на палову постаці і старой выявы Хрыста з выразам боскасці і пакуты. Зрэшты, добрыя айцы жылі тут больш за дзвесце гадоў, не пакінуўшы пасля сябе ніводнай адметнай памяткі.

Апрача каталіцкага касцёла ў Стоўбцах ёсць яшчэ мураваная руская царква, заснаваная Чартарыйскімі, пасля якіх яна адышла ва ўласнасць манарха. Славяцца тут, зрэшты, лёхі і крамы з півам, нібы другі падземны горад, рымскія катакомбы, тыя лёхі і крамы — добры напамінак аб іншых, весялейшых часах. Пара такіх крамаў, што належаць заможнейшым купцам, да гэтага часу працвітае.

Стоўбцы налічваюць амаль 2000 жыхароў. Палова іх летам адпраўляецца ў Крулявец — яўрэі як купцы і іх розныя ступені і наймення камісіянеры, мяшчане як рулявыя і сплаўшчыкі. Летам пануе тут ціша і пустэча, восенню ж і зімой — рух і галас, характэрныя для збожжавай прыстані, дзе амаль цалкам гаспадараць дзеці Ізраіля.

лічачы, што ён заснаваў у Кавалеўшчыне касцёл, якога там ніколі не было (толькі на могілках малая капліца святой Магдалены), другая памылка — ён быццам спачывае у тым жа касцёле, у той час, як Слушка пахаваны ў стаўбцоўскім касцёле, дзе мы самі бачылі яго прах.

IX

КОЙДАНАВА
УРЫВАК З ДЗЁННІКА

Выезд з маіх былых ваколіц.— Начлег у Койданаве.— Слова пра гэтую мясціну: яе старажытнасць, напады татар, касцёлы, успамін добрага свяшчэнніка.— Сабор гельвецкага веравызнання ў Койданаве і дамавіны ў ім Радзівілаў.



У кожным кутку чалавека туга сустракае,
А сэрца дарэмна свайго суцяшэння чакае.

Я. Каханоўскі. «ТРЭНЫ»

У душэўных пакутах ёсць нешта святое: разарванае імі сэрца — нібы святыня ў час страшнай Ахвяры, калі ў яе нельга пускаць неасвечаных. Пакідаючы *мае былыя ваколіцы,* хачу толькі трошкі сказаць пра тыя прычыны, што змусілі мяне да гэтага.

Пад маёй зацішнай страхою жыло сямейнае шчасце. Усё, здаецца, было так добра сярод дзятвы, у згодзе з Богам, з прыродай, у сяброўстве з кнігай, пакуль самым балючым чынам *не кранула мяне Божая рука.*

Магіла на стаўбцоўскіх могілках забрала ў мяне двое дзяцей — маю надзею на будучыню. Хто не быў бацькам, хто не любіў, хто ніколі не марыў, не зразумее майго болю, не зразумее стану душы, ахопленай роспачлівым адчаем, маіх пакут. Жадаючы зменшыць боль роздумам, працай, малітвай, углядваннем у твар прыроды, я адчуваў, што думкі ўвесь час бяруць адзін толькі кірунак, а кожны кут у доме, кожны прадмет у акне, кожная сцежка ў агародзе сталі для мяне сведкамі былога шчасця, якія выклікаюць успаміны: то хвіліны, калі схіляўся над хворымі ў ложку, то іх скананне, то карціну пахавання тых, за каго аддаў бы ўласнае жыццё. Я не змог знайсці такіх сіл, такога гераізму, каб заставацца ў гэтых мясцінах, сярод гэтых успамінаў, таму, кінуўшы жменю пяску на апошнюю труну, вырашыў, як сапраўдны вандроўнік, пайсці куды вочы глядзяць.

17 верасня 1852 года, развітаўшыся з добрымі прыяцелямі і зірнуўшы затуманенымі ад слёз вачамі на дом, які перастаў ужо быць маім домам, і на такія любыя сэрцу ваколіцы, рушылі мы ў дарогу на Мінск, каб ехаць да Вільні. Праз мілю ад Залучы завіталі ў бацькоўскі дом — новыя слёзы, новыя развітанні! Змяркалася, калі мы выязджалі — нас не пускалі, прасілі пераначаваць, але нам як хутчэй трэба было... ехаць без мэты, як найхутчэй і як найдалей уцячы адсюль і глынуць халоднага гаючага паветра, аблегчыць душэўны боль.

Лесам, паўз бераг ракі Сулы, што непадалёку ад майго былога дома ўпадае ў Нёман, потым, перабраўшыся цераз

гэтую раку каля яе вытокаў у вёсцы Засулле, вялікай палявой раўнінай ехалі міляў пяць сярод гожай ночы. За намі быў мой дом, налева — мястэчка Свержань і Стоўбцы, адсюль ішоў паштовы гасцінец між бясконцых лясоў, якія цягнуліся ад вусця Нёмана. Мы едзем прыватнай шырокай дарогай да Койданава. Перад намі мільгаюць гожыя сядзібы, вёскі, засценкі, крыжы пры дарозе; там водны млынок між маляўнічых пагоркаў каля рэчкі, там велічны маёнтак над вялікім возерам. Але не ўсё можна было разгледзець, бо зямля хавалася ў змроку. Праўда, поўнік, што добра свяціў з начнога неба, дазваляў усё ж шмат чаго ўбачыць, мы дзівіліся зямному хараству, маліліся вялікаму Тварцу сусвету.

Пасля пяцігадзіннай хуткай язды мы спыніліся ў колішнім радзівілаўскім, а цяпер казённым мястэчку Койданаве, дзе дах яўрэйскай карчмы прытуліў нас на начлег. Хацелася адпачыць душой і целам пасля цяжкай дарогі, але тут праз тонкую перагародку даносіўся звон шклянак і гучны голас нейкага чыноўніка земскага суда, што расказваў пра свае геройскія ўчынкі ў нейкім тутэйшым следстве.

Назаўтра, пакуль напасвіліся коні, я агледзеў мястэчка Койданава. Горад гэты стары, як свет, а лепш сказаць, як Кітай, і, як Кітай, чужы ўсякаму прагрэсу — які быў спрадвеку непрыглядны, такі і цяпер застаўся. У Стрыйкоўскага можна прачытаць, што пад Койданавам вялікі князь жмудскі Скірмунт у 1241 годзе даў адпор татарам на чале з Балаклаем, а Міндоўг дабіўся перамогі над тымі ж татарамі, а таксама над рускімі князямі Даніэлем і Васілём.*

У 1442 годзе Казімір Ягелончык яшчэ перад уступленнем на польскі трон, толькі прызначаны намеснікам свайго брата ў Літве, аддаў Койданава разам з некалькімі іншымі гарадамі Міхалу, сыну Жыгімонта Кейстутавіча.

* Так піша Стрыйкоўскі[66]. Карамзін жа (т. IV, стар. 53, выд. 1842) сцвярджае, што, наадварот, Міндоўг быў пераможаны, але не падае пісьмовых звестак, на якія пры гэтым абапіраецца. «Даніэль цешыўся ўжо думкай аб сваёй поўнай незалежнасці, калі незлічоныя войскі манголаў, якія вёў жорсткі Бурандай, наступнік слабага Курамсы, апынуліся на мяжы Літвы з Расіяй. *«Ты друг ці вораг хана?* — запыталіся ў галіцкага караля паслы Бурандая.— *Калі ты друг, ідзі з намі на Літву!»* Даніэль вагаўся, марудзіў з адказам, але, нарэшце, бачачы перавагу татарскіх сіл, паслаў да Бурандая свайго брата Васільку з войскам і паклонам. Полчышчы манголаў абрынуліся на незнаёмую ім дагэтуль Літву. Толькі бясконцыя пушчы і багністыя балоты ратавалі жыхароў. Гарады і вёскі былі змецены з твару зямлі». (Там жа, стар. 54). «Хітрыя захады Даніэля не мелі выніку. Ані ў Кракаве, ані ў Венгрыі ён не знайшоў дапамогі, і адзінай для яго ўцехай стала атрыманая ў дарозе вестка, што Васілька перамог Міндоўга, страшнага для суседзяў, але слабейшага за манголаў».

Потым Койданава стала ўласнасцю кароны: Жыгімонт Аўгуст ў 1551 годзе аддаў яго з *замкам* як спадчыну брату сваёй любай жонкі Барбары Мікалаю Радзівілу Рудаму, у родзе якога па біржанскай лініі горад заставаўся аж да знікнення гэтай лініі, пасля чаго перайшоў да дому князёў Радзівілаў нясвіжскіх.

Апрача сваёй старажытнасці Койданава нічым іншым не вызначаецца. Налічвае дзве ці тры сотні сасновых дамкоў, больш за палову іх складаюць аж занадта знаёмыя яўрэйскія корчмы і двары. Насельніцтва горада складае 1550 душ абодвух палоў*. Апрача яўрэяў і хрысціян тут жывуць на выдзеленых землях і татары. Жыгімонт III у 1588 годзе надаў Койданаву два кірмашы (цяпер змізарнелыя). Новыя крамы і яўрэйскія бажніцы на рынку сталі як бы сэрцам горада, бо хрысціянскае насельніцтва знаходзіцца тут, як і ва ўсіх нашых мястэчках, на другім плане.

Хрысціяне маюць аж тры малітоўныя дамы. Гэта — грэка-расійская царква, што нядаўна пабудавана на рынку і вылучаецца сапраўды прыгожым спалучэннем італьянскай архітэктуры з візантыйскай. Яшчэ ёсць даўнейшы касцёл, заснаваны аж у 1439 годзе літоўскім ксяндзом Міхалам,— драўляны, сціплы і знадворку, і ў сярэдзіне. Ён нагадаў мне нядаўна памерлага тутэйшага плябана ксяндза Заусцінскага, сапраўднага святара, людскога дабрачынца, у час пахавання якога ўсе даведаліся пра тыя незлічоныя дары, паднашэнні, пазыкі і міласціны, што шчодра атрымлівалі ад яго бедныя і няшчасныя у мястэчку і ў ваколіцах. Не магло не крануць сэрца тое адзінае ў сваім родзе пахаванне. Каля труны святара чуліся галашэнні і плач беднага люду, які страціў у яго асобе айца, а ўдзячныя яму за многія дабрадзействы койданаўскія яўрэі адправілі па ім ў сваёй бажніцы набажэнства — у час яго выкліканы з Мінска рабін выступіў з арыгінальнай, вельмі жаласнай казаню. Хто ж з нас не жадаў бы такога пахавання? Але, скажа нехта, каб быць дабрачынцам людскім, трэба мець скарбы. Так, скарбы, толькі не ў мяшку, а ў сэрцы. Шанаваны ўсімі плябан не меў вялікіх набыткаў, іх ледзьве хапіла на тое, каб аплаціць сціплае пахаванне, але валодаў духам Божым.

Ён насіў у сэрцы любоў і шчодра адараў ёй усіх бліжніх. Добры наш прыяцель Юльян Гарайн[67] у «Дзённіку Варшаўскім» за мінулы год шчыра расказаў пра ксяндза Заусцінскага і яго пахаванне.

Трэцяя хрысціянская святыня ў Койданаве — гельвецкая царква, заснаваная Мікалаем Радзівілам Рудым, які сваім адзінаверцам падараваў пляц і муры старога замка, а на патрэбы божай службы — невялікую, але добрую вёску Чарнягоўшчыну. Тая святыня агароджаная высокім мураваным парканам, умацаваная зубцамі і байніцамі, стаіць наводшыбе, у канцы мястэчка, у яго заходнім баку. Зубцы і мур наўкруга разбураюцца, валы асядаюць, равы зраўніваюцца з зямлёй — ўсё гэта яшчэ больш жыва пераносіць нашу думку ў XVI стагоддзе, калі гельвецкае веравызнанне ў Літве, нягледзячы на магутную апеку Кішкаў, Радзівілаў і іншых магнатаў, мусіла ўзбройвацца, ідучы на малітву — каб залішняя заўзятасць езуітаў не прычынілася да ўсякіх зняваг у адносінах да іх псалмоў. А паколькі матэрыяльная сіла мае тэндэнцыю да злоўжыванняў, не дзіва, што літоўскія кальвіністы з абароны не раз пераходзілі ў наступ, сведчанне чаго тыя нашумелыя трагічныя выпадкі, якія мелі месца ў Вільні, Слуцку і г. д. Не ведаем, ці здаралася такое ў Койданаве, але мы разумеем імкненне кальвініскіх пастараў умацоўваць свой касцёл якраз у XVII стагоддзі, калі ўжо нясвіжскія Радзівілы вярнуліся ў каталіцызм, даўшы тым самым прыклад навакольнай шляхце, а ўладальнікі Койданава і абаронцы пратэстантызму Радзівілы лініі біржанскай — Крыштоф, Януш і Багуслаў — жывучы далёка адсюль, не маглі абараніць сваіх адзінаверцаў ад мясцовых гвалтаўнікоў.

Койданаўская святыня ў неспакойныя часы Яна Казіміра стала ахвярай нападаў і рабункаў*. Сінод гельвецкага веравызнання, які адбыўся ў 1691 годзе ў Вільні, прыняў пастанову, каб кожны чацвёрты год сінод, ці ўсеагульны з'езд літоўскіх кальвіністаў, праводзіўся ў Койданаве. Хаця і шмат мелася тут школ гэтага веравызнання, але ў ліку койданаўскіх пастараў былі вядомыя ў свой час асобы, напрыклад Крыштоф з Жарноўца. Вось і ўсё,што хацелася сказаць пра святыню.

Агледзелі мы яе іншым разам, калі прыязджалі ў Койданава. Пачцівае кіраўніцтва паказала ўсе куткі касцёла, дзе знаходзіліся каменная плітка алтара, амбон, хоры і лаўкі. На алтары, на вялікае маё здзіўленне, я знайшоў цудоўна захаваны экземпляр Брэсцкай Бібліі, той вялікай у нашы часы бібліяграфічнай рэдкасці, на друкаванне якой Мікалай Чорны Радзівіл выклаў значныя сумы, паслаўшы ў Брэст трыццаць славутых тады літаратараў. Вялізныя стосы экземпляраў выдання па загаду яго сына Мікалая Крыштофа палілі ў агні на рынках у Вільні і Нясвіжы, і толькі лічаныя асобнікі змаглі ўцалець.

Па гэтай кнізе яшчэ сёння моляцца ў Койданаўскай святыні. Брэсцкая Біблія, старыя абарончыя муры касцёла, пакрытыя плесняй, і ўрачыстая ціша жыва перанеслі мяне ў XVI стагоддзе, паставілі перад вачамі душы некалькіх адметных тагачасных постацей, нагадалі ідэі таго стагоддзя, ідэі, што кіпелі рэлігійнымі і палітычнымі душэўнымі

* Гэта лічбы 1843 г. Гл. Журналъ Министерства Внутренних дѣлъ — 1843, Мартъ.

* Гл. Лукашевіча «Dzieje wyznania Helw. w Litwie». T. II, стар. 37.

бурамі. Толькі магільны пах з-пад алтара вяртаў да балючай праўды — на зямлі ўсё смяротнае: людзі, іх сённяшнія ідэі, іх жаданае *Заўтра*, якое праз хвіліну становіцца сумным і смешным *Учора*.

Напомнілі мне і пра радзівілаўскія дамавіны, што тут знаходзяцца. Зайшлі мы пад алтар і па вузкіх падгнілых сходах ступілі ў склепік, дзе стаіць некалькі таксама падгнілых, са спарахнелымі касцямі трун Радзівілаў, вызнаўцаў кальвінізму. Найбольш багатыя з іх, металічныя, спазналі рукі рабаўнікоў. Але хто канкрэтна з магнатаў тут спачывае, ніхто мне не здолеў сказаць. Калі Радзівілы-католікі збудавалі сабе грабніцу ў Нясвіжы, каб у сямейным коле некалькіх пакаленняў разам стаць у вялікі дзень Уваскрэсення перад Богам, другая, не менш магутная іх галіна,— пратэстанты, складалі свае косці па ўсім краі. Адны з іх ляжаць у Біржах, другія — у Кейданах, Койданаве, Слуцку, трэція, як Багуслаў, канюшы літоўскі,— аж у Круляўцы, у чужой зямлі. Але хто ж усё-такі канкрэтна пахаваны ў Койданаве? Тое павінна ўведаць і сказаць духавенства. Зрабіць яму гэта будзе лягчэй таму, што кальвіністы з часу свайго з'яўлення тут і да сённяшняга дня захоўваюць з рэдкім ушанаваннем і дакладнасцю свае акты. Нам здаецца, тая вялікая іх частка, якую трымаем ў руках, з двума вядомымі паглыбленнямі збоку, належыць, напэўна, Мікалаю Радзівілу Рудаму, што заснаваў і забяспечыў святыню,— мужу, якога любіў Жыгімонт Аўгуст і, як расказвае біёграф Багуслава Радзівіла, нібы яшчэ на каленях песціў, мужу, які па-геройску змагаўся ў бітвах пад кіраўніцтвам Баторыя. Можа, мы памыляемся, можа, гэтая частка — не Мікалая Руфа. Мы шкадуем, што не вывучылі старыя паперы — мо і ўдалося б атрымаць уяўленне пра тую галаву. Пры ўсёй сваёй недасканаласці навука Галена[68] і Спурзгейма[69] — прыгожая навука, калі пры яе дапамозе ільга пасля смерці адрозніць чало, якое насіла вянец з дубу і алівы, ад чала, заплямленага ганьбай.

X

ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА ВАКОЛІЦЫ

Вера.— Звычаі.— Ступень асветы.— Умовы побыту.— Гаспадарка.— Узаемаадносіны паміж панам і народам



Ты пакуль што — быццам тая дзічка ў гаі,
На якую ніхто і не зважае.
Прышчапі ж галінак — з розуму і цноты,
З веры ў Бога шчырай, з дабраты, пяшчоты,
Гэткіх дасць яна пладоў!

М. Рэй[70] з Нагловіц

Перапыняючы тут нашу вандроўку, мы адчуваем патрэбу даць малюнак звычаяў тутэйшай стараны. Кола нашага даследавання выходзіць за межы намечанай намі прасторы ў некалькі міляў і ўключае ўсю заходнюю частку сённяшняй Мінскай губерні, дзе знаходзім нямала агульнага з *нашымі* ваколіцамі. Паколькі вясковы люд будзе прадметам разгляду ў наступным раздзеле, тут жа зоймемся саслоўем сярэднешляхецкім і перш за ўсё пазнаёмімся з яго *верай*.

Гатычныя касцёлы і касцельчыкі нашых гарадоў і мястэчак кожны тыдзень запаўняе Хрыстова паства, каб па прывычцы ці з душэўнай патрэбы выліць душу ў малітве, кожны тыдзень ксёндз пробашч прамаўляе з амбона якую-небудзь казань па друкаванай кнізе. І ўсё ж хрысціян як глыбокай правінцыі, так і гарадоў трывожыць вялікая бяда нашага часу. Бяда гэтая — не бязбожнасць ці нявер'е, але, можа, горш за тое — абыякавасць да веры, холад у сэрцах, а адсюль адсутнасць выратавальнага станоўчага ўплыву, што павінна аказаць рэлігія на грамадства. Сярод духавенства ў правінцыі мы сустракаем добрыя сэрцы, светлыя галовы, аднак рэдка бачым пастара, які быў бы ў цесных духоўных сувязях са сваёй паствай. Рэдка які плябан добра ведае станоўчае і заганы, долю і нядолю сваёй парафіі, рэдка ўглыбляецца ва ўмовы тутэйшага жыцця. Таму не дзіва, што казані, якія тут чуем, не вельмі стасуюцца з мясцовымі звычаямі, яны з холадам выслухоўваюцца, малыя даюць вынікі. Мы чуем вучоны дагматычны трактат там, дзе трэба рабіць уплыў на мараль, дэкламацыю пра пыхлівасць у нас, дзе сціплы жыхар незаможнай ваколіцы, далёкі ад яе д'ябальскіх нашэптванняў, грэшыць хіба што келіхам. Асобныя найбольш значныя заганы так характэрны для пэўных мясцін, што добра вывучыўшы, можна было б нанесці іх на геаграфічную карту. Ёсць ваколіцы, заражаныя звадамі ды сваркамі, у іншых жа да крайнасці дайшло суседскае дружбацтва — пашыраюцца нястрыманыя гулянкі, якія забіваюць час і адбіраюць

здароўе, у адным месцы як бы пасяліўся чорт, у другім няспешны прэферанс, нібы павольная гангрэна, паралізуе грамаду. З такімі заганамі кіраўнікі сумлення павінны б змагацца, іх слова, сказанае ў часе і да месца, пойдзе толькі на карысць грамадству. Але як вызначыць той час? Дзе ўбачыць тое месца? Адказ на гэтыя пытанні можна знайсці, калі добра пазнаёміцца з духам паствы. Не зможа зжыць тыя заганы пропаведзь духоўніка, які не ведае грахоў сваіх суседзяў. У такім разе ўплыў нават самых красамоўных яго слоў будзе раўняцца нулю.

Дзякуй Небу! Няма ў нас вялікіх злачынстваў, ёсць толькі большыя ці меншыя грахі, заганы, звязаныя з традыцыяй, са звычкамі. Мы ў іх застылі. А паколькі ў занадта будзённым стане духа прыходзім мы маліцца і спавядацца Богу, паколькі не ведаем моцных рэлігійных узрушэнняў, што ж растопіць той лёд у нашых сэрцах? Хто ж вызваліць нас ад маральнай стагнацыі? Хто абудзіць у нас вялікія хрысціянскія якасці? Тады б духоўнікі, г. зн. кіраўнікі *духа*, толькі машынальна абходзілі б свае рэлігійныя абрады.

Старана, пра якую ідзе тут гаворка (Мінскі, Слуцкі і Навагрудскі паветы), а яна складаецца з паасобных вотчын, агромністай колісь Радзівілаўшчыны і меншых прыватных уладанняў, не мае, можна сказаць, так званай арыстакратыі. Толькі дзе-нідзе які больш заможны паўпанак, бы пацук сярод дробных мышэй, паказвае сваю фанабэрыю перад драбнейшай шляхтай. Таму чыста панскія грахі — напышлівасць, касмапалітызм, эгаізм, раскоша — не мелі магчымасці тут разрасціся і заглушыць усё тое добрае, што ёсць ў гэтай мясцовасці. Дастатак, якім адорвае Бог некаторыя дамы ці людзей, служыць для пашырэння жыццёвых выгод, дапамагае ў набыцці ведаў і — трэба сказаць праўду — робіць хоць нейкі ўплыў на паляпшэнне долі вясковага люду. А калі часам маладзейшая генерацыя паноў-землеўладальнікаў на кантрактах у Мінску ці ў Навагрудку дазволіць сабе якія-небудзь панскія выбрыкі, калі ў вінарні ці за зялёным столікам за адну ноч прасадзіць гадавы прыбытак, то такія выбрыкі, як адзінкавыя праграшэнні, ні ў якой меры не павінны даваць падставу меркаваць пра ўсю ваколіцу. Не ў адным заможным доме можна сустрэць добрую кнігу, прыгожую карціну, не ў адной вёсцы можа ўзрадаваць дабрыня памешчыка, што заўсёды адаб'ецца і на твары селяніна, і на яго ж адзенні, і на стане ягонай хаткі, і на велічыні ягонага гумна для збожжа. Мы маглі б тут назваць некалькі светлых і высакародных сельскіх памешчыкаў, але не бачым патрэбы прыводзіць уласныя імёны, бо мы вывучаем хутчэй людскія садружнасці наогул, чым канкрэтных людзей.

Што ж да стану асветы драбнейшай шляхты, дык тут

мусім сказаць праўду: не ўсе яшчэ ў нас усвядомілі яе неабходнасць. Маладых людзей аддаюць на выхаванне ў гімназіі Слуцка і Мінска, потым — у айчынныя універсітэты, рэшта моладзі ідзе на чыноўніцкую службу. Тыя, хто ідзе вучыцца,— надзея краю. Што з таго атрымаецца, пакажа будучыня. Тым часам у нас можна знайсці мноства сем'яў, дзе ў святой прастадушнасці з пагардай глядзяць на кнігу, бо яна, бачыце, нічога не дае для гаспадаркі, затое шчыра вераць, як у нешта святое, у прадказанні з Віленскага ці Бердычаўскага календароў. У апошнія часы ў ваколіцах з'явілася некалькі дзесяткаў экземпляраў «Газеты Варшаўскай» і «Дзённіка Варшаўскага» — доказ вялікага ў нас прагрэсу, бо дагэтуль адзін толькі «Кур'ер»[71] задавальняў нашы сціплыя інтэлектуальныя патрэбы. Чытаючы газеты, часам вельмі пацешна іх каменціруем. Любая палітычная вестка часцей за ўсё толькі тады прымецца да веры, калі яе растлумачыць па-свойму пачціваму шляхціцу які-небудзь аўтарытэтны арандатар, карчмар ці купец альбо які-небудзь пан Моўша ці Лейба, добра ва ўсім дасведчаны. Я сустракаў сталых чытачоў «Газеты» ці таго ж «Дзённіка», якія з цяжкасцю адольвалі палітычную частку, а ў літаратурны раздзел нават і не жадалі заглядваць. Калі я пытаўся ў іх, чаму не чытаюць далей, яны рабілі паважны выгляд, даючы зразумець, што чытанне ў сур'ёзнай газеце матэрыялаў пра будзённае жыццё зневажае іх чытацкую годнасць. Мала хто чытае пра гандаль, бо хто ж можа даць больш дакладныя звесткі пра яго, чым мясцовыя яўрэі? Не цікавяцца чытачы і новымі ўказамі і пастановамі ўрада, бо ведаюць, што пра іх раскажа і мясцовы пан асэсар. Дык ці ж трэба здзіўляцца, што яўрэй і пан асэсар злоўжываюць гэтым, што, добра ведаючы пра нашу любасць да дамашняга цяпла, не прамінаюць, каб скарыстаць нейкім чынам нашу недасведчанасць. Але колькасць такіх шляхціцаў пачынае значна змяншацца: сыны і дочкі іх, захапляючыся літаратурай і мастацтвам, пачынаюць мяняць сітуацыю да лепшага. Ужо да сцен сціплых літоўскіх фальваркаў дайшлі гукі мелодый Ліста і Тальберга, становяцца вядомымі тут не толькі імёны Sue[72] і Dumas'a[73], але нават Каржанеўскага[74], Крашэўскага і іншых айчынных пісьменнікаў, якія прыйшліся да спадобы. Вядома, у гэтай цікавасці да музыкі, у гэтым чытанні няма яшчэ сістэмы, паслядоўнасці. У доўгія зімовыя вечары часцей за ўсё мы бавім час гульнёй у прэферанс (рэдка дзе келіхам) і менш за ўсё чытаем. Але ўжо цешыць тое, што кніга паволі пачынае станавіцца патрэбнай у шляхецкім доме. Мінская губерня мае магчымасць некалькі разоў на год набываць новыя выданні: віленскія кнігары пасылаюць свае крамы на кірмашы ў Мінск, Пінск і Наваградак, на нясвіжскі

кірмаш і кожны раз на пэўную суму прадаюць друкаваны тавар. Наколькі можна меркаваць з бессістэмных звестак, Мінск са сваімі немалымі ваколіцамі набывае літаратуры штогод на чатыры-пяць тысяч рублёў срэбрам. Гэта страшна мала! Бо прымаючы пад увагу, што Мінская губерня налічвае 1 010 965 жыхароў*, атрымліваецца: на кожнага чалавека ў год прыпадае духоўнага спажытку на суму меней, чым паўкапейкі срэбрам, інакш кажучы, меней за адзін польскі грош. Вось якое гамеапатычнае лячэнне духу! Але з агульнай колькасці насельніцтва, выключаючы яўрэяў, якія чытаюць талмуды, што не бяруцца тут ў рахунак, сялян, якія не чытаюць, бо чытаць не ўмеюць, засцянковую шляхту, якая не чытае, бо ёй няма за што купляць кнігі, і шляхту трохі вышэйшага палёту, якая не чытае, каб не страціць свайго аўтарытэту,— выключаючы, паўтараю, гэтае нечытаючае насельніцтва, цікава, колькі ж можна налічыць чытацкай публікі? І на якую суму кожны з чытачоў набывае кожны год кніг? Зноў жа колькі з агульнай сумы, хацелася б нам ведаць, прыпадае на малітоўныя кнігі, на музычныя ноты, на падручнікі для навучання дзяцей і колькі на мастацкую літаратуру? Колькі на кнігі польскія? Колькі на французскія? Аналізуючы лічбы, можа ўдалося б даведацца пра ступень асветы, яе патрэбы, пра зацікаўленасць літаратурай і навукамі. Не будзем рабіць дакладных даследаванняў. Перш за ўсё таму, што зрабіць гэта даволі складана, а другое — баімся атрымаць несуцяшальныя вынікі.

Жыццё сярэдняга класа ў тутэйшым баку пасрэднае, як пасрэдныя ўраджаі на тутэйшых нівах, як пасрэдная праца на іх, як пасрэдная наша прамысловасць і гандаль. У нас амаль зусім няма фабрык. Апрача збожжа, больш ураджайныя мясціны даюць лён і пяньку. Лясы дадаюць яшчэ трохі брусу, клёпак, смалы, дзёгцю, шкіпідару, паташу і рагожы, але ў нас вельмі мала лясоў, мы вельмі неабачна іх вынішчаем, а каб прадаць тое, што нам даў Бог, за мяжу, чамусьці не можам без пасрэдніцтва яўрэяў, не ўмеем як найлепш карыстацца ўласнай прадукцыяй. На нашых кантрактавых з'ездах няма ў абароце вялікіх грашовых сум, затое нязначныя шляхецкія набыткі, дзякуючы сціпласці жыццёвых патрэб, не абцяжараны вялікімі даўгамі. Не відаць шыкоўных экіпажаў і каштоўных жаночых строяў, і, што з гэтага вынікае, не відаць жабрачых лахманоў на плячах аратаяў; шляхціц і мужык жывуць, як кажуць, сярэдне.

Чаму ж «сярэдне», калі з нашай зямлі, з поту нашай працы маглі б паплыць цэлыя стругі багацця? Бо наш селянін не мае дастатковай незалежнасці, а шляхціц — духу прадпрымальніцтва, схільнасці да прамысловасці.

* Падлікі з 1846 г. Гл. «Статистическіе очерки Россіи» Арсеньева.

Гаспадарчая руціна, добрая ў часы нашых прадзедаў, якія заўсёды яе трымаліся, у нашы дні і пры сённяшніх умовах жыцця мала чаго дае. Але паволі ўсё павінна змяніцца к лепшаму, бо патрэба ў культурным гаспадаранні стала на парадак дня. Старыя ўмовы жыцця мяняюцца, старыя крыніцы прыбыткаў высыхаюць, адна толькі разумная прамысловасць можа сёння ўтрымаць гаспадара. Бульба, некалі каштоўнейшая культура, што паўстагоддзя карміла і гарэлачным морам залівала нашы правінцыі, колькі гадоў назад падлегла хваробе, гіне дашчэнту; яўрэй, гэтая колісь душа вёскі і двара, выгнаны з карчмы, не прыйдзе на дапамогу ў крытычны час; агністае пітво, якое калісьці з такой паважнасцю і шчодрасцю разлівала яго рука, сёння абкладзена падаткамі, абмежавана ўмовамі, а таму падаражала і на многа павінна зменшыць прыбытак ў правінцыі. Рад ці не рад, а сельскі жыхар павінен скіраваць вочы на зямлю-карміцельку і паспрабаваць, ці не зможа ён вярнуць руплівым гаспадараннем страчаныя прыбыткі; рад ці не рад, а мусіць звярнуцца да чутай даўно нешляхецкай нямецкай навукі агрaноміі, вывучыць яе асновы і скарыстоўваць яе парады.

Штодзённы вопыт паказвае недахопы трохпольнага гаспадарання. Севазварот, улічваючы вялікія абшары нашай зямлі і малую колькасць рабочых рук, відаць, не можа быць прыгодны для ўкаранення. Хто ведае, ці адпавядала б і нашым патрэбам, і хлебаробскім сілам чатырохпольнае гаспадаранне, якое прапануюць некаторыя аграномы.

Кажучы пра той недалёкі час, калі жыццё будзе прымушаць нас звярнуцца да культурнага гаспадарання, прыходзіць мне на памяць вядомы ва ўсёй Літве выдатны прыклад якраз *з маіх былых ваколіц:* гэта — уладанне генерала М., якому з колішняй вялікай радзівілаўскай спадчыны перайшло мястэчка Мір і шэсць ці сем іншых вялікіх фальваркаў. Гаспадаранне на тых землях можа быць добрай школай для ўсёй правінцыі. Выкарыстанне прагрэсіўных спосабаў вядзення гаспадаркі зрабіла яе ўзорнай, усё наўкола квітнее, здзіўляе сваім багаццем, тут незлічоныя чароды авечак, шырокія, засееныя збожжам і кармавымі культурамі палі, што даюць уладальніку значныя прыбыткі. Добрай падмогай з'яўляецца і гандаль. Хоць ён і не лічыцца тут галоўным, але яму заўсёды аддаецца належная ўвага працаўніка палёў. Яго віціны, нагружаныя ўласным і суседскім збожжам, ужо некалькі гадоў выпраўляюцца ў кожную навігацыю да Круляўца. Дзякуючы сваёй палепшанай канструкцыі, яны могуць і лягчэй плыць, апераджаючы збудаваныя на спрадвечны лад судны, і браць больш збожжа. Не раз, з цікавасцю прыглядаючыся да вялікіх уладанняў генерала, дзівіліся мы яго працы, настойлівасці, разумнасці

яго задум,нaваўвядзенняў, а таксама прастаце і найпунктуальнейшай дакладнасці вядзення складанай і заблытанай машыны гаспадарання і яго канцылярскага кантролю. Шкода, што ва ўсёй правінцыі мала можна назваць падобных прыкладаў.

Закончым артыкул некалькімі словамі пра ўзаемаадносіны шляхты з вясковым людам.

Не трэба быць вучоным, дастаткова быць чалавекам і хрысціянінам, каб убачыць, як шмат павінны мы аддаць сялянам — сардэчнасці як братам, удзячнасці як карміцелям. Матэрыяльны побыт люду так непасрэдна звязаны з побытам уладальніка зямлі, што гэты апошні, грэшачы Богу сваім нядбальствам да падданых, сам становіцца пакутнікам, бо цяпер занепадае і яго ўласная гаспадарка. Занепад той, фінансавае пагаршэнне якраз і ёсць кара за грахі, якія разам з першародным грэхам узялі мы ў спадчыну ад продкаў. Рэшткі даўняй шляхецкай пыхі і цяперашняе наша гультайства — вось крыніца кепскага становішча люду. У некаторых мясцовасцях прага раскошы даводзіць да поўнага краху.

Але несправядліва было б толькі наракаць на нядолю люду, бо, трэба прызнаць, у апошні час можна ўбачыць і нямала таго, што абнадзейвае. Перш за ўсё — гэта пазбаўленне вёскі ад карчмара, ён цяпер толькі ў асобных прыхільнікаў яўрэйства як нейкая асаблівасць, як адгалосак даўніны застаецца пад якім-небудзь выглядам у глухой вёсцы ці ў двары. Змяншэнне п'янства сярод сялян абавязкова пацягне за сабой і любоў да працы, а паблажлівасць і справядлівасць двара, што дае магчымасць памнажаць набыткі, яшчэ больш заахвоціць яго да працы. Ужо сёння ў многіх мясцовасцях прыкметна паляпшэнне жыцця люду, ужо не адзін землеўладальнік пачынае дзяліцца хлебам са сваімі сялянамі. Прыйдзе час — не адразу быў пабудаваны Кракаў — і памешчык пачне дзяліцца з селянінам таксама ведамі, а нарэшце і сэрцам. Дай толькі Божа, каб у нас было ведаў і сэрца болей, чым неабходна для ўласнай нашай патрэбы!

XI

ВЁСКІ І ЛЮД

АГУЛЬНАЯ КАРЦІНКА

Наш селянін ў чатырох перыядах свайго жыцця.— Старажытнасць вёсак.— Тып вёскі і асобнай хаты.— Дзяцінства селяніна.— Выхаванне дзіцяці.— Перыяд росту і сталення.— Старасць.— Смерць.



Але землямроб, як ліхвяр той, ніколі
Спакою не знае, шчыруючы ў полі.
І быдла, і чэлядзь сваю не шкадуе,
Сам церпіць і сквар, і стыхію любую.
Гной возіць, скародзіць, арэ, засявае,
Жне, косіць, малоціць, у схоў засыпае
Ды меле... Таму сёння мае багата
Ўсяго, што даў Бог з невычэрпнейшых спратаў.
Прымаючы дар той, што вывез ён з поля,
Прамовіць: «Хай скрозь будзе Божая воля».

Кляновіч. «ЮДАШАЎ МЕХ»

Нашы маёнткі займаюць звычайна самыя лепшыя мясціны — як па прыгажосці краявідаў, так і з боку гаспадарчай карысці. Выключэнне бывае тады, калі вёска ўзнікла раней, чым панскі двор. Не ўсе ж вёскі ўтварыліся згодна панскай волі. Яшчэ трэба ўлічыць, што час узнікнення маёнтка часта перадаецца з пакалення ў пакаленне родавым паданнем. Пра вёску ж, пра тое, хто і калі заснаваў яе, адкуль прыйшлі цяперашнія яе жыхары, ніхто табе не скажа, ніхто не адгадае паходжання яе назвы. Здаецца, люд вырас са сваёй зямлі, як грыбы яго бароў, як кветкі яго лугоў, як параскіданыя тут і там на яго палявых шнурах грушы. Калі б дакапацца да пачатку нашых сёл, можа, выявілася б, што ні адзін са старажытнейшых тутэйшых гарадоў на шмат маладзейшы за многія вёскі, што яны на адным і тым жа месцы, пад той жа або трохі зmenенай назвай стаяць тут восем ці дзесяць стагоддзяў. І не адно мужыцкае імя было добра вядома праз стагоддзі ў сваёй ваколіцы, пакуль з'явіліся імёны і гербы магнатаў. Калі б народ наш лепей помніў мінулае, калі б разумеў сэнс пошукаў так званай гістарычнай арыстакратыі свайго радаводу, як бы ён пасмяяўся з нашай пыхі, з таго, што мы ганарымся старажытным, трыста гадоў назад атрыманым гербам, ён, што тысячы год налічвае ў сваёй генеалогіі... Наш селянін не піша і не чытае гісторыі, але верачы ў якое-небудзь сваё мясцовае паданне, з пагардай глядзіць на шляхецкую расу, інстынктыўна адчуваючы, што яны, шляхціцы, якіясьці прыхадні, а ён — тутэйшы жыхар і гаспадар тутэйшай зямлі.

Але вернемся да прадмета гаворкі — намалюем нашы вёскі з натуры і пададзім тут толькі іх характэрныя рысы.

Двор з прычыны таго, што ўзнік перш, чым падлеглая яму вёска, выбраў для сябе прыгажэйшы пагорак, ураджайнейшае і раўнейшае поле, больш рыбнае возера, словам, усё лепшае. Але панскія сядзібы мы не будзем тут апісваць, бо выгляд іх залежыць ад мясцовасці,

ад патрэб, густу і заможнасці уладальнікаў, вызначаюцца яны вялікай разнастайнасцю, таму немагчыма падаць тут іх тыповую карціну. Вёскі ж, наадварот, самой толькі мясцовасцю розняцца адна ад другой, а так усе падобныя паміж сабою, як сёстры — паходжаннем, патрэбамі, звычаямі і доляй сваіх жыхароў.

Месцяцца яны звычайна непадалёку ад рэчкі, каля луга па адзін бок і каля поля — па другі. Перасякае іх вуліца — з хатамі на адным баку, і з хлявамі — на другім. Часам касцёл, царква і заўсёды карчма узвышаюцца пасярэдзіне ці ў канцы сяла. Па абодвух яго канцах стаяць вароты, якія большую палавіну года не замыкаюцца. Пры варотах нярэдка стаіць крыж, альбо бяроза, ці груша, ці пафарбаваны ў белыя і чорныя палосы слуп з надпісам назвы вёскі і колькасці хат, воддаль — мясцовыя могілкі з простымі заімшэлымі крыжамі. Гэта — агульны выгляд літоўскай вёскі, характэрны як для *маіх былых ваколіц*, так і іншых ваколіц краю.

Прыгледзімся бліжэй да асобнай хаты з яе прадметамі. Перад нашымі вачамі жыва ўстае яе вобраз, але слабае пяро не здолее некалькімі хай і трапнымі штрыхамі яе апісаць. Вось доўгая і вузкая, павернутая бокам да вуліцы, з чатырма дробнымі вокнамі пабудова. Сцены яе зрублены з акруглых яловых ці сасновых бярвенняў. Накрыта яна саламянай страхой, якая найчасцей маляўніча пашарпана і цвіце зялёным мохам. Над ёю выдаўблены пень дрэва выконвае функцыю коміна. У сярэдзіне будынка відаць вузкія адзінарныя дзверы з драўлянай закруткай, перад імі ляжыць калода ці камень — своеасаблівы ганак. Акружае хату абкладзеная дрэвам і засыпаная зямлёй прызба, дзе вечарамі ці ў свята любіць наш селянін пасядзець, пагаманіць у коле сям'і ці суседзяў. Насупраць хаты — невялікі маляўнічы свіронак, які называецца ў некаторых мясцовасцях *клеццю*. Далей — падпаветка з адкрытым саламяным дахам. Там захоўваюцца сохі, бароны, калёсы і іншыя гаспадарчыя прылады. Невялікая стайня, ці абора, дапаўняе вясковы падворак, агароджаны жардзяным плотам, упрыгожаны часам садком, дзе расце старая расахатая ігруша, стаіць адзін-другі вулей пчол, бушуе на градах шыракалісты тытунь, жаўцее высокі сланечнік, зелянее вясельная рута, пасаджаная дзявочымі рукамі, ці раскашуецца гожы куст таямнічай, у народных песнях апетай каліны. На другім баку вуліцы — гумно са збожжам, шчуплае, як той кавалак хлеба, што спажывае наш селянін, а перад ім — высокі драбінасты пераплот, дзе пад восень убачыш, як на выставе, увесь плён сялянскай нівы, ці студня з доўгім жураўлём, а часам — гняздо бусла, таямнічага апекуна шчаслівай, выбранай ім хаты. Буслінае гняздо — уцеха гаспадара, прадмет ушанавання і зайздрасці суседзяў.

Мы апісалі знешні выгляд хаты, цяпер увойдзем у яе сярэдзіну. Там цёмна, часта дымна і вільготна. Галоўная рэч і аздоба хаты — вялікая печ каля парога, на якой у дні марознай зімы грэюцца старыя і дзеці. Паўз сцены — шырокія і тоўстыя лавы з дубовых і сасновых дошак. Перад лавай — доўгі і вузкі стол. Месца ў хаце, дзе сыходзяцца з двух бакоў лавы за сталом, называецца *покуць* — ганаровае месца, там садзіцца толькі гаспадар — галава сям'і ці запрошаны ў нядзелю добры госць. У іншым кутку стаяць малыя жорны, якімі мелюць збожжа. Большую палавіну года яны глухія, толькі ўвосень стукаюць на досвітку і вечарамі. Вось унутраны выгляд хаты нашага селяніна, вось карціна, якую, не жадаючы паэтызаваць, мы паказваем ва ўсёй сваёй праўдзівасці.

У такіх вось хатах нараджаюцца, жывуць і паміраюць людзі нашых вёсак. Прасочым жа збольшага іх жыццё ад калыскі да магілы. Пачнём словамі Свяшчэннага пісання. Жанчына крычыць ад болю пры родах, але потым цешыцца, што нарадзіўся чалавек. Боль, радасць і пэўная ўрачыстасць суправаджаюць прыход чалавека на свет. Але паколькі прыгорблены працаю наш селянін хоча сабе мецъ падпору ў старасці і памочніка ў гаспадарцы, ён заўсёды болей радуецца нараджэнню сына, чым дачкі. Вось якія словы ўкладае ў вусны бацькі народная песня, што спяваецца пры нараджэнні дзіцяці: «Калі ў мяне сын народзіцца, я здабуду для гасцей вішнёвага соку, калі дачка, вадой іх прыму, калі сын, збудую высокія гмахі, калі дачка — і шалаша не пастаўлю».

Над дзіцячай калыскай будучага хлебароба не вельмі затрымліваецца маці, занятая працай дома ці ў полі. Яе абавязак — толькі накарміць малое, а забаўляць яго, суцяшаць, калі плача, закалыхваць, каб спала,— гэта клопат старэйшага брата ці сястрычкі. Саламяная калыска немаўля так зроблена, каб маці змагла лёгка ўскінуць яе на плечы і панесці ў поле, дзе працуе, а калі дзіця ў гэтай калысцы, пастаўленай у цень жытняга снапа, плача ад скавару ці голаду, малы апякун ці апякунка спявае яму песню пра катка, які прынясе малому шаўковы пасак ці смачны піражок, пра курак, што радзяцца, чым бы яго пачаставаць. Вядома, гэтыя кацiныя ды курыныя абяцанкі ніколі не выконваюцца, а калі б і выканаліся, не вельмі прыдаліся б дзіцяці, але манатонны спеў закалыхвае яго да сну.

Так, сплючы і плачучы, правядзе малое першы год свайго падарожжа па зямлі. Калі скончыцца той год, маці адлучыць дзіця ад грудзей, і яно пачне ўжо карміцца няхітрай сялянскай стравай. А ў хаце бывае ўсякае: часам, як кажа прымаўка, з квасам, а парою з вадою, а найчасцей — сем посных пятніц на тыдні. Праўда, як кажа іншая прымаўка, густая каша не адганяе дзяцей, якія ад

вадзяністай уцякаюць. Але ж не так лёгка знайсці патрэбную страву для немаўля. А калі яму не ўсмак цвёрды хлеб з жытняй мукі і мякіны, альбо калі пакута прымушае плакаць і клікаць матку, то ўжо для суцяшэння не абяцаюць яму залатога паска, які прыносіць кот, а проста страшаць крыкуна воўкам, што прыходзіць з лесу хапаць крыклівых дзяцей, то дзедам-жабраком, што забярэ яго ў торбу, то панам, што будзе яго біць. Воўк, дзед і пан — гэта страшныя прывіды, якія, лётаючы над калыскай нашага селяніна, дапамагаюць дзіцяці заснуць. І пазнейшы век не хутка выб'е з яго галавы тыя пострахі. Паглядзіце, як кідаецца ўцякаць адзетая ў брудныя кашулькі грамадка дзяцей, калі пакажацца на вуліцы вёскі пан ці жабрак, як хаваецца яна ў хатах, зачыняючы вокны, альбо шукае ратунку ў блізкіх каноплях. Рэдка калі паманіш ты дзяцей кавалкам цукру ці хлебам і рэдка хто з нас мае ахвоту выбіваць з сялянскай галавы тыя страхі.

Перыяд дзяцінства і першай маладосці нашага селяніна абодвух полаў можна апісаць некалькімі словамі. Да гадоў дзесяці бегае ён самапасам у адной кашулі і босы. Летам, калі старэйшыя ідуць на работу, застаецца разам з равеснікамі ў вёсцы, гуляе з імі, дратуе суседскія агароды, латошыць садавіну альбо забаўляецца ў пяску ці ў гразі. Калі мінае дзесяць гадоў жыцця, а то і раней, ён адзяе шату сталасці — суконную сярмягу і лапці з ліпавай кары, памагае ўжо мацеры гадаваць малое дзіця, бацьку — пасвіць раніцай валы, ганяе на начлег коней, потым — ідзе грэбці сена, бо ўжо з дванаццаці гадоў лічыцца як рабочая душа і значыцца ў інвентары. У больш маладзейшым веку, чым колішні рымлянін, атрымлівае селянін сваё права грамадзянства, якое выражаецца тут адбываннем летніх талок, што ў некаторых мясцовасцях называюць *гвалтамі.* Так праходзіць яго перыяд фармавання сэрца і ведаў. Маральнае і духоўнае навучанне абмяжоўваецца для яго засваеннем штодзённай малітвы, мясцовых песень і казак. Жыццёвую практыку бярэ ён з уласных назіранняў, з вопыту старэйшых і з прымавак, дзе, як кажуць вучоныя, ёсць нямала народнай мудрасці, адчуванняў і вераванняў, але з іх не ўсё можна ўзяць за правіла пачціваму чалавеку. Бо ў прымаўках люду, як і ў яго хлебе, ёсць і здаровае зерне, і мякіна, а то і атрута. Не бачачы гэтага, ён спажывае і тое, і другое без разбору. Таму не трэба дзівіцца падупаласці яго цела і духу. Назавём некалькі прымавак сумніцельнай маральнасці, якія не забывае люд: *«І Бога хвалі, і чорта не гнявi»*, *«Будзе шчасце — і розум знойдзецца»*, *«На крывое палена патрэбен крывы клін»*, *«Вазьмі, нябожа, што мне нягожа»*, *«Доўг круціць, а голад крадзе»*, *«Бліжэй к целу кашуля, чым кафтан»*, *«Не ганячы — не купіць, не хвалячы — не прадаць»*, *«Дурны лае, а мудры бярэ»*, *«Дрэнны той крук, што выпускае здабычу з рук»*, *«Ліслівае цяля дзве маткі ссе, а гордае — ніводнай»*, *«Дзе цяжка пераскочыць, можна падлезці»* і г. д.

Разам са здаровай маральнасцю, што знаходзім у народных прымаўках, недасведчанае дзіця, мусіць, слухаючы, верыць гэтым і падобным максімам жыцця. Прыкра, але няма каму растлумачыць маладому пакаленню шкоднае насенне двурушніцтва і фальшу, эгаізму, крадзяжу, ашуканства, нізкага падхалімства, якія хаваюцца ў прыведзеных вышэй прымаўках. Аднак папытаемся, хто павінен гэтым заняцца? На жаль, калі і з'явіцца ў вёсцы нейкім цудам настаўнік для дзяцей, то звычайна ён будзе, як хутка выявіцца, толькі п'яніца і злодзей. Бо каб быў іншым, то знайшоў бы занятак больш карысны для сябе, чым вясковы бакалаўр.

З пятнаццаці ці васемнаццаці гадоў пачынаецца ў маладога чалавека перыяд сталасці — плечы яго ўзмацнелі, рукі прывыклі да плуга, касы і сякеры, у грудзях пачалі віраваць маладыя пачуцці. Ён спявае ўжо тужлівую песню: «Палавіна лет мінае, я шчасця не маю... Хаджу, блуджу, хаджу, блуджу, як то слонца ў крузе. Куды пайду, чы што раблю, усё сэрца ў тузе». І ў сэрцы русакосай дачкі сяла нараджаецца нейкі невыразны сум, у галаву прыходзяць хвалюючыя думкі, ёй хочацца ўпрыгожыць шыю шклянымі пацеркамі, галоўку — кветкай ці чырвонай калінай, паглядзецца ў вадзе, ці да твару яе строі, ці гожая яна сабой.

І наступае для маладых сэрцаў пара кахання. Усё мае цяпер для іх асаблівае значэнне: і сумесная праца ў полі абодвух полаў, і нядзельныя паходы ў царкву ва ўсёй красе іх убогіх строяў, і танец у карчме альбо ў панскім двары на дажынках, і гулянкі на гаманлівых зімовых вечарніцах, узаемныя падражніванні, песні, жартоўныя кпіны. Вось як, напрыклад, спяваюць хлопцы: «Колькі ў рэшаце вады ест, столькі ў дзевачак праўды ест». А дзяўчаты ім у адказ: «Эй, разгуляўся Юр'еў конь, разбіў камень капытом. Як у тым камені зерня ест, так ў хлопцаў праўда ест».*

Але наш селянін жыве занадта рэальным жыццём, і таму не мае часу аддавацца доўга чарам кахання. Як сон, мінаецца пара пустаты: селянін жа наш перш за ўсё — рабочая істота, і яго сямейныя сувязі — вынік гаспадарчых камбінацый, яны амаль не маюць дачынен-

* Аб'ектам нашых даследаванняў народных звычаяў з'яўляюцца тыя ж самыя ваколіцы, якія вывучаў добрай памяці Ян Чачот (Мінскі і Навагрудскі паветы), і песні, што тут цытуюцца, узяты з яго зборніка «Сялянскія песні з-над Нёмана і Дзвіны (1846).

ня да яго кахання. Нельга сказаць, каб гэты малады чалавек не пакахаў ніводнай з вясковых дзяўчат ці, наадварот, кахаў усіх. Аднак, калі панскі двор ці бацька вырашаць, што яму пара жаніцца, ён з халоднай крывёй пасылае сватоў да ўсіх па чарзе дзяўчат у ваколіцы, не надта клапоцячыся, каб выбраць тую ці іншую. У дзяўчыны ёсць як быццам прывілей у выбары, але і тут акалічнасць альбо чужая воля робяць рашаючы ўплыў на яе рашэнне. Дастаткова зірнуць на вясельныя песні і абрады, каб пераканацца, што дзяўчына, аддадзеная чужой волі, становіцца хутчэй паланянкай, чым спадарожніцай жыцця будучага мужа. Дзіўныя гэта абрады! Муж нібы выкрадае жонку ў бацькоў, дзяўчына ўвесь час слепа робіць тое, што кажуць ёй то бацькі, то шаферкі і вясельныя свацці, то муж. Яе становішча ў тую найважнейшую хвілю жыцця заўсёды пасіўнае і падлеглае. *Вязуць* яе да шлюбу, адзяюць чапец, загадваюць адбіваць усім прысутным дзесяткі надакучлівых паклонаў, піць, спяваць, нават плакаць пры абходзінах аднаго з адвечных традыцыйных абрадаў, што як святасць берагуць старыя, перадаючы маладым. «Кланяйся, дзяўчына, кланяйся,— спяваецца ў вясельнай песні,— старога і малога не мінай, слёзкамі зямліцу аблівай, роднага ойчаньку пазнавай». Слёзы тут абавязковыя, хоць папраўдзе дзяўчына ў глыбіні душы цешыцца пераменай у сваім жыцці. Ей звычайна спяваюць: «Зязюлька, зязюлька, кукуеш галасна, да не жаласна: не чутно за ельнічкам, за белым бярэзнічкам. Красная дзяўчына, плачаш галасна, да не жаласна: не чутно за дружкамі, за гаалснымі скрыпкамі». На гэта дзяўчына адказвае: «Я па бары не хадзіла, голасу не збірала, плакаць не вучылася...»

Нарэшце, маладая жонка жагнае дом бацькоў і родных, дзякуе за хлеб і адзенне, перапрашае за ўсё, зноў плача, зноў кланяецца і пакідае родную хату. Спявае мацеры: «Паглядзіся, матанька, да мяне аддаўшы да нявестку ўзяўшы. Да ўстанеш раненька — да няма каго будзіці, возьмеш вядзёрка — няма вадзіцы, ты ж будзеш думаць, што валэ пагнала, да твае валэ стаяць у хляве, да твае дзіця ў чужой старане».

А ў чужой старане, у чужой хаце першыя хвіліны маладой жанчыны рэдка калі бываюць шчаслівыя, бо не любоў, а выпадак зрабіў маладых мужам і жонкай. Трапіўшы ў лона чужой сям'і, не ведаючы яе духу і яшчэ не прыжыўшыся там, даводзіцца ёй сутыкацца з бацькамі і раднёй мужа, таму хутка яна становіцца косцю сямейнай сваркі. Свякроў, кажа прымаўка, любіць нявестку, як сабакі дзеда. Вечная нязгода паміж жонкамі двух братоў таксама праявілася ў прымаўках. Сумная мусіць быць доля маладой жанчыны. У народных песнях можна знайсці мноства прачулых скаргаў маладзіцы пасля замуства. Вось як наракае яна ў адной песні: «Ой, нашто ж мне свайго мілага гудзіць, калі мяне, маладу, да не раненька будзіць, да сам ідзе на ток малаціць, а мне, маладзенькай, вяліць легчы запачыць. Ой, сам ідзе на поле гараці; а мне, маладзенькай, вяліць ісці гуляці. Ой, іду я, іду гуляці, кроіцца маё сэрцайка на часці. Ой, мае суседачкі і п'юць і гуляюць, а мяне адну бяздольную, адну акаляюць... Ой, гдзе ж мае дзявоцкія падзеліся гулі? Ой, выйду я на вулічку, рассыпаны вішні, ой, гдзе ж мае падзеліся мыслі?.. Ой, крутая бярозанька, што пад гаем зросла, няшчасная нядзеленька, што я замуж пошла...»

У іншай песні спяваецца: «Каюся млода, а не памалу, што млода замуж пашла. Жыву я гадок, жыву я другі, у мамкі не бываю. Абярнуся я шэрай зязюляй і палячу ў мамкін сад. Сяду ў мамкіным саду на белай лілеі. Як закукую, як зашчабячу жаласным галасочкам, чы не пачуе мая маманька пад аконцам седзя. Як вышаў старшы брацец з новага церама: *калі зязюля, калі шэрая, ляці ў шчырыя бары, калі сястрыца, калі родная, хадзі ка мне ў госці.* Ах, добра табе, мой брацетка: гдзе радзіўся, там і жыць, а я маладзенькая ў чужой старане, цяжэнька мне жыць. Чужа старана тугою арана, слёзамі засеена, свая старана сошкаю арана, пшонкаю засеена.»

Сумуючы па сям'і, маладзіца спявае: «Пахіліцеся, лозы, ад дуба да бярозы, каб мне было відна да ойчанька майго. Лозанькі схіліліся, да хмаркі явіліся, такі мне не відно да ойчанька майго, такі ж мне не відненька да ойчанька майго родненькага!» Вось яна ідзе ў лес і як дзіця прыроды, чуючы інстынктыўна яго лячэбнае ўздзеянне на душу, кліча ў лесе лепшую долю і просіць, каб яна адгукнулася ёй баравым рэхам.

Але паступова туга мінаецца, жанчына прывыкае да новай сваёй ролі. Агульнасць долі і нядолі збліжае яе з чужой сям'ёй. Потым турботы і ўцехі мацярынства ды гаспадарчыя клопаты выбіваюць з маладой галавы дзявочыя мроі.

Мужчына пасля шлюбу становіцца адразу самастойным чалавекам. Цяжкая праца, сціплая яда і надта ж прыцягальнае «гарачае» пітво — вось увесь змест яго жыцця. Панскі двор, блізкае мястэчка, царква і карчма — адзіныя пункты, вакол якіх душой і целам кружыцца ён увесь свой век. Жывучы сёння і толькі для сёння, часта паўтарае прымаўку: *«Дзень наш — век»*, і жыве з дзіўнай безагляднасцю на заўтра. Забыўшы пра вясновы голад, ледзь толькі дачакаецца больш-менш ураджайнай восені, шчодра спраўляе дзяды*, зернем аплачвае з працэнтамі арандатару даўгі за выпітую гарэлку, потым п'е ў нядзелю за гатоўку, п'е датуль, пакуль нічога не

* Памяць памерлых.

застанецца, і просіць новую пазыку, а таксама дапамогі ў пана. У песні* спяваецца: «Сівы салавейка, чаму ты не спяваеш? Чаму ты, малады, чаму не гуляеш? Чы ты, малады, шчасця, долі не маеш? Патраціў я долю цераз сваволю, у новай карчомцы на горкай гарэлцы. Цяпер жа мне некуды павярнуцца, усё маё сяло ў Боруха на водцэ. Тут мае конікі, тут мае волікі, тут мая адзежка, тут мае грошыкі.»

Так прызнаецца селянін у сваёй віне, з якой не мае сілы выбавіцца. Калі глядзіш на яго збоку, ствараецца уражанне, нібы з сям'ёй звязвае яго толькі прывычка, карысць, што мае ад дзяцей і жонкі, і ён любіць іх так жа, як свайго каня ці вала, і намнога менш, чым люльку, якую ў вольную хвіліну запальвае з нейкай урачыстай важнасцю на твары, любіць, не шкадуючы дубца прадметам сваёй прыязнасці: quos diliget castigat, альбо, як кажа прымаўка: *«Кахай, як душу, а трасі, як грушу»*. Але з аднаго павярхоўнага позірку меркаваць пра сэрца нашага селяніна было б несправядліва і вельмі крыўдна для яго. Дзіця прыроды, ён не прывык крывіць душой, а чуласць сваю выяўляе ў дзіўных формах. О, ёсць глыбіня ў яго грудзях! Паглядзіце, як гэты паважны гаспадар сям'і ў вольную ад турбот хвіліну бярэ на калені малое і ўрачыста садзіцца з ім на прызбе сваёй хаты; паглядзіце, як шмат у сялян песень пра тугу мацеры па сыне, які апынуўся на чужыне ці быў забіты на вайне — ён там і сокал, ён і сонца, і ўся яе ўцеха; паглядзіце, якая доўгая і ціхая жалоба, якая святая памяць пануе ў хаце па нябожчыку! А цяпер спытайцеся, колькі добры пан можа прывесці доказаў прыхільнасці да сваіх падданых! Ёсць, паўтараю, глыбіня пачуццяў у гэтых загарэлых касцістых грудзях, прыкрытых грубай і падранай світкай. Намаляваўшы з натуры знешні выгляд нашага люду, мусім вам падаць без ідэалізацыі яго нароўны ўнутраны свет. Іншым разам, ды і не адзін, можа, раз, калі, карыстаючыся правам мастака, расхінём перад вамі яго сэрца, вы ўбачыце, якая сіла пачуццяў хаваецца ў гэтым дзікім на выгляд, але ціхім дзіцяці прыроды.

У некалькіх словах можна паказаць увесь год нашага люду — з такіх гадоў сплятаецца ўсё яго жыццё. Цэлую зіму малоціць ён панскае збожжа і возіць з лесу дрэва. Бліжэй да дня святога Мацея, калі, як кажуць, ужо зіма пацее, абходзіць ён шчодрую велікапосную пятніцу, потым адпраўляе велікапосную споведзь і ў вясновы голад святкуе Вялікдзень. У пачатку красавіка выходзіць у поле з сахой. У канцы чэрвеня распачынае касьбу і жніво. А на святога Эліяша (20 ліпеня) у яго ўжо, паводле прымаўкі, поўная печ хлебнага цеста. Гэта наступіла пара дастатку — прыходзіць Божае Пераўтварэнне, час усялякага выспявання, і бачыш часовае багацце ў хатах і гумнах. У дзень Маткі Боскай Зельнай ён асвячае калоссе, а на святога Барталамея, згодна з даўняй прымаўкай, бярэцца за асеннюю сяўбу. На святога Мікалая аплачвае падаткі, а рэштку гадавых збораў спажывае ў час калядных урачыстасцей, якія праз колькі дзён шчодра, са свіннінай і гарэлкай, спраўляе. А потым пакорліва распачынае сваю звычайную чараду работ і голаду.

Такі перыяд сталасці селяніна. Але вось прыходзіць зіма яго жыцця, прыходзіць досыць позна, бо ў гэтым бясконцым змаганні з працай і нястачамі ён набыў моцнае фізічнае здароўе. Паступова горбяцца плечы, звешваецца галава, моршчыцца твар, пачынаюць трэсціся рукі. Мужчына, як звычайна ў старасці, набывае шаноўнае імя дзеда і, пакашліваючы, глядзіць на сваё маладое пакаленне, якому з'яўляецца галавой і вышэйшым аўтарытэтам. Жанчына, гожая калісь жанчына, адчувае, як з часам блажэе яе твар, ведае, што імя бабы — прыраўніваецца да слова «чараўніца» — абражае яе, яна з абыякавасцю ставіцца цяпер да свайго адзення і, пачынаючы бурчаць і лаяць моладзь, памалу рыхтуецца да смерці. Дзед няньчыць сваіх унукаў альбо, калі асіраціў яго Бог, ідзе пасвіць вясковую жывёлу. Баба, седзячы на печы з кудзеляй, прамаўляе пацеры, спявае традыцыйныя песні, расказвае казкі, вучыць малых дзяцей.


З часам старыя, адчуваючы сябе лішнім цяжарам у хаце, надзяюць на плечы накрыж па дзве торбы, бяруць у рукі кіі і, спяваючы дзедаўскія пацеры, пускаюцца ў свет, ходзячы ад вёскі да вёскі, ад касцёла да касцёла і просячы ў добрых людзей які грош ці кавалак хлеба. А добрыя людзі ахвотна, з пэўнай пашанай прымаюць *старцоў* (выраз тэхнічны), бо ва ўсім славянскім свеце звычай жабравання ў старасці вельмі распаўсюджаны і ніхто не зневажае ані саміх жабракоў, ані сям'ю, якая пусціла на валацужніцтва родных бацькоў.

Так літоўскі селянін у хаце на печы альбо пад чыімсьці плотам заканчвае сваё ціхае жыццё. Сям'я паплача па ім, замкне яго ў чатыры сасновыя дошкі, пахавае на могілках, а праз год пасля смерці паставіць на магіле драўляны крыж, справіць памінкі, нап'ецца там, потым яшчэ паўздыхае, памоліцца і... забывае нябожчыка.

* Гл. Збор Чачота, стар. 24.

XII

ПІЛІГРЫМ У КАНЦЫ ВАНДРОЎКІ



Вось, нарэшце, і абышоў я, радзіма,
Гарады твае, вёскі з кіем пілігрыма.
Блізка бачыў я вежы касцёлаў, крыніцы,
Падзямельныя склепы твае, камяніцы,
І, каб мне пахваліцца хоць чым было можна,
Ўзяў я памятак колькі у ранец дарожны:
Частку нёманскай хвалі, камень даўняе вежы,
Завушніцу з магілы, з дрэва лісцік свежы...
Удоўж і ўшыр абышоўшы ўсё Прынямонне,
Спачываю пад грушай развесістай сёння.
Перад тым, як мне выйсці на новую каляіну,
Я той шлях, што прайшоў, сваім зрокам акіну.
Там над возерам замак глядзіцца ў зоры,
На пагорку там бачу я бацькаўскі дворык.
Там і хатка, дзе шчасце мяне абмінула,
Там цвінтар, дзе дзятва — мая кроў — заснула.
Там святыні, там блізкія стрэхі з саломы,
Звоніць птаства маё, ходзіць вецер знаёмы.
Да мяне зноў вяртаюць нябачныя крыллі
Усе пачуцці, што некалі сэрца палілі,
Тыя думкі, што ўсё ў галаве віравалі...
О куткі мае мілыя! Родныя далі!
Калі ў свет мяне кіне нястрыманым ветрам,
Набяру сабе ў грудзі адгэтуль паветра,
Набяру яго шмат, каб надоўга хапіла,
Каб яно мае песні заўсёды жывіла.
Толькі чым, мае долы, ўзамен вам аддзячыць?
Можа, благаславеннем вандроўным, жабрачым,
Яго з ветрам пусціўшы па родным абшары,
Каб збыліся людзей нашых лепшыя мары:
Над лясамі, над Нёманам, на мужычым загоне
Хай жа лепшыя песенькі птушкі зазвоняць,
Закрасуюць хай збожжам пясчаныя нівы
І аратага сэрца ўстрапянецца шчасліва.
А вясною, ля Нёмана, ў ціхай затоцы,
Калі бусел, свет славячы, зноў заклякоча,
Паспяшае мой дух, каб пацешыцца з вамі,
Палунаць зноў над вёскамі, над цвінтарамі,
Дзе ваду піў з бруі, дзе меў хлеб я з пагоркаў,
Дзе ліў слёзы па дзецях пад згубнаю зоркай,
Адкуль з болем пусціўся я ў новую пуцявіну
І дзе памяць пра край свой у песні пакінуў!

КАМЕНТАРЫІ

1 Зімаровіч Юзаф Бартламей (1597—1677) — польскі паэт і гісторык. Нарадзіўся ў Львове.

2 Маецца на ўвазе Вільня.

3 Кахоўскі Вэспраз'ян Геранім (1633—1700) — польскі паэт, празаік, гісторык.

4 Алківіяд (каля 450—404 да н. э.) — палітычны і ваенны дзеяч старажытных Афін. Быў вучнем Сакрата, але не згаджаўся з яго поглядамі.

5 Так у часы Сыракомлі называлі апрача этнаграфічнай Літвы большую частку Беларусі, якая ўваходзіла ў беларуска-літоўскую дзяржаву Вялікае княства Літоўскае.

6 Свабодна адчужальная індывідуальна-сямейная зямельная ўласнасць у раннефеадальнай Заходняй Еўропе — як перажытак існавала і пры развітым феадалізме.

7 У літоўскай міфалогіі язычніцкі Бог грому і маланкі, атаясамліваўся з Зеўсам і Юпітэрам. Адпавядае Перуну у беларусаў.

8 Багіня кахання ў літоўскай міфалогіі.

9 Крывэ-Крывэйта — вярхоўны літоўскі жрэц, капішча якога, паводле падання, было на месцы цяперашняй Кафедральнай плошчы ў Вільні.

10 Жыгімонт II Аўгуст (1520—1572) — вялікі князь Вялікага княства Літоўскага (1544—1572), кароль Польшчы (1548—1572).

11 Жыгімонт I (Стары) — вялікі князь Вялікага княства Літоўскага і кароль Польшчы (1506—1548).

12 Плуг Адам (сапр. Пяткевіч Антоні Антонавіч (1823—1903) — польскі і беларускі пісьменнік. Нарадзіўся ў в. Замосце на Случчыне. Жыў у в. Жукаў Барок на Стаўбцоўшчыне.

13 А. Плуг настаўнічаў у Бесарабіі.

14 Кляновіч Себастыян Фабіян (1545—1602) — польскі паэт, які пісаў на лацінскай і польскай мовах.

15 Поўнае імя паэта не высветлена.

16 Трэмбіцкі Станіслаў (1739—1812) — польскі паэт эпохі Асветніцтва.

17 Ясінскі Якуб (1759—1794) — польскі паэт, удзельнік паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі. Загінуў у адным з баёў.

18 Увесь рымскі народ (лац.)

19 Маецца на ўвазе міжусобная барацьба паміж Свідрыгайлам (каля 1370—1452), сынам вялікага князя літоўскага Альгерда, і Вітаўтам (1350—1430), вялікім князем літоўскім, сынам Кейстута.

20 Жыгімонт Кейстутавіч (г. н. невядомы — 1440) — вялікі князь Вялікага княства Літоўскага.

21 Балінскі Міхал Ігнатавіч (1794—1864) — гісторык і публіцыст, родам з Полаччыны, пісаў на польскай мове. Аўтар 3-га тома «Старажытнай Польшчы» (1846), дзе шмат увагі ўдзяліў гісторыі Беларусі, яе гарадоў, мястэчак і інш., «Гісторыі горада Вільні» у 2-х тамах (1836—1837), на якую тут, відавочна, і робіцца спасылка.

22 Казімір IV Ягелончык (1427—1492) — вялікі князь Вялікага княства Літоўскага з 1440 г. і кароль Польшчы з 1447 г.

23 Аляксандр (1461—1506) — вялікі князь літоўскі з 1492 г. і кароль Польшчы з 1501 г.

24 Глінскі Міхал (1470—1534) — князь, военачальнік. Ў 1506 г. на чале войска Вялікага княства Літоўскага разграміў пад Клецкам крымскіх татар.

25 Крашэўскі Юзаф Ігнацы (1812—1887) — польскі пісьменнік, гісторык, грамадскі дзеяч. З сям'і пружанскага харунжага. Аўтар шматлікіх гістарычных раманаў (асобныя прысвечаны мінуламу Беларусі), навуковых прац: «Старажытная Літва, яе гісторыя, законы, мова, вера, звычаі, песні...» (1847—1850), «Барысаў» (1848), «Мастацтва славян, асабліва ў Польшчы і добрахрысціянскай Літве» (1860) і інш., а таксама падарожных нарысаў, у тым ліку пра Беларусь, напрыклад «Пінск і Піншчына» (1838), «Успаміны Палесся, Валыні і Літвы» (1840), «Карціны з жыцця і падарожжаў» (1842), «Адзенне мяшчан і сялян з ваколіц Брэста, Кобрына і Пружан» (1860).

26 Гельветы — гальскае племя, што жыло ў I ст. да н. э. у Швейцарыі, якую пагэтаму называлі яшчэ Гельвецыяй. Сталіца Гельвецыі — Жэнева з'яўлялася аплотам аднаго з напрамкаў Рэфармацыі — кальвінізму (заснавальнікам яго быў Кальвін). Адсюль, відавочна, і вызначэнне кальвінізму як гельвецкае веравызнанне.

27 Адлюстраванне (лац.).

28 Ходзька Ігнацы (1794—1861) — польскамоўны пісьменнік Беларусі.

29 «Караль Станіслаў Радзівіл, уладальнік Алыкі, Нясвіжа, Біржаў, Дубінак, Слуцка, Капыля і Клецка, галава і граф у Шыдлоўцы, Міры, Крожах і Белай...» «Выплавіў Амбросій Іаан Пат». «Св. Міхаіл, св. Караль Станіслаў».

30 Каханоўскі Ян (1530—1584) — польскі паэт.

31 Маецца на ўвазе Адам Міцкевіч, месцам нараджэння якога многія лічылі Наваградак, хоць нарадзіўся ён на хутары Завоссе Наваградскага павета, а ў Наваградку быў толькі ахрышчаны.

32 Першы ў Вялікім княстве Літоўскім біскуп аднаго з каталіцкіх ордэнаў — дамініканцаў, названага імем яго заснавальніка.

33 Бластусовіч Пётр (Кміта Пётр Бляст) — выдавец, друкар і паэт 1-ай паловы XVII стагоддзя. Працаваў у Вільні. З 1612 да канца 1620-ых гадоў кіраваў друкарняй у Любчы Наваградскага павета.

34 Выдавец і друкар XVII стагоддзя. Узначальваў Любчанскую друкарню ў 40 — 50-ых гадах.

35 Аўзонская даліна, Аўзонія — так называлі ў старажытнасці Італію, па імені першага цара Аўзона, які быў, згодна з міфалогіяй, сынам Адысея.

36 Ад назвы мястэчка Боцькі на Беласточчыне, вядомага калісьці рымарскімі вырабамі, асабліва бізунамі, што прызначаліся для «выхавання» вучняў у школах.

37 Даленга-Хадакоўскі Зарыян (сапр. Чарноцкі Адам (1784—1825) — славянназнавец, пачынальнік беларускай, польскай, рускай і ўкраінскай археалогіі, фалькларыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі. Родам з Мінскай губерні.

38 Гескі Юзаф — прыдворны жывапісец Радзівілаў у Нясвіжы ў другой палове XVIII — пачатку XIX стагоддзя.
39 Дамель Ян (1780—1840) — беларускі жывапісец.
40 Асвечанае свяцілішча (лац.).
41 Вішнеўскі Міхал (1794—1865) — польскі гісторык літаратуры. Аўтар «Гісторыі польскай літаратуры» (т. 1—10, 1840—1857), даведзенай да сярэдзіны XVII стагоддзя.
42 Ягайла, Якаў, Уладзіслаў II (каля 1348—1434) — вялікі князь Вялікага княства Літоўскага (1377—1392), кароль Польшчы (1386—1434), заснавальнік каралеўскай дынастыі Ягелонаў.
43 Папроцкі Барталамей (1543—1614) — польскі паэт, гісторык, аўтар гербоўніка «Гербы польскага рыцарства» (1584).
44 Тут: умовамі (лац.).
45 Скарга (Павенскі) Пётр (1536—1612) — рэлігійны і палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, пачынальнік польскай аратарскай прозы.
46 Растоўскі Станіслаў (1711—1782) — прафесар Віленскай акадэміі, тэолаг, гісторык, пісаў на лацінскай мове.
47 Карэ́ц — драўляная або металічная пасудзіна з ручкай для зачэрпвання вады, квасу і т. п.
48 Прэнт — даўняя мера даўжыні (4,5 м).
49 Святая гара (лац.).
50 Белона — паводле міфаў, італійская багіня вайны, жонка Марса.
51 Вышэйшая ступень, крайняя мяжа.
52 Канарскі Станіслаў Геранім (1700—1773) — польскі грамадскі дзеяч, публіцыст і педагог.
53 Дружбацкая Альжбета (1687—1760) — польская паэтэса.
54 Бяляўскі Юзаф (1729—1809) — польскі драматург і паэт.
55 Змрочная крэпасць (лац.).
56 Таварыства Ісуса (лац.).
57 Багіня агню.
58 Чарнецкі Стэфан (1599—1665) — польскі военачальнік.
59 Брагэ Ціхан (1546—1601) — дацкі астраном.
60 «Божа слаўны» — рэлігійны гімн.
61 Нарушэвіч Адам Станіслаў (1733—1796) — польскі паэт, гісторык, родам з мястэчка Лагішын на Піншчыне.
62 Карпінскі Францішак (1741—1825) — польскі паэт.
63 Падземны горад (лац.).
64 Смуглевіч Францішак (1745—1807) — жывапісец, графік, педагог. У творчасці адлюстраваў жыццё Польшчы, Літвы, Беларусі, Расіі.
65 Стрыйкоўскі Мацей (1547?—159?) — гісторык і паэт. З 1570 г. жыў на Беларусі і ў Літве.
66 Гарайн Юльян (1821—1883) — польскамоўны пісьменнік Беларусі. Родам з Радашковічаў. Скончыў Мінскую гімназію.
67 Гален Клаўдзій (131—211) — рымскі лекар, вывучаў анатомію чалавека.
68 Спурзгейм Каспер (1776—1832) — французскі вучоны-медык.
69 Рэй Мікалай (1505—1569) — славуты польскі пісьменнік, родам з вёскі Нагловіцы, «бацька польскай літаратуры».
70 «Кур'ер Віленскі» — часопіс.
71 Сю Эжэн (1804—1857) — папулярны французскі раманіст.
72 Дзюма Аляксандр (бацька) (1802—1870) — вядомы французскі раманіст, драматург.
73 Каржанеўскі Юзаф (1797—1863) — польскі драматург, раманіст і педагог.

ЗМЕСТ

Сыракомля У.

С 95 Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: Успаміны, даследаванні гісторыі і звычаяў / Пер. з польскай мовы, прадм., камент. К. Цвіркі.— Мн.: Полымя, 1992.— 159 с.: іл.— (Літ. помнікі Беларусі).

ISBN 5-345-00503-6.

Сырокомля В. Странствования по моим бывшим околицам: Воспоминания, исследования истории и обычаев.

Гэта даволі значны празаічны твор Уладзіслава Сыракомлі (1823—1862) адносіцца да жанра падарожных нарысаў. Апісваючы гістарычныя падзеі ў некаторых гарадах і мястэчках Беларусі, аўтар узнаўляе карціну далёкага мінулага тутэйшай зямлі. Чытач пабывае і ў палацы мясцовага магната, і ў шляхецкай сядзібе, і ў беднай хаціне вяскоўца. З любоўю распавядаючы пра дарагія сэрцу мясціны — Нясвіж, Стоўбцы, Койданава, Мір і інш., У. Сыракомля не абыходзіць увагай і жыццё простага люду, паказвае яго побыт, звычкі, раскрывае багацце душы. Са старонак кнігі паўстаюць перад чытачом і вобразы знакамітых людзей краю — паэта Адама Плуга, філосафа С. Маймана, мастака Ю. Гескага і інш.

Адрасуецца масаваму чытачу.

С $\frac{0503020903—038}{М 306(03)—92}$ 15—92

ББК 63.3 (2Б)

Научно-популярное издание

СЫРОКОМЛЯ Владислав

СТРАНСТВОВАНИЯ ПО МОИМ БЫВШИМ ОКОЛИЦАМ

Воспоминания, исследования истории и обычаев

Минск, издательство «Полымя»

На белорусском языке

Навукова-папулярнае выданне

СЫРАКОМЛЯ Уладзіслаў

ВАНДРОЎКІ ПА МАІХ БЫЛЫХ ВАКОЛІЦАХ

Успаміны, даследаванні гісторыі і звычаяў

Загадчыца рэдакцыі *Л. І. Круглова*. Рэдактар *В. І. Дрозд*. Афармленне *У. А. Фандулева*. Мастацкі рэдактар *І. А. Дзямкоўскі*. Тэхнічны рэдактар *М. І. Ванкевіч*
Карэктар *Я. А. Лукошка*

ІБ № 996

Здадзена ў набор 24.04.91. Падпісана да друку 18.05.92. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера афсетная. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 8,4. Ум. фарб.-адб. 8,61. Ул.-выд. арк. 8,79. Тыраж 2400 экз. Выд. № 8518. Зак. 1329.
Цана 2 р. 80 к.

Выдавецтва «Полымя» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. 220600, Мінск, пр. Машэрава, 11. Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.